УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА”

Факультэт гістарычны

Кафедра гісторыі Беларусі

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________ А.М. Дулаў
29 05 2018 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________ В.А. Космач
29 05 2018 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасці

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

У 2 частках

Частка 2

Складальнік: І.У. Мандрык

Разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні навукова-метадычнага савета
27.06.2018 г., пратакол № 6

Репозиторий ВГУ

УДК 94(476)(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я73
Г51

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 2 ад 19.12.2018 г.

Складальнік: прафесар кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава,
доктар гістарычных навук **І.У. Мандрык**

Р э ц э н з е н т ы :
кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА "БДАТУ";
прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры
ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар гістарычных навук *В.А. Космач*

Г51 **Гісторыя Беларусі для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны :** вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне : у 2 ч. / склад. І.У. Мандрык. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2019. – Ч. 2. – 199 с.

Вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі (перыяд навейшага часу) падрыхтаваны згодна з тыпавой вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, якая зацверджана ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь (рэг. № ТД-А.465).

Змест комплекса раскрывае сутнасныя элементы і праявы эканамічных адносін, важнейшыя рысы гаспадарчага і сацыяльнага развіцця беларускага грамадства на этапе 1943–2015 гг.

Асноўная ўвага звернута на праблемныя пытанні і асэнсаванне гістарычнага працэсу ў краіне з акцэнтаваным паказам падзей, што адбываліся ў рэгіянальным маштабе.

ВМК прызначаны для студэнтаў гістарычнага факультэта дзённай і завочнай форм навучання, магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў і настаўнікаў.

**УДК 94(476)(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)я73**

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2019

Репозиторий ВГУ

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Другая частка ВМК з’яўляецца працягам той, якая была прысвечана высвятленню гістарычных працэсаў на Беларусі ў перыяд 1919–1945 гг. Пры падрыхтоўцы раздзелаў ВМК, уключаных у другую частку , аўтар абапіраўся на тэарытычную і фактулагічную аснову прац вядомых у краіне гісторыкаў, даследуючых падзеі гісторыі Беларусі пасляваеннага перыяду, змест фундаментальных зборнікаў, выдадзеных у краіне і ў замежжы. Істотнае месца ў ВМК займаюць творы М.П. Касцюка, П.Ц. Петрыкава, Я.К. Новіка, П.І. Брыгадзіна, Л.М. Лыча, У.І. Навіцкага, В.П. Асмалоўскага, А.А. Каваленi, Э.М. Загарульскага , У.С. Кошалева, І.Р. Іофэ, П.А. Лойкі, В.М. Фаміна, У.М. Міхнюка, А.М. Мацко і інш.

Адначасова, аўтар ВМК праводзіў самастойны пошук дакументальных матэрыялаў. У навуковы зварот уведзены дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, абласнога дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

Аналіз апрацаваных крыніц дазваляе казаць, што ў нашых бібліятэках яшчэ і сёння знаходзіцца шмат гістарычных работ, якія не пазбаўлены ад павярхоўных высноў, аднабаковасці ў паказе палітры складаных гістарычных падзей на Беларусі ў пасляваенны час. Асобныя айчынныя гісторыкі і палітыкі ў сваім жаданні паглыбіцца ў сутнасць змен і наяўных праблем (што зусім слушна) не заўважаюць якасных дасягненняў у сферы матэрыяльнай вытворчасці і духоўным уздыме беларускага народа пасля разбуральнай для нашай рэспублікі вайны. Спрабуючы паказаць дэфармацыі сацыялізму, якія мелі месца ў сапраўднасці, яны канцэнтруюць увагу на негатыўных момантах у развіцці рэспублікі.

Праводзячы глыбокі аналіз падзей, абапіраючыся на канцэпцыю цэласнасці і непадзельнасці гістарычнага працэсу, аўтар ВМК імкнецца давесці да яго карыстальнікаў асноўную думку, што з часу вызвалення ад фашысцкай акупацыі і да 1990 года Савецкая Беларусь развівалася ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай цывілізацый. У гэтыя гады тут, як і ў папярэднія стагоддзі, накапліваліся, выспявалі шматлікія супярэчнасці, узнікалі складаныя праблемы ў палітычным , матэрыяльным і духоўным жыцці, што аб’ектыўна прыводзіла да рознаварыянтнасці іх вырашэння. Афіцыйны курс, які існаваў і праводзіўся кіраўніцтвам дзяржавы на працягу гэтага перыяду, безумоўна, не быў адзінаправільным. Гістарычны працэс у рэспубліцы насіў нераўнамерны, хвалепадобны і спіралепадобны характар. У беларускім грамадстве мелі месца і трагізм, і застой, і абмежаванасць нацыянальна – культурнага жыцця і іншыя хібы. Але, пры высвятленні асноўных заканамернасцяў гістарычнага развіцця краіны на гэтым этапе, ёсць падставы сцвярджаць, што савецкі час характарызуецца прагрэсам, найкаштоўнейшымі матэрыяльнымі і духоўнымі здабыткамі.



Репозиторий ВГУ

Нават у самыя змрочныя гады палітычнага рэжыму грамадская атмасфера ў краіне была прасякнута пафасам стваральнай працы. Пры вырашэнні праблем нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця краіны, насельніцтва Беларусі праяўляла мужнасць і высокую адказнасць, сапраўдны працоўны гераізм і добрасумленнае служэнне Айчыне. Савецкая Беларусь, якая належыла да ліку найбольш пацярпелых і зруйнаваных тэрыторый у гады Вялікай Айчыннай вайны, з дапамогай працоўных іншых рэспублік у кароткія тэрміны справілася з такой бядой, заняла годнае месца ў сусветным супольніцтве.

У раздзеле ВМК "Беларусь сучасная" (ад 1990 да 2015 г.) даследуюцца падзеі часоў распаду СССР і пераходу Беларусі да дзяржаўнага суверэнітэту і рыначных адносін. Змест раздзела будуецца на аснове шматлікіх распрацовак навукоўцаў і публікацыях самога аўтара, у тым ліку манаграфіі: "Гістарычная абумоўленасць будаўніцтва ў Беларусі сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі: пазначаны курс, складанасці, вынікі", выдадзенай у 2017 годзе ў ВДУ імя П.М. Машэрава.

У гэтым раздзеле ВМК атрымалі навуковае асвятленне асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь ва ўмовах парламенцкага кіравання (да сярэдзіны 1994 г.) і пасля гэтага – ў час прэзідэнцкага праўлення, калі быў абраны яе першы Прэзідэнт. Тут аналізуецца дзейнасць рэспубліканскіх і рэгіянальных органаў улады на першым этапе (1991–1995 гг.) у абставінах крызісных з'яў, і настойлівым імкненні да пераадолення негатыўных працэсаў у эканоміцы – на другім этапе ад 1996 г. да 2015 г. Адзначаецца, што на працягу фарміравання беларускай мадэлі сацыяльна –эканамічнага развіцця, назіраліся паступовыя зрухі ў лепшы бок. У той жа час існавалі прычыны структурнага характару, якія не дазволілі на гэтым этапе пабудаваць стабільна функцыянуючую эканоміку і забяспечыць на сярднееўрапейскім узроўні дабрабыт усіх членаў грамадства.

У ВМК зроблены аўтарскія адзнакі і высновы аб прагрэсіўным развіцці беларускага грамадства, аб магчымасцях і межах прымянення назапашанага сацыялізмам гістарычнага вопыту ў сучаснай дзяржаўнай палітыцы і практычнай дзейнасці па фарміраванні рыначнай сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

Вучэбна-метадычны комплекс адлюстроўвае спецыялізацыю студэнтаў, ён можа быць карысным для магістрантаў, аспірантаў і выкладчыкаў грамадазнаўчых дысцыплін.

Аўтар спадзяецца, што дадзенае выданне аб гістарычных падзеях у жыцці і дзейнасці беларускага народа ў пасляваенны перыяд і на этапе з 1991 г. – па сёняшні час, з акцэнтаваным паказам падзей, што адбываліся ў Віцебскім рэгіёне, будзе садзейнічаць фарміраванню ў моладзі цэласнага ўяўлення аб гістарычным шляху беларускага народа, і акажа дапамогу яго карыстальнікам пры вырашэнні сучасных праблем у развіцці Беларусі.

Рэпазіторый ВДУ

# II. МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АВАЛОДАННІ ЗМЕСТАМ ВЫВУЧАЕМЫХ ТЭМ

ТЭМА 1. **Беларусь пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Першы аднаўленчы этап. Выхад БССР на міжнародную арэну**

*1. БССР пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Першы аднаўленчы этап.*

*2. Выхад БССР на міжнароднаю арэну.*

***1. БССР пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Першы аднаўленчы этап.*** Прыступаючы да разгляду гэтага пытання, студэнты павінны звярнуць увагу на тое, што Беларусь даволі працяглы час знаходзілася пад нямецкай акупацыяй і належыла да ліку найбольш пацярпелых тэрыторый. Вайна нанесла народнай гаспадарцы і культуры Беларусі велізарныя страты. За гады акупацыі (1941–1944 гг.) Беларусь страціла больш за 50 % свайго нацыянальнага багацця, пры новым падліку – кожнага трэцяга жыхара, 380 тыс. чалавек дэпарціравана на прымусовыя работы ў Германію, адкуль шмат іх не вярнуліся на радзіму. Разбурана і спалена 209 гарадоў і раённых цэнтраў (з 270), 9200 вёсак. У Беларусі пасля вызвалення заставалася 5% даваенных энергетычных магутнасцей. Знішчана больш 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, 90% станочнага парку, поўнасцю знішчана маёмасць калгасаў і саўгасаў, знізілася пагалоўе буйной рагатай жывёлы. У запусценне прыйшлі больш за 1 млн га ворных земель, Разбураны меліярацыйныя збудаванні, МТС, 420996 дамоў калгаснікаў. На 40% скараціліся пасяўныя плошчы, без даху над галавой засталося амаль 3 млн чал. Пасля вызвалення ў рэспубліцы налічвалася 60 тыс. дзяцей-сірот. Цалкам было знішчана 6177 і часткова 2648 школьных памяшканняў, 24 навуковыя ўстановы, 200 бібліятэк, 4756 тэатраў і клубаў, 1 377 бальніц і амбулаторый, 2 188 дзіцячых устаноў.

Велізарныя страты панесла ў час вайны гаспадарка Віцебшчыны. З 213 працаваўшых тут да вайны прадпрыемстваў саюзнага і рэспубліканскага падпарадкавання засталося толькі 2, з 8695 прадпрыемстваў рэспубліканскага і абласнога – 98. Пасяўныя плошчы складалі ў час уборачнай 1944г. 25% даваенных. Ад 620209 кв. метраў жылой плошчы ў вобласці пасля вызвалення заставалася толькі каля 75 тыс. кв. м [1, с. 1-4]. У Полацку за гады вайны нямецка – фашысцкія захопнікі разбурылі і знішчылі гарадскую гаспадарку амаль на 90% [2, с. 39-39об].

З 628 населеных пунктаў Беларусі, спаленых разам з людзьмі, 221 – знаходзіўся на Віцебшчыне. Амаль 70 тысяч жыхароў вобласці было сагнана ў Нямеччыну. Надзвычайная дзяржаўная камісія (НДК), (створана

Репозиторий ВГУ

адразу пасля вызвалення) ацаніла шкоду, нанесёнnую нямецка-фашысцкімі захопнікамі прамысловым прадпрыемствам, дзяржаўным і грамадскім арганізацыям, калгасам і грамадзянам вобласці, у 25259000000 руб. (у цэнах 1941 г.) [3, с. 4].

Па дадзеных гаспадарчых кніг уліку сельскага насельніцтва (улік праведзены згодна з рашэннем СНК БССР ад 27 лістапада 1944г.), у Віцебскай вобласці на 1 студзеня 1945 г. ад 701,4 тыс. чалавек сельскага насельніцтва даваеннага часу (па уліку 1939 г.), засталося 433,8 тыс. (61,8%). У Полацкай вобласці страты сельскага насельніцтва па усходніх раёнах склалі 48,7% [3, с. 89-93]. Больш высокае скарачэнне насельніцтва адзначана ў гарадах: у Віцебску ад 167299 жыхароў даваеннага часу на 1 жніўня 1944 г. налічвалася 15225, у Оршы – ад 35578 – 6583, у Полацку – ад 29577 – 2364. Пераправерка страт беларускага насельніцтва, якая была праведзена ў сярэдзіне 1980-х гг., паказала , што загінуўшых мірных жыхароў, партызан, не вярнуўшыхся з Германіі, значна больш , чым гэта ўказвалася адразу пасля вызвалення. Як прыклад, у Талачынскім раёне НДК паказала зніжэння ліку насельніцтва на 2,5 тыс., пазней пры пераправерцы аказалася каля 10 тыс. [4, с. 2]

Лячэбная сетка аховы здароўя была разбурана фашыстамі ў гарадах Віцебскай вобласці на 75%, у раёнах – на 85%. Да вайны ў вобласці дзейнічала 1765 школ, 5 ВНУ і 30 тэхнікумаў. Учас вайны матэрыяльна – тэхнічная база ўстаноў адукацыі была амаль поўнасцю знішчана [5, с. 1-4].

За час гаспадарання фашыстаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці забіты, замардаваны , спалены сотні тысяч яе жыхароў.У Гарадоцкім раёне такі лёс напаткаў больш за 6000 мірных жыхароў. Акупанты закатавалі ўсё яўрэйскае насельніцтва, што пражывала ў межах раёна [6, с. 139-140].

Не ўяўляецца магчымым пералічыць усё, што спалена, разбурана, разрабавана, вывезена ў Германію, але магчыма адзначыць, што застаўшаяся пасля вайны прамысловасць Беларусі была адкінута ў стан сярэдзіны 20-х гг., а ўзровень жыцця насельніцтва (забяспечанасць харчаваннем, вопраткай, абуткам, медыцынскай дапамогай, магчымасці матэрыяльнай базы культуры) без перабольшвання – у пачатак аднаўлення пасля грамадзянскай вайны. Агульныя матэрыяльныя страты БССР дасягалі 75 млрд рублей, гэта ў 35 разоў больш за дзяржаўны бюджэт рэспублікі 1940 г. Рабочых і служачых у 1945 г. засталося ад 1940 г. 46,5%. Вайна пакінула на Беларусі сотні тыяч інвалідаў, разрушыла многія сем’і.

Вялікія ахвяры, прынесеныя вайной, стварылі ў краіне неспрыяльную дэмаграфічную сітуацыю доўгатэрміновага характару. Асабліва заўважыным было скарачэнне колькасці мужчын. Вынікам гэтага стала рэзкае зніжэнне нараджальнасці.

Складаным і цяжкім быў пераход да мірнага будаўніцтва з часу яе вызвалення, беларускі народ чакала нялёгкая паласа развіцця. І тым больш трэба адзначыць, што аднаўленне гаспадаркі вялося з вялікім напружаннем



Рэпазіторый ВДУ

сіл і велізарным уздымам, патрыятычным энтузіязмам насельніцтва. Аднаўленне народнай гаспадаркі БССР праходзіла на планавай аснове, з істотнай дапамогай іншых рэспублік і, перш за ўсё, РСФСР. 27 снежня 1943 г. прынята пастанова ЦК УКП (б) і Саўнаркома СССР “Аб аказанні дапамогі вызваленым раёнам Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей БССР па аднаўленні МТС і калгасаў”, а 1 студзеня 1944 г. – “Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і ЦК КП (б) Беларусі”. Дзве гэтыя пастановы арыентавалі мясцовыя ўлады наладзіць аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі на планамернай, але паскоранай аснове. Па рашэнні ЦК УКП( б) і СНК СССР рэспубліка атрымала з саюзнага бюджэта на 1944–1945 гг. 1,7 млрд руб. сродкаў ( гэта гадавы бюджэт БССР 1940 г.). У першую чаргу, як прадпісвалася пастановамі, беларускае кіраўніцтва павінна было тэрмінова разгарнуць неабходную палітычную, арганізацыйную і гаспадарчую работу па аднаўленню калгасаў з тым, каб вясновую сяўбу 1944 г. правесці калгаснымі гаспадаркамі. На Віцебшчыне, у Лёзненскім раёне ў 1943 г. на вызваленай ад акупацыйных войск тэрыторыі да пачатку снежня гэтага года ўзнавілі работу 96 калгасаў, былі праведзены выбары іх праўленняў, падабраны брыгадныя кіраўнікі [7, с. 18-21]. У Дубровенскім раёне ў гэты час адноўлена дзейнасць 46 калгасаў. Для ўзнаўлення калгасаў былі накіраваны камуністы і камсамольцы з ліку партызан, якія выйшлі на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі.

У пачатку ліпеня 1944г. бюро Віцебскага абкама КП(б)Б прыняло пастанову “Аб правядзенні работ па размініраванні і збору трафейнай і айчыннай ваеннай маёмасці ў вызваленых ад нямецкай акупацыі гарадах і раёнах”. Згодна з пастановай для размініравання палеткаў, прамысловых аб’ектаў, жылога фонду ва ўсіх раёнах вобласці з ліку рабочых, служачых, калгаснікаў і навучэнцаў (ва ўзросце не маладзей 15 год) былі створаны спецыяльныя каманды мінёраў (50–100 чалавек), арганізавана іх спецыяльная падрыхтоўка, наладжаны кантроль за захаваннем тэхнікі бяспекі ў час працы [8, с. 33-34]. Побач з мужчынамі гэтай небяспечнай працай займаліся жанчыны. Прыклады самаадданасці і мужнасці пры размініраванні тэрыторыі паказвалі Кацярына Цыбуля і Соф’я Марчанка з каманды Суражскага раёна. У ліку іншых размінёраў яны адзначаны знакам “Выдатны мінёр” [9, с. 46].

Да канца верасня работы па размініраванню тэрыторыі вобласці ў асноўным былі завершаны.

На 1 верасня 1944 г. у вобласці аднавілі працу 2768 калгасаў. Механічны парк да гэтага часу на ўсёй тэрыторыі вобласці складаўся з 532 трактараў, 398 трактарных плугоў, 19 сеялак, 17 культыватараў, 39 аўтамабіляў.

З першых дзён вызвалення, на Беларусь з іншых саюзных рэспублік былі камандзіраваны падрыхтаваныя спецыялісты, прыбывалі эшалоны з абсталяваннем, інструментамі, будаўнічымі матэрыяламі, насеннем,



Репозиторий ВГУ

жывёлай, прадметамі хатняга ўжытку. Завозілася прамысловае абсталяванне, трактары, камбайны. Ужо да канца 1944 г. у БССР з руін было ўзнята больш за 3 тыс. прадпрыемстваў, з іх 196 машынабудаўнічых. Паколькі яшчэ працягвалася Вялікая Айчынная вайна, на вызваленай тэрыторыі Беларусі наладжвалася вытворчасць і рамонт ваенных матэрыялаў, танкаў, аўтамабіляў, іншай тэхнікі для фронта.

Вельмі востра стаяла ў пачатку аднаўленчага перыяду праблема забеспячэння электраэнергіяй вытворчай і сацыяльнай сфер. У 1944–1945 гг. з Расіі ў Беларусь прыйшло 8 энергацягнікоў, наладжаны пастаўкі вугалю і нафты. У гарадах, на асобных прадпрыемствах і нават у калгасах, вялося стварэнне электрастанцый з невялікай магутнасцю. У другім паўгоддзі 1944 г. у БССР былі адноўлены 72 электрастанцыі. За кароткі час удалося аднавіць Гомельскую, Мінскую, Бабруйскую і Навагрудскую электрастанцыі. Важнае значэнне надавалася асноўнаму энергетычнаму аб’екту Віцебскай вобласці – БелДРЭС. На яго аднаўленні ў 1944 г. працавала 520 чалавек. У самыя кароткія тэрміны размініравана тэрыторыя станцыі і пасёлка, прыведзена ў парадак абсталяванне кацельнай, адноўлена пад’яздная чыгуначная ветка, адрамантавана 40 кватэр, адчынена баня, сталоўка на 500 месц. У сакавіку 1945 г. стаў дзейнічаць першы энергаагрэгат БелДРЭС. Адначасова пачалося будаўніцтва буйной электрастанцыі ў Віцебску.

Па прыкладу Мінска ва ўсіх гарадах і пасёлках Віцебшчыны працаздольнае насельніцтва ўдзельнічала ў работах па разборцы разбураных будынкаў, расчыстцы вуліц, будаўніцтве дамоў і грамадскіх будынкаў, прывядзені ў парадак тратуараў, дарожнага пакрыцця, развядзенні зялёных насаджэнняў. У Полацку гэту работу каардынаваў выканкам гарадскога Савета дэпутатаў. Кожнаму прадпрыемству, установе і арганізацыі, а таксама непрацуючаму насельніцтву выдаваўся план – нарад з указаннем адрасу, аб’ёму, тэрміну і кошту выконваемай работы па існуючых расцэнках.

Прыйшлі ў заняпад за гады вайны ўсе віды транспарту. У жніўні 1944 г. Віцебская аўтабаза мела ўсяго 8 аўтамабіляў, у тым ліку 4 – трафейныя. Пасажырскія перавозкі да 1946 г. ажыццяўляліся на грузавых аўтамабілях і толькі часткова – на трафейных аўтобусах. У наступныя гады матэрыяльная база транспартных прадпрыемстваў вобласці мела тэндэнцыю да хуткаснага росту. У Віцебску была створана аўтатранспартная кантора, сталі паступаць аўтамабілі айчыннай вытворчасці (ГАЗ-03-03, ГЗА-651, ЗІС-155). З 1947 г. аўтабазы вобласці папаўняліся аўтамабілямі мінскага аўтазавода.

У вельмі складаных умовах прыйшлося пачынаць аднаўленне сваёй гаспадаркі чыгуначнікам Беларусі. У стане велізарнага разбурэння знаходзіліся галоўны і пад’яздныя чыгуначныя шляхі. Не хапала паравозаў, рухомага саставу. З дапамогай насельніцтва да канца 1945 г.



Репозиторий ВГУ

чыгуначнікі аднавілі 2574 км галоўных пуцей, узводзілі вакзалы, паравозныя і вагонныя дэпо. У той жа час на іх лягло пытанне пабудовы мастоў на асфальтаваных і грунтовых дарогах (праз Днепр, Бярэзіну, Сож, Дзвіну, Нёман). Толькі за 1944 г. чыгуначнікамі было пабудавана больш за 3 тыс. мастоў [10, с. 282]. Да канца верасня 1944 г. быў адноўлены чыгуначны рух ва ўсіх напрамках Віцебскага, Полацкага і Аршанскага вузлоў (акрамя веткі Орша- Лепель і Расоны – Ідрыца). Чыгуначнікі вобласці прымалі павышаныя абавязацельствы па выкананню заданняў. У Віцебскім паравозным дэпо ў красавіку 1945 г. рабочыя на чале з інжынерам Гусевым, укараніўшы дэпаўскі метад, у 7 разоў скарацілі час, што ішоў на рамонт паравозаў (пры норме ў 240 гадзін рамонт ажыццяўляўся за 36 гадзін).

Стваральнай працай ў вырашэнні задач па перавозцы грузаў і пасажыраў вызначаліся ў гэты час усе без выключэння прадпрыемствы, якія складалі чыгуначны канвеер. Разам яны імкнуліся скараціць тэрміны дастаўкі грузаў спажыўцам, забяспечыць бяспеку руху цягнікоў. Калектывы брыгад, змен, цэхаў спаборнічалі за павышэнне ўчастковай хуткасці руху цягнікоў, за скарачэнне абароту паравоза, вагона, умацаванне дысцыпліны працы. Машыніст Полацкага дэпо Абуховіч С.Л. у кожнай паездцы перакрываў норму тэхнічнай хуткасці цягніка на 3 км у гадзіну. Прадуктыўна працавалі пад яго кіраўніцтвам усе брыгады, вадзіўшыя цягнікі гэтым жа паравозам. Нямала перадавікоў вытворчасці было ў Віцебскім вагонным дэпо. Самааддана, не шкадуючы сіл, працавалі на аднаўленні гаспадаркі дэпо і рамонце вагонаў слесар Н.А. Навіцкі, слесар – аглядчык У.П. Голубеў, майстар Г.І. Амасёнок і інш. Дзякуючы іх працы, прадпрыемства рэгулярна спраўлялася з даведзенымі планавымі заданнямі і прынятымі сацыялістычнымі абавязацельствамі. У дэпо ўласнымі сіламі ажыццяўлялася механізацыя і аўтаматызацыя рамонту вагонаў, узводзіліся вытворчыя і культурна – бытавыя памяшканні.

Добра разумеючы, што поспех наступлення Чырвонай Арміі і нармалізацыя жыцця і працы ў вызваленых раёнах залежыць ад стану чыгуначнага транспарту, рабілася ўсё магчымае для яго найхутчэйшага аднаўлення. Асаблівую настойлівасць і ініцыятыву ў працы па аднаўленні чыгункі праяўлялі самі чыгуначнікі. Не заставаліся ў баку ў гэтай важнай справе працоўныя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя прамысловых прадпрыемстваў, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя, навучэнцы. Арганізоўваліся суботнікі і нядзельнікі па расчыстцы шляху, будаўніцтву пад’яздных дарог да чыгункі, прывядзенню ў парадак прывакзальнай плошчы. Агульнымі намаганнямі працоўных Віцебшчыны былі пабудаваны два вялікіх масты праз Заходнюю Дзвіну і чатыры малыя масты на іншых рэках. Ужо ў маі 1945 г. (у параўнанні з восенню 1944 г.) прыкметна палепшыўся стан пуцявой гаспадаркі. У 1945 г. чыгуначнікі

Репозиторий ВГУ

Віцебшчыны не дапусцілі ніводнага выпадку затрымкі цягнікоў з-за няспраўнасці шляху.

Партыйнае і савецкае кіраўніцтва рэспублікі прыкладала намаганні па вырашэнні паўсядзённых задач забеспячэння насельніцтва жылымі памяшканнямі, адзеннем, харчаваннем, вытворчасці тавараў шырокага выкарыстання. Праблемы гаспадарчага будаўніцтва былі пад пастаяннай ўвагай ЦК Кампартыі Беларусі. У кастрычніку 1944 г. пасля даклада першага сакратара Віцебскага абкама партыі Кудраева В. Г. на бюро ЦК "Аб рабоце па аднаўленню гаспадаркі Віцебскай вобласці" было адзначана, што нягледзячы на сур'ёзныя цяжкасці, тут была праведзена велізарная работа: у аднаўленні гаспадаркі удзельнічала ўсё насельніцтва вобласці. Да гэтага часу тут адноўлена звыш 43000кв. метраў жылога фонду, 1475 школ, 57 бальніц на 4720 ложкаў, 70 амбулаторый; план хлебанарыхтовак выкананы на 101,5%, план пасеваў азімых –на 117,7%. У прынятай пастанове былі адзначаны і хібы: нездавальняюча вяліся работы па аднаўленню асноўных карпусоў фабрыкі "КІМ", станкабудаўнічых заводаў імя Камінтэрна і Кірава, папяровай фабрыкі "Чырвоная звязда", а таксама па рамонце і аднаўленні жылога фонду і культурна – бытавых установ у гарадах Віцебск, Орша, Лепель. Не выконваўся ў вобласці план па выпуску цэглы, чарапіцы, вапны. На 1 снежня 1944 г. у зямлянках былі размешчаны 33 школы [11, с. 84]. Партыйным і савецкім арганізацыям вобласці прапанавана ўзмацніць работу з тым, каб да наступлення зімы адрамантаваць і пабудаваць новыя жылыя дамы для калгаснікаў, рабочых і служачых. Была пастаўлена задача размясціць да наступлення халадоў усё насельніцтва ў прыгодных для жылля памяшканнях.

Наркамзему БССР дано даручэнне аказаць дапамогу Віцебскай вобласці ў аднаўленні калгасаў і машынна-трактарных станцый, нафтабаз, паставіць у вобласць дадаткова сельскагаспадарчыя машыны, коней і буйнарагаты скот.

Вышэйшы партыйны камітэт рэспублікі лічыў неабходным паднять кіруючую і арганізуючую ролю ў гаспадарчым і культурным жыцці дзейнічаючых у вобласці Саветаў (асабліва сельскіх Саветаў) [12, с. 145-152] . Але ўсё ж прыярытэт аддаваўся партыйным камітэтам. Тут на гэты час працавалі лепшыя ўпраўленцы.

Як бачна, задачы аднаўлення разбурэнняў у гады вайны ў першыя месяцы пасля вызвалення вырашаліся пры актыўным і пагалоўным удзеле насельніцтва рэспублікі, з дапамогай іншых саюзных рэспублік. Але вывесці эканоміку БССР на даваенны ўзровень за такі кароткі тэрмін, як паказана ніжэй, не ўдалося.

Лічбы, прыведзеныя ў табліцы, сведчаць пра тое , што агульны аб'ём вытворчасці, а таксама аб'ёмы ў асобных галінах, дзе БССР да Вялікай Айчыннай вайны не адставала ад саюзных паказчыкаў, на пачатку першай пасляваеннай пяцігодкі, быў яшчэ ў дзесяткі разоў ніжэшым [10, с. 283].

Репозиторий ВГУ

| Аб’емы вытворчасці БССР да СССР у 1945 г. (у % да 1940 г.) | СССР | БССР |
|---|---|---|
| Агульны аб’ем вытворчасці | 80 | 20 |
| У тым ліку: | | |
| Электраэнергія | 67 | 16 |
| Металаапрацоўчыя станкі | 81 | 3 |
| Фанера | 59 | 5 |
| Абутак | 91 | 5 |

Бачна, што перыяд ад пачатку вызвалення да канца 1945г., які прадстаўлены, як першы аднаўленчы этап, на Беларусі і ў яе рэгіёнах быў вельмі складаным у плане забеспячэння матэрыяльна –бытавымі ўмовамі яе жыхароў. Міліёны людзей аказаліся пазбаўленымі сродкаў існавання, месціліся ў склепах і зямлянках. У той жа час 20% аб’ёмаў вытворчасц, што ўдалося аднавіць практычна яшчэ ў гады вайны, сведчаць аб высокай настойлівасці, энтузіязме, самаадданасці і патрыятызме нашых суайчыннікаў.

***2. Выхад БССР на міжнароднаю арэну.*** Пытанне аб выхадзе рэспублікі на міжнародную арэну пастаўлена ў сувязі з аднаўленнем знешнепалітычных правоў саюзных рэспублік у новых пасляваенных умовах. Яшчэ ў час Другой сусветнай вайны на 10-й сесіі Вярхоўнага Савета СССР 1 лютага 1944 г. быў прыняты закон “Аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна – рэспубліканскі Народны камісарыят”. Паводле закона, БССР як союзная рэспубліка атрымала права мець непасрэдныя зносіны з замежнымі краінамі, заключаць з імі пагадненні, абменьвацца дыпламатычнымі прадстаўнікамі. Дадзенае рашэнне ўлічвала новую расстаноўку палітычных сіл у свеце, якая згодна з поглядамі савецкага кіраўніцтва, павінна быць складзена ў пасляваенны час .

У адпаведнасці з рашэннямі, прынятымі ў Маскве на 6-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР (прайшла ў Гомелі ў сакавіку 1944 г.) былі ўнесены змены ў Канстытуцыю рэспублікі, прыняты закон аб стварэнні Народнага камісарыята замежных спраў БССР. Праведзеная падрыхтоўчая работа давала БССР юрыдычную аснову і права для пастаноўкі пытання аб членстве ў будучай арганізацыі па падтрыманні міра і бяспекі ў свеце, пастаяннага ўдзелу ў абмеркаванні пытанняў пасляваеннага ўладкавання з улікам нацыянальных інтарэсаў.

На Крымскай канферэнцыі кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (4-11.02.1945 г.), прадстаўнікі СССР дасягнулі згоды з саюзнікамі ў пытанні аб прыняцці БССР (і Украіны) у арганізацыю міжнароднай бяспекі.

Канчаткова пытанне аб дзяржавах – заснавальніках вызначылася на ўстаноўчай канферэнцыя Аб'яднаных нацый ў красавіку – чэрвені 1945 г. у



Репозиторий ВГУ

Сан-Францыска. З улікам канстытуцыйных палажэнняў, уклада рэспублікі ў барацьбу з фашысцкай Германіяй і панесенных ёю вялікіх ахвяраў і страт, зробленай заяве аб імкненні спрыяць усталяванню міра і міжнароднай бяспекі, БССР было нададзена права быць заснавальнікам уплывовай міжнароднай арганізацыі. Дэлегацыя БССР у складзе К.Кісялёва, А. Жэбрака, У. Перцава, Г. Байдукова і Ф. Шмыгава прыняла ўдзел у працы ўстаноўчай канферэнцыі**.**

26 чэрвеня 1945 г. дэлегацыя Беларусі, разам з дэлегацыямі 50 краін, прагаласавала за прыняцця Статута ААН**.** У змесце Статута былі зафіксаваны мэты арганізацыі па падтрымцы міжнароднага міру і бяспекі, развіццю дружалюбных адносін паміж нацыямі, ажыццяўленню міжнароднага супрацоўніцтва ў вырашэнні праблем эканамічнага, сацыяльнага, культурнага і гуманітарнага характару. Праз Статут ААН, уваходзячыя ў яе краіны, прынялі на сябе абавязацельствы дзейнічаць у адпаведнасці з такімі прынцыпамі як суверэнная роўнасць дзяржаў; вырашэнне міжнародных спрэчак выключна мірнымі сродкамі; неўмяшанне ў справы, якія тычацца ўнутранай кампетэнцыі любой дзяржавы; адмаўленне ў міжнародных адносінах ад пагрозы сілай або яе прымяненне; захаванне тэрытарыяльнай недатыкальнасці і палітычнай цэльнасці любой дзяржавы і інш. Дзейнасць БССР з гэтага часу вялася ў асноўных органах ААН: Генеральнай Асамблеі, Савеце Бяспекі, Эканамічным і Сацыяльным саветах, Савеце па апецы, Міжнародным судзе. Прадстаўнікі Беларусі тут выступалі прыхільнікамі нацыянальна-вызваленчага руху, падтрымлівалі імкненне народаў да ўстанаўлення рэжыму народнай дэмакратыі ў шэрагу краін вызваленых Савецкай Арміяй.

Разгром Германіі і Японіі, падтрымка СССР народна – дэмакратычных сіл у краінах Еўропы і Азіі прывёў да рэзкага ўзрастання колькасці краін сацыялістычнага тыпу. Калі да II Сусветнай вайны сацыялізму належала 17% тэрыторыі зямнога шара і 9% насельніцтва, то у 1955 г. сусветная сістэма сацыялізму займала больш за 25% тэрыторыі і 35% насельніцтва **[**13, с. 232-234]. Сацыялістычнымі прызналі сябе Албанія, Балгарыя, Венгрыя, Польшча, Румынія, Чэхаславакія, Югаславія, В'етнам, Карэя, Кітай, з 1950 г. – ГДР, Куба.

Як бачна, пасля завяршэння Другой сусветнай вайны ў свеце назіраецца новая расстаноўка палітычных сіл. Побач з дзяржавамі капіталістычнага накірунку развіцця склалася вялікая група краін, арыенцірам якіх стала будаўніцтва сацыялізму. Свет раскалоўся на дзве супрацьлеглыя сістэмы. Адсунутыя на другі план супярэчнасці двух сацыяльна – эканамічных сістэм ў час барацьбы супраць фашызму, па яе завяршэнню сталі зноў абвастрацца. Уладальнікі ядзернай зброі, цэнтральныя дзяржавы СССР і ЗША пачалі весці барацьбу за геапалітычную перавагу. Прэзідэнт ЗША Г. Трумэн у сакавіку 1947 г. запрасіў у Кангрэса сваёй краіны 400 млн долараў на “падтрымку свабодным народам, якія супраціўляюцца спробам закабалення,

Репозиторий ВГУ

зыходзячым ад узброенай меншасці або знешняга ціску". Гэта дактрына з'явілася палітычным касцяком шырокамаштабнай стратэгіі "стрымлівання камунізму", а яе эканамічным стрыжнем стаў "план Маршала". Дж. Маршал – Дзяржаўны сакратар ЗША – у чэрвені1947 г. прапанаваў аказаць эканамічную дапамогу еўрапейскім дзяржавам з мэтай аднаўлення разбуранай у гады Другой сусветнай вайны эканомікі. Эканамічная дапамога з боку ЗША прадугледжвала падпарадкаванне эканомікі заходнееўрапейскіх краін ЗША. Да "плана Маршала" далучылася 16 краін (Вялікабрытанія, Францыя, Аўстрыя, Бельгія, Галандыя і інш.). СССР адмовіўся ад удзелу ў "плане Маршала" і прапанаваў альтэрнатыву – "план Молатава". Праз "план Маршала" ЗША атрымалі саюзнікаў у глабальным супрацьстаянні з СССР. Замацаванне тэндэнцыі да канфрантацыі ў адносінах Усход – Захад прывяло да падпісання ў Вашынгтоне ў красавіку 1949 г. Паўночнаатлантычнага пакта. У адказ на гэта ў1955 г. быў створаны Варшаўскі блок. Паміж імі пачынаецца палітычнае, эканамічнае і ваеннае супрацьстаянне. Каб дасягнуць ваеннага парытэту, важнае месца бакі адводзілі стварэнню сучаснага ўзбраення. У выніку, разбураны вайной СССР не толькі не атрымаў ад нядаўніх саюзнікаў дапамогі, ён быў уцягнуты ў знясільваючаю гонку ўзбраенняў.

Пасля выхаду БССР на міжнародную арэну ў якасці самастойнага суб'екта, усе яе знешнепалітычныя акцыі былі накіраваны на ўстанаўленне дыпламатычных адносін з замежнымі краінамі. Дэлегацыя БССР у ААН унесла пэўныя прапановы і праўкі ў тэкст Дэкларацыі правоў чалавека аб правах жанчын, дапамогі краінам, што сталі на шлях самастойнага развіцця. Прапановы дэлегацыі БССР былі падтрыманы і пасля абмеркавання прыняты ўдзельнікамі Генеральнай Асамблеі.

Членства рэспублікі ў ААН адкрыла магчымасць яе ўдзелу ў працы шэрагу спецыялізаваных устаноў, у тым ліку – Сусветнай арганізацыі здароўя, Міжнароднай арганізацыі Працы, Міжароднага саюза электрасувязі, Сусветнага паштовага саюза.

БССР, як член ААН, мела грамадска – палітычныя, эканамічныя, культурныя сувязі з замежжам. За 1944–1955 гг. дэлегацыі рэспублікі падпісалі больш 30 дагавораў, пагадненняў і канвенцый па палітычных і прававых пытаннях, падтрымалі многія рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН, якія адпавядалі агульначалавечым каштоўнасцям.

Статус дзяржавы – заснавальніцы ААН дазволіў БССР далучыцца да дзейнасці Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый (ЮНРРА), якая была створана для падтрымкі пацярпелых у вайне краін. У жніўні 1945 г. БССР была прынята ў ЮНРРА, пасля чаго з 1946г. у рэспубліцы пачала працаваць місія гэтай арганізацыі. Напачатку 1946 г. у адпаведнасці з пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б пры ўрадзе рэспублікі было створана Упраўленне па рэалізацыі пагаднення з адміністрацыяй ЮНРРА. У надзвычай цяжкім эканамічным становішчы дапамога на суму



Репозиторий ВГУ

61 млн долараў ЗША , якую БССР атрымала ад ЮНРРА да канца 1947 г., была своечасовай, хоць і не вырашальнай для беларускага народа.

Членства рэспублікі ў ААН абумовіла яе ўдзел ў міжнародным абмене духоўнымі набыткамі і развіцці турыстычных кантактаў. На працягу 1946–1955 гг. рэспубліканскія выдавецтвы выпусцілі 71 выданне перакладной літаратуры народаў свету тыражом больш за 2,7 млн экз., у тым ліку на беларускай мове – 46 выданняў тыражом 846 тыс. экз. [14, с. 65].

З 1953г. пры Савеце Міністраў БССР было ўтворана Упраўленне па замежнаму турызму, а ў 1955 г. рэспубліку наведалі першыя групы замежных грамадзян, больш за 100 беларусаў выезжалі за мяжу. Праз Беларускае аддзяленне Усесаюзнай гандлёвай палаты былі наладжаны экспартныя пастаўкі прадукцыі прадпрыемстваў Беларусі ў краіны замежжа.

У заключэнні трэба адзначыць, што выхад БССР на міжнародную арэну ў якасці суб'екта міжнародных адносін меў важнае значэнне. Гэта спрыяла ўмацаванню міжнароднага прэсціжу рэспублікі, актывізацыі яе знешнепалітычнай дзейнасці, умацаванню міжнароднай бяспекі, вырашэнню праблемы пазбаўлення шэрагу краін ад каланіяльнай залежнасці, пашырэнню інфармацыі аб унутраным жыцці ў краіне. Аднак ва ўмовах склаўшагася ўнутры краіны рэжыма, супярэчлівых міжнародных адносінах, міжнародная дзейнасць народнага камісарыята (з 1946 г. – міністэрства) БССР не магла быць самастойнай. Прадстаўніцтвы БССР пры ААН дзейнічалі ў адпаведнасці са знешнепалітычным курсам, вызначаемым саюзным урадам, які не заўседы адпавядаў нацыянальным інтарэсам рэспублікі.

**Спасылкі**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (у далейшым НАРБ). Ф. 4. – Оп. 51. – Д. 1а.
2. Полоцк Занальны Дзяржаўны архіў (у далейшым ПЗДА). – Ф. 658. – Воп. 1. – Спр. 23.
3. НАРБ. – Ф. 7. – Оп. 3. – Д. 1769.
4. Саветская Беларуссия. – 1998. – 27 сент.
5. НАРБ. –Ф. 4. – Оп. 51. – Д. 1а.
6. Государственный архив Витебской области (у далейшым ГАВО). – Ф. 1п. – Оп. 1. – Д. 45.
7. НАРБ. – Ф. 4-п. – Оп. 33. – Д. 177
8. ГАВО. – Ф. 1-п. – Оп. 1. – Д. 20.
9. НАРБ. – Ф. 263. – Оп. 1. –Д. 65.
10. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. – Ч. 2. Люты 1917 г. / Я.К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац.і дап. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.
11. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 1. – Д. 27.
12. НАРБ. – Ф. 4п. – Оп. 61. – Д. 84.
13. Мандрык, І. Гісторыя Беларусі (у канстэкце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык. – Віцебск УА ФПБ "МІПСА" ВФ, 2009. –276 с.
14. Гісторыя Беларусі: у 6т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. /Л. Лыч [і інш] ; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экаперспектіва, 2011. –728 с.; іл.




Репозиторий ВГУ

ТЭМА 2. **Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі ў першыя пасляваенныя пяцігодкі (чацвёртую (1946–1950 гг.) і пятую (1951–1955 гг.).**

*1. Аднаўленне прамысловага комплексу і транспарту.*

*2. Аграрная палітыка: цяжкасці пры развіцці сельскай гаспадаркі ў першае пасляваеннае дзесяцігодзе.*

***1. Аднаўленне прамысловага комплексу і транспарту****.* Развіццё прамысловага комплексу і транспарту рэспублікі ў гэтым раздзеле прапануецца разглядаць як другі этап дзесяцігадовага пасляваеннага аднаўлення на аснове перспектыўнага планавання. Заўважым, што прыняты ў верасні 1946 г. першы пасляваенны ( чацвёрты з пачатку ўвядзення перспектыўнага планавання) пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР (1946–1950 гг.) распаўсюджваўся на тэрыторыю ў тых жа межах, што і ў 1939 г., за выключэннем 17 раёнаў Беластоцкай вобласці разам з г. Беласток і 3 раёнаў Брэсцкай вобласці, якія паводле дагавора паміж СССР і Польшчай аб савецка –польскай мяжы, былі перададзены ад БССР да Польшчы.

Асноўная задача гэтай пяцігодкі заключалася ў тым, каб аднавіць разбурэнні вайны, дасягнуць у эканоміцы даваеннага ўзроўню, а затым перавысіць гэты ўзровень у значных памерах. План устанаўліваў канкрэтныя заданні па аднаўленні разбураных вайной прадпрыемстваў. Асаблівае значэнне надавалася аднаўленню даваеннай структуры прамысловасці, яе вядучых галін: энергетыкі, прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, станкабудавання, сельскай гаспадаркі, а таксама развіццю новых галін і пераадоленню эканамічнай і тэхнічнай адсталасці заходніх абласцей Беларусі [1, с. 9].

Асноўная маса людзей пасля вайны жыла надзеяй на паляпшэнне матэрыяльнага становішча і, перш за ўсё, жыллёвых умоў. Гэты фактар, а таксама неабходнасць узвядзення прамысловых прадпрыемстваў падштурхоўваў дзяржаўныя ўлады да ўмацавання матэрыяльна – тэхнічнай базы і кадравага складу будаўнічых арганізацый. На працягу 1945– 1947гг. былі створаны буйныя будаўнічыя арганізацыі. Да пачатку 1949г. у асноўных будаўнічых арганізацыях працавала звыш 30 тыс. рабочых, інжынераў і тэхнікаў (на тэрыторыі Віцебскай вобласці на 1 красавіка 1949 г. у будаўнічай галіне налічвалася 2108 чалавек) [2, с.159**]**.

У Мінску поўным ходам ішло будаўніцтва прадпрыемстваў , устаноў сацыяльнай сферы , у тым ліку гігантаў прамысловасці – аўтамабільнага і трактарнага заводаў, у Оршы – завода швейных машын, у Віцебску – дывановага камбіната. Выдатныя ўзоры працы паказвалі будаўнікі рэспублікі – Д. Булахаў, М. Гуд, М. Макарэвіч, Т. Фандо. Нягледзячы на цяжкія ўмовы вытворчай дзейнасці і матэрыяльна – бытавыя ўмовы, работнікі прамысловасці настойліва змагаліся за аднаўленне

Рэпазіторый ВДУ

прадпрыемстваў і нарошчванне выпуску прадукцыі. Хуткімі тэмпамі ішло аднаўленне вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Ужо ў 1948 г. удалося дасягнуць яе даваеннага ўзроўню.

Адбыліся зрухі ў тэрытарыяльным размяшчэнні прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. У Мінску быў пабудаваны камбінат будаўнічых матэрыялаў, адноўлены Клімавіцкі і Аршанскі сілікатныя заводы, цэментныя заводы ў Ваўкавыску і Крычаве. Была наладжана вытворчасць піламатэрыялаў, нарыхтоўка драўніны, выраб запалак, клеенай фанеры. Толькі за 1946 1950 гг. у лік дзеючых з такім вытворчым прызначэннем увайшло 31 прадпрыемства. У сістэме мясцовай прамысловасці сталі працаваць 200 цагельных заводаў. На завяршэнні 1946 г. у рэспубліцы аднавілі работу звыш 70 буйных фабрык і заводаў саюзнага падпарадкавання. У тым жа годзе было выраблена ўжо 31% прамысловай прадукцыі ад даваеннага ўзроўню, каля 34% – электраэнергіі, 17% – металарэжучых станкоў.

Важнае значэнне надавалася разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва, руху стаханаўцаў і ўдарнікаў. У выніку напружанай і высокапрадуктыўнай працы рабочых і інжынерна – тэхнічных работнікаў пры будаўніцтве і ўводзе вытворчых магутнасцей у чэрвені 1947 г. выпусцілі прадукцыю мотавелазавод, мінскі тонкасуконны камбінат. У кароткі тэрмін аднавілі свае прадпрыемства ільнокамбінатаўцы Оршы. У1951 г. выпуск прадукцыі на ільнокамбінаце перавысіў даваенны ўзровень, а прадукцыўнасць працы ўзрасла ў 3,4 разы. Паскоранымі тэмпамі тут ішло будаўніцтва жылля. За першых шэсць пасляваенных гадоў для працаўнікоў камбіната было ўзведзена 13 тыс. кв. метраў жыллёвай плошчы [3, с. 399].

Пры разглядзе пытання аб пасляваенным аднаўленні неабходна асобна адзначыць, што напрамкам пасляваеннага развіцця Беларусі ў прамысловасці было не толькі аднаўленне разбураных у час вайны старых галін вытворчасці, але, і стварэнне новых працаёмкіх галін. Так, у машынабудаванні такімі напрамкамі былі аўтамабіле – і трактарабудаванне, выпуск дарожных машын і будаўнічых механізмаў**.** Восенню 1944 г. пачалося будаўніцтва Мінскага аўтамабільнага завода. У маі 1946 г. тут жа прыступілі да ўзвядзення яшчэ аднаго буйнага прадпрыемства рэспублікі – трактарнага завода. Актыўную дапамогу калектывам заводаў ў распрацоўцы генеральных праектаў, камплектаванні кадрамі спецыялістаў, абсталяваннем аказвалі прадпрыемствы Масквы, Ленінграда, Кіева, Горкага, іншых прадпрыемстваў краіны.

У 1947 г. аўтазавод выпусціў першых 18 аўтамашын, у 1950 г. з канвеера завода сышло 2399 , а ў 1955 г. – 12918 аўтамабіляў. У архіўных матэрыялах захаваліся звесткі аб лепшых працаўніках завода. Важную задачу вырашалі ў час падрыхтоўкі да ўзвядзення і будаўніцтва спецыялісты з Маскоўскага і Горкаўскага аўтамабільных заводаў:

Рэпазіторый ВДУ

І. Талкуноў, А. Белакрыніцкі, В. Вайнбранд. Стараннасцю і ўзорнай працай на будаўнічых пляцоўках, а затым і пры выпуску прадукцыі вызначаліся У. Гурскі, М. Дземідзенка, П. Караўкін, У. Сафонаў [4, с.22-23].

За гады вайны тэхнічная думка зрабіла крок наперад, і кіраўніцтва рэспублікі, прадпрыемстваў, якія будаваліся ў БССР, улічвалі гэта. Прадпрыемствы атрымлівалі сучасную ў той перыяд тэхніку, прымяняліся новые тэхналогіі. Была выкарыстана і частка тэхнічнага прамысловага абсталявання, атрыманага па рэпарацыях з Германіі.

У 1950 г. уступіў у строй і выдаў першую прадукцыю трактарны завод. Да 1955 г. на заводзе паступова нарошчваўся выпуск прадукцыі. У 1955 г. было выпушчана для народнай гаспадаркі ўсіх саюзных рэспублік 18266 трактароў “Кіравец Д-35”. Высокай прадукцыйнасці працы тут дасягалі наватары трактарабудавання слесар – лякальшчык Я. Клімчанка, сталявар А. Азараў, электразваршчык М. Антонік, токар П. Арахоўскі.

У 1950 г. прамысловасць рэспублікі выпусціла валавай прадукцыі на 15 % больш, чым у 1940 г. Высокімі тэмпамі развівалася машынабудаванне і металаапрацоўка: у 1950 г. выпуск прадукцыі тут складаў 237% ад узроўню 1940г., у той час як у лясной , папяровай і дрэваапрацоўчая галіне толькі 89%, а лёгкая 74%.

Гісторыя мае нямала прыкладаў, якія сведчаць аб высокай арганізацыі і працоўным энтузіязме працоўных калектываў Віцебшчыны ў перыяд аднаўлення і рэканструкцыі сваіх падраздзяленняў. За гады 4-ай пяцігодкі вобласць стала адным з цэнтраў станкабудавання і металаапрацоукі, яна ж адраджалася і як цэнтр лёгкай прамысловасці. З першых дзён сталі аднаўляцца прадпрыемствы, якія вярнуліся з эвакуацыі на месца сваёй ранейшай дыслакацыі. Напрыканцы жніўня 1945 г. у захаваўшымся будынку дзіцячых яслей пачала працу фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі”. У 1950 г. тут працавала 2548 чалавек [5, с. 244].

Настойліва змагаліся за аднаўленне свайго прадпрыемства працоўныя панчошна – трыкатажнай фабрыкі «КІМ”. У 1946 г.тут быў наладжан выпуск высакаякаснай прадукцыі для патрэб насельніцтва. На працягу ўсіх пасляваенных гадоў працоўны калектыў фабрыкі ўзначальваў сацыялістычнае спаборніцтва за выпуск прадукцыі высокай якасці. У 1950 г. у спаборніцтве за выкананне і перавыкананне планаў чацвёртай пяцігодкі тут удзельнічала больш за 95% рабочых. У ліпені 1948 г. увайшоў у строй галоўны корпус фабрыкі.

У сакавіку 1945 г. з Беларэцка (Башкірская ССР) у Віцебск быў перабазіраваны завод заточных станкоў (прадпрыемства, створанае на базе Клінскага чыгуналіцейнага завода) разам з 297 рабочымі, ІТР, служачымі, тэхнічнай дакументацыяй і абсталяваннем. Папоўнены за кошт віцяблян, працоўны калектыў завода ў кароткія тэрміны наладзіў выпуск заточных і металарэзных станкоў [6, с. 25].

Репозиторий ВГУ

У 1947 г. у Віцебску ўступіў у строй дыванова – плюшавы камбінат, быў пабудаваны цэлы шэраг культурна-бытавых аб'ектаў. Вялізарная нагрузка лажылася на работнікаў камунальных прадпрыемстваў – вадаканала, электратранспарта. У кароткія тэрміны тут удалося аднавіць гарадскую гаспадарку. 5 кастрычніка 1947 г. у Віцебску пачаў курсіраваць трамвай.

У гэты час з'уляецца мноства каштоўных ініцыятыў і рухаў, якія зыходзілі знізу, ад саміх працоўных і былі накіраваных на пераадоленне цяжкасцей у развіцці эканомікі. Так, токар завода імя «Камінтэрна» Пасанаў выступіў з ініцыятывай арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва за павелічэнне міжрамонтнага перыяду станкоў. Ініцыятыва была падтрымана на ўсіх прамысловых прадпрыемствах Віцебшчыны.

Калектыў завода заточных станкоў падтрымаў пачын макеяўскіх станкабудаўнікоў аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне першага пасляваеннага пяцігадовага плана. Токар гэтага прадпрыемства Г. Клімаў на аснове ўласнай рацыяналізатарскай прапановы дамогся рэкорднага выніку. Ужыўшы хуткаснае рэзанне пры апрацоўцы дэталяў, ён пры норме 2 гадзіны 45 хвілін выдаткаваў на дадзеную аперацыю толькі 15 хвілін. Метад Клімава стаў прымяняцца на заводах імя Кірава і імя Камінтэрна [7, с. 26]. У цэхах і на ўчастках завода разгарнулася спаборніцтва за права мець асабістае таўро якасці вырабаў. У працэсе спаборніцтва (у ім у 1950 г. удзельнічала каля 90% працаўнікоў прадпрыемства) у працоўных з'явілася пачуццё асабістай адказнасці за эканомнае выкарыстанне матэрыялаў і электрычнай энергіі. У асяродку інжынерна-тэхнічных работнікаў завода заточных станкоў нарадзілася ініцыятыва арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва за ўкараненне перадавой тэхнікі. Гэтая ініцыятыва знайшла сваіх паслядоўнікаў на іншых прадпрыемствах рэспублікі .

З вышэй прыведзенага зместу добра бачна, што развіццё прамысловасці ў Беларусі ў пасляваенны час адбывалася на больш высокай тэхнічнай аснове, ішло хуткімі тэмпамі, якія значна перавышалі даваенныя.

Для аднаўлення прамысловасці БССР за 4-ую пяцігодку былі ажыццёўлены будаўнічыя работы, якія перавысілі па аб'ёме тры даваенныя. Асноўныя вытворчыя фонды прамысловасці рэспублікі за 1946–1950 гг. выраслі амаль у чатыры разы. У агульнасаюзным падзеле працы БССР вызначылася ў гэты час **як машынабудаўнічы і металаапрацоўчы рэгіён з адпаведнай энергетычнай і паліўнай базай. Адбылася другая індустрыялізацыя рэспублікі.**

Гэтыя тэндэнцыі развіцця прамысловасці рэспублікі замацоўваліся і ў далейшым. БССР стала ператварацца ва ўсесаюзны зборачны цэх машынабудаўнічай індустрыі. Такія прыярытэты развіцця БССР у складзе саюзнай дзяржавы ішлі ёй на карысць, на карысць беларускаму народу.

Репозиторий ВГУ

У гады 5-ай пяцігодкі (1951–1955 гг.) СССР бярэ накірунак на індустрыяльнае развіццё, назіраецца паскоранае разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. У БССР, як і ў папярэдняй пяцігодцы, апераджальнымі тэмпамі вялося развіццё тых галін прамысловасці, якія забяспечвалі ў найбольшай меры навукова-тэхнічны прагрэс усёй народнай гаспадаркі: машынабудаванне, металаапрацоўка, хімічная і нафтахімічная прамысловасць. У выніку адбываецца значнае ўдасканаленне тэхнікі і тэхналогіі, механізацыя вытворчасці. У асобных галінах ужо выкарыстоўваецца аўтаматыка. Высокамеханізаванымі сталі торфапрадпрыемствы, прадпрыемствы швейнай прамысловасці**.**

Станкабудаўнічыя заводы рэспублікі даваеннага ўзроўню выпуску прадукцыі дасягнулі ў 1951 г., а ў 1955 г. – значна перакрылі гэтую мяжу. Каля 80% металарэжучых станкоў, зробленых у БССР, выпускалі тры віцебскія заводы. Як і ў папярэдні час, тысячы рабочых , ІТР, служачых вобласці ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве, прымалі на сябе павышаныя абавязкі, дабіваліся высокіх норм выпрацоўкі. Токар Віцебскага завода заточных станкоў Г. Клімаў заставаўся ўдарнікам працы і ў гэтай пяцігодцы. За 4 гады і 4 месяцы 5-ай пяцігодкі ён выканаў 12 гадавых норм.

Пяцігодка ў прамысловасці рэспублікі была паспяховай: за 1951–1955 гг. аб'ём валавой прадукцыі павялічыўся больш чым у 2 разы.

Чыгуначнікі Беларусі на гэтым этапе вырашалі адну з галоўных сваіх задач: забеспячэння бесперабойнай перавозкі ўзрастаючага патока грузаў і пасажыраў. Павялічвалася колькасць двухпутных і шматпутных ліній, ажыццяўляўся пераход на рэйкі цяжкага тыпу, аднаўляўся паравозны і вагонны парк. Эксплуатацыйная даўжыня чыгункі у 1955г. павялічылася да 5385 км ( у 1945 г. было 5013 км). Было адноўлена і пабудавана звыш 250 вялікіх і малых вакзалаў. У гэтыж час прыняў першых пасажыраў новы чыгуначны вакзал у Віцебску.

З кожным годам у БССР узрастала перавозка пасажыраў: калі ў 1940 г. было перавезена 28,9 млн чалавек, то ў 1955 г. 32,5 млн. Прыклады эфектыўнага выкарыстання паравознага парку паказвалі працаўнікі дэпо г. Орша. У 1949 г. яны давялі сярэднесутачны прабег паравозаў да 500 км і больш. Дадзеная ініцыятыва знайшла прымяненне як на аддзяленнях Беларускай, так і на іншых чыгунках краіны. У далейшым яна ўдасканальвалася. У 1952 г. дзяжурны па Мінскаму аддзяленню П.Д. Суднікаў укараніў метад комплекснага аператыўнага планавання і рэгулявання працы цягнікоў, які даваў высокую эфектыўнасць працы чыгуначнікаў сеткі дарог СССР і знайшоў распаўсюджанне сярод чыгуначнікаў замежных краін. У 1956 г. Суднікаву за поспехі ў развіцці чыгуначнага транспарту было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай працы[8,с.74]. Машыністы Н. Баранаў, Н. Еўсікаў, Б. Каліванаў, Н. Трубчыкаў сталі ініцыятарамі ваджэння цяжкавагавых цягнікоў.



Репозиторий ВГУ

Аднаўляўся і рачны флот, будаваліся магутныя буксірныя і пасажырскія цеплаходы. У 1950 г. аб'ёмы работ , якія выконваліся рачнікамі да Вялікай Айчыннай вайны, былі перакрыты.

Хутка расла магутнасць аўтамабільнага транспарту. Папаўнялася матэрыяльная база аўтагаспадарак рэспублікі, ішло ўмацаванне гэтай галіны кваліфікаванымі кадрамі. Аб'ём перавозак аўтамабільным транспартам за 10 год ( ад 1945 да 1955 г.) узрос з 2,3 млн тон да 70,3 млн тон. За гэтае дзесяцігоддзе была пабудавана аўтамабільная магістраль Мінск – Брэст.

Тэндэнцыю да хуткага роста матэрыяльнай базы аўтамабільнага транспарту ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзя магчыма прасачыць на тэрытарыяльна-абласным узроўні. Пры стварэнні аўтабазы ў Віцебску ў сярэдзіне жніўня 1944г. тут налічвалася толькі некалькі адноўленых умельцамі аўтамабіляў. Да 1946 г., як адзначалася ў ранейшай тэме, абмежаваныя пасажырскія перавозкі ў вобласці ажыццяўляліся на грузавых аўто і толькі часткова на трафейных аўтобусах. У наступныя пасляваенныя гады ў вобласць стала паступаць значная колькасць аўтамабіляў, у тым ліку айчыннай вытворчасці, павялічваўся шэраг падрыхтаваных праз розныя формы адукацыі працаўнікоў. З пачатку 1954 г. склаліся ўмовы для падзелу Віцебскай аўтатранспартнай канторы на дзве: аўтатранспартную пасажырскіх аўтамабіляў і аўтатранспартную грузавых аўтамабіляў. У 1955 г. быў утвораны абласны аўтатранспартны трэст у складзе прадпрыемстваў Віцебска, Оршы, Полацка і Лепеля. На завяршэнні гэтага года ў склад аўтатрэста ўваходзіла ўжо 9 аўтапрадпрыемстваў.

Амаль нанава будуецца ў рэспубліцы ў гэтым дзесяцігоддзі паветраны грамадзянскі флот. Ужо ў другой палове 1944 г. і за ўвесь 1945 г. было перавезена 15тыс. пасажыраў. У далейшым адкрываліся новыя лініі, нарошчваўся аб'ём перавозак, быў пакладзены пачатак сельскагаспадарчай авіяцыі.

Адраджэнне і развіццё прамысловасці савецкай Беларусі забяспечвалася за кошт добрасумленнай працы рабочых, служачых, інжынерна – тэхнічных работнікаў. Усе пачыны і формы датэрміновага выканання заданняў ішлі ад працоўных. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі выяўлялі сярод іх найбольш рацыянальныя, імкнуліся зрабіць іх масавымі.

Маштабнае аднаўленне гаспадаркі, будаўніцтва новых прадпрыемстваў патрабавала вялікіх працоўных рэсурсаў, у якіх, на жаль, пасля вайны меўся вялізарны дэфіцыт. Папаўненне рабочага класа на пачатку мірнага часу адбывалася за кошт дэмабілізацыі і рэпатрыяцыі, а таксама за кошт прытоку рабочых з сельскай мясцовасці, у далейшым – за кошт планавай падрыхтоўкі ва ўстановах працоўных рэзерваў і на прадпрыемствах.

Рэпазіторый ВДУ

Вядучае месца ў падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых кадраў было адведзена ўстановам сістэмы прафесійна – тэхнічнага навучання. У пачатку 1945 г. у БССР працавалі 55 устаноў гэтай сістэмы. У 1948 г. пачалі ствараецца рамесныя вучылішчы. У 1951 г. у сістэме прафесійна – тэхнічнага навучання функцыянавала 12 рамесных, 4 чыгуначных, 6 спецыялізаваных рамесных вучылішчаў і 34 будаўнічыя школы ФЗН. Новым крокам у развіцці сістэмы прафтэхнавучання стала стварэнне ў 1948 г. рамесных вучылішчаў з 4-гадовым, а ў 1954 г. – тэхнічных вучылішч – з 2-гадовым навучаннем [9, с. 1]. За 1946–1955 гг. сістэма прафтэхадукацыі рэспублікі выпусціла 112,6 тыс. кваліфікаваных рабочых. Вялікую колькасць рабочых розных спецыяльнасцей па курсавой, брыгаднай і індывідуальнайнай сістэме падрыхтавалі за гэты час непасрэдна на вытворчасці. Павышэнне кваліфікацыі рабочых вырашалася накіраваннем моладзі на роднасныя прадпрыемствы саюзных рэспублік. Адначасова ў рэспубліцы вялася падрыхтоўка спецыялістаў інжынерна – тэхнічнага ўзроўню. (Аб гэтым падрабязна будзе сказана ў спецыяльным раздзеле).

Другая палова 50-х – 60-х гг. адзначалася пастаянным ростам сярэдняй заработнай платы рабочых, ІТР і служачых рэспублікі. У абсалютным вызначэнні звестак аб узроўні заработнай платы да 1970 г. органы статыстыкі не друкавалі, але вядома, што ў 1950г. рэальная заработная плата была блізкай да даваеннага узроўню. Напрыканцы 1950 г. узровень жыцця грамадзян рэспублікі прыйшоў у адпаведнасць з 1928 г. (лепшы рубеж даваеннага часу).

З 1952 г. па 1958 г. заработная плата, без уліку выплат і ільгот з грамадскіх фондаў спажывання, павялічалася на 10%, з 1956 г. па 1959 г. на 11%, за 1959 г. – 1965 г. – на 27,7%. У 1965 г. заработная плата ў цэлым па народнай гаспадарцы БССР складала 80,9 руб., у 1966 г. – 85,1 руб.[10, с. 166]

Як бачна, прыступіўшы да мірнага будаўніцтва, беларускі народ за першае пасляваеннае дзесяцігодзе аднавіў будаўнічыя арганізацыі, прамысловасць і транспарт , прадпрыемствы і ўстановы сацыяльна-культурнай сферы, гарады і вёскі. Большасць людзей працавала з вялікім напружаннем сіл, часам без разліку на ўзнагароды, матэрыяльнае і маральнае заахвочванне. Разам з тым, у вышэй названых галінах гаспадаркі Беларусі заставалася яшчэ шмат праблем і нявырашаных задач, перш за ўсе гэта адносілася да своечасовага ўкаранення ў вытворчасць навукова – тэхнічных распрацовак. Сур'ёзнае адставанне мелася ў развіцці тых галін прамысловасці, якія забяспечвалі штодзенныя патрэбы насельніцтва.

***2. Аграрная палітыка: цяжкасці пры развіцці сельскай гаспадаркі ў першае пасляваеннае дзесяцігодзе.*** На самым пачатку вывучэння дадзенага пытання трэба заўважыць, што на фоне поспехаў у развіцці прамысловасці, у сельскай гаспадарцы на гэтым этапе наглядалася даволі цяжкае становішча. Яно звязана як з разбурэннямі ў час вайны, так і з

дзяржаўнай палітыкай у адносінах да вёскі ў даваенны і пасляваенны час. Прымусовая калектывізацыя, праблемы забеспячэння калгасна – саўгаснай вытворчасці кваліфікавнымі кадрамі, адсутнасць прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці, высокія нормы грашовых падаткаў, абавязковыя пастаўкі дзяржаве без уліку сабранага ўраджаю, слабая забяспечанасць тэхнікай – усё гэта негатыўна адбівалася на выніках дзейнасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Да ўсіх бед , якія мелі месца да вайны, прыйшла яшчэ адна: значны недахоп сялянскіх рук. Асноўная нагрузка ў вёсцы лягла на плечы жанчын і падлеткаў. Сяляне абцяжарваліся працай на калгасных палетках каб пазбегнуць судовай адказнасці і захаваць за сабой прысядзібны надзел, выконвалі ўстаноўлены мінімум працадней.

Паўсюдна назіраўся дэфіцыт прадуктаў харчавання, адзення. У 1940 г. харчовая прамысловасць рэспублікі выраблялa 19% прадукцыі ад узроўню 1940 г., а лёгкая – толькі 10%. У снежні 1945г. рабочыя гарадоў найбольш важных галін вытворчасці атрымлівалі па сістэме нарміраванага размеркавання ад 500 гр да 1кг хлеба ў суткі, служачыя – 450-500 гр, дзеці-да 15гадовага ўзросту – 400 гр, утрыманцы – 300 гр. У 1946г. у зернавых раёнах СССР выпаў неўраджай. Летам 1946 г. была ўведзена картачная сістэма забеспячэння насельніцтва хлебам. Сялянам карткі не выдавалі. Даходы калгаснікаў заставаліся значна ніжэйшымі, чым у гараджан. У 1946 г. толькі ў 10% калгасаў выдалі на працадзень па 18 кап. грошай , 300-350 г збожжа, затым – 450 г мякіны. У астатніх менш або нічога. У 1946 г. у сярэднім па СССР калгасы змаглі выдаць на працадзень 520 г хлеба, у БССР толькі 340 г, ва Украіне – 270 г. У сувязі з тагачасным становішчам урад прыняў дзве пастановы: “Аб мерах па забеспячэнню захаванасці хлеба, недапушчэнню яго разбазарвання”(27. 06.1946 г.), і “Аб забяспечанасці захаванасці дзяржаўнага хлеба”, згодна з якімі судовыя органы прымянялі суровыя меры пакарання нават за самыя нязначныя парушэнні. У 1947 г. у краіне быў сабраны адносна добры ўраджай , які дазволіў ужо на завяршэнні года правесці адмену картачнай сістэмы на прадукты харчавання і тавары масавага ўжытку. Багацця, канешне , не наглядалася: у 1948 г. вытворчасць харчовай прамысловасці складала толькі 35%, а лёгкай – 29% ад даваеннай. На вуліцах населеных пунктаў сустракаліся людзі, якія прасілі міласціні. Беларусі, як найбольш пацярпелай ад фашысцкай акупацыі рэспублікі, значную дапамогу аказваў саюзны ўрад. За тры пасляваенныя гады калгасы рэспублікі атрымалі 160 тыс. тон харчовага збожжа, 122 тыс. коней, 113 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы. У 1948 г. па рашэнні Савета Міністраў СССР Беларусі было выдзелена і пастаўлена 3 тыс. трактароў, 200 тон збожжа, 2 тыс. трактарных плугоў і іншы сельскагаспадарчы інвентар. Аднвчасова з адменай картак прайшла грашовая рэформа. Невялікія ўклады (да 3 тыс. руб.) абменьваліся на новыя грошы ў зберкасах 1 :1, з 3 да 10 тыс. руб. –

Рэпазіторый ВДУ

3:2, больш за 10 тыс. руб. –- 1:10. Фінансавае становішча ў рэспубліцы стабілізавалася, што дазволіла праводзіць зніжэнне цэн на прадукты і прамысловыя тавары. Да сярэдзіны 1950-х гг. аплата працы ў калгасах расла марудна. Яна істотна адставала ад заработнай платы рабочых і служачых, вызывала незадаволенасць у сялянства. Калгаснікі, асабліва моладзь, імкнуліся пакінуць вёску і ўладкавацца на працу на прадпрыемствах**.**

У заходніх раёнах Беларусі на завяршэнні вайны сацыялістычны сектар на вёсцы складаў толькі 0,43%. Да 1949 г. масавая калектывізацыя, як асноўны накірунак, тут не праводзілася, да яе рыхтаваліся: ажыццяўлялася рэформа паводле якой устанаўлівалася абмежаваная норма землекарыстання. На адзін сялянскі двор не больш за 15 га. Лішкі забіраліся ў дзяржаўны фонд і размяркоўваліся паміж беззямельнымі сялянамі і батракамі. У 1949 г. уладныя структуры палічылі, што ўмовы для масавай калектывізацыі тут саспелі. У 1950 г. больш за 80% сялянскіх двароў былі аб’яднаны ў калетыўныя гаспадаркі.

У 1950 г. на ўсёй тэрыторыі БССР пасяўныя плошчы складалі 91,4% даваенных, пасевы збожжа – 97,1%. Асобныя, як іх тады называлі , перадавыя гаспадаркі, мелі па тым часе нядрэнныя вынікі. Шмат працаўнікоў палёў і ферм свядома адносіліся да сваіх абавязкаў. Дзяржава імкнулася стымуляваць іх працу. Пасля прынятага Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР указа “Аб прысваенні звання Героя Сацыялістычнай Працы і ўзнагароджанні ордэнамі і медалямі СССР калгаснікаў, рабочых МТС і саўгасаў за атрыманне вялікіх ураджаяў пшаніцы, жыта, кукурузы, цукровых буракоў і бавоўны” , па выніках работы за 1947 г. 511 калгаснікаў і 109 работнікаў саўгасаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалалямі, 6 перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці атрымалі званне Героя Сацыялістычнай працы СССР. Сярод іх А. Кухарава – звеннявая калгаса імя Сталіна Васілевіцкага раёна, Т. Шкурко – звеннявая саўгаса “Чырвоная ніва” Брагінскага раёна. Такой жа ўзнагароды былі ўдастоены працаўнікі саўгаса “10 гадоў БССР” П. Калыска, Ф. Саўчык, У. Пайграй, А.Стыкун [11, с. 40].

Але ўвогуле прыкметных змен у сельскагаспадарчым комплесе ў гэтыя гады не адбылося. Прычына негатыўных з’яў, як бачыцца сёння, ляжала ў непрадуманых подыходах кіраўніцтва дзяржавы пры ажыццяўленні аграрнай палітыкі. Высокая стаўка па падаткам (сельскагаспадарчы на калгаснікаў і падаходны на рабочых саўгасаў, а яшчэ на халасцякоў, падатак на пабудову, зямельная рэнта, разавы збор на калгасных рынках, збор з уладальнікаў транспарта (нават на веласіпеды), самаабкладанне і г.д.) не стымулявала матэрыяльную зацікаўленасць сялянства. Нізкі ўзровень аплаты за працу ў калгасах і саўгасах прыводзіў да страты сялянскай веры ў прафесію хлебароба. Многія сяляне пакідалі вёску, кідалі сваю гаспадарку, шукалі працу ў прамысловасці, другіх

Репозиторий ВГУ

галінах, што прыводзіла да скарачэння найбольш прадукцыйнай яго часткі. Калгасы страцілі шмат працаздольных людзей. Так, нягледзячы на вельмі цяжкія ўмовы працы на вапнавым заводзе “Руба” ў Віцебску на працу ўладкаваліся сяляне Н.А. Бабарыкіна, І.С. Маташова з калгаса “Перамога” Навікоўскага сельскага Савета Бешанковічскага раёна і шэраг працаўнікоў калгаса “Серп і молат” Віцебскага раёна. Улады былі занепакоены становішчам, якое складвалася ў калгасах. Калектыўныя гаспадаркі церпелі страты, як адзначаецца ў дакументах, “несваечасова выконваюць пасяўныя і ўборачныя работы”. Дзеянні ўлад былі сканцэнтраваны на тым, каб замацаваць селяніна ў калгасах у існуючай жорсткай сацыяльнай сістэме. У 1950 г. шырокае распаўсюджанне набывае перапіска паміж сельскімі Саветамі , райвыканкамамі і дырэкцыямі прадпрыемстваў. Гаворка ў іх вялася аб вяртанні былых калгаснікаў на ранейшыя месцы жыхарства і працы – у вёскі. Падключыўшы пракуратуру, мясцовыя кіраўнікі савецкай улады патрабуюць ад дырэкцый прадпрыемстваў звольніць і вярнуць у калгасы сялян, якія паехалі ў гарады і пасёлкі “без дазволу”. Але такія меры не даюць чакаемых вынікаў. І ў далейшым наглядаўся масавы адток сельскага насельніцтва з вёсак, што з’яўлялася пратэстам супраць аграрнай палітыкі дзяржавы [12, с. 4].

Пэўныя цяжкасці з выкананнем сельскагаспадарчых работ склаліся ў заходніх абласцях БССР. Недавер да калектыўнай гаспадаркі, прывязанасць да сваёй ўласнасці сталі прычынай масавага перасялення насельніцтва ў Польшчу. З кастрычніка 1944 г. па снежань 1946 г. з раёнаў Заходняй Беларусі выехала каля 240 тыс. чалавек. Па гэтай прычыне тут таксама, як і ўвогуле ў рэспубліцы, адчуваўся дэфіцыт працаздольнага сялянства, кваліфікаваных спецыялістаў і кіраўнікоў. Нізкі адукацыйны узровень старшынь калгасаў (з 3031 старшыні калгаса рэспублікі толькі 110 мелі сярэднюю і 5 вышэшую адукацыю) не дазваляў належным чынам арганізаваць рэнтабельную працу гаспадарак.У Віцебскай вобласці ў 195 г. 53% старшынь калгасаў мелі толькі пачатковую адукацыю [13, с. 5].

Нездавальняючай была ўкамплектаванасць гаспадарак рэспублікі спецыялістамі вышэйшага, сярэдняга звяна і механізатарамі. Не ўдалося ў кароткі тэрмін наладзіць сістэму падрыхтоўкі аграномаў, ветурачоў, заатэхнікаў. Сярод трактарыстаў, камбайнераў назіралася нізкая працоўная дысцыпліна, высокая цякучасць. Гэта негатыўным чынам сказвалася на якасці правядзення асноўных сельскагаспадарчых работ. Сельскагаспадарчая вытворчасць адставала ад тэмпаў развіцця іншых галін. Такое становішча склалася яшчэ і таму, што ў гады 5-ай пяцігодкі ў дзяржаўнай палітыцы краіны, як і ў папярэдняй пяцігодцы, акцэнт быў зроблены на прыярытэтным развіцці прамысловага комплексу. Вялікія страты ў час вайны, а таксама адток працаздольных сялян з вёскі не пакрываліся ростам тэхнічнай аснашчанасці пры правядзенні сельскагаспадарчых работ. У 1952 г. з-за ўстарэлай тэхнікі, нізкай

Рэпазіторый ВДУ

працоўнай дысцыпліны з 43 МТС Віцебскай вобласці толькі 6 выканалі гадавы план трактарных работ [14, с. 11,97, 100, 116]. Пасяўныя плошчы бульбы ў 1953 г. у вобласці, у параўнанні з даваенным узроўнем, складалі 58,5%, ільна – толькі 38% [15, с. 42]. У 1952 г. тут з усёй плошчы пасеваў зернавых было сабрана ў сярэднім 4,9 ц з гектара, надоі малака на адну карову ў калгасах склалі 795 кг ( гэта менш чым у 1940 г.).

Вельмі павольна звыкаліся з сацыялістычнай сістэмай гаспадарання ў аграрным сектары сяляне заходніх абласцей. У 1950 г. колькасць калгаснікаў, якія не выпрацавалі абавязковага мінімуму працадзён, складала тут 291961 чалавек, альбо 54,5% ад агульнай колькасці. Не выпрацавалі ні аднаго працадня 54712 чалавек , ці 10,2% [16, с. 48].

У 1953 г. у Берастаўіцкім, найлепшым у эканамічных адносінах раёне, на працадзень было выдадзена па 1кг зерня, 1,2 кг бульбы, 0,5 кг сена і саломы. У Маладзечанскай вобласці ў гэтым годзе з 813 калгасаў у 247 грошы на працадні не выдаваліся зусім, у 272 – выдадзеныя сумы складалі да 20 капеек [17, с. 258–259]. Такая аплата працы калгаснікаў не стымулявала іх на высокую прадукцыйнасць.

Вялікі паток скаргаў з месцаў да цэнтральнага кіраўніцтва на такое становішча патрабаваў неадкладных змен у аграрнай палітыцы краіны. Таму робіцца спроба пераламіць становішча , што склалася ў сельскай гаспадарцы. У жніўні 1953 г. на сесіі Вярхоўнага Савета СССР было сказана аб нізкім жыццёвым узроўні калгаснікаў, іх масавых уцёках з вёскі. У прынятых дакументах было прапанавана павысіць матэрыяльную зацікаўленасць сялян у працы, а ў верасні пленум ЦК УКП(б) разгледзеў асобна пытанне аб стане ў вёсцы, намеціў цэласную праграму па развіцці аграрнага сектара краіны [18, с 303–345].

Пасля пленума ў БССР пашыраецца сістэма падрыхтоўкі кадраў масавых прафесій для сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1954 г. пачалі працаваць 27 школ механізацыі сельскай гаспадаркі, 13 рамесных вучылішчаў, школа Міністэрства саўгасаў БССР. Тут па тыпавой праграме праходзілі падрыхтоўку больш за тысячу трактарыстаў і больш за 4 тыс. механізатараў [19, с. 42]. З прадпрыемстваў і ўстаноў гарадоў і раённых цэнтраў рэспублікі на працу ў МТС было накіравана 3100 чалавек, з іх 1721 – з вышэйшай адукацыяй. У канцы 1955г. 66,4% кіраўнікоў МТС мелі вышэйшую адукацыю.

У 1955 г. на працу ў калгасы накіравалі 30 тыс. чалавек. Умацоўваўся склад старшынь калгасаў: на гэты час 43,2% з іх мелі вышэйшую адукацыю. Павелічэнне капітальных укладанняў у развіццё сельскай гаспадаркі, механізацыя і электрыфікацыя працы, іншыя захады, а самае галоўнае , пашырэнне ( хоць і невялікае) самастойнасці калгасаў, развязала ініцыятыву для больш рацыянальнага вядзення гаспадаркі, павелічэння вырабу сельскагаспадарчай прадукцыі. Вырасла сярэдняя выпрацоўка на аднаго калгасніка. У 1955 г. яна складала 229 працадней (у 1951 г. на аднаго калгасніка ў БССР было напрацавана толькі 179 працадней).

Рэпазіторый ВДУ

Пашыраліся пасевы традыцыйных для Беларусі культур: у 1955 г. бульба і збожжа займалі больш за 60% пасяўных плошчаў. У 1955 г., рэкордным па ўраджайнасці бульбы, было сабрана з аднаго гектара амаль у 2 разы больш чым у 1953 г. У 1955 г. калгасы датэрмінова выканалі план хлебанарыхтоўкі і прадалі дзяржаве звыш плана 3 млн пудоў збажыны. Значна ўзраслі за два гады пасяўныя плошчы пад лён. Гэтую культуру не вырошчвалі ў БССР толькі 4 раёны (Дамачкоўскі, Лагішынскі, Целяханскі, Камарынскі). Ураджай гэтай культуры да 1955 г. вырас больш чым у 3 разы. Надоі малака ў калгасах рэспублікі за два гады павялічыліся ў 1,7 раза.

По стане на 1 студзеня 1956 г. грашовыя даходы калгасаў складалі 1 млрд 360 млн рублей, што ў 10–12 разоў больш, чым у папярдні год [20, с. 68].

Значны пералом у павышэнні вынікаў працы сельскагаспадарчага комплексу намеціўся ў Віцебскай вобласці. За 1954–1955 гг. вытворчасць мяса і малака тут вырасла амаль удвая, а вытворчасць свініны – больш чым у 5 разоў. Сярэдні надой на карову дасягнуў 1101 кг. Такі вынік, нават па тым часе, не быў высокім, але дынаміка росту прадукцыйнасці працы сялян за кароткі тэрмін здвалася абнадзейваючай. Грашовыя даходы калгасаў вобласці ўзраслі з 1953 г. па 1956 г. больш чым у 3,7 раза. Гэта дало магчымасць у 1955 г. выдаць калгаснікам у сярэднім на адзін працадзень па 4,8 рублі, што ў 5 разоў больш чым у 1953 г. Што тычыцца рэспубліканскіх вынікаў увогуле, то тут яны былі нават вышэйшымі (Віцебская вобласць у гэты час адставала ад Гродзенскай, Брэсцскай, Гомельскай і Мінскай абласцей). Кіраўніцтва краіны вымушана было пайсці на паляпшэнне матэрыяльнага становішча калгаснікаў. Менавіта з сярэдзіны 50-х гг. была ўведзена практыка штомесячнага авансавання калгаснікаў.

Такім чынам бачна, што аднаўленне сельскай гаспадаркі праходзіла ў надзвычай складаных умовах. У першыя пасляваенныя гады, каб павысіць зацікаўленасць у росце прадукцыйнасці грамадскай вытворчасці на вёсцы , улады рабілі стаўку на адміністрацыйны рэсурс. Такі падыход не мог прывесці да жадаемых вынікаў. Вывядзенне сельскай гаспадаркі з працяглага заняпаду адбылося пасля верасня 1953 г. Павелічэнне капітальных укладанняў у развіццё сельскай гаспадаркі, механізацыя і электрыфікацыя працы, іншыя захады, а самае галоўнае, пашырэнне самастойнасці калгасных гаспадарак, развязала ініцыятыву для больш рацыянальнага вядзення гэтай важнай галіны. Да 1958 года развіццё сельскай гаспадаркі краіны шпарка рухалася наперад, адбываўся значны рост вырабу сельскагаспадарчай прадукцыі, але істотныя недахопы ў арганізацыі працы ў калгаснай вытворчасці не дазволілі ў далейшым дабіцца тут высокай эфектыўнасці. (Аб гэтым, як і аб далейшых зменах у аграрнай галіне, будзе падрабязна выкладзена ў наступнай тэме).

**Спасылкі**

1. Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946–1950 гг. – Мінск, 1946.

2. Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 2800. – Оп. 1. – Д. 78.
3. Профессиональные союзы Беларуси: история и современность/ под. ред. Л. П. Козика. Минск: Федерация профсоюзов Беларуси, 2007. – 672 с.
4. Народное хозяйство Белорусскай ССР: стат. сб. – Минск, 1957
5. Очерки истории профсоюзов Витебщины: монография / сост.: И. К. Возмитель, И. В. Мандрик; редкол.: И,В. Мандрик [и др. ]. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с.: ил.
6. ГАВО. – Ф. 2800. – Оп. 1. – Д. 5.
7. ГАВО. – Ф. 2800. – Оп. 1. – Д. 5.
8. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш. ]; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.; іл.
9. Национальный архив Республики Беларусь НАРБ). – Ф. 909. – Оп. 1. – Д. 162.
10. Наша республика :Цифры и факты. – Минск, 1967.
11. ГАВО. – Ф. 4. – Оп. 2. – Д. 213.
12 Мандрык, І. Радзімкі мінулага / І. У. Мандрык // Віцебскі рабочы. – 1992. - 25 жн.
13. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 115. – Д. 35.
14. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 53. – Д. 11.
15. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 60. – Д. 11.
16. НАРБ. – Ф. 4. Оп. 46. –Д. 564.
17. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 20. – Д. 653.
18. О мерах по дальнейшаму развитию сельского хозяйства СССР / КПСС в резалюциях и решениях съездов, конференций, пленумов ЦК. – М., 1972. – Т. 8.
19. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 2. – Д. 233.
20. Патолічаў, Н.С. Справаздачны даклад Цэнтральнага камітэта Беларусі XXII з’езда КПБ.

## ТЭМА 3. **Грамадска-палітычнае жыццё ў пасляваенны перыяд**

*1. Аднаўленне дзейнасці арганізацый, якія фарміруюць палітычную сістэму грамадства.*

*2. Антысавецкія арганізацыі, іх дзейнасць.Апагей культу асобы Сталіна.*

***1. Аднаўленне дзейнасці арганізацый, якія фарміруюць палітычную сістэму грамадства.*** Перамога ў вайне, усталяванне міру далучыліся да змены настрою ў грамадскім жыцці. У той часткі насельніцтва краіны, якая свядома валодала інфармацыяй, адбылася пераацэнка ранейшых каштоўнасцей. У іх свядомасці ўсё выразней спела разуменне, што разам з вайной у мінулае павінны адысці і выкліканыя ёю экстрымальныя ваенныя абставіны і бытавыя нястачы. Свядомасць простых людзей, роздумы мясцовых кіраўнікоў партыі і Саветаў усё больш прыводзілі іх да думкі аб неабходнасці павароту дзяржавы да сацыяльных праграм, усталявання дэмакратычных прынцыпаў у грамадска-палітычным жыцці. Рабочыя жадалі годнай зарплаты, сяляне думалі, што ўлада можа даць свабоду

выбара землекарыстання. Інтэлігенцыя мела надзею на лібералізацыю рэжыма і свабоду творчасці. Многім людзям казалася, што ўсё цяжкае і страшэннае ўжо ў мінулым і больш ніколі не вернецца. З такім новым палітычным мысленнем і пачалося пасляваеннае аднаўленне дзейнасці асноўных інстытутаў палітычнай сістэмы краіны.

Паколькі ядром усіх грамадска – палітычных сіл была прызнаная Канстытуцыяй краіны КПСС, у рэспубліцы яе складовая частка – КП(б)Б, – па часе вызвалення пачало хутка аднаўляцца партыйнае жыццё кіруючай палітычнай арганізацыі. За 1944–194 гг. партыйныя арганізацыі былі створаны на большасці буйных прадпрыемстваў, у калгасах і саўгасах . Напрыканцы 1945 г. у складзе Кампартыі Беларусі налічвалася толькі 66% даваеннай колькасці. На 1.01.1946 г. у партыі састаяла 48,2 тыс. чалавек (супраць 72,1 тыс. у 1941 г.). Партыя ў краіне з'яўлялася кіруючай, яна выконвала ўсеабдымныя функцыі. Пастановы партыйных камітэтаў насілі абавязковы характар не толькі для яе ніжэйстаячых структур, але і для ўсіх дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. То бок, партыя да гэтага часу, у пэўным сэнсе , трансфарміравалася ў вышэйшую заканадаўчую ўладу. Партыйныя арганізацыі пярвічнага звяна ( на прадпрыемствах і ўстановах) галоўным напрамкам сваёй дзейнасці лічылі вырашэнне гаспадарчых спраў. Партыйныя камітэты раённага і больш высокага рангу мелі ў сваіх структурах галіновыя аддзелы па прамысловасці, сельскай гаспадарцы, бытавому абслугоўванню ды інш.

Да сярэдзіны 50-х гг. шэрагі партыі выраслі: на 1.01 1956 г. на ўліку састаяла 145069 камуністаў і 12655 кандыдатаў, 25% камуністаў працавалі на прадпрыемствах.

Першым сакратаром ЦК КПБ у пасляваенныя гады на вызначаным этапе быў П.К.Панамарэнка (да 1947 г. ён сумяшчаў гэту пасаду з пасадай старшыні Савета Міністраў БССР ). Гісторыкі характарызуюць яго як працавітага , адказнага кіраўніка ў вырашэнні самых складаных праблем, здольнага адстойваць інтарэсы рэспублікі ў Маскве. У наступныя гады ЦК Кампартыі Беларусі паслядоўна ўзначальвалі М.І. Гусараў (з 1947 г. да 1950 г.), М.С. Патолічаў (з 1950 г. да 1956 г).

1 студзеня 1944г. з мэтай набліжэння партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва да мясцовых умоў у БССР было утворана 5 новых абласцей – Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская, Пінская, Полацкая, Вілейская вобласць была рэарганізавана ў Маладзечанскую. Згодна з такім адміністрацыйна – тэрытарыяльным падзелам у рэспубліцы дзейнічалі 12 абласных і 205 раённых камітэтаў КП (б) Беларусі. Дзенасць партыйных камітэтаў у першыя гады пасля вызвалення адчувала недахоп для апаратнай работы адукаваных кадраў. Цяжкай справай стала ўкамплектаванне штатаў партыйных камітэтаў раённага звяна. Асабліва гэта тычылася заходніх тэрыторый, якія толькі ў 1939г. былі далучаны да БССР. Сюды з мэтай умацавання кадравага складу ў 1945 г. было

Рэпазіторый ВДУ

накіравана больш за тысячу партыйных і савецкіх работнікаў з рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі [1, с. 64].

У сярэдзіне 1953 г. з 1175 партыйных работнікаў заходніх абласцей БССР толькі 21 прадстаўляў мясцовае насельніцтва. У апаратах Баранавіцкага абласнога і гарадскога, Брэсцкага і Гродзенскага гарадскога камітэта партыі не было ні аднаго работніка з ліку мясцовага насельніцтва**.** У гістарычнай літаратуры зроблены правільны акцэнт на тое, што недавер да мясцовых кадраў, незапатрабаванасць былых членаў КПЗБ, стаўка на прыязджаючых кіруючых работнікаў, якія не ведалі мясцовых умоў, адмоўна ўплывала на кіраўніцтва народнай гаспадаркай і галінах культуры.

Востра стаяла ў гэты час праблема ўзроўню адукацыі партыйных і савецкіх работнікаў. 2 жніўня 1946 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову "Аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў." Выкананне пастановы прадугледжвала стварэнне сеткі партыйных навучальных устаноў. Акрамя Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК УКП(б), было створана 50 двухгадовых партыйных школ у рэгіёнах, у тым ліку і ў Мінску [2, с. 42,43]. З 1946 г. па 1951 г. у Мінскай партыйнай школе навучалася 1450 чалавек. У 1955 г. школа былаператворана ў трохгадовую , што дазволіла расшырыць праграму з мэтай атрымання тут за час вучобы больш глыбокай падрыхтоўкі . У 1955 г. была створана рэспубліканская савецка –партыйная школа, якая давала сваім выпускнікам сярэднюю адукацыю і кваліфікацыю малодшага агранома – арганізатара.

Адначасова адбывалася адраджэнне Саветаў дэпутатаў працоўных**.** Ім згодна з дзеючай Канстытуцыяй належыла галоўная функцыя дзяржаўнага кіраўніцтва і арганізацыя грамадскага жыцця. У 1947 г. адбыліся першыя пасля вайны выбары ў Вярхоўны Савет БССР, а ў 1948 г. – у мясцовыя Саветы. Старшынямі Прэзідыума ВС БССР выбіраліся Н.Я. Наталевіч, з 1948 г. – В.І. Казлоў, пасля яго – С.В. Прытыцкі. Да дэпутацкіх абавязкаў у мясцовых Саветах прыступілі 64877 чалавек [3, с. 157].

Дзейнасць Саветаў усіх узроўняў ажыццяўлялася праз сесіі і пасяджэнні выканкомаў, працу пастаянных камісій.

У складанае першае пасляваеннае дзесяцігоддзе на карысць Саветаў можна аднесці ўсе аспекты, якія тычацца аднаўлення і станаўлення эканомікі і сацыяльнай сферы, пачынаючы ад фарміравання мясцовага і рэспубліканскага бюджэту, збору сельскагаспадарчага падатку і канчаючы размеркаваннем прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў. З удзелам дэпутатаў праводзіліся ўсе арганізацыйныя і палітычна – масавыя мерапрыемствы па аднаўленні гарадоў і вёсак,устаноў народнай адукацыі, іншыя справы. Як і ўсе іншыя арганізацыі, Саветы знаходзіліся пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў.

У працы Саветаў меліся недахопы, прысутнічаў фармалізм, парой непрафесіяналізм пры вырашэнні пытанняў паўсядзённага жыцця насельніцтва. Назіралася практыка неабгрунтаванай замены кадравага



Репозиторий ВГУ

складу Саветаў шляхам прызначэнства (кааптацыі -парой нават не з ліку дэпутатаў), што прыводзіла да вялікай цякучасці ў складзе кіраўнікоў гэтых дзяржаўных устаноў. Пралікам пры вылучэнні старшынь і сакратароў Саветаў у Заходніх абласцях, як і пры падборы кіраўнікоў партыйных камітэтаў, з’яўлялася недапушчэнне да кіраўніцтва мясцовых работнікаў. Такая заарганізаванасць не спрыяла выкананню саветамі ў поўнай меры сваіх канстытуцыйна вызначаных функцый.

З першых дзён пасля вызвалення вялося адраджэнне прафсаюзаў – самай масавай грамадскай арганізацыі. Аднаўляліся структуры рэспубліканскага і мясцовага ўзроўню. На пачатку 1946 г. у БССР налічвалася 350 тыс. членаў прафсаюза, што складала 70% агульнай колькасці рабочых і служачых. У прынятай пастанове ЦК КП(б) Беларусі “Аб рабоце прафсаюзнай арганізацыі БССР” (15.01. 1946 г.) перад прафсаюзнымі арганізацыямі ставілася задача “прыцягнення рабочых, сельскагаспадарчых работнікаў, інжынерна – тэхнічных работнікаў і служачых да актыўнай работы па аднаўленні народнай гаспадаркі і задавальненні культурна – бытавых патрэб працоўных”. У гэтым напрамку і разгортвалася іх работа. Прафсаюзы былі ініцыятарамі развіцця сацыялістычнага спаборніцтва, наладжвалі работу клубаў, дамоў культуры, мастацкай самадзейнасці, фізічнай культуры і спорту. Шмат увагі прафсаюзы надавалі стварэнню умоў для бяспечнай працы на вытворчасці.

Пастаянна ўзрастала колькасць членаў прафсаюза. У 1956 г. прафсаюзы Беларусі аб’ядноўвалі 1175 тыс. чалавек, (93,7% усіх працаваўшых у вытворчасці, акрамя калгасаў). Значную ўвагу прафсаюзныя арганізацыі надавалі прыцягненню рабочых, ІТР і служачых да вырашэння пытанняў арганізацыі вытворчасці. Пад іх кіраўніцтвам знаходзіліся вытворчыя нарады. Вытворчыя нарады, як даступная форма ўдзелу працоўных у кіраванні вытворчымі працэсамі, з кожным годам набіралі папулярнасць, пашыралі свае рады. Важная роля належыла прафсаюзам у распрацоўцы, прыняцці і ажыццяўленні разам з адміністрацыяй калектыўных дагавораў, у якіх вызначаліся пытанні вытворчай дзейнасці прадпрыемстваў, пытанні аплаты працы, быту працаўнікоў. Практыка заключэння калектыўных дагавораў на прадпрыемствах рэспублікі пастаянна пашыралася. Напрыклад, у 1947 г. было заключана 889 калектыўных дагавораў, а ў 1950 г. у два разы болей [4, с. 419].

Забеспячэнне ідэйнага і арганізацыйнага ўплыву на моладзь патрабавала аднаўлення камсамольскіх структур. У кароткія тэрміны камсамольскія арганізацыі былі створаны на прамысловых прадпрыемствах, калгасах, саўгасах і іншых установах. На 1 студзеня 1949 г. у БССР налічвалася 20469 арганізацый Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі (ЛКСМБ), на ўліку састаяла 308 тыс. членаў, што на 52 тыс. перавышала даваенную колькасць [5, с. 310]**.** Узначальваць камсамольскую арганізацыю рэспублікі на працягу першага пасляваеннага

дзесяцігоддзя было даручана вядомым гістарычным асобам – М. Зімяніну (1940–1946 гг.), К. Мазураву (1946–1947 гг.), П.Машэраву (працаваў першым сакратаром ЦК ЛКСМБ з кастрычніка 194 7г. па ліпень 1954 г.), якія ў наступныя гады выраслі ў буйных партыйных і дзяржаўных дзеячаў. Партыйныя камітэты ўважліва адносіліся да дзейнасці камсамола. У чэрвені 1951 г. на пленуме ЦК КП(б) Б быў заслуханы і абмеркаваны даклад першага сакратара ЦК рэспубліканскай моладзёвай арганізацыі П.М. Машэрава "Аб рабоце камсамольскай арганізацыі Беларусі". Праца камсамольскіх арганізацый накіроўвалася на падняцце актыўнасці моладзі на вытворчасці для залечвання ран, нанесеных краіне фашыстамі. У цэнтры ўвагі камсамола Беларусі былі пытанні арганізацыйнага ўмацавання камсамола, як вядучай грамадска-палітычнай арганізацыі, павышэння агульнаадукацыйнага і палітычнага ўзроўню моладзі. На 1 студзеня 1956 г. у ЛКСМБ налічвалася 658 тыс. юнакоў і дзяўчат.

Важнае значэнне ў той час камсамол павінен быў надаваць пытанням аб набыцці рабочай моладдзю адукацыі: у 1951 г. 47% моладзі, якая была занята на вытворчасці, мелі толькі пачатковую адукацыю. Камсамольскія арганізацыі наладжвалі цесныя сувязі са школамі рабочай і сельскай моладзі.

Добра была наладжана ў камсамольскіх арганізацыях работа па выхаванні моладзі на працоўных традыцыях. За 1954–1955 гг. ад юнакоў і дзяўчат у камітэты камсамола паступіла звыш 100 тыс. заяў з просьбай накіраваць іх на засваенне цалінных і залежных зямель у Казахстан і Сібір.

***2. Антысавецкія арганізацыі, іх дзейнасць.Апагей культу асобы Сталіна.*** Да напружаных знешніх абставін, што ўносілі неспакой ў паўсядзённае жыццё людзей пасляваеннга часу, далучылася актыўная дзейнасць польскіх, украінскіх, літоўскіх узброеных фарміраванняў і беларускіх падпольных арганізацый на заходніх тэрыторыях БССР. З самага пачатку пасля вызвалення на тэрыторыі пераважна заходніх абласцей (Баранавічская, Брэсцкая, Полацкая, Пінская, Маладзечанская, Гродзенская) скаліся бандыцкія фарміраванні. Навукоўцы ўказваюць, што ў розных антысавецкіх арганізацыях састаяла каля 50 тыс. чалавек. Захаваліся, утвораныя яшчэ ў 1942 г., фарміраванні Арміі Краёвай. Не падпарадкаваўшыся патрабаванням аб здачы зброі і ўступлення ў шэрагі Чырвонай Арміі, або ў Войска Польскае, яны накіравалі свае намаганні на барацьбу супраць Савецкай улады. У асобных раёнах акаўцы трымалі насельніцтва ў пастаяннай напружанасці. Яны ўчынялі дыверсіі на чыгунках, нападалі на армейскі транспарт, забівалі прадстаўнікоў органаў улады, ваеннаслужачых. За 1944 г.былі зарэгістраваны 574 бандыцкія праяўленні, у тым ліку 75 цяжкіх злачынстваў, 11 дыверсій. Ад рук акаўцаў загінула 66 чалавек партыйна –савецкага апарату. Толькі ў другой палове 1944 г. яны забілі 277, паранілі 54 байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі. Нягледзячы на загад генерала Акуліцкага ад 19 студзеня 1945 г. аб

роспуску акаўскіх фарміраванняў, многія іх структуры захаваліся. Асобныя невялікія групы паўстанцаў перайшлі ў падполле і праіснавалі да сярэдзіны 50-х гг.

Адкрытую вайну з савецкай уладай ў раёнах Беларусі, якія межавалі з УССР (на Палессі), працягвалі ўкраінскія нацыяналісты. Іх метады не адрозніваліся ад тых, што ўжывалі акаўцы. Да іх ліквідацыі, як і да акаўцаў, былі падключаны фарміраванні НКУС–НКДБ. Актыўная дзейнасць акаўскіх і аўнаўскіх фарміраванняўбыла спынена толькі ў 1953 г.

З палітычным бандытызмам змыкалася крымінальная злачыннасць, якая стымулявалася велізарнай колькасцю зброі, пакінутай вайной. Гэта перашкаджала наладжванню на Беларусі мірнага жыцця.

Што тычыцца беларускіх падпольных фарміраванняў і арганізацый, то можна адзначыць, што ініцыятарамі іх стварэння, як правіла , былі ўдзельнікі калабарацыянісцкага руху. У лістападзе 1946 г. у Навагрудку ўзнікла падпольная арганізацыя "Саюз вызвалення Беларусі". Узначаліў гэту арганізацыю, вярнуўшыйся з Германіі, член саюза беларускай моладзі, створанай фашыстамі ў гады вайны , нехта Г. Казак.

У канцы 1945 г.- пачатку 1946 г. у Плiскім раёне Полацкай вобласці дзейнічала арганізацыя на чале з праваслаўным святаром Г. Бортнікам. Прычынамі стварэння гэтай і іншых падпольных арганізацый ("Чайка" у Слоніме, "Саюз беларускіх патрыётаў" – у Глыбокім) былі незадаволенасць дзейнасцю мясцовых уладных структур падчас суцэльнай калектывізацыі, ігнараванне нацыянальнай культуры, а таксама, як яны заяўлялі ў сваіх дакументах, імкненне да стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы. Пратэстны настрой у інтэлігенцыі больш за ўсё выклікала заганная дзейнасць вышэйшага палітычнага кіраўніцтва, высокая цэнтралізацыя і бюракратызацыя.

Грамадска – палітычнае жыццё пасляваенных гадоў выразна несла на сабе аўтарытарны стыль. Адмовіцца ад негатыўных рыс даваеннага сацыяльна – эканамічнага і палітычнага развіцця, аб чым марылі людзі, прыступаючы да аднаўлення краіны, адразу не ўдалося. Сталінскі рэжым эвалюцыянаваў не ў лепшы бок, станавіўся даволі жорсткім. Да 1953 г. наглядалася ўзмацненне культу асобы Сталіна і ідэалагічнага дыктату. Палітычнае кіраўніцтва краіны імкнулася праз усе сродкі масавай інфармацыі нейтралізаваць крытычныя тэндэнцыі ў асяродку інтэлігенцыі і франтавікоў. Узраслі абароты рэпрэсіўнай машыны супраць нездавальняючых уладу прадстаўнікоў інтэлігенцыі, рабочага класа і сялянства. Асобны ўдар прыйшоўся на сялянства заходніх абласцей. У адпаведнасці са сталінскай тэорыяй калектывізацыі, стварэнне калгасаў у заходніх абласцях, як і на папярэднім этапе ва ўсходніх, суправаджалася ліквідацыяй заможных аднаасобных гаспадарак. Згодна з пастановай Савета Міністраў БССР "Аб падатковым абкладанні кулацкіх гаспадарак заходніх абласцей", прынятай 6 верасня 1947 г., кулацкімі лічыліся

Рэпазіторый ВДУ

гаспадаркі, якія прымянялі наёмную працу аднаго ці больш сезонных работнікаў. Выканкамам раённых Саветаў даручалася праз тыдзень пасля прыняцця пастановы зацвердзіць спісы такіх гаспадарак і перадаць фінансавым аддзелам для налічэння павышаных (ад 20% да 50%) падаткаў. У 1948 г. стаўкі сяльгаспадатку сталі значна вышэйшымі, часта непасільнымі. Выплаціць іх было немагчыма нават з умовай распродажы маёмасці гаспадара. Сталі ўзрастаць нядоімкі па нявыплачаным сяльгаспадаткам, а з гэтым – і судовыя расправы. Сялян арыштоўвалі і высылалі ў Сібір і Казахстан. У другой палове 1949 г. у гэтыя мясцовасці было выслана 3400 заходнебеларускіх сямей [6, с. 440, 441].

Калектывізацыя на далучаных у 1939 г. землях працягвалася прымусовымі метадамі, асноўны удар прыйшоўся на самых дбайных і працавітых сялян. На працягу 1951–1952 гг. з Беларусі было выселена без права вяртання 1242 сям'і (5259 чал.). Сяляне, якія ўступілі пад прымусам у калектыўныя гаспадаркі, не лічылі сябе яе саўласнікамі, пасіўна паводзілі сябе ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, што негатыўна ўплывала на прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі і, само сабой разумеецца, на дабрабыт насельніцтва.

Зыходзячы з прызнання работы ў галіне ідэалогіі , як работы , маючай сур'езныя недахопы і сур'езныя правалы, Сталін і яго бліжайшае атачэнне вызначылі і накіроўвалі палітычны курс на правядзенне рэпрэсіўных акцый супраць кіруючых работнікаў, вучоных, творчых асоб у галіне літаратуры, мастацтва. Правакацыі Цанавы, які ўзначальваў органы дзяржаўнай бяспекі рэспублікі са снежня 1938 г. па кастрычнік 1951 г., зведалі на сабе Першы сакратар ЦК ЛКСМБ П.М.Машэраў, С. Прытыцкі, які працаваў кіраўніком Гродзенскага абкама КП(б) Б, Прэзідэнт акадэміі навук БССР А. Жэбрак і іншыя сумленныя палітычныя і навуковыя дзеячы. Рэпрэсіі, праведзеныя ў пасляваенны час, не дасягнулі даваенных памераў, але яны ўносілі ў грамадства трывожны настрой і хваляванні за свой лёс, за лёс сваіх блізкіх, за будучыню краіны.

Вывучаючы пасляваенныя абставіны, асобныя даследчыкі сцвярджаюць, што ў 40–50 гг. ніякага грамадска – палітычнага жыцця не магло быць. Былі толькі асобныя атрыбуты. Цалкам з гэтай думкай наўрад ці магчыма пагадзіцца. Значна бліжэй да аб'ектыўнасці находзіцца выснова аўтараў, якія пішуць, што негатыўнага ў тых пасляваенных цяжкіх умовах у паўсядзённым жыцці беларусаў хапала. Пераходу да дэмакратычных адносін у грамадска – палітычным жыцці не адбылося. У краіне захавалася палітычная сістэма, што склалася ў сярэдзіне 20-х і ўзмацнілася сталінскім аднауладдзем у 30-я, 40-я гг.

Разглядаючы гэтую тэму, трэба падкрэсліць, што ў БССР многія негатыўныя рысы савецкага пасляваеннага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця змягчаліся складам яе вышэйшых кіраўнікоў. На вядучыя партыйныя і дзяржаўныя пасады прыйшлі выпрабаваныя вайной



Рэпазітарый ВДУ

партызанскія важакі П. Панамарэнка, У. Казлоў, В. Лабанок, К. Мазураў, П. Машэраў і іншыя блізкія да народу асобы, якія карысталіся яго павагай і даверам. Кіраўнікі такога кшталту праяўлялі больш самастойнасці і гнуткасці ў мысленні і выкананні ўказанняў з цэнтра. Дзякуючы гэтаму, улады Беларусі мелі народную падтрымку, а сталінскі таталітарны прэс паслабляўся. На агульным фоне савецкай бюракратыі ў беларускім грамадстве назіраліся пэўныя працэсы грамадска – палітычнага жыцця. Большасць грамадзян Беларусі праяўляла сваю актыўнасць, не паглыбляючыся ў недаўняе мінулае, былі гатовыя мірыцца з часовымі цяжкасцямі, удзельнічалі ў выбарах, выбіраліся дэпутатамі Саветаў усіх узроўняў, працавалі ў іх пастаянных камісіях, уваходзілі ў склад прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый.

За кароткі тэрмін у Беларусі былі адноўлены партыйныя, савецкія органы, грамадскія арганізацыі, якія з цягам часу арганізацыйна ўзмацняліся, раслі колькасна, удасканальвалі формы і метады сваёй дзейнасці, займалі важнае месца ў аднаўленні і развіцці эканомікі і культуры рэспублікі. Змучаныя і знясіленыя вайной людзі знайшлі ў сабе сілы і волю ў кароткі тэрмін загаіць цяжкія раны, аднавіць разбураныя гарады і вёскі, прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Нябачанымі раней тэмпамі ішло будаўніцтва тысяч буйных заводаў і фабрык, сярэдніх і дробных прадпрыемстваў. Сваёй жыццяздольнасцю ў пасляваенным аднаўленні народнай гаспадаркі краіны беларускі народ здзівіў увесь свет.

**Спасылкі**


1. Бодак, А.Ю. Национальная политика в БССР (1943–1955гг): дисс. … канд. ист. Наук / А.Ю. Бодак. – Минск, 1997.
2. КПСС в резолюциях. – М., 1985. – Т. 8.
3. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 2. –Д. 213.
4. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 2.
5. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 2. – Д. 213.
6. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 62. – Д. 1.


## ТЭМА 4. **Аднаўленне і развіццё духоўнай культуры Беларусі на этапе 1945–1955 гг.**

*1. Аднаўленне і развіццё народнай адукацыі і навуковых даследаванняў.*

*2. Становішча ў галіне мастацкай культуры.*

***1. Аднаўленне і развіццё народнай адукацыі і навуковых даследаванняў.*** Аднаўленне і развіццё асветы і навукі ў другой палове 40-х – пачатку 50-х гг. у БССР праходзілі ў складаных умовах. Складанасці заключаліся ў адсутнасці або беднасці матэрыяльна-тэхнічнай базы школьных устаноў, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных

Репозиторий ВГУ

устаноў; недастатковасці настаўніцкіх кадраў, падрыхтаваных выкладчыкаў ВНУ. Складанасць першых пасляваенных гадоў узмацнялася розным узроўнем культурнага развіцця рэгіёнаў (адсталасць Заходняй Беларусі), а таксама, як адзначалася ў папярэднім раздзеле, узмоцненым ідэалагічным кантролем за ўсімі пытаннямі культурнага і сацыяльнага жыцця з боку ўлады.

Матэрыяльна-тэхнічная база культуры ў гады вайны прыйшла ў поўны заняпад. Будынкі школ, клубаў, бібліятэк былі спалены ці ператвораны ва ўстановы для іншага выкарыстання. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва ў тых складаных умовах праявілі сапраўдны клопат па аднаўленні разбураных і будаўніцтву новых навучальных устаноў. З дапамогай грамадскасці кіраўнікі сістэмы адукацыі рабілі ўсё магчымае, каб не прыпыніць навучанне. Далучэнне насельніцтва да адукацыі адбывалася разам з вызваленнем населеных пунктаў.

У пастанове сходу партыйнага актыву Віцебскай абласной арганізацыі КП(б) Б “Аб чарговых задачах абласной партыйнай арганізацыі”, прынятай 26 лютага 1944г., партыйным камітэтам, савецкім і гаспадарчым арганізацыям было дадзена даручэнне: “у кароткі тэрмін аднавіць сетку пачатковых і сярэдніх школ, ахапіць вучобай усіх дзяцей школьнага ўзросту” [1, с. 58]. Трэба заўважыць, што пастановы не заставаліся дэкларацыямі. Характэрны прыклад: менш чым праз месяц пасля вызвалення раённага цэнтра (вызвалены 8 кастрычніка), 4 лістапада 1943 г. Лёзненскі райвыканкам прыняў рашэннем аб аднаўлені працы Калышанскай пачатковай школы. Тут жа загадчыцай школы была зацверджана настаўніца Гукало Марыя Паўлаўна. Дзеці школьнага ўзросту адразу прыступілі да заняткаў [2, с. 46].

Ужо напачатку 1945/46 навучальнага года на Беларусі былі ўведзены ў дзеянне 80 % школ ад даваеннай колькасці. Пачатковай, сямігадовай адукацыяй ў школах, школах рабочай і сельскай моладзі навучалася 1 млн 358 тыс. чалавек. За 1946–1950 гг. дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы і арганізацыі ўвялі 205 школ на 62,5 тыс. вучнёўскіх месцаў, вялікая колькасць школ была пабудавана непасрэдна ў калгасах. У 1950/51 гг. колькасць школ у БССР ужо перавышала даваенную. У далейшым наглядалася тая ж тэндэнцыя ў пашырэнні матэрыяльна – тэхнічнай базы адукацыі ва ўсіх рэгіёнах рэспублік [3, с. 105]. Напачатаку 50-х гг. матэрыяльная база адукацыі дазволіла дзяржаве ажыццявіць поўны ахоп дзяцей, як навучаннем, так і правядзеннем выхаваўчай працы. У 1955/ 56 навучальным годзе за парты агульнаадукацыйнай школы селі 1 млн 289,7 тыс. чалавек. Зніжэнне колькасці навучэнцаў, у параўнанні з папярднімі гадамі адбылося па той прычыне, што з 1949/50 навучальнага года ў школы прыйшлі дзеці , народжаныя ў гады вайны, калі нараджальнасць была вельмі нізкай [4, с. 159].

У 1956 г. была адменена плата за навучанне ў сярэдняй школе. Пасля чаго адукацыя ў краіне на доўгім адрэзку часу (да пачатку 1990-х гг.) была бясплатнай для ўсіх тыпаў асветных устаноў. З кожным пасляваенным навучальным годам у агульнаадукацыйных школах рос колькасны і якасны склад настаўнікаў: з 64 тыс. у 1950 г. да 78,8 тыс. у 1955/56 навучальным годзе. Павялічвалася доля настаўнікаў з вышэйшай педагагічнай адукацыяй.

З большымі складанасцямі ў арганізацыі адукацыйнай справы насельніцтва прыйшлося сустрэцца ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Адукацыю насельніцтва працягваць пасля вайны тут прыходзілася з большымі цяжкасцямі, пачынаць з найпрасцейшых формаў. Каб ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць сярод дарослых людзей, адкрываліся школы рабочай моладзі, сельскай моладзі, гурткі. За 1946/47–1947/48 навучальныя гады адукацыю тут атрымала большая частка ўсяго дарослага насельніцтва. Спрыяльныя ўмовы былі створаны тут для арганізацыі навучання і выхавання дзяцей. У 1948 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі працавала 5,2 тыс. школ і груп граматы, якія наведвалі 115 тыс. чалавек [4, с.42]. З улікам таго, што ў абласцях, геаграфічна адносячыхся да Заходняй Беларусі (Брэсцкай, Гродненскай і інш.), не наглядалася зніжэнне кантынгента агульнаадукацыйных школ, асаблівая ўвага тут надавалася ўводу новых і рэканструкцыі дзеючых устаноў адукацыі. У пасляваенным дзесяцігоддзі тут была створана вялікая колькасць пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ [4, с. 42].

Заслугай дзяржавы ў адукацыйнай справе на гэтым этапе з'яўляецца сутнаснае вызначэнне нацыянальнага фактару, аператыўнасць падрыхтоўкі падручнікаў, большасць з якіх выдавалася на беларускай мове. На завяршэнні пасляваеннага дзесяцігоддзя выкладанне на беларускай мове вялося прыкладна ў 95% школ рэспублікі. Істотнай хібай у школьнай справе, на якую ўказваюць навукоўцы, была адсутнасць у праграме для выкладання такога важнага для моладзі прадмета як нацыянальная гісторыя. Школьнікі атрымлівалі ўрокі па гісторыі, на якіх ім распавядалі, што Беларусь ніколі не мела сваёй уласнай дзяржаўнасці, а сапраўдная гісторыя Беларусі пачалася толькі з перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

На добрым узроўні вырашалася ў БССР у пасляваенным дзесяцігоддзі праблема аднаўлення і развіцця сярэдняй спецыяльнай школы.

Вялікая патрэба ў кадрах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй патрабавала хуткага аднаўлення навучальных устаноў і вялікіх выдаткаў. Дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі, нягледзячы на цяжкасці, добра справілася з гэтай задачай. Ужо ў першым пасляваенным годзе сярэднія навучальныя ўстановы прынялі 26,2 тыс.чалавек (з іх 22,7 тыс. на стацыянарнае аддзяленне). У 1954/55 навучальным годзе гэтыя паказчыкі склалі адпаведна 54,7 тыс. чалавек (47,6 тыс.). Выпуск спецыялістаў



Рэпазіторый ВГУ

у першай пасляваеннай пяцігодцы склаў 40,3 тыс., у другой (1951–1955 гг.) – 48, 9 тыс. чалавек [6, с. 289, 291].

Выдатным дасягненнем у тых умовах можна назваць справу па аднаўленні і развіцці вышэйшай школы. З першых мірных дзён адбывалася аднаўленне ВНУ. Буйным цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі стала сталіца БССР – г. Мінск. У прыстасаваных будынках пачалі працаваць ужо ў 1944 г. палітэхнічны, медыцынскі інстытуты і інстытут народнай гаспадаркі, Белдзяржуніверсітэт. Высокай папулярнасцю ў моладзі карысталіся Белдзяржуніверсітэт, Беларускі політэхнічны, педагагічны інстытут.

У Віцебску аднавілі сваю работу тры вышэйшыя навучальныя ўстановы. Віцебскі педінстытут пачаў сваю работу 2 кастрычніка 1944 г. у падрыхтаваных для заняткаў памяшканнях па вуліцы Фрунзэ, у будынках № 29, 31 у складзе трох факультэтаў. На вучобу ў ВНУ пасля завяршэння вайны мог практычна паступіць кожны, хто меў сярэднюю адукацыю. Выпускнікоў сярэдняй школы ў Беларусі было менш, чым планавалася прыняць на вучобу студэнтаў. Напрыклад, у 1946 г. у ВНУ прапанавалася прыняць 4,5 тыс. чалавек, а дзесяцігодку (сярэднюю школу) закончылі 1577 чалавек. Восенню ў год перамогі ў аўдыторыі 24 ВНУ прыйшло 12,8 тыс. навучэнцаў. У 1948 г. адкрыўся Беларускі тэатральны інстытут. Колькасць студэнтаў у рэспубліцы ў гэтым годзе дасягнула даваеннай.

На пачатку 1950/51 навучальнага года ў БССР было ўжо 29 ВНУ, у іх навучалася 31,6 тыс. студэнтаў. У 1954 г. прыняў студэнтаў на першы курс Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, у 1955 г. – інстытут замежных моў. Адметнай з’явай ў развіцці вышэйшай школы з’явілася адкрыццё ў1953 г.у Гомелі Беларускага інстытута чыгуначнага транспарту (БІЧТ). Падпарадкоўвалася дадзеная навучальная ўстанова саюзнаму Міністэрству шляхоў зносін. Падрыхтоўка кадраў у БІЧТ вялася для ўсіх саюзных рэспублік.

Паколькі на гэтым этапе развіцця агульнаадукацыйныя школы мелі вострую патрэбу ў настаўніках, з усіх тыпаў вышэйшых навучальных установ большая іх колькасць мела педагагічную накіраванасць. У 1950 г. падрыхтоўку педагагічных кадраў вялі 7 педагагічных і 10 настаўніцкіх інстытутаў (настаўніцкія інстытуты не давалі сваім выпускнікам вышэйшай адукацыі). Пры такім падыходзе праблема падрыхтоўкі кваліфафаных педагогаў у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе вырашалася станоўча, але поўнасцю вырашыць яе не атрымалася. Так, на пачатку 1955/56 навучальнага года з 11375 настаўнікаў 8–10 класаў вышэйшую адукацыю мелі 67,6% , незакончаную вышэйшую – 27,9%, сярэднюю – 4,4%. Горшыя паказчыкі наглядаліся сярод настаўнікаў 5–7 класаў: вышэйшую адукацыю мелі толькі 9,3 % настаўнікаў, працуючых з кантынгентам гэтых класаў, няпоўную вышэйшую 57,6%, сярэднюю –

Репозиторий ВГУ

32,7%. Адукацыйны ўзровень настаўнікаў у сельскіх школах значна саступаў узроўню гарадскіх школ.

Станоўчыя зрухі адбываліся ў развіцці сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў былых раёнах Заходняй Беларусі. У Гродна пачаў працаваць педагагічны інстытут, а ў 1951 г. расчыніліся дзверы і Гродзенскага інстытута сельскай гаспадаркі. У Маладзечна, Баранавічах былі адкрыты настаўніцкія інстытуты, у Брэсце – педагагічны.

У 1954/55 навучальным годзе ў вышэйшай школе БССР налічвалася 47,5 тыс. студэнтаў, што ў 3,4 разы больш , чым у 1945/46 навучальным годзе. Выпуск студэнтаў за гады 4-ай пяцігодкі склаў 14 тыс., а за гады 5-ай пяцігодкі – ўжо 33,5 тыс.

У 1944 г. пачала сваю дзейнасць вядучая навуковая ўстанова – АН БССР. Ішло хуткае аднаўленне дзейнасці ўсіх яе даваенных структурных падраздзяленняў і стварэнне шэрага новых. У 1950 г. у складзе Акадэміі навук функцыянавалі 28 навукова-даследчых устаноў (супраць 8 у 1945г.). У 1951 г. у акадэмічнай навуцы налічвалася 968 супрацоўнікаў , у тым ліку 55 дактароў і 165 кандыдатаў навук. Ішло аднаўленне навуковых аддзяленняў у сістэме вышэйшых навучальных устаноў, ствараліся ведамственыя навукова-даследчыя інстытуты, лабараторыі. Вяліся даследаванні па праблемах, звязаных з асаблівасцямі сацыяльна – эканамічнага і культурнага раазвіцця БССР, а таксама фундаментальнымі праблемамі фізікі, матэматыкі, машынабудавання, біялогіі , электронікі, геахіміі і геаграфіі, біялагічнай хіміі ды іншых навук.

Вялікая ўвага надавалася распрацоўцы гісторыі Кампартыі Беларусі, грамадзянскай гісторыі Беларусі, гісторыі СССР, усіх аспектаў Вялікай Айчыннай вайны, этнаграфіі, археалогіі. У 1955 г. ва ўсіх навуковых установах рэспублікі працавалі 4123 навуковыя супрацоўнікі (супраць 2629 , што меліся ў 1950 г.). Адбыўся даволі значны рост работнікаў з навуковымі ступенямі і званнямі. Колькасць кандыдатаў навук ад 1951 г. да 1955 г. вырасла больш чым на тысячу чалавек (1951 г. – 576; 1955 г. – 1606), дактароў навук у 1955 г. налічвалася 125 чалавек [6, с. 262]. Па колькасці дактароў і кандыдатаў навук БССР у 1955 г. яшчэ адставала ад некаторых саюзных рэспублік. Па гэтаму паказчыку яна займала ў СССР толькі восьмае месца [7, с. 252].

Трэба пагадзіцца з існуючым на сёння меркаваннем гісторыкаў, што пры стварэнні ў краіне дэмакратычных умоў працы, набыткі ў галіне адукацыі і навукі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе маглі быць больш значнымі. Умяшанне партыйнага і савецкага кіраўніцтва ў навуковы працэс, часам не не зусім прадуманае, адмоўна адбівалася на якасці навучання і выніках даследаванняў. Так, спрабуючы павысіць увагу да выкладання прыродазнаўчых і біялагічных дысцыплін, ЦК УКП(б) 20 верасня 1948 г. прыняў пастанову “Аб паляпшэнні выкладання біялагічных навук у школах і педагагічных навуковых установах”. У ёй

Репозиторий ВГУ

вызначаліся меры па прапагандзе вучэння Т. Лысенкі, якія акажуцца заганнымі і нанясуць шкоду народнай гаспадарцы краіны. Т. Лысенка ў процівагу тэорыі Моргана (амерыканскі вучоны), А. Вайсмана і Г. Мендаля (нямецкія біёлагі), якія даказалі , што ў храмасомах жывёл і раслін знаходзіцца спадчыннае рэчыва, якое ўтрымліваецца незалежна ад умоў жыцця і фарміруе развіццё жывога арганізма, лічыў, што не храмасомы, а ўмовы жыцця вызначаюць развіццё біялагічных папуляцый. У Беларусі, як і ўвогуле ў краіне, пачаліся адкрытыя ганенні на вучоных, якія заставаліся на пазіцыях лабараторыі генетыкі, якую узначальваў А. Жэбрак. З пасады акадэміка – сакратара аддзялення біялагічных навук АН БССР быў зняты акадэмік Ц. Годнеў, дэкан біялагічнага факультэта БДУ В. Акімава, загадчык кафедры біялогіі прафесар Б.Вакар. Усяго па гэтай прычыне, на пачатак кастрычніка 1948 г. сваіх пасад пазбавіліся 115 вучоных. У Віцебскім педінстытуте на кафедры біялогіі быў таксама перагледжаны план навуковых прац. Пачалося вывучэнне новай тэмы "Развядзенне дубовага шаўкапрада ва ўмовах БССР". Кафедру біялогіі ўзначаліла кандыдат біялагічных навук А.Зіноўева (падзяляла, як адзначана ў архіўных крыніцах, ідэі Мічурына, Лысенкі) [8, с. 99].

Адчувала на сабе ідэалагічны ўплыў гістарычная навука. Не хапала крытычнага падыходу пры вывучэнні гістарычных з'яў і фактаў. Канстатацыя лічбаў у бок іх павышэння лічылася поспехам, далёкіх вынікаў не заўважалі . Гэта добра бачна пры асвятленні гістарычных падзей першых савецкіх пяцігодак. Часам жаданае прызнавалася за сапраўднае.

Шырокі рэзананс у навуковых кругах БССР атрымала ў 1950 г. дыскусія па пытаннях мовазнаўства, ініцыяваная І.Сталіным. У сваіх артыкулах Сталін зрабіў выснову аб шляхах развіцця сусветнай мовы, якая павінна спалучыць у сабе "элементы нацыянальных і занальных моў". У ВНУ Беларусі пры абмеркаванні сутнасці сталінскіх ідэй была разгорнута дыскусія, падчас якой выказваліся думкі аб закрыцці беларускамоўных школ.

Адбылося ў гэты час абмеркаванне варыянта падручніка па палітэканоміі прадстаўленага эканамістамі. У ім увага ў асноўным была сканцэнтравана на вывучэнні палажэнняў, выкладзеных І.Сталіным у брашуры "Эканамічныя праблемы сацыялізму ў СССР", у якой адсутнічала крытычнае вывучэнне становішча ў эканоміцы і сацыяльнай сферы краіны; дасягненні, атрыманыя за кошт экстэнсіўнага фактару, лічыліся перспектыўнымі. У сувязі з рэкамендацыямі АН СССР тэарэтычныя спасылкі брашуры шырока выкарыстоўваліся ў вышэйшых навучальных і акадэмічных установах.

Не абыйшлося і без грубых адносін і выгнання з працы няўгодных вучоных – гісторыкаў. У 1948 г. сярод гісторыкаў развярнулася дыскусія ў сувязі з абмеркаваннем кнігі Н.Л. Рубінштэйна, "Русская историография". Аўтара крытыкавалі за перавышэнне ролі нямецкіх навукоўцаў у станаўленні рускай гістарычнай думкі. Крытыкі патрабавалі заняцца, перш



Репозиторий ВГУ

за ўсё, паслярэвалюцыйнай гісторыяй. У далейшым менавіта па гэтым напрамку пайшло развіццё савецкай гістарыяграфіі. Такі падыход да навуковай дзейнасці не садзейнічаў яе эфектыўным вынікам , а наносіў непапраўную шкоду.

Такім чынам, вывучэнне пытання аб аднаўленні і развіцці адукацыі і навуковых даследванняў на этапе 1945–1955 гг. дазваляе зрабіць выснову аб тым, што матэрыяльная база і палітычныя ўмовы, у якіх прыходзілася весці адукацыю ў першыя пасляваенныя гады, былі далёка не такія, якія патрабаваліся для развіцця цывілізаванага грамадства. Відавочна, што праблемы адраджэння агульнаадукацыйнай сярэдняй і вышэйшай школы, развіццё навукі, выхаванне людзей праз афіцыйную ідэалогію, канешне, вырашыліся б значна якасней, каб на гэтыя сацыяльныя сегменты не адбывалася ідэалагічнага ўціску. Што тычыцца матэрыяльна –тэхнічнай базы адукацыі і навукі, трэба улічваць час – дзяржава на гэтым этапе не мела сродкаў, каб стварыць яе ў кароткія тэрміны на ўзроўні перадавых краін.

***2. Становішча ў галіне мастацкай культуры***. Адраджэнне культурнага жыцця ў пасляваенны час таксама праходзіла ў складаных умовах. Паслаблены ў гады вайны адміністрацыйны ўціск і рэпрэсіўны падыход да іншадумцаў зноў стаў вядучым метадам ва ўстанаўленні парадку. Наступіў перыяд апагею культу асобы І.Сталіна.Усе сродкі прапаганды стварылі воблік І.Сталіна як адзінага нязменнага лідара дзяржавы. Сталін і яго паплечнік А.Жданаў санкцыяніравалі прыняцце ў жніўні 1946 г. пастановы ЦК УКП(б) “Аб часопісах “Звязда”і “Ленінград”. У пастанове моцнай крытыцы падверглісся рэдакцыі часопісаў за тое, што друкавалі творы паэтэсы Г. Ахматавай і пісьменніка М. Зошчанкі. Аўтараў абвінавацілі ў песімізме і дэкадэнцтве (ад франц. Decadent–упадачны), “гнілой безыдэйнасці, вульгарнасці і апалітычнасці”. Такі ж разгром у 1948 г. паследаваў у галіне кіно і музычнай культуры. Заганнымі ў ідэйна – палітычным плане, слабымі ў мастацкіх адносінах названы кінафільмы “Вялікае жыццё”, “Іван Грозны”, “Адмірал Нахімаў”, опера Мурадэлі “Вялікая дружба” [9, с. 222–227].

У Беларусі ў шэраг безыдэйных і ідэалагічна шкодных для народа папалі рэдакцыі часопіса “Полымя”, газеты “Савецкая Беларуссія” і “Звязда”. Іх аўтары абвінавачваліся ў касмапалітызме і нізкапаклонстве перад Захадам.

Супраць нацыянальнай інтэлігенцыі, той яе часткі, якая, на думку ўлад, не забяспечвала ідэалагічнай чысціні,былі праведзены рэпрэсіі. Рэпрэсіі зведалі на сабе кампазітар А. Туранкоў, міністр асветы П. Саевіч і іншыя прадстаўнікі ўсіх пластоў беларускага грамадства. У 1946 г. па прапанове палітычных цэнзараў былі зняты з выдання 18 літаратурных твораў. Сярод іх аповесць Я. Брыля “Маленства”, апавяданні І. Гурскага “Домік з верандай” і “Сымоніха”, вершы М.Танка “Дружба”і “Восень”.

У пастанове ЦК УКП(б) “Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі (студзень 1947 г.) адзначалася, што “адсутнасць прынцыповай бальшавіцкай крытыкі” і “замоўчванне памылак творчасці пісьменнікаў прывялі да з’яўлення безыдэйных твораў (п’еса Крапівы “Мілы чалавек”) і памылковых (п’еса Кучара “Заложнікі”), якія няправільна адлюстроўваюць савецкую рэчаіснасць і барацьбу беларускіх партызан”. Такое заключэнне стала падставай для арыштаў па другім разе С. Шушкевіча, Р. Бярозкіна, С. Грахоўскага, Б. Мікуліча, А. Пальчэўскага.

У 1949 г. у Краснаярскі край быў сасланы вядомы паэт і празаік У.М. Дубоўка. Тады ж і такой жа самай меры пакарання падвергся пісьменнік А.І. Александровіч. Вядомы вучоны-гісторык М.М. Улашчык у 1951 г. быў асуджаны на 8 гадоў турмы. Па палітычных матывах быў арыштаваны і міністр асветы Беларусі П.В. Саевіч, які абвінавачваўся ў нацыяналізме, контррэвалюцыйнай дзейнасці , шпіянажы. Прычына рэпрэсіі супраць Саевіча заключалася ў тым, што ён адмовіўся быць галоўным рэдактарам кнігі, прысвечанай партызанскаму руху ў Беларусі , падрыхтаванай супрацоўнікамі МДБ БССР, якую міністр дзяржаўнай бяспекі БССР Л. Цанава выдаў як сваю працу. Ваенны трыбунал войск МДБ 28 лістапада 1951г. асудзіў П.Саевіча да 25 гадоў папраўча – працоўных лагераў і 5 гадоў пазбаўлення правоў [10, с. 144]. Усяго за час сталінскай дыктатуры рэпрэсіям падвергліся 238 літаратараў Беларусі, з іх толькі каля 20 засталіся ў жывых.

Палітычнае кіраўніцтва краіны кантралявала склад выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, якасць іх выкладання ў свеце фарміравання светапогляду студэнцкай моладзі. У 1949 г. пасля вывучэння аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК УКП(б) гэтага пытання ў беларускіх педагагічных вузах было адзначана крайне нездавальняючае становішча ў складзе педагогаў. На 1 кастрычніка 1949г. з 610 выкладчыкаў шасці педагагічных і 10 настаўніцкіх інстытутаў толькі 93 (15%) мелі вучоныя ступені і званні, з іх прафесараў і дактароў навук – 9 (1,4%), дацэнтаў і кандыдатаў – 84 чалавекі (13,6%).

І ўсё ж бязвыхаднасці ў час пераходу да мірнага жыцця ў галіне культуры, як падаюць гэта сёння асобныя аўтары, не наглядалася. Пасля завяршэння вайны пачалі выходзіць газеты і часопісы, аднавіў дзейнасць Саюз пісьменнікаў Беларусі. Паэты, празаікі, драматургі, мастакі стварылі цэлы шэраг прац аб гераічнай барацьбе народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, аб мірным жыцці і працы простых людзей і кіраўнікоў дзяржавы. Ужо ў 1945 г. выйшлі ў свет кнігі Э. Агняцвет “Край мой родны”, П. Броўкі “Выбраныя творы”, В. Вольскага ”Цудоўная дудка”, П. Панчанкі “Далёкія станцыі” і інш. Плённа працаваў ў гэты час Я. Колас. У 1946 г. ён закончыў паэму “Адплата”, а праз год –“Рыбакову хату” , за якую атрымаў Дзяржпрэмію СССР. У 1954 г. ён завяршыў трэцюю кнігу палескіх аповесцей “На ростанях”.



Репозиторий ВГУ

Большасць беларускіх пісьменнікаў у пасляваенны час звярталася да героікі вайны. К. Чорны, І Шамякін, М. Лынькоў, І. Мележ, Я. Брыль, К. Крапіва, А. Куляшоў, А. Вялюгін, М. Аўрамчык стварылі працы, дзе паказваюцца падзеі, што адбываліся ў тыле ворага, штодзённыя клопаты і нягоды ўдзельнікаў вайны, адзінства мэт і дзеянняў салдат і партызан. З болем пішуць яны пра непамерныя страты і з радасцю – пра шчасце заваяванага міру, адраджэнне гарадоў і вёсак. Безумоўна, што ў асобных творах, з сённяшняга пункта гледжання, прысутнічалі павярхоўнасць, апісальна-адлюстрацыйнае асвятленне ўчынкаў, схематызм, славаслоўе, панаванне сацрэалізму. Аднак, уважлівае іх прачытанне дае магчымасць заўважыць, што тут захоўваецца і вялікая каштоўнасць гуманізму, разумнага сэнсу і прыстойнасці. На творах, напісаных у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі, дзе распавядаецца гісторыя, культура і побыт , працоўныя заслугі простых людзей, іх імкненне жыць у міры і згодзе, выхоўвалася цэлае пакаленне людзей Беларусі.

Значнай фігурай ў пісьменніцкім асяродку быў М. Танк – пісьменнік, жыццё якога праходзіла да 1939 г. на заходніх землях Беларусі. Першае пасляваеннае дзесяцігодзе было адным з самых плённых у яго літаратурнай дзейнасці. У разглядаемым перыядзе былі выдадзены яго кнігі паэзіі “Вастрыце зброю”, “Праз вогненны небасхіл” (1945), ”Выбраныя вершы” (1947), “Каб ведалі” ( за яе ў 1948 ён атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР), “На камні, жалезе і золаце” (1951), “Выбраныя творы” (1952, 1954). У іх закранаюцца самыя розныя бакі жыцця беларусаў.

Як бачна , беларускія пісьменнікі пакінулі адметны след ва ўсіх жанрах літаратуры, раскрылі тут самыя разнастайныя праблемы гістарычнага мінулага і бягучага часу свайго краю.

Хутка адраджалася пасля заканчэння вайны тэатральнае мастацтва. Вярнулі сабе даваенную славу тэатральныя калектывы Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я.Купалы і Беларускага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

Найлепшых узораў нацыянальнага песеннага мастацтва дабіўся пад кіраўніцтвам музыказнаўца і дырыжора Г. Цітовіча, заснаваны ў 1952 г. Дзяржаўны народны хор БССР. У 1955 г. хор прадстаўляў беларускае нацыянальнае мастацтва ў Маскве і Варшаве.

Нязменна ўзбагачаўся рэпертуар Беларускага ансамбля песні і пляскі, якім кіраваў выдатны харавы дырыжор Р. Шырма.

Зроблены практычныя крокі ў гэтыя гады па аднаўленні і развіцці беларускага кінамастацтва. У 1946 г. кінастудыя “Савецкая Беларусь” перайменоўваецца ў “Беларусьфільм”. У 1947 г. кінастудыя выпусціла свой першы пасляваенны фільм “Новы дом”. Затым была даволі сур’ёзная ўдача: у 1949 г. паводле сцэнарыя А. Маўзона быў зняты фільм “Канстанцін Заслонаў”.



Рэпазіторый ВДУ

Узбагацілі культуру Беларусі мастакі і скульптары. Плённа працавалі над тэмай , звязанай з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, Я. Зайцаў, В. Волкаў і В. Цвірка. У майстэрні З.Азгура выконваліся партрэты партыйных і дзяржаўных дзеячаў, пісьменнікаў і паэтаў. Тое ж самае было характэрна для прац скульптараў А. Бембеля, А. Глебава.

Ствараліся ў гэты час музеі. Найбольшая ўдзельная вага прыходзілася на краязнаўчыя і мемарыяльныя музеі. За дзесяць гадоў колькасць музеяў у БССР вырасла больш чым у 3 разы: 1945 г. налічвалася 8 музеяў, у 1955 г. – 27.

Расла з кожным пасляваенным годам сетка культурна – асветніцкіх установ. За перыяд з канца 1945 г. па гэты ж час 1955 г. колькасць клубаў вырасла з 2703 да 5420. З іх 5031 клуб дзейнічаў у сельскай мясцовасці. Асобныя клубныя калектывы мастацкай самадзейнасці мала ў чым саступалі прафесійным.

Як бачна, нягледзячы на цяжкасці, памылкі, няўдачы, ва ўмовах ідэалагічнага ўціску ў рэспубліцы за пасляваеннае дзесяцігоддзе нямала зроблена па падняцці культурнага ўзроўню і развіцці нацыянальнай свядомасці працоўных.

**Спасылкі**

1. НАРБ. – Ф. 4-п. – Оп. 51. –Д. 2.

2.ГАВО. – Ф. 160. – Оп. 3. –Д. 1.

3. Развитие народного хозяйства Белорусской ССР за 20 лет (1944–1963). – Минск, 1964.

4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. –728 с.; іл.

5. Саевіч, П. Народная асвета БССР за 30 год / П. Саевіч. Мінск, 1948.

6. Народное хозяйство Белорусской ССР: стат. сб. –Минск, 1957.

7. Культурное строительство СССР: стат. сб. – М., 1956.

8. НАРБ. –Ф. 4. – Оп. 81. – Д. 94 .

9. КПСС о культуре , просвещении и науке. – М., 1956.

10. Нарысы Гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 2. / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і інш. – Мінск, 1995.

## ТЭМА 5. **Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 50-х – сярэдзіне 60-х гг.**

*1. Тэндэнцыі эканамічнага развіцця прамысловасці рэспублікі ва ўмовах навукова – тэхнічнай рэвалюцыі.*

*2. Сельская гаспадарка, спроба пераламіць негатыўнае становішча.*

***1. Тэндэнцыі эканамічнага развіцця прамысловасці рэспублікі ва ўмовах навукова – тэхнічнай рэвалюцыі.*** У 1956 г. пачынаецца новая шостая савецкая пяцігодка. У БССР яна, як і папярэднія, прадугледжвала паскоранае развіццё машынабудаўнічай , энергетычнай, будаўнічай,



Репозиторий ВГУ

а таксама лёгкай, лясной, харчовай прамысловасці, укараненне ў прамысловасць і транспарт найноўшых дасягненняў навукі , тэхнікі і передавога вопыту, ажыццяўленне мадэрнізацыі абсталявання. Пад уплывам "адлігі", што наступіла пасля 1953 г., выкананне дзяржаўных заданняў на пачатку пяцігодкі ішло паспяхова. Вынікі 1956г. абнадзейвалі: прырост прамысловай прадукцыі склаў у рэспубліцы 12%. У наступны год кіраўніцтва СССР патрабавала яшчэ болей ажывіць вытворчую дзейнасць і вырашыць шэраг праблем навукова – тэхнічнага прагрэса. Трэба было кіравацца рашэннямі ліпеньскага (1955 г.) Пленума ЦК КПСС. Рашэнне партыйнага сходу прадугледжвала рэзкае падняцце тэмпаў НТП ва ўсіх галінах прамысловасці за кошт электрыфікацыі, комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў. Таксама патрабавалася, як запісана ў рэзалюцыі Пленума, укараненне навейшых высокапрадукцыйных станкоў, машын, апаратаў, пастаяннага ўдасканальвання тэхналогіі вытворчасці, прымяненне атамнай энергіі ў мірных мэтах. Тут жа справядліва ўказвалася на тое, што ў міністэрствах і ведамствах, на прадпрыемствах шмат лішніх упраўленцаў і раўназначных звеньяў. Стары гаспадарчы механізм і экстэнсіўны шлях развіцця прывёў краіну да сур'ёзных супярэчнасцей, патрабуецца перабудова ў кіраванні прамысловым і будаўнічым комплексам, адыход ад празмернай цэнтралізацыі.

Пасля ўказанняў з цэнтра з лютага 1957г. адбываецца перабудова кіравання шляхам пераносу кіраўніцтва прадпрыемствамі на месцы. Быў зроблены пераход ад галіновага да тэрытарыяльнага прынцыпу кіравання. У гэтай сувязі скасаваны шэраг міністэрстваў і ведамстваў, створаны Савет народнай гаспадаркі (СНГ). Пасля гэтай перабудовы ў СССР дзейнічала 105 саўнаргасаў. Беларускія прамысловыя і будаўнічыя прадпрыемствы складалі адзіны эканамічны раён. Тут скарачаецца 9 міністэрстваў, ствараецца асобны орган кіраваня – Савет народнай гаспадаркі – падпаракаваны Савету міністраў БССР. Саўнаргасу было падпарадкавана 835 найбольш буйных прадпрыемстваў саюзнага і рэспубліканскага значэння (34,5% ад агульнай колькасці), астатнія засталіся ў загадванні абласных і раённых выканаўчых камітэтаў [1, с. 3, 6, 24].

На першых парах перабудова дала магчымасць паглыбіць спецыялізацыю , больш поўна выкарыстаць мясцовыя рэсурсы. За 1956–1958 гг. у Беларусі быў уведзены ў эксплуатацыю шэраг новых заводаў і цэхаў. Прадпрыемствы сталі выпускаць каля 300 новых тыпаў станкоў, машын, прыбораў. Да канца 1958 г. была падрыхтавана да пуску першая чарга самай магутнай у той час электрастанцыі рэспублікі – Васілевіцкай ДРЭС. Прыярытэтнай галіной прамысловасці рэспублікі ў гэты час (з 1958 г.) становіцца хімічная прамысловасць.

У наступным перыядзе перабудова ў кіраванні прамысловым комплексам была прызнана неабгрунтаванай. Пасля яе ўкаранення адбыўся разрыў гаспадарчых сувязей і адносін паміж рэгіёнамі і галінамі адзінай

саюзнай эканамічнай прасторы. Адмоўныя вынікі такой рэканструкцыі былі заўважаны ў паскарэнні НТП. Узніклі цяжкасці ў правядзенні адзінай тэхнічнай палітыкі. Новыя структуры аказаліся не здольнымі забяспечыць прагрэс у навуковай сферы. Таму пачалі ўзнаўляцца галіновыя камітэты, а ў 196 г. галіновае кіраванне прамысловасцю зноў вярнулася ў практыку. Былі створаны галіновыя саюзна – рэспубліканскія і рэспубліканскія міністэрствы.

У 1958 г. у працэсе выканананняў задач, намечаных на шостую пяцігодку, з'явілася шмат новых момантаў, якія не былі ўлічаны пры першапачатковай распрацоўцы і прыняцці плана. Перш за ўсё ў плане не знайшла адлюстравання неабходнасць прыярытэтнага стварэння прадпрыемстваў нафтавай і газавай галіны, не была ўлічана неабходнасць у паскораным будаўніцтве жылля, умацаванні матэрыяльна – тэхнічнай базы калгасна – саўгаснай гаспадаркі. У сувязі з гэтым было вырашана аб'яднаць два апошнія гады шостай пяцігодкі (1959–1960) з наступнай, сёмай і распрацаваць сямігадовы план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959–1965 гг. Згодна з прынятым планам валавая прадукцыя прамысловасці краіны ў 1965 г. павінна была ўзрасці на 80%, а сельскай гаспадаркі – на 70%.

Беларусь за перыяд сямігодкі павінна была стаць рэспублікай вялікай хіміі. На базе Старобінскага радовішча калійных і каменных солей быў створаны Беларускі калійны камбінат. Ён вырабляў 40% патрэб СССР у калійных солях. У 1963 г. пачала дзейнічаць першая чарга Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, наладзіў выпуск прадукцыі Гродзенскі азотна – тукавы камбінат, у 1965 г. –Лідскі лакафарбавы завод.

З 1956 г. па 1965 г. у рэспубліцы былі пабудаваны прадпрыемствы-гіганты: Белаўтазавод (Жодзіна), Мінскі маторны завод, Полацкі завод "Шкловалакно", завод аўтаматычных ліній (Мінск), Брэсцкі дывановы камбінат і іншыя.

Прыярытэтам ў развіцці прамысловасці БССР ў гэы час стала нарошчванне вытворчасці электраэнергіі. У эксплуатацыю былі ўведзены Бярозаўская ДРЭС (1961), Наваполацкая ЦЭЦ (1963). Асноўныя электрастанцыі былі пераведзены на газавае і нафтавае паліва. Адбываецца адкрыццё Рэчыцкага нафтарадовішча і арганізацыя на яго базе ў 1965 г. першага рэспубліканскага нафтапромыслу. У паліўным балансе рэспублікі адбылося рэзкае павелічэнне нафтапрадуктаў і прыроднага газу. Іх удзельная вага ў 1965 г. склала да 34,6% (у 1958 г. гэты паказчык вызначаўся ў 4,2%). **У 1962 г. у асноўным было завершана стварэнне адзінай беларускай энергетычнай сістэмы.** Пачынаецца будаўніцтва Лукомльскай ДРЭС. Вынікі ў выпрацоўцы электраэнергі і яе спажыванні ў прамысловасці аказаліся пераканаўчымі: у 1965 г. у параўнанні з 1958 г. выпрацоўка электраэнергіі ўзрасла ў 3,1 разы (план быў 2,6 раз),

спажыванне – у 4 разы. Пакладзены у гэты час пачатак газафікацыі кватэр у сельскай мясцовасці.

Асаблівасцю прамысловага развіцця рэспублікі ў перыяд сямігодкі стала паскоранае ўвядзенне прадпрыемстваў, якія адносяцца да неметалаёмкіх галін машынабудавання і металаапрацоўкі: апаратабудавання, электронікі, радыёэлектронікі, аўтаматычных ліній. Электроніка Беларусі спецыялізавалася на выпуску паўправадніковых прылад інтэгральных схем, рэзістараў, тэхналагічнага абсталявання для іх вырабу. Гэтая прадукцыя выкарыстоўвалася ў вытворчасці сродкаў тэле-і радыёвяшчання, сродкаў аўтаматызацыі і сістэм кіравання, у тым ліку ў ваенных ведамствах.

Першым прадпрыемствам электроннай прамысловасці БССР з’явіўся Віцебскі завод радыёдэталей, створаны ў 1957 г. Большая частка яго прадукцыі накіроўвалася на выраб прыбораў для ваеннай тэхнікі. Заказы ваенна–прамысловага комплексу (ВПК) выконвалі Мінскі завод электронных вылічальных машын, пабудаваны ў канцы 50-х гг., Мінскі радыёзавод, завод “Прамсувязь” і іншыя прадпрыемствы. Да сярэдзіны 60-х гг. вытворчасць ваеннай прадукцыі засвоена на іншых беларускіх прадпрыемствах. Да яе выпуску прыступілі Аршанскі і Маладзечанскі прыборабудаўнічыя заводы. З 1957 г. па 1962 г. наменклатура вырабаў ваеннай тэхнікі вырасла амаль у 6 разоў. У далейшым ваенныя заказы размяшчаліся на іншых дзеючых прамысловых прадпрыемствах рэспублікі.

З развіццём прамысловага комплексу і здавальняючай на гэтым этапе дэмаграфіі ўзнікла неабходнасць у бесперабойным забеспячэнні перамяшчэння прадукцыі і насельніцтва. У гэтых умовах узрастала роль транспарту, і ў першую чаргу чыгуначнага. На Беларускай чыгунцы былі праведзены работы па пракладцы новых ліній асноўнага і пад’язднога шляху, пабудаваны 45 – кіламетровы ўчастак Слуцк – Салігорск, Чашнікі – Лукомль. Першы цягнік у Салігорск прыбыў 2 ліпеня 1959 г., грузы для будаўніцтва Лукомальскай ДРЭС былі дастаўлены цягніком па ўведзенай чыгуначнай ветцы ў азначаны пункт 26 лістапада 1965 г.

У пачатку 1961 г. разгарнуліся работы па электрыфікацыі пасажырскага прыгараднага руху ад Мінска да станцыі Аляхновічы. 7 снежня 1961 г. машыніст Г. Галкін правёў першы цягнік па 48 – кіламетроваму шляху за 52 мінуты, што было на паўгадзіны хутчэй, чым тады, калі цягай быў паравоз. У 1965 г. даваенны ўзровень перавозак грузаў і пасажыраў чыгункай быў павялічаны ў 2,6 раза.

Аб'ём перавозак аўтамабільным транспартам у 1965 г. узрос у параўнанні з 1940 г. у 65 разоў. У гэты час у Беларусі налічвалася 2700 аўтобусных маршрутаў даўжынёй 125 тыс. км. У 1960 г. на лініі гарадоў Мінск, Гомель выйшлі тралейбусы. Былі зрухі ў лепшы бок у працы прадпрыемстваў воднага і паветранага транспарту. За гады сямігодкі перавозкі пасажыраў паветраным транспартам павялічыліся ў 7 разоў.

Репозиторий ВГУ

Толькі за адзін 1965 г. з Мінскага аэрапорта было адпраўлена 300 тыс. пасажыраў. На водным транспарце ціхаходныя пасажырскія судны замяшчаліся суднамі на падводных крылах.

У 1970 г. у эксплуатацыю быў здадзены новы для Беларусі від транспарту – магістральны газаправод Дашава – Мінск. Са снежня 1964 г. Полацкі нафтаперапрацоўчы завод стаў атрымліваць нафту з нафтаправода "Дружба" па ветцы Унеча – Полацк.

Важнай старонкай тагачаснага жыцця з'яўлялася распаўсюджанне пачынанняў і ініцыятыў перадавікоў і наватараў вытворчасці. У працоўных калектывах спаборнічалі за эканомію сыравіны і матэрыялаў, павышэнне прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту прадукцыі, за званне лепшага ў прафесіі. У канцы 50-х – пачатку 60-х гг. сярод работнікаў вытворчасці Беларусі набыў вядомасць вопыт Герояў Сацыялістычнай Працы растачніка мінскага завода аўтаматычных ліній А. Віташкевіча і шліфоўшчыка падшыпнікавага завода Ф. Аляксіевіча. Яны адмовіліся ад паслуг наладчыкаў і перайшлі на самаабслугоўванне і дробны рамонт сваіх станкоў. Да 1965 г. іх пачын падтрымалі больш за 14 тыс. рабочых рэспублікі, што дазволіла адказацца ад паслуг звыш 600 слесараў і наладчыкаў, атрымаць 580 тыс. руб. эканамічнага эфекту.

З кастрычніка 1958 г. па ініцыятыве моладзі дэпо Масква – Сарціровачная ў краіне разгарнуўся рух пад лозунгам "Вучыцца працаваць і жыць па-камуністычнаму". За права быць удастоеным ганаровага звання "Ударнік камуністычнай працы" змагаліся рабочыя і служачыя, за права называцца "Калектывам камуністычнай працы" – прадпрыемствы і іх структурныя падраздзяленні. Да пачатку 1962 г.у прамысловасці рэспублікі за гэта званне спаборнічалі каля 30 тыс. цэхаў, змен, брыгад, дзе працавалі каля 400 тыс. чалавек. На Віцебшчыне аднымі з першых падтрымалі гэты рух калектывы Віцебскага аддзялення, Аршанскага чыгуначнага вузла Беларускай чыгункі і прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці і станкабудавання. У 1959 г. у ліку першых званне «Калектыў камуністычнай працы» было прысвоена вагоннаму дэпо Віцебск і станцыі Глыбокае [2, с. 325]. У 1960 г. за поспехі ў вытворчасці, актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці, вялікую працу па сцвярджэнні камуністычнай маральнасці і побыту такое званне было прысвоена калектыву Віцебскага дыванoвага камбіната. Адбываўся бесперапынны рост удзельнікаў гэтага руху. Так, у 1965 г. вага ўдзельнікаў спаборніцтва ў Беларусі дасягнула 75–80% агульнай колькасці рабочых і служачых. За гады сямігодкі званне ўдарнікаў камуністычнай працы ў Беларусі прысвоена больш як 200 тыс. чалавек, 200 прадпрыемстваў атрымалі званне калектываў камуністычнай працы [3, с. 361].

У Віцебскай вобласці гэтыя паказчыкі былі таксама маштабнымі: у спаборніцтве ўдзельнічалі 8095 брыгад, 337 прадпрыемстваў, звыш 156 тысяч працоўных і служачых [4, с. 86].



Репозиторий ВГУ

Аналіз прынятых працаўнікамі рэспублікі ў гэтыя гады абавязацельстваў сведчыць, што ўдзельнікі спаборніцтва ставілі перад сабой рэальныя і дасягальныя задачы: павышаць прадукцыйнасць працы, сваю адукацыю і культуру, дапамагаць адсталым, змагацца з парушальнікамі вытворчай дысцыпліны і г.д. Напрыклад, на дывановым камбінаце пасля аб'явы аб уступленні ў спаборніцтва за званне прадпрыемства камуністычнай працы была праведзена мадэрнізацыя і ўдасканаленне дзеючага абсталявання. Укараненне гэтай і іншых форм спаборніцтва станоўча адбілася на павелічэнні выпуску прадукцыі, дазволіла ўжо ў 1962 г. дасягнуць узроўню вытворчасці, які быў запланаваны на заканчэнне 1965 г. Прадукцыя камбіната дзясяткі разоў экспанавалася на сусветных выставах і атрымлівала высокую адзнаку.

Пошук эфектыўных метадаў і асэнсаваныя паводзіны кіраўніцтва рэспублікі ў тых умовах не заўсёды супадалі з пазіцыяй вышэйшага партыйнага кіраўніцтва СССР, але, як аказвалася, давалі станоўчы эфект. Тым не менш, як адзначаюць гісторыкі, што таксама мае і сваё практычнае падцвярджэнне, у рабоце прамысловасці і іншых галінах народнай гаспадаркі БССР наглядаліся сур’ёзныя недахопы. Хваляванне выклікала тое, што да гэтага часу (сярэдзіна 60-х гг.) замарудзіліся тэмпы росту прадукцыйнасці працы, высокімі аказваліся затраты на выпуск адзінкі прадукцыі. Асобныя прадпрыемствы рэспублікі не спраўляліся з заданнем сямігодкі па выпуску валавой прадукцыі і асартыменту, па росту вытворчасці працы, зніжэнні сабекошту, паляпшэнні якасці прадукцыі.

Нягледзячы на тое, што з 1956 г. па 1965 г. у СССР адбылося, па сутнасці , двайное павелічэнне колькасці вучоных, дасягненні навукі і тэхнікі ў належнай меры не выкарыстоўваліся. Эканоміка краіны да сярэдзіны 60-х гг. не змагла выйсці на шлях эфектыўнага развіцця. Не адпавядалі патрабаванням часу і іншыя вынікі працы, з дапамогай якіх можна было падняцца на ўзровень развітых капіталістычных краін. Да таго ж, у гэты час сацыялізм у спаборніцтве дзвюх сістэм стаў губляць свае перавагі, і выйграць спаборніцтва, ідучы такім шляхам, у капіталістычных краін, аб чым было заяўлена кіраўніком дзяржавы (М.С. Хрушчоў), станавілася вялікай праблемай.

У працах вядучых айчынных навукоўцаў (Л. Абалкін, А. Аганбегян, Т. Заслаўская і інш.) было сказана аб тым, што СССР істотна адстае ад Захаду ў галіне навукі, тэхнікі і найноўшых тэхналогій. У першую чаргу, як разумелі навукоўцы – эканамісты, неабходна было ажыццявіць глыбокія сацыяльна-эканамічныя рэформы, паслабіць бюракратычныя метады ў кіраванні вытворчасцю і стварыць умовы. якія б адкрылі магчымасці для распрацоўкі і своечасовага укаранення ў вытворчасць дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. **Паўстала ва ўвесь рост задача забеспячэння кардынальнага павароту эканомікі на інтэнсіўны шлях развіцця.**



Рэпазіторый ВДУ

Вераснёўскі (1965 г.) Пленум ЦК КПСС (у той час першым сакратаром ЦК КПСС быў выбраны Л.І. Брэжнеў, старшынёй Савета Міністраў СССР стаў А.М. Касыгін) разгледзіў пытанне “Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці”. У змесце пастановы было прызнана, што эканоміка краіны не адпавядае патрабаванням часу. Вырашана развіваць дэмакратычныя пачаткі ў арганізацыі эканамічнага жыцця, укараняць новыя формы і метады ў сістэму кіравання прамысловасцю і стымулявання вытворчасці. Прынятая на Пленуме пастанова прадугледжвала ўвядзенне ў дзеянне дзяржразліковых і таварна-грашовых механізмаў, скарачэнне шэрагу паказчыкаў кантролю за дзейнасцю прадпрыемстваў. Было прызнана, што галоўным паказчыкам у дзейнасці прадпрыемстваў павінна быць атрыманне імі прыбытку [5, с. 77].

На аснове дадзенай пастановы ва ўсіх рэспубліках былі распрацаваны праграмы дэцэнтралізацыі кіравання, увядзення ў дзеянне дзяржразліковых і таварна-грашовых механізмаў. У БССР да выканання партыйнага рашэння аднесліся з высокай адказнасцю. Змест праграмы, ход укаранення, прамежкавыя і канчатковыя яе вынікі ў Беларусі будуць высвятляцца ў раздзеле ВМК, прысвечанага наступнаму перыяду.

***2. Сельская гаспадарка, спроба пераламіць негатыўнае становішча.*** Як ужо было заўважана вышэй, на фоне поспехаў у развіцці прамысловасці ў першым пасляваенным дзесяцігоддзі асабліва цяжкім заставалася становішча ў сельскай гаспадарцы. Прыкметнае адставанне гэтай галіны было звязана з папярэдняй недальнабачнай дзяржаўнай палітыкай. Прымусовая калектывізацыя ў заходніх абласцях, слабая забяспечанасць тэхнікай, падатковы цяжар, невысокая эфектыўнасць працы калгаснікаў, недахоп спецыялістаў – усё гэта з’яўлялася тормазам у развіцці сельскай гаспадаркі і прычынай даволі нізкага матэрыяльнага становішча сельскіх жыхароў. Улады вымушаны былі звярнуць увагу на гэтую галіну гаспадаркі. Робіцца спроба каб пераламіць такое становішча. На вераснёўскім (1953 г.) Пленуме ЦК КПСС упершыню былі вызначаны дзейсныя меры па эканамічным умацаванні сельскагаспадарчай вытворчасці, пашырэнні самастойнасці калгасаў і саўгасаў, павялічэнні матэрыяльнай зацікаўленасці сялян. Згодна з распрацаванымі мерамі саюзны ўрад “спісаў” усю запазычанасць калгасаў і калгаснікаў за папярэднія гады, прыкладна ў 2,5 разы быў зніжаны грашовы падатак з калгаснікаў, рэзка павялічаны закупачныя цэны на мяса, малако, масла, бульбу і агародніну, значна паніжаны нормы абавязковых паставак дзяржаве прадуктаў жывёлагадоўлі, бульбы і агародніны як калгасамі, так і асабістымі гаспадаркамі калгаснікаў. На работу ў калгасы і саўгасы было накіравана 20 тыс. гараджан. У БССР за 1953-54 гг. было накіравана

Рэпазіторый ВДУ

прыкладна 6 тыс. аграномаў, тэхнікаў і іншых спецыялістаў. Аказала дапамогу БССР у кадрах Ленінградская вобласць. Вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя ўстановы гэтай вобласці РСФСР накіравалі ў БССР больш за 200 інжынераў і тэхнікаў.

Згодна з патрабаваннямі часу да снежня 1955 г. з Віцебска, Полоцка, Оршы ў сельскія раёны вобласці было паслана 2500 чалавек, з іх 1076 спецыялістаў сельскай гаспадаркі, у якасці старшынь калгасаў – 807 чалавек, 304 –у партыйны і савецкі апарат [6, с. 16].

Важнае значэнне ў павышэнні эфектыўнасці працы сялянства мела рашэнне, якое было прынята ў сакавіку 1955 г. аб наданні калектыўным гаспадаркам права планавання сваёй вытворчасці, структуры і памеру пасеваў , колькасці жывёлы і мерапрыемстваў па павялічэнні яе прадукцыйнасці на аснове планаў таварнай прадукцыі [7, с. 494–496].

З 1958 г. кааператыўна –калгасная ўласнасць упершыню была пастаўлена ў адзін шэраг з агульнанароднай, закладзены пачатак наладжванню калгаснай вытворчасці ў адпаведнасці з інфраструктурай вёскі. Дзяржава здзейсніла шэраг мер па зніжэнні цэн на прамысловую прадукцыю, што спажывалася калгасамі і саўгасамі, прадастаўленні ільготнай пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і на разлікі з МТС, асваенні забалочаных зямель.

Згодна з прынятай 21 лютага 1957 г. ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР пастановай "Аб мерах па ўздыму сельскай гаспадаркі Беларускай ССР", палову выдаткаў на асушэнне забалочаных зямель у Беларусі дзяржава прыняла на сябе, да таго ж калгасы на тры гады вызваляліся ад абавязковых паставак прадукцыі з плошчы асушаных і засвоеных зямель.

Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база сельскай гаспадаркі. У 1956 г. магутнасць трактарнага парка ў калгасах рэспублікі ўзрасла (у параўнанні з 1950 г.) больш чым у 2 разы, колькасць камбайнаў павялічылася ў 5,5 раза. Назіраліся прыклады творчых адносін калгаснікаў да працы. Да такіх гаспадарак належыў калгас "Рассвет" Магілёўскай вобласці (старшыня К.П. Арлоўскі). Пад кіраўніцтвам Героя Савецкага Саюза Арлоўскага ў калгасе склаўся добры маральны і працоўны клімат, гаспадарка з кожным годам набірала сілу [8, с. 337]. Заўважаліся таксама станоўчыя зрухі ў развіцці іншых калектыўных гаспадарак. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі рэспублікі ў1958 г., у параўнанні з 1953 г. склала больш за 200%. Невыпадкова эканамісты прызналі гэтыя вынікі найбольш паспяховымі ў гісторыі савецкай вёскі.

Станоўчыя зрухі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці меліся на Віцебшчыне. У 1954 г. тут таксама намеціўся пералом. Былі пашыраны пасяўныя плошчы, тэрмінова выкананы план хлебанарыхтовак і закупкі бульбы. Творча адносіліся да выканання сваіх абавязкаў, дабіваліся высокіх паказчыкаў на вытворчасці брыгадзір трактарнай брыгады калгаса "XVIII партз'езда" Талачынскага раёна Барадаўка Іван Міхайлавіч, даярка саўгаса

Рэпазіторый ВГУ

“Рэканструктар” гэтага ж раёна Галубцова Вольга Сямёнаўна, звеннявая по вырошчванні ільну калгаса “XVIII партз’езда” Кароткая Валенціна Пракоф’еўна. У 1958 г. праца гэтых людзей была заслужана адзначана прысуджэннем ім высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Вялікі ўплыў на развіццё аграрнага сектара аказвалі машынна – трактарныя станцыі (МТС). У пачатку 1958 г. у БССР дзейнічалі 343 МТС, яны мелі 33820 трактароў (у пераліку на 15-моцныя), значную колькасць іншых сельскагаспадарчых машын. Аднак, да гэтага часу іх работа не стала задавальняць інтарэсы дзяржавы і аграрыяў. Склаліся абставіны, калі кадры МТС не забяспечвалі высокапрадукцыйнай працы калгасаў. Паказчыкам іх працы быў не канчатковы вынік, які ацэньваецца ростам вытворчасці прадукцыі, а аб’ёмамі апрацаваных плошчаў. Таму ў сакавіку 195 г. сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла закон аб далейшым развіцці калгаснага ладу і рэарганізацыі машынна – трактарных станцый, згодна з якім тэхніка МТС перадавалася калгасам за плату. У БССР продаж тэхнікі калгасам быў ажыццёўлены практычна ў год прыняцця закона. Да 1960 г. МТС тут перасталі існаваць. Частка іх была рэарганізавана ў рамонтна – тэхнічныя станцыі (РТС). У пачатку 1965 г. 55% калгасаў і 80% саўгасаў мелі рамонтныя майстэрні. Жыццё пацвердзіла мэтазгоднасць такога кроку. Гэтым актам было скасована своеасаблівае 30-гадовае “двоеўладдзе”, калгасы сталі гаспадарамі ўсіх сродкаў вытворчасці, і ў той жа час, як адзначаюць асобныя гісторыкі, вялікія расходы калгасаў на набыццё адпрацаваўшай свой рэсурс тэхнікі па неапраўдана завышаных цэнах і ўкладанне фінансавых сродкаў у яе рамонт і тэхнічнае абслугоўванне адмоўна адбілася на канчатковых выніках гаспадарчай дзейнасці. Перадача машынна – трактарнай тэхнікі, іншыя захады дзяржавы садзейнічалі ўзрастанню энергаўзброенасці сельскай гаспадаркі. Так, спажыванне электраэнергіі ў аграрным сектары рэспублікі з 1958 г. да 1964 г. павялічылася ў 4 разы. У 1965 г. на палетках працавала 43 тыс. аўтамабіляў, 55 тыс. трактароў, 13,5 тыс. камбайнаў.

У рэспубліцы была арганізавана падрыхтоўка кадраў для аграпрамысловага комплексу. Яна вялася з улікам патрэб і ў вялікай колькасці: толькі за адзін 1965 г. з вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў было выпушчана 7350 спецыялістаў сельскагаспадарчай накіраванасці. Аднак такія чарговыя новаўвядзенні дзяржавы як ліквідацыя “неперспектыўных” вёсак, скарачэнне прысядзібнай асабістай гаспадаркі (1956 г.), перабудова кіравання аграрным сектарам шляхам стварэння вытворча – тэрытарыяльных калгасна – саўгасных упраўленняў, падзелу абласных партарганізацый на прамысловыя і сельскія (1962 г.) прывялі да запавольвання росту сельскагаспадарчай прадукцыі. Негатыўную ролю адыграў даволі імклівы перавод калгасна – кааператыўнай уласнасці ў дзяржаўную. Саўгасы, згодна з новай трэцяй праграмай партыі, павінны былі стаць вядучымі сацыялістычнымі



Рэпазіторый ВГУ

прадпрыемствамі на вёсцы [9, с. 137]. Працэс пераводу калгасаў у саўгасы суправаджаўся пераходам сялян у статус рабочых, але і такія захады не садзейнічалі працоўнаму пад’ёму і павелічэнню рэнтабельнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. У рэспубліцы адбывалася пастаяннае пашырэнне пасяўных плошчаў, але павелічэнне ўраджайнасці ў раслінаводстве адбывалася марудна: з 1960 г. да 1965 г. ураджайнасць зерневых вырасла з 8,6 ц да 11,3 ц з га, бульбы адпаведна – са 104 ц да 121 ц, ільна –валакна –з 3,1 да 4,1 ц. Нестабільнасць у вытвочасці зерня назіралася не толькі ў БССР, але і ў іншых рэспубліках СССР. Неабходна было набываць яго ў значных памерах у замежжы.

У 1954 г. лютаўска-сакавіцкі Пленум ЦК КПСС указаў на даступную і хуткую крыніцу павелічэння вытворчасці зерня праз засваенне цалінных і абложных зямель. Выкананне рашэнняў Пленума ажыццяўлялася за кошт усіх рэспублік. З Беларусі па прызыву камсамола 35 тыс. маладых людзей выехалі на асваенне казахстанскіх стэпаў. Яны стварылі там новыя гаспадаркі, папоўнілі цалінныя калгасы і саўгасы рабочай сілай. Праца людзей прыносіла свае вынікі. На новых землях рэзка ўзрасла вытворчасць зерня. Калі ў 1949–1953-х гг. там вырошчвалася ў сярэднім за год 22,7 млн т і нарыхтоўвалася 9, 9 млн т хлеба, то за 1954–1958 –я гг. зборы дасягнулі 45, 2 млн т у год. У 1957 г. было ўзарана – 36 млн га новых зямельных плошчаў. Цалінныя калгасы і саўгасы сталі асноўнымі пастаўшчыкамі пшаніцы, у тым ліку і ў БССР. У 1958 г. дзяржаўныя закупкі зерневых культур складалі 56,6 млн т. Па афіцыйных дадзеных, ужо ў 1954–1961 гг. за кошт таварнага зерня з засвоеных цалінных і абложных зямель Казахстана і РСФСР дзяржава пакрыла ўсе ўкладанні ў сельскую гаспадарку гэтых раёнаў і атрымала чыстага даходу звыш 3,3 млрд руб. (у цэнах тых гадоў) [10, с. 459].

З 1954 г., згодна з ідэяй М. Хрушчова, многія калгасы Беларусі сталі ўкараняць пасевы кукурузы на сілас. У 1954 г. тут было засеяна 48,5 тыс. га кукурузы, у 1955 г. – 320 тыс. га. Пад кукурузу адводзіліся лепшыя пахатныя землі, але яе ўраджайнасць заставалася нізкай. З гэтай прычыны дабіцца значнага прыросту кармавой базы для жывёлагадоўлі не ўдалося, чакаемых зрухаў у лепшы бок у сельскай гаспадарцы СССР да сярэдзіны 60-х гг. не адбылося. Пасля 1959 г.і ў БССР тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі , што назіраліся ў 1954–1958 гг., панізіліся. Ураджайнасць сельскагаспадарчых культур і прадукцыйнасць жывёлы заставаліся нізкімі, сабекошт прадукцыі – высокім. Асабліва няўдала складвалася становішча ў жывёлагадоўлі. Мала дапамагло тут і шэфства камсамола. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак і птушкі з 1959 г. па 1964 г. рэзка скарацілася, знізіліся і надоі малака. Тэмпы росту сельскагаспадарчай прадукцы былі невысокімі, насельніцтва расло колькасна хутчэй, чым прадукцыя сельскай гаспадаркі. У 1959–1965 гг. прадукцыя сельскай гаспадаркі павінна была вырасці на 70%, рост за 6 год склаў толькі 10%,

а ўдоі малака за 1959-1964 гг. знізіліся на 370 кг. У сувязі з гэтым, у сакавіку 1965 г. на павестку дня будзе зноў пастаўлена пытання аб паляпшэнні работы аграрнага сектара. Якім чынам рашэнні сакавіцкага і верасnёўскага (1965 г.) пленумаў адаб'юцца на эканамічных паказчыках сельскай гаспадаркі СССР і БССР , убачым праз разгляд гэтай праблемы ў наступных раздзелах.


**Спасылкі**

1. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 96. –Д. 2687.

2. Витебское отделение Белорусской железной дороги: этапы развития: исторический очерк 1886–2001 / гл. ред. П.С. Пахолкин. – Витебск, 2001. – 541 с.

3. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969). Минск: Беларусь, 1970. – 476 с.

4. ГАВО. – Ф. 2800. – Оп. 3. – Д. 6.

5. Постановление Пленума ЦК КПСС (1965 г.) "Об улучшении руководства промышленностью, совершенствования планирования и усиления экономического стимулирования промышленного производства" // КПСС в резалюциях и решениях съездов, конференций, пленумов ЦК. – М., 1972. – Т. 8.

6. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 151. – Д. 2.

7. КПСС в резалюциях и решениях съездов, конференций, пленумов ЦК. – М., 1972. – Т. 8.

8. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 2. – Д. 323.

9. КПСС в резалюцыях и решениях... т. 10.

10. Шумилов, М.И. История России: конец XIX – начало XXI века: учеб. пособие / М.И. Шумилов, М.М. Шумилов. – 2-е изд., испр. и доп. – Ростов н/Д: Феникс, 2005. – 637 с.


## ТЭМА 6. **Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 60-х – сярэдзіне 70-х гг.**

*1. Развіццё прамысловага комплексу з улікам новых падыходаў да эканомікі ў 1966–1970-я гг.*

*2. Прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, сувязь на этапе 1971–1975-х гг.*

***1. Развіцце прамысловага комплексу з улікам новых падыходаў да эканомікі ў 1966–1970-х гг.*** Да сярэдзіны 1960-х гадоў БССР, як адна з саюзных рэспублік СССР, валодала магутным эканамічным і навукова-тэхнічным патэнцыялам. Да гэтага часу ў асноўным было завершана стварэнне адзінай Беларускай энергасістэмы, паскорана развівалася станкабудаванне, прыборабудаванне, электроніка, радыёэлектроніка, вытворчасць аўтаматычных ліній. Прыярытэтнае развіццё атрымаў ваенна-прамысловы комплекс. Важныя змены адбыліся ў паліўнай галіне, быў пакладзены пачатак вялікай хіміі. Рэспубліка мела высокую канцэнтрацыю і выразную спецыялізацыю, вялікую долю прадпрыемстваў, арыентаваных

на экспарт (зборачны цэх Савецкага Саюза). Тут партыйнае кіраўніцтва, эліта грамадства, як у цэнтры так і на месцах, і да гэтага часу знаходзіліся ў пастаянным пошуку механізму вываду эканомікі з цяжкасцей, вырашэнні супярэчнасцей. З 1957 г. Кампартыю Беларусі ўзначальваў вопытны і таленавіты кіраўнік К.Т. Мазураў, які ў складаных умовах таго часу праяўляў самастойнасць, адстойваў інтарэсы рэспублікі. Уменне выдзяляць галоўнае, дзейнічаць нестандартна – такі настрой, ініцыяваны з Мінска, даходзіў да кіраўнікоў абласных і ніжэйшых структурных падраздзяленняў рэспублікі. Але, нягледзячы на значны прагрэсіўны рух у эканоміцы і сацыяльнай палітыцы рэспублікі , як адзначалася ў папярэдняй лекцыі, таксама назіраліся хібы, што замінялі паскоранаму развіццю.

Кіраўніцтва БССР (у 1965г. на пасаду першага сакратара ЦК КПБ быў выбраны П.М. Машэраў) разумела, дзе знаходзяцца супярэчнасці і было падрыхтавана да іх вырашэння на аснове прапанаваных вераснёўскім Пленумам (1965 г.) падыходаў**.** Гэтую падрыхтаванасць і захады, якія прывялі да істотных зменаў у наступны час, выразна праявіліся ў выніках працы беларускага народа ў гады 8-ай пяцігодкі.

Пасля вераснёўскага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС, які прапанаваў шляхі ўдасканалення кіравання прамысловасцю (яны ўжо вядомы з папярэдняга раздзела), пераход на эканамічныя метады стаў асноўным і найважнейшым напрамкам у дзейнасці партыйных і савецкіх арганізацый рэспублікі. У БССР да гэтага часу была цалкам адноўлена ранейшая сістэма прамысловых міністэрстваў і камітэтаў. З 1966 г. прадпрыемствы прамысловасці БССР прыступілі да рэалізацыі намечанага ў пяцігадовым плане курсу на ўкараненне інтэнсіўных метадаў у развіцці гаспадаркі. Асноўны сэнс пры гэтым зводзіўся да неабходнасці дамагчыся павышэння навуковага ўзроўню ў планаванні, удасканаленні вытворчых і грамадскіх адносін, пашырэння ініцыятывы і гаспадарчай самастойнасці прадпрыемстваў, больш поўнага задавальненне патрэбаў насельніцтва на высакаякасныя тавары і паслугі.

Пераход на новую сістэму ажыццяўляўся паступова, з улікам падрыхтаванасці прадпрыемстваў да яе ўкаранення. З дапамогай навукоўцаў і выкладчыкаў эканамічных дысцыплін вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на ўсіх прадпрыемствах былі прапанаваны мерапрыемствы, якія дазвалялі забяспечыць укараненне новых метадаў гаспадарання і стымулявання вытворчасці. На буйных прадпрыемствах рэспублікі былі створаны лабараторыі тэхніка-эканамічнага аналізу, арганізавана вучоба кадраў**.**

Першым у Беларусі з 1 студзеня 1966г. на новыя механізмы планавання і эканамічнага стымулявання перайшоў Гомельскі шклозавод, з другога квартала таго ж года – яшчэ 8 прадпрыемстваў. На Мінскім тонкасуконным камбінаце, у самым пачатку ўкаранення эканамічнай рэформы , усе аддзелы прадпрыемства ўкамплектаваны спецыялістамі, у



Репозиторий ВГУ

кароткія тэрміны механізаваны працаёмкія працэсы, уведзена 14 паточных ліній, што дазволіла працоўнаму калектыву выйсці па ўзроўню тэхнічнай аснашчанасці ў гэтай пяцігодцы ў лік першых сярод тэкстыльных прадпрыемстваў СССР.

Павелічэнне матэрыяльных стымулаў у час укаранення рэформы мела становучы ўплыў на рост вытворчай актыўнасці работнікаў прадпрыемстваў рэспублікі. Гэты час быў адзначаны з'яўленнем мноства каштоўных грамадскіх ініцыятыў і рухаў, накіраваных на пераадоленне цяжкасцей у развіцці эканомікі. Разгарнулася спаборніцтва за эканомнае расходаванне матэрыялаў і сыравіны, ад перадавікоў вытворчасці паступалі шматлікія прапановы па адкрыцці асабовых рахункаў працоўных укладаў, датэрміновым выкананні дзяржаўных планаў і асабістых абавязкаў. Прыкладам высокай актыўнасці пры ўкараненні рыначных адносін з’яўляўся працоўны калектыў Мінскага трактарнага завода, які ў 1970 г. налічваў 28 тыс. рабочых. У дзейнасці партыйных і грамадскіх арганізацый завода яскраваназіраўся накірунак на разгортванне вытворчай дэмакратыі і развіццё актыўнасці працоўных**.** Арганізацыя спаборніцтва на заводе вызначалася сапраўднай галоснасцю і сістэмай матэрыяльнай зацікаўленасці ў высокапрадукцыйнай працы. За гады восьмай пяцігодкі прадукцыйнасць працы тут вырасла ў 1,5 раза. У 1970 г. калектыў завода выпусціў звыш 80 тыс. трактараў, за восьмую пяцігодку – 400 тыс., што склала шостую частку вытворчасці трактароў у СССР. Новыя мадэлі трактароў МТЗ-50 і МТЗ -52 першымі ў краіне атрымалі дзяржаўны “Знак якасці [1, с. 15]. Праца парткама і адміністрацыі завода па развіцці вытворчай і грамадска-палітычнай актыўнасці была адобрана сакратарыятам ЦК КПСС. У той жа час, як адзначана ў пастанове сакратарыята ЦК КПСС, на заводзе меліся істотныя недахопы, якія заміналі эфектыўнаму гаспадаранню: за 1966–1970 гг. страты прадпрыемства ад забракаванай прадукцыі і невытворчых расходаў склалі амаль 8,3 млн руб. [2, с. 1–11].

У Віцебскай вобласці пытанне аб мерах па ўкараненні новых гаспадарчых механізмаў было разгледжана 27 студзеня 1966 г. на XV абласной партыйнай канферэнцыі. Матэрыялы канферэнцыі арыентавалі працоўныя калектывы на неабходнасць прымянення эфектыўных формаў гаспадарання, адмаўлення ад валавых паказчыкаў. Усім прадпрыемствам і арганізацыям рэкамендавалася, як і прадпісвалася ў пастановах ЦК КПСС і Урада СССР, праяўляць самастойнасць і ініцыятыву, зрабіць асноўным паказчыкам эфектыўнасці працы аб'ём рэалізаванай прадукцыі – гэта значыць, збыт і прыбытак [3, с. 202–204].

Арыентуючыся на дакументы цэнтральных і мясцовых структур кіравання аб рэфарміраванні эканомікі , працоўныя калектывы сталі прымяняць іх на практыцы. На Віцебскім дывановым камбінаце, калектыў якога быў у ліку першых па засваенні новых умоў гаспадарання, пайшлі па



Рэпазіторый ВДУ

шляху складання комплекснай праграмы тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемства. У падрыхтоўцы і ажыццяўленні праграмы прымалі ўдзел усе інжынерна-тэхнічныя і эканамічныя службы, перадавікі вытворчасці. Добра спраўлялася са сваімі абавязкамі, створаная на чале з галоўным інжынерам М.Я. Барадуліным, камісія па ўкараненні рэформы, якая каардынавала дзеянні ўсіх службаў камбіната. У кароткія тэрміны на камбінаце было праведзена абнаўленне асноўных фондаў прадпрыемства, набыта і ўстаноўлена больш прадуктыўнае абсталяванне. Павышэнне тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, прафесійны рост працоўных, ІТР і служачых прывёў да паляпшэння якасці выпускаемых вырабаў, своечасовай іх рэалізацыі. Прыбытак прадпрыемства за 1966 г. тут склаў 7 млн рублёў. Для таго часу гэта былі значныя фінансавыя сродкі, якія ішлі на мадэрнізацыю вытворчасці, павелічэнне заработнай платы і развіццё сацыяльных структур камбіната. Узрасла актыўнасць работнікаў, ішло замацаванне шэфства перадавікоў вытворчасці над маладымі рабочымі. На працягу ўсіх гадоў восьмай пяцігодкі калектыў прадпрыемства з'яўляўся лепшым у сваёй галіне. Тут больш, чым на аналагічных прадпрыемствах іншых рэгіёнаў велізарнай краіны, здымалі прадукцыі з адзінкі абсталявання. Больш за 99% вырабаў на камбінаце выпускалася першым гатункам. Вопыт працы калектыву камбіната па зніжэнні сабекошту і выпуску якаснай прадукцыі абагульняўся ва ўсесаюзным маштабе. Адзначана, што высокія паказчыкі тут дасягнуты за кошт укаранення перадавога вопыту непасрэдна на працоўных месцах [4, с. 13]. На Аршанскім і Віцебскім млынкамбінатах, Варапаеўскім камбікормавым заводзе, якія першымі перайшлі на новыя ўмовы планавання і эканамічнага стымулявання, былі прапанаваны мерапрыемствы па укараненні навуковай арганізацыі працы і павышэнні рэнтабельнасці. Паскоранымі тэмпамі тут праводзілася мадэрнізацыя вытворчых працэсаў, стваралiся спрыяльныя ўмовы для высокапрадукцыйнай працы.

З мэтай дэбюракратызацыі кіравання прамысловым комплексам, што было прадугледжана ўмовамі рэформы, у БССР, як і ў іншых рэгіёнах Саюза ССР, адбываецца стварэнне новай формы арганізацыі вытворчага працэсу – вытворчых аб’яднанняў, працуючых па дзяржразліку. Да 1970 г.у БССР было створана 28 вытворчых аб’яднанняў. Яны выраблялі 10–12% усёй прамысловай прадукцыі рэспублікі. Са стварэннем вытворчых аб’яднанняў павысіўся узровень канцэнтрацыі, адбылося паглыбленне спецыялізацыі вытворчасці і больш рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна – тэхнічных рэсурсаў. Станоўча гэта адбілася і на ўкараненні ў вытворчасць навуковых распрацовак. У Мінску аднымі з першых распачалі дзейнасць аб’яднанні: “Прагрэс”, імя Н.К.Крупскай, “Камсамолка”. Салігорскія калійныя камбінаты стварылі аб’яднанне “Беларуськалій”. Стварэнне вытворчых аб’яднанняў і новыя падыходы да эканамічнага і сацыяльнага развіцця дазволілі прадпрыемствам рэспублікі



Репозиторий ВГУ

дабіцца ўжо на першым этапе станоўчых вынікаў у гаспадаранні. Асабліва відавочна такая накіраванасць адзначаналася на прадпрыемствах электраэнергетыкі, машынабудаўнічай, нафтахімічнай і лёгкай прамысловасці, чыгуначным транспарце.

Дэбюракратызацыя эканамічнага жыцця ў перыяд гэтай пяцігодкі прывяла да ажыўлення на прамысловых прадпрыемствах тэхнічнага прагрэсу, адкрыла магчымасці для ўкаранення ў вытворчасць сучасных машын, механізмаў і тэхналагічных працэсаў. За гады восьмай пяцігодкі у рэспубліцы больш чым на 2 тыс. вырасла колькасць устаноўленых паточных і аўтаматызаваных ліній, у два разы – комплексна – механізаваных і аўтаматызаваных участкаў і цэхаў. Значна павялічылася колькасць мадэрнізаванага вытворчага абсталявання: калі ў 1965 г. яго налічвалася 3980 адзінак, то ў 1970 г. – 6851, ці ў 1,7 раза больш. За гэты час у БССР было створана 16 вылічальных цэнтраў, уведзена ў дзеянне 12 аўтаматызаваных сістэм кіравання вытворчасцю і тэхналагічнымі працэсамі. У 1970 г. у БССР налічвалася каля 200 машынавылічальных станцый і вылічальных цэнтраў, абсталяваных тэхнічнымі сродкамі [5, с. 248]. Актыўна працавалі па ўкараненні НТП у вытворчасць прамысловыя прадпрыемствы Віцебскай вобласці. Толькі за 1968–1970 гг. тут па розных напрамках НТП былі ажыццеўлены 360 планавых мерапрыемстваў, у тым ліку 109 з іх тычыліся перадавых тэхналогій, 85 – механізацыі і 62 – аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў. У цэлым за гады восьмай пяцігодкі ў вытворчасць ўведзена 184 паточныя, механізаваныя і аўтаматызаваныя лініі, устаноўлена звыш 10 тыс. адзінак новага і мадэрнізавана 6 тыс. адзінак дзеючага вытворчага абсталявання, створана больш за 240 новых відаў станкоў, машын, установак, матэрыялаў. На прадлрыемствах укаранено 62 тыс. рацыяналізатарскіх прапаноў з умоўна гадавой эканоміяй звыш 46 млн рублёў [6, с. 177]. Велізарныя змены ў тэхнічным пераўзбраенні ў гады ўкаранення эканамічнай рэформы адбыліся на горадаўтваральным для Оршы прадпрыемстве – ільнокамбінаце. За 5 гадоў тут былі ўстаноўлены 608 адзінак найноўшага і мадэрнізавана, 2 тысячы дзеючага абсталявання [7, с. 2]. Пашырэнне гаспадарчай самастойнасці працоўных калектываў, што назіралася ў сапраўднасці, стала стымуляваць ініцыятывы, накіраваныя на дасягненне высокіх паказчыкаў эфектыўнасці працы. Актыўнасць рабочага класа выражалася ў розных формах спаборніцтва. Пачатак руху за комплексную эканомію сыравіны, матэрыялаў і стварэнне фонду эканоміі на Віцебшчыне пакладзены закройшчыцай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», членам КПСС А.А. Голубковай. Прыклад Голубковай меў шматлікіх паслядоўнікаў: на Віцебскай мэблевай фабрыцы, дывановым камбінаце, іншых прадпрыемствах вобласці прымаліся калектыўныя і асабістыя павышаныя абавязацельствы, ход выканання якіх асвятляўся ў насценных газетах, на Дошках паказчыкаў, вітрынах. Эфектыўнасць прапановы

Голубковай праявілася ўжо на старце пяцігодкі. Пры падвядзенні вынікаў аказалася, што толькі за два месяцы 1966 г. на прамысловых прадпрыемствах Віцебска ад яе ўкаранення быў атрыманы эканамічны эфект у суме звыш мільёна руб. [8, с. 75]. Укараненне эканамічных метадаў гаспадарання на прадпрыемствах Віцебскай вобласці ішло настолькі паспяхова, што ўжо ў лістападзе 1966 г. гэта было адзначана ў ЦК КП Беларусі [9, с. 177]. Тады ж у Віцебску была праведзена рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, з разглядам выкарыстоўваемых тут эканамічных падыходаў, якія вывелі вобласць на перадавыя пазіцыі ў краіне.

Паслядоўна вялася ў гэтыя гады праца па ўкараненні прагрэсіўных формаў у кіраванні будаўнічым комплексам. За 1966–1970-я гг. капіталаўкладанні ў прамысловасць БССР выраслі супраць папярэдняй пяцігодкі амаль у 2 разы, а фінансаванне ў будаўнічую галіну – у 2,6 раза. Будаўнікі Віцебскай вобласці на стварэнне і мадэрнізацыю ўласных вытворчых фондаў выдаткавалі за гэты перыяд велізарную для таго часу суму -10 млн рублёў. У вобласці стабілізаваўся кадравы склад будаўнічых арганізацый. Цякучка (колькасць прынятых і звольненых за год людзей) сярод будаўнікоў знізілася на працягу трох апошніх гадоў восьмай пяцігодкі на 7,4%. Прадукцыйнасць працы пры плане 18% вырасла на 20% [10, с. 18–19]. У Наваполацку сярод будаўнікоў горада ў гэты час склаўся рацыянальны рух за якасную і тэрміновую здачу ўзводзімых аб'ектаў. У аснову гэтай працы быў пакладзены вопыт будаўнічага трэста № 16 «Нафтабуд» па распрацоўцы і ўкараненні сеткавага планавання і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы за кошт атрыманага прыбытку. Дадзенае пачынанне мела найважнейшае значэнне для ўсёй будаўнічай галіны рэспублікі, але асабліва важным яно было для маладога горада, дзе разгарнулася маштабнае будаўніцтва. Лепшым людзям горада прысвойвалася званне «Ганаровы будаўнік Наваполацка». Першымі гэтага звання ў 1967 г. дабіліся восем рабочых і ІТР. Сярод іх начальнік будаўнічага ўпраўлення № 121 А.А. Кітараў, брыгадзір мантажнікаў М.Ф. Гайдаў, маляр Т.І. Гугалінская. Пераход на новыя ўмовы гаспадарання, пашыраная самастойнасць прадпрыемстваў разняволілі ініцыятыву іх кіраўнікоў. У дырэктароў, начальнікаў цэхаў і майстроў участкаў з'явілася зацікаўленасць ва ўдасканаленні вытворчасці, у выпуску прадпрыемствам найбольш важнай для краіны прамысловай прадукцыі і неабходных для насельніцтва прадметаў спажывання. У выніку ўзраслі магчымасці выхаду на рэнтабельную працу прадпрыемстваў, якія раней знаходзіліся ў спісе адстаючых. Так, Аршанскі завод лёгкага машынабудавання ў 1967 г. перамясціўся з адстаючых у лік перадавых у сваёй галіне. Аб'ём вытворчасці і збыт прадукцыі за тры апошнія гады пяцігодкі тут павялічыліся амаль у 2 разы. На аршанскім заводзе "Чырвоны змагар" разгарнулася спаборніцтва пад дэвізам "Кожны працоўны – грамадскі кантралёр", "Кожную аперацыю – на выдатна".

Рэпазіторый ВДУ

У выніку здача прадукцыі з першага прад'яўлення на заводзе склала 98,5%, а калі ў мэтах стымулявання выпуску высакаякаснай прадукцыі з 1967 г. у краіне была ўведзена дзяржаўная атэстацыя прадукцыі з прысваеннем Знака якасці, першым у СССР такім Знакам быў адзначаны сабраны тут станок асабліва высокай дакладнасці мадэлі 3711 [11, с. 12].

Высокія паказчыкі росту прамысловай вытворчасці і маштабнае будаўніцтва, што назіралася ў рэспубліцы, запатрабавалі прапарцыянальнага развіцця транспартнай сістэмы, тэхнічнага пераўзбраення вытворчасці і сацыяльнага развіцця яе калектываў. Вядучае месца ў перавозцы грузаў і пасажыраў адводзілася чыгуначнаму транспарту. Прадпрыемствы чыгуначнага транспарту рэспублікі, абапіраючыся на вытворчую актыўнасць працоўных, паспяхова спраўляліся з узрослымі задачамі. Беларуская чыгунка, якая была сярод чыгунак СССР, як бы палігонам для апрабавання ўсяго новага, у 8-ай пяцігодцы амаль поўнасцю перайшла на перавозкі грузаў і пасажыраў цеплавозамі і электравозамі, перавага надавалася толькі вялікагрузным саставам. Цалкам была электрыфікавана асноўная чыгуначная лінія Беларусі Брэст – Масква. Высокі эканамічны эфект для чыгуначнага транспарту СССР дала, распрацаваная групай энтузіястаў Беларускай чыгункі, сістэма дастаўкі грузаў, якая атрымала назву «маршрутызацыя». Адпраўленне грузаў па прапанаванай беларускімі чыгуначнікамі сістэме ўжывалася на ўсёй чыгуначнай сетцы СССР [12, с. 19]. Ужо на пачатку лістапада 1970 г. чыгуначнікі Беларусі выканалі пяцігадовыя планы па ўсіх паказчыках. Адпраўленне грузаў за гэты час узрасло больш чым на 60%, грузаабарот – на 35, а аб'ём пасажырскіх перавозак – на 52%. Прычым, шэраг аддзяленняў, у тым ліку і Віцебскае, а таксама Аршанскі вузел (Аршанскі чыгуначны вузел па вытворчай рабоце ставіўся да Мінскага аддзялення) увесь аб'ём прыросту перавозак атрымалі за кошт росту прадукцыйнасці працы.

Эканамісты называюць 8-ую пяцігодку (час укаранення рэформы) "залатой". Сапраўды, па ўсіх сацыяльна-эканамічных паказчыках перыяд 1966–1970-х гг. быў лепшым за апошнія 30 гадоў. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці БССР узрасла на 39%. Павысіўся тэхнічны ўзровень прадпрыемстваў, на іх былі абсталяваны паточныя і аўтаматычныя лініі, больш стала комплексна-механізаваных вытворчасцей, участкаў і цэхаў.

За 1966–70-я гг. у Беларусі было ўведзена 50 буйных прадпрыемстваў. Рэспубліка датэрмінова выканала пяцігадовы план па ўсіх асноўных паказчыках. Аб'ём вытворчасці павялічыўся прыкладна на 80% ( замест 70% планавых). БССР у гэтыя гады выйшла на віднае месца ў агульнасаюзным падзеле працы. У 1970 г. на прадпрыемствах рэспублікі выраблялася звыш 11% мінеральных угнаенняў, у тым ліку 48,7% калійных, 17,5% трактараў, 15,1% падшыпнікаў, 21,8% матацыклаў, 10,4% льняных тканін, 9,5% тэлевізараў.



Рэпазіторый ВДУ

Сур'ёзна вырас у гэтай пяцігодцы эканамічны патэнцыял Віцебшчыны. У народную гаспадарку вобласці было ўкладзена больш за 1,5 млрд руб., што амаль у 2 разы больш, чым за папярэднія пяць гадоў. Пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю Наваполацкі хімкамбінат, дзве ўстаноўкі па першаснай перапрацоўцы нафты на нафтаперапрацоўчым заводзе магутнасцю 12 млн тон у год, У лік дзеючых уступілі першыя тры агрэгаты Лукомльскай ДРЭС, шэраг буйных прадпрыемстваў электроннай прамысловасці і будіндустрыі [13, с. 33, 62, 63]. У 1967 г. вытворчая і сацыяльная актыўнасць працоўных вобласці знайшла дзяржаўнае прызнанне. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Віцебская вобласць была адзначана самай высокай дзяржаўнай узнагародай – Ордэнам Леніна [14, с. 1].

У 1970 г. у асноўным быў завершан пераход прамысловасці БССР на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання. Колькасць такіх прадпрыемстваў з 1966 г. па 1971 г. павялічылася з 40 да 1559 (амаль у 39 разоў). Удзельная вага такіх прадпрыемстваў займала 83% ад іх агульнай колькасці. Тут працавала 95% прамыслова – вытворчага персаналу. Аб’ём вытворчасці складаў 96%. Прадпрыемствы, што працавалі па новай сістэме, давалі рэспубліцы 98% прыбытку [15, с. 42].

На Віцебшчыне за гэты час на новую сістэму гаспадарання перайшлі ўсе прадпрыемствы прамысловасці, сувязі, транспарту, будаўніцтва. На іх долю прыпадала 98% агульнага аб'ёму прадукцыі, прыбытак за пяцігодку вырас удвая. Сярэднегадавыя тэмпы росту аб'ёмаў вытворчасці за час укаранення рэформы склалі 12,2%, аб'ём вытворчасці вырас за пяцігодку на 78%, вытворчасць працы – на 43%. Гэтыя паказчыкі былі вышэй, чым у БССР і ў краіне ў цэлым [16, с. 14]. У перыяд завяршэння пяцігодкі на Віцебшчыне выпускалася 16,5% прадукцыі БССР. У тым ліку, 100% прадукцыі нафтаперапрацоўкі, 98% шаўковых тканін, 78% панчошна-трыкатажных вырабаў, 78% дываноў і дывановых вырабаў, 43% металаапрацоўчых станкоў [17, с. 18–19].

Падводзячы вынік ўкаранення эканамічнай рэформы на прадпрыемствах Беларусі ў 1966–1970-х гг., не станем браць пад сумненне замацаваўшуюся ў навуковай літаратуры выснову аб тым, што яна не раскрыла ў поўнай меры магчымасці для самастойнай і ініцыятыўнай дзейнасці працоўных калектываў. Але адначасова адзначым: перыяд 8-й пяцігодкі па ўсіх сацыяльна-эканамічных паказчыках у БССР, як і ў краіне ў цэлым, быў лепшым за апошнія 30 гадоў. Рэформа, якая атрымала назву “эканамічная рэформ Касыгіна”, аказала пазітыўнае ўздзеянне на эканоміку краіны. Яна развязала ініцыятыву калектываў, стымулявала развіццё вытворчых аб'яднанняў, унутры якіх на больш высокім узроўні вырашаліся пытанні тэхнічнага пераўзбраення, удасканалення арганізацыі працы, сацыяльныя праблемы. Адбылася стабілізацыя працоўных калектываў, прыкметна ўзрасла вытворчая і грамадская актыўнасць

Рэпазіторый ВДУ

работнікаў усіх галін. Павялічыўся (кратна) прыбытак прадпрыемстваў, што дазволіла ім фармаваць фонды развіцця вытворчасці, матэрыяльнага заахвочвання работнікаў, сацыяльна-культурных мерапрыемстваў і жыллёвага будаўніцтва. Перыяд 8-ай пяцігодкі варта разглядаць як лепшы перыяд савецкай гісторыі.

***2. Прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, сувязь на этапе 1971–1975 гг.*** У папярэднім пытанні было адзначана, што гаспадарчая рэформа 1965 г. надала пэўны і відавочны імпульс эканамічнаму развіццю рэспублікі. У значнай ступені дзякуючы рэфармаванню ў структуры прамысловасці БССР адбыліся прыкметныя змены. Была створана хімічная індустрыя, выраслі новыя гарады , якія сталі цэнтрамі хімічнай, энергетычнай, нафтахімічнай, машынабудаўнічай прамысловасці. Вырасла канцэнтрацыя вытворчасці, узмацнілася спецыялізацыя, палепшыліся найважнейшыя эканамічныя паказчыкі.

Фактары, што садзейнічалі ўздыму эфектыўнасці ў 8-й пяцігодцы, як бы па інерцыі, дзейнічалі і ў першай палове 70-х гг. Важныя падзеі ў гэты час адбыліся ў горадзе беларускіх хімікаў – Наваполацке. У 1972 г. тут была пушчана другая чарга на хімічным камбінаце па вытворчасці нітрылу акрылавай кіслаты, і на яго аснове пачаўся выраб нітрону. У 1974 г. засвоена вытворчасць алефінаў-устаноўка ЭП-60 і ўстаноўка “Палімір-50” па вырабе поліэтылену. У 1974 г. на нафтаперапрацоўчым заводзе на працоўны рэжым выведзены ўстаноўкі сукцынімідных прысадак. Завод забяспечваў пастаўкі прадукцыі не толькі Полацкаму хімкамбінату, але і Магілёўскаму камбінату сінтэтычнага валакна, Гродзенскаму хімічнаму камбінату і іншым прадпрыемствам краіны.

У 1972 г.быў пабудаваны Беларускі шынны камбінат у Бабруйску. У нафтахімічнай галіне ў БССР уведзены і выдавалі неабходную прадукцыю Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў, Полацкі завод “Шкловалакно”, Гродзенскі завод сінтэтычных валокнаў. У 1971 г. на Магілёўскім аўтамабільным заводзе (МаАЗ) упершыню ў СССР пачалася серыйная вытворчасць самазвальнага аўтапоезда для падземных работ. У 1974 г. было створана Мінскае вытворчае аб’яднанне вылічальнай тэхнікі, а таксама шэраг прадпрыемстваў аптычнага прыборабудавання.

Высокія паказчыкі меліся ў будаўнічым комплексе БССР**.** У 1975 г. у БССР налічвалася 760 падрадных будаўнічых і мантажных арганізацый (у 1965 г. іх было 355). Умацоўвалася матэрыяльна – тэхнічая база, адбывалася тэхнічнае пераўзбраенне будаўнічай індустрыі , а разам з гэтым павышаліся магчымасці своечасовага ўзвядзення новых і пашырэння дзеючых прадпрыемстваў**.** Укараненне прагрэсіўнай сістэмы кіравання ў будаўнічую галіну было звязана з прымяненнем перадавога брыгаднага гаспадарчага разліку па метадзе Злобіна. У 1971 г. па метадзе М.А. Злобіна (прозвішча будаўніка, Героя Сацыялістычнай Працы з



Рэпазіторый ВДУ

падмаскоўнага горада Зеленаград, які праславіўся дзякуючы гэтай прапанове), у БССР працавалі 144 будаўнічыя калектывы, а ў 1974 г. – больш за 1300. Ідэя была простая: група працоўных брала на сябе абавязацельствы выканаць даручаную ёй працу да вызначанай даты, як правіла, з апераджэннем «нарматыўна» вызначанага тэрміну, не дапускаючы браку і павелічэння кошту работ. Узровень аплаты працы работнікаў брыгада размяркоўвала па свайму бачанні. Дзякуючы ўкараненню гэтага метаду, прымяненню новых тэхналогій, за 1971–1975-я гг. у БССР уведзена ў строй 90 новых буйных прамысловых прадпрыемстваў, вытворчасць працы ў будаўнічай індустрыі ўзрасла на 20–25%, час будаўніцтва аб'ектаў скараціўся на 15–20%.

На прамысловыя радпрыемствы рэспублікі брыгадныя формы арганізацыі працы былі перанесены з працоўнага калектыву Волжскага аўтамабільнага завода, дзе яны прымяняліся ў мэтах павышэння эфектыўнасці вытворчасці і прадукцыйнасці працы. Навізна такой формы арганізацыі працы заключалася ў тым, што ўсе сябры калектыву працавалі па адзінаму нараду. Каэфіцыент працоўнага ўдзелу даваў магчымасць размяркоўваць заробак паміж рабочымі згодна з узнёскам кожнага з іх у агульную справу. Пры такой арганізацыі члены брыгады былі зацікаўлены ў асваенні сумежных прафесій і аперацый. Адным з першых брыгадную форму арганізацыі працы ў БССР сталі прымяняць на аб'яднанні "Гомсельмаш". У 1976 г. на адзіны нарад працы тут перайшла брыгада Л. Кананчука з ліцейнага цэха.

Садзейнічала павышэнню эфектыўнасці вытворчасці і такая мера, як прыняцце на прамысловых прадпрыемствах сустрэчных планаў, у якіх прадугледжваўся дадатковы ў адносінах да кантрольных лічбаў выпуск прадукцыі. У пачатку 1973 г. амаль на ўсіх прадпрыемствах рэспублікі былі створаны заводскія і цэхавыя камісіі па распрацоўцы сустрэчных планаў. У склад камісій былі ўключаны эканамісты, рабочыя, ІТР і служачыя, партыйны, прафсаюзны і камсамольскі актыў. Сустрэчныя планы абмяркоўваліся і прымаліся на працоўных, прафсаюзных і камсамольскіх сходах, якія тады праводзіліся згодна патрабаванняў рэгламенту.

Працоўны калектыў Наваполацкага нафтаперапрацоўчага завода ў сустрэчным плане прыняў на сябе абавязкі выканаць пяцігадовае заданне (1971–1975 гг.) па росце прадукцыйнасці працы на два гады раней, чым намечалася раней. Парткам і кіраўніцтва завода каардынавалі намаганні эканамічных і тэхнічных службаў, грамадскіх арганізацый на тэхнічнае пераўзбраенне вытворчых працэсаў, павышэнне ўзроўню арганізацыі працы і кіравання. Намечаныя рубяжы сустрэчнага плана працоўны калектыў завода выканаў якасна і ў тэрмін [18, с. 7].

Паспяхова выконвалася распрацаваная праграма дзеянняў на 1971–1975 гг. у галіне прамысловасці, транспарту і будаўніцтва, ў іншых працоўных калектывах Віцебскай вобласці. У плане сацыяльна –

эканамічнага развіцця, які быў абмеркаваны ў сакавіку 1971 г. на пленуме абкама КПБ, а затым прыняты на сесіі абласнога Савета дэпутатаў працоўных, асноўны ўхіл зроблены на своечасовае ўзвядзенне аб'ектаў сацыяльнага назначэння, тэхнічную пераасністку вытворчасці на аснове выкарыстання эканамічных метадаў гаспадарання. Апора на эканамічныя механізмы, намечаныя рэформай 1965 г., узмацніла ў работнікаў прадпрыемстваў матывацыю да распрацоўкі і ўкаранення новай тэхнікі, удасканалення тэхналагічных працэсаў, выпуска якаснай прадукцыі. Падчас падрыхтоўкі да 50-годдзя ўтварэння СССР, у вобласці быў шырока распаўсюджаны пачын Героя Сацыялістычнай Працы закройшчыцы фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» Галубковай А.А. Ад імя шматтысячнага калектыву свайго прадпрыемства яна заявіла аб імкненні годна сустрэць гэтую дату, заклікала працоўных рэспублікі зрабіць абавязацельствы напружанымі, адшукаць усе наяўныя на вытворчасці рэзервы. Прапанова Голубковай, іншых ініцыятараў была падтрымана ў пастанове абкама партыі аб правядзенні ў 1972 – юбілейным для саюзнай дзяржавы годзе- пятнаццаці ўдарных вахт у гонар саюзных рэспублік [19, с. 20]. Мабілізуючым сродкам па пошуку ўнутраных рэзерваў на прадпрыемствах рэспублікі стала ўкараненне з 1970 г., па вопыце ленінградцаў, комплексных планаў сацыяльнага развіцця. У Віцебскай вобласці ў першай палове 70-х гг. планы сацыяльнага развіцця працоўных калектываў складзены на 130 буйных прадпрыемствах [20, с. 17]. Згодна з гэтымі планамі ў працоўных калектывах ствараліся аб’екты культурнага і фізкультурнага прызначэння, узводзіліся санаторыі –прафілакторыі, жыллё для працаўнікоў. За 1970–1975 гг. ў вобласці засвоена 2 млрд 470 млн рублёў капітальных укладанняў, што ў 1,4 разы больш, чым у папярэдняй 8-й пяцігодцы. Такі аб’ем будаўнічых работ выкананы за кошт увядзення прагрэсіўнай брыгаднай арганізацыі працы па «метаду Злобіна», аб якім ужо было сказана вышэй. У 1975 г. у вобласці па метадзе Злобіна працавала больш за 200 брыгад. Спаборнічаючы паміж сабой, будаўнікі Віцебска і Оршы імкнуліся да своечасовага ўводу і высокай якасці аб'ектаў. У Віцебску раней прынятага тэрміну былі ўведзены магутнасці шоўкавага камбіната па вытворчасці 7 млн кв. метраў тканіны. У Оршы датэрмінова здадзена ў эксплуатацыю трэцяя чарга ільнокамбіната [20, с. 24, 25, 52]. На Полацкім хімкамбінаце, пры значным скарачэнні колькаснага складу, атрымалася асвоіць праектныя магутнасці на два месяцы раней нарматыўнага тэрміну [21, с. 17]. Прадукцыйнасць працы на будаўніцтве павысілася на 35,4%, за кошт яе росту атрымана 88,4% прыросту аб'ёмаў капіталаўкладанняў . У гарадах вобласці пабудавана 13 буйных заводаў і фабрык, электрастанцый па сучасных тэхналогіях. У іх ліку Лукомльская ГРЭС – найважнейшы народнагаспадарчы аб'ект краіны, агульнай магутнасцю 2 млн 400 тыс. кВт, будаўніцтва якога пачалося ў снежні 1964 г. У жніўні 1974 г. у эксплуатацыю быў уведзены апошні,



Репозиторий ВГУ

восьмы энергаблок станцыі. Падчас будаўніцтва было асвоена больш за 230 млн руб. капітальных укладанняў. Ударна працаваў над ўзвядзеннем аб'екта шасцітысячны калектыў будаўнікоў. Прымяненне прагрэсіўных рашэнняў і рэжым эканомнага расходавання матэрыялаў дазволіў на 16 месяцаў скараціць перыяд будаўніцтва ДРЭС і на 18,4 млн руб. знізіць сабекошт работ. За кароткі тэрмін вырас новы горад. Насельніцтва Новалукомля ў жніўні 1974 г. складала 14 тыс. чалавек. Для жыхароў горада было пабудавана 120 тыс. кв. м жылой плошчы, 2 сярэднія школы, 4 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, бальніца і паліклініка, гандлёвы цэнтр, кінатэатр, шэраг іншых аб'ектаў сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння.

У гэты ж самы час у строй дзеючых уведзены трэцяя чарга Аршанскага ільнокамбіната, завод даламітавай мукі «Гралёва», Аршанскі інструментальны завод, шэраг буйных цэхаў і вытворчасцей на Наваполацкім нафтаперапрацоўчым заводзе і хімічным камбінаце. Лік комплексна-механізаваных і аўтаматызаваных цэхаў і ўчасткаў на прамысловых прадпрыемствах вобласці, у параўнанні з папярэдняй пяцігодкай, павялічыўся ў 1,8 раза, струменевых механізаваных і аўтаматычных ліній – у 1,7 раза. За 1971–1975-я гг. была ажыццёўлена рэканструкцыя 137 прадпрыемстваў, укаранёна больш за 17 тыс. мерапрыемстваў па навуковай арганізацыі працы, эфектыўнасць якіх у ацэнцы спецыялістаў была роўная 16 млн рублёў і ўмоўнаму вызваленню 10 тыс. чалавек вытворчага персаналу. Высокія тэмпы росту меліся на прамысловых прадпрыемствах Віцебска, Оршы, Наваполацка. Па выніках працы ў гонар гэтай даты больш за 50 працоўных калектываў вобласці выйшлі пераможцамі ва Усесаюзным і рэспубліканскім спаборніцтвах, дзясяткі тысяч працоўных атрымалі матэрыяльнае і маральнае заахвочванне. Вынікова працавалі ўсе гады дзявятай пяцігодкі працоўныя калектывы Наваполацкага нафтаперапрацоўчага завода, вытворчага аб'яднання “Палімір”, Полацкага завода “Шкловалакно”, Аршанскага ільнокамбіната, Віцебскага дыванoвага камбіната, фабрыкі імя КІМ, вытворчага аб'яднання “Маналіт” [22, с. 7].

Пошук выхаду з цяжкасцей, развіццё эканомікі рэспублікі за кошт інтэнсіўных фактараў, насычэнне яе высокакваліфікаванымі кадрамі, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў рабочымі, служачымі і ІТР прамысловага комплексу на этапе 1966–1975 гг., трэба аднесці ў актыў партыйных і савецкіх устаноў, грамадскіх арганізацый. Аналіз архіўных дакументаў, якія раскрываюць дзейнасць партыйных і савецкіх органаў рэспублікі ў гэты час, паказвае, што тут склаліся канструктыўныя сілы, якія разумелі неабходнасць правядзення ў краіне карэнных пераўтварэнняў. Асабліва яскравай з’яўлялася асоба першага сакратара ЦК КП Беларусі П.М. Машэрава, які з 1965 г. па 1980 г. знаходзіўся на гэтай пасадзе. Валодаючы бясспрэчнай смеласцю, ён меў свой погляд на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі ў маштабах вялікай краіны.

Рэпазіторый ВДУ

П.М. Машэраў задоўга да 1985 г. арыентаваў партыйна-гаспадарчы актыў рэспублікі **на перабудову**, на перавод эканомікі рэспублікі на інтэнсіўныя метады гаспадарання. У 1973 г. П.М. Машэраў у заключным слове на Пленуме ЦК КПБ казаў: "Для павышэння эфектыўнасці прамысловай вытворчасці нам усім трэба значна лепш працаваць. А гэта магчыма зрабіць толькі пры ўмове глыбокай **перабудовы** ўсёй нашай дзейнасці ў галіне эканомікі, ва ўсіх звёнах арганізацыі вытворчасці і кіравання, абавязковай **перабудовы** на пачатках інтэнсіўных, і толькі інтэнсіўных, метадаў арганізацыі справы..." [23, с. 149]. Прамысловая вытворчасць, сацыяльны сектар БССР і ў застойныя, як іх цяпер часта называць, гады развіваліся (у параўнанні з суседнімі рэспублікамі) стабільна, устойліва. Рэалізацыя намечаных задач **у** прамысловым комплексе БССР ажыццяўлялася пры высокай прадукцыйнасці працы. За 1971–1975 гг. яна вырасла на 43%, аб'ём прамысловай вытворчасці – на 64%. У прамысловым комплексе Віцебскай вобласці гэтыя паказчыкі аказаліся нават вышэйшымі за агульнарэспубліканскія: прадукцыйнасці працы за гэты перыяд тут склала 50,5%(!), аб'ём вытворчасці – 65% [24, с. 4, 8, 10]. Вырабы прадпрыемстваў Віцебшчыны экспартаваліся больш чым у 100 краін свету. У жніўні 1974 г. заслугі працоўных абласнога цэнтра былі адзначаны высокай узнагародай. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР горад Віцебск быў узнагароджаны Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Спасылкі**

1. Росийский государственный архив народного хозяйства (далей –РГАНХ). – Ф. 89. – Оп. 53. – Д. 18.

2. РГАНХ. – Ф. 89. – Оп. 46. – Д. 36

3. Государственный архив Витебской области (ГАВО). –Ф. 1. – Оп. 115. – Д. 3.

4. ГАВО. –Ф. 1. – Оп. 115. – Д. 282.

5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд. )[і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. –728 с.; іл.

6. Возрастание руководящей роли партии в коммунистическом строительстве (на материалах Компартии Белоруссии 1959– 1973 гг.). – Минск, Беларусь, 1979.

7. Вечерний Минск. – 1971. – 4 апр. – С. 2.

8. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 115. – Д. 113.

9. Возрастание руководящей роли партии в коммунистическом строительстве (на материалах Компартии Белоруссии 1959–1973 гг.). – Минск, Беларусь, 1979.

10. ГАВО. – Ф. 1. –Оп. 122. – Д. 75.

11. ГАВО. –Ф. 1. –Оп. 117.– Д. 18.

12. Мандрик, И.В.Деятельность партийных организаций по повышению производственной и общественно-политической активности работников железнодорожного транспорта Белоруссии (1966–1970 гг.): автореф. ... канд. ист. наук / И.В. Мандрик. – Минск, 1982. – 23 с.

13. ГАВО. – Ф. 1. –Оп. 122. – Д. 77.



Репозиторий ВГУ

14. Советская Белоруссия. – 1967. – 9 февр.
15. Народнае хозяйство Белорусской СССР в 1970 году: стат. сб. – Минск, 1971.
16. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 122. – Д. 3.
17. ГАВО. – Ф. 1. –Оп. 122. – Д. 75.
18. ГАВО. –Ф. 1. –Оп. 127. – Д. 8.
19 . ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 124. – Д. 26.
20. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 127. – Д. 5.
21. ГАВО. –Ф. 1. – Оп. 127. – Д. 29.
22. ГАВО. – Ф. 1. –Оп. 135. – Д. 2
23.НАРБ. – Ф. 4. –Оп. 20. –Д. 510
24. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 135. – Д. 2.

## ТЭМА 7. **Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у гады 10–11-й пяцігодак (1975–1985 гг.)**

*1. Планы і рэаліі пры развіцці прамысловага комплексу ў 10-й пяцігодцы.*

*2. Прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, сувязь на этапе 1981 – 1985 гг.*

***1. Планы і рэаліі пры развіцці прамысловага комплексу ў 10-й пяцігодцы.*** У 10- й пяцігодцы ў развіцці прамысловасці рэспублікі ставілася задача ажыццявіць у краіне буйнамаштабную комплексную праграму засваення навукова – тэхнічных дасягненняў, падняць прадукцыйнасць працы і значна павысіць жыццёвы ўзровень насельніцтва. Стаўка рабілася на стварэнні сістэм машын і механізмаў, якія змаглі б цалкам ахапіць увесь тэхналагічны працэс, механізаваць і аўтаматызаваць працаёмкія віды вытворчасці не на асобных, а на ўсіх функцыянуючых прадпрыемствах. Ставілася задача вызваліцца ад негатыўных тэндэнцый, што намеціліся і сталі заўважанымі ў папярэднія гады яе развіцця.

У поле зроку партыйных камітэтаў, савецкіх заканадаўчых і выканаўчых органаў рэспублікі ўвайшла праблема пасіўных адносін часткі працоўных да працы, якая выяўлялася ў такіх формах, як нізкая прадукцыйнасць працы, прагулы, з'яўленне на працоўных месцах у нецвярозым стане, крадзёж вырабаў з прадпрыемстваў (несуны) і іншыя негатыўныя праявы, якія лічыліся не ўласцівымі для сацыялістычнага грамадства. Праблема зніжэння зацікаўленасці ў працы , што не адпавядала этапу развітога сацыялізму, стала тэмай для абмеркавання на партыйных форумах. На пасяджэнні бюро ЦК КПБ у сакавіку 1976 г. пры абмеркаванні пытання “Аб рабоце партыйных арганізацый Гомельскай вобласці па фарміраванні і развіцці здаровых матэрыяльных і духоўных запатрабаванняў працоўных” было адзначана, што асобныя работнікі на глебе палітычнай абмежаванасці і маральнай няспеласці слаба ўдзельнічаюць у стваральнай працы і грамадска-палітычнай дзейнасці,

праяўляюць набытніцкія імкненні, дапускаюць выпадкі рвацтва, злоўжывання службовым становішчам [1, с. 187–190].

У дакладзе першага сакратара Віцебскага абкама КП Беларусі С.М. Шабашова на сходзе партыйна- гаспадарчага актыву (сакавік 1976 г.) таксама адзначалася, што той патэнцыял, які павінен мець сацыялістычны лад, у папярэднія гады ў працоўных калектывах вобласці выкарыстоўваўся не поўна [2 с. 10–14].

Перад партыйнымі, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі ставілася задача палепшыць работу па выхаванні ў працоўных вытворчай і грамадскай актыўнасці. Ва ўсіх калектывах рэспублікі былі зацверджаны мерапрыемствы, скіраваныя на паляпшэнне выкарыстання рабочага часу, павышэнне арганізаванасці і дысцыпліны, стварэнне неабходных умоў для высокапрадукцыйнай працы. Паўсюдна разгарнулася работа з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны і бракадзеламі. Важным сродкам уздзеяння на парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, асоб, якія ўхіляліся ад норм агульначалавечай маралі, выкрадальнікаў аказвалі грамадскія аддзелы кадраў, саветы працоўных калектываў, саветы жанчын, саветы настаўнікаў моладзі, сяброўскія суды.

Даследаванні, праведзеныя ў той час, паказвалі, што вынікаў у фарміраванні свядомай дысцыпліны дасягалі на тых прадпрыемствах, дзе была наладжана добрая арганізацыя працы на вытворчасці, сістэма матэрыяльнага і маральнага стымулявання, створаны ўмовы для павышэння адукацыйнага і культурнага ўзроўня працоўных. Зусім слушна, што задача па стварэнні неабходных умоў для паўсядзённай працы на прадпрыемствах стала ўвязвацца з удасканаленнем тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, са стварэннем належных вытворча – бытавых умоў і зніжэннем руціннай, цяжкай ручной працай.

Вырашэнне праблем, як было дэкларавана ў плане развіцця рэспублікі на 1976–1980-х гг., знаходзілася ў павялічэнні ўзроўню навукова – тэхнічнага прагрэсу ў галінах народнай гаспадаркі. У рэспубліцы была праведзена тэхнічная рэканструкцыя старэйшых станкабудаўнічых заводаў і прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, што дазволіла за гады 10-й пяцігодкі перавесці з ручной на механізаваную працу больш за 30 тыс. чалавек, адначасова атрымаць ад гэтага эканомію ў 620 млн руб. [3, с. 15]. Укараняліся дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу пры ўвядзенні новых аб'ектаў і магутнасцей, якіх за 1976–1980-я гг. у БССР было пабудавана 4380. Сярод іх буйныя прадпрыемствы: Пінскі завод кавальска – прэсавых аўтаматычных ліній, Брэсцкі завод прэцызійных вузлоў для тэкстыльнага абсталявання, завод ліцейнага абсталявання ў Пінску, камбінат нярудных матэрыялаў "Мікашэвічы", а таксама заводы сельскагаспадарчага машынабудавання ў Бабруйску і Лідзе.



Репозиторий ВГУ

У Віцебскай вобласці за гады дзясятай пяцігодкі ў народную гаспадарку было накіравана больш за 2,7 млрд рублёў капітальных укладанняў, што на 13% больш, чым за папярэднія 5 гадоў. Зрухі да лепшага ў будаўнікоў адбыліся дзякуючы брыгаднай арганізацыі працы. Ва ўстаноўленыя тэрміны ў вобласці было пабудавана 9 новых буйных прадпрыемстваў. У дзеянне, як і вызначалася, быў уведзены другі завод даламітавай мукі «Гралёва», завод каляровых тэлевізараў у Віцебску, завод бялкова-вітамінных канцэнтратаў у Наваполацку, Аршанскі завод па вытворчасці формаў і аснасткі, трэцяя чарга Лукомльскай ДРЭС, Новалукомскі хлебазавод, іншыя аб'екты. Пры праектаванні і ўвядзенні новых прадпрыемстваў выкарыстоўваліся дасягненні навуковых ведаў і перадавога вопыту.

Змястоўна вялася праца па ўкараненні новых відаў тэхнікі і ўдасканаленні тэхналагічнага працэсу на прадпрыемствах, звязаных з выпускам прадукцыі абароннага значэння. Добрым прыкладам для іншых калектываў рэспублікі з'яўляўся вопыт у выкарыстанні вытворчых фондаў на вытворчым аб'яднанні “Маналіт”. Тут за кошт укаранення аўтаматычнай сістэмы кантролю часу працы абсталявання, іншых удасканаленняў арганізацыі працы за першыя два гады пяцігодкі аб'ём вытворчасці быў павялічаны на 42,4%, прадукцыйнасць працы – на 35,9, а фондааддача ўзрасла на 14%. Практыка працы парткама і адміністрацыі аб'яднання “Маналіт” па стварэнні комплекснай сістэмы кіравання вытворчасцю і стан гэтай працы на іншых вытворчых прадпрыемствах грунтоўна абмяркоўваліся ў чэрвені 1979 г. на пленуме абласнога партыйнага камітэта. Тут было адзначана, што камуністы прадпрыемства здолелі стварыць творчую атмасферу, аб'яднаць вакол сябе працаўнікоў і накіраваць энергію на рашэнне пастаўленых задач.

У тым жа годзе вопыт працоўнага калектыву “Маналіту” па эфектыўным выкарыстанні вытворчых фондаў атрымаў адабрэнне ў ЦК Кампартыі Беларусі. Шырокае распаўсюджанне ён знайшоў у працоўных калектывах рэспублікі [4, с. 12].

Значны ўклад ва ўдасканаленне абсталявання прадпрыемстваў уносілі вынаходнікі і рацыяналізатары. Па афіцыйных дадзеных у 1980 г. колькасць вынаходнікаў і рацыяналізатараў у БССР складала 158,8 тыс. чал., з іх 101 тыс. працавала на прамысловых прадпрыемствах. Ад іх працы меліся станоўчыя вынікі. Шырокім размахам характарызаваўся рух вынаходнікаў і рацыяналізатараў на прадпрыемствах Беларускай чыгункі. Каля 5 тыс. чалавек, у тым ліку 70% рабочых, пастаянна займаліся ўдасканаленнем вытворчых працэсаў. За гады 10 -й пяцігодкі эканамічны эфект ад укаранення на чыгунцы больш чым 43 тыс. прапаноў і вынаходніцтваў склаў 22 млн рублёў [5, с. 4]. Лепшыя рацыяналізатары ўзнагароджваліся ганаровым званнем “Заслужаны рацыяналізатар БССР”.

Рэпазіторый ВДУ

Вялікае значэнне ў выкананні планавых заданняў у прамысловасці ў другой палове 70-х гг. адводзілася транспартным прадпрыемствам. У 1975 г. колькасць работнікаў, занятых на перавозках грузаў і пасажыраў, дасягала амаль 300 тыс. чал. [6, с. 219]. Перад транспартнымі арганізацыямі востра паўстала задача рацыянальнага выкарыстання парку вагонаў, аўтамабіляў, іншых сродкаў вытворчасці. На ўзбраенне быў прыняты вопыт, які выкарыстоўваўся чэлябінскімі чыгуначнікамі па скарачэнні прастояў вагонаў пад грузавымі аперацыямі. У мэтах наладжвання зацікаўленасці і павышэння адказнасці за эфектыўнае выкарыстанне працоўных, матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў было наладжана міжгаліновае спаборніцтва чыгуначнікаў з аўтатранспартнікамі і калектывамі прамысловых прадпрыемстваў.

У Віцебскай вобласці комплексным спаборніцтвам за лепшае выкарыстанне вагонаў было ахоплена 40 чыгуначных станцый і 147 прадпрыемстваў прамысловасці. Шырокую падтрымку сярод чыгуначнікаў краіны ў 70-я гг. знайшла ініцыятыва калектыва калоны машыніста-інструктара Віцебскага лакаматыўнага дэпо, члена КПСС Півульскага: «Вадзіць толькі вялікагрузныя цягнікі». Гэты заклік стаў дэвізам у рабоце ўсіх лакаматыўных брыгад рэспублікі. Укараненне пачыну перавозкі грузаў у цяжкавагавых цягніках дазволіла эканоміць тысячы тон дызельнага паліва [7, с. 54]. На шасці аддзяленнях Беларускай чыгункі працягваўся, пачаты ў 8-й пяцігодцы, метад перавозкі грузаў, названы маршрутызацыяй. Ажыццяўлялася ў гэты час радыкальная рэканструкцыя многіх чыгуначных станцый, у тым ліку і станцыі Віцебск.

У выніку прынятых мер удалося скараціць прастой вагонаў на ўсіх пад'язных шляхах Беларускай чыгункі. На Віцебскім аддзяленні ў кароткі час было выключана 72 тыс. тон нерацыянальных перавозак, прастой вагонаў скараціўся, супраць прынятай нормы, на 0,23гадзіны. Тэмпы росту прадукцыйнасці працы на Беларускай чыгунцы за пяць гадоў склалі 110%, прадукцыйнасць працы лакаматыва – 110,7%. На два працэнты ўзрасла сярэдняя вага цягніка [8, с. 6, 7]. Удасканальвалася і ўмацоўвалася матэрыяльна – тэхнічная база іншых відаў транспарту і сувязі.

У Віцебскай вобласці за пяць год была праведзена значная работа па рэканструкцыі і пашырэнні прамысловых прадпрыемстваў, канцэнтрацыі вытворчасці. У 1980 г. на тэрыторыі вобласці функцыянавала 185 вытворчых аб'яднанняў і прадпрыемстваў станкабудавання, радыёэлектронікі, прыборабудавання, металаапрацоўкі, нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай, хімічнай, лёгкай, харчовай, мяса-малочнай прамысловасці, будіндустрыі і дрэваапрацоўкі. За гады 10-й пяцігодкі на дзеючых прадпрыемствах быў рэканструіраваны кожны трэці цэх, механізавана 330 вытворчасцей, цэхаў і ўчасткаў, уведзена ў эксплуатацыю 390 механізаваных, струменевых і аўтаматызаваных ліній, мадэрнізавана 7 тыс. адзінак дзеючага абсталявання. За кошт укаранення мерапрыемстваў

па новай тэхніцы на прамысловых прадпрыемствах вызвалена, умоўна, больш за 20 тыс. чалавек. Трэцяя частка усіх прадпрыемстваў вобласці забяспечыла ўвесь прырост прадукцыі з памяншэннем колькасці працуючых. Сярэднесутачны выпуск вырабаў за гэтую пяцігодку вырас на 18,6%. Прадукцыя са Знакам якасці ў агульным аб'ёме вытворчасці ў 1980 г. складала 21%. З добрымі паказчыкамі завяршылі пяцігодку калектывы заводаў "Чырвоны Кастрычнік", электравымяральных прыбораў, дывановага аб'яднання, вытворчага аб'яднання "Полацкшкловалакно", фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі", камбікормавага завода ў Глыбокім, Лукомльскай ДРЭС, фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі" і многія іншыя.

Працоўныя калектывы Наваполацкага нафтаперапрацоўчага завода і аб'яднання "Палімір" дамагліся (сярод прадпрыемстваў сваёй галіны) найменшых удзельных расходаў паліва, электра -і цеплаэнергіі на тону перапрацаванай сыравіны [9, с. 22].

Аднак, нягледзячы на прымаемыя меры, працэс абнаўлення асноўных вытворчых фондаў у прамысловасці ішоў марудна. Штогод на прадпрыемствах рэспублікі ўдасканальвалася не больш за 6 тыс. адзінак абсталявання, а патрабавалася абнаўляць больш за 100 тыс. У 1980 г. ручной працаў на вытворчасці ў прамысловасці быў заняты яшчэ кожны трэці рабочы. Удзельная вага станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем у машынабудаванні складала толькі 1,7%. Гэта адмоўна ўплывала на якасць прадукцыі. Удзельная вага прадукцыі з дзяржаўным "Знакам якасці" складала на завяршэнні пяцігодкі не больш за 20%. Высокімі былі страты прадпрыемстваў ад выпуску бракованай прадукцыі.

Нявырашанай праблемай усіх прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі гэтага перыяду заставалася праблема фарміравання на прадпрыемствах перспектыўных і бягучых вытворчых планаў. Вышэйшыя саюзныя плануючыя арганізацыі сталі павялічваць прадпрыемствам план па выпуску і рэалізацыі тварнай прадукцыі, і, як звычайна, скарачалі вылучэнне запытаных прадпрыемствамі матэрыяльных рэсурсаў і сродкаў на капіталаўкладанні. Руплівы, здавалася б, падыход, выкарыстання матэрыяльных і фінансавых сродкаў, але не абгрунтаваны дакладнымі разлікамі з'яўляўся прычынай невыканання прадпрыемствамі мерапрыемстваў, звязаных з тэхнічным і арганізацыйным удасканаленнем вытворчасці.

На асобных прадпрыемствах замест актыўнага пераводу эканомікі на інтэнсіўныя метады развіцця, шырокага выкарыстання дасягненняў навукова – тэхнічнай думкі, працягваўся працэс уключэння ў вытворчасць дадатковых працоўных рэсурсаў, раслі аб'ёмы новага прамысловага будаўніцтва. Такія метады кіравання выклікалі "прабуксоўку" ў дзейнасці прадпрыемстваў. Так, доля прыросту прадукцыйнасці працы за кошт навукова – тэхнічнага прагрэсу ў гэтае пяцігоддзе на прадпрыемствах Віцебскай вобласці складала менш за 50% (пры заданні 75–80%). Не было выканана заданне па зніжэнні ўдзельнай вагі цяжкай ручной працы



Рэпазіторый ВДУ

(колькасць дапаможных рабочых засталася на ўзроўні 1975 г.), на 11,6% знізілася фондааддача. Няўстойліва працавалі ў асобныя гады 10-й пяцігодкі заводы заточных станкоў, буйнапанэльнага домабудавання ў Віцебску, формаў і аснасткі, трактарарамонтны ў Оршы, камбінат будаўнічых матэрыялаў у Полацку і шэраг іншых.

Не ўдалося выйсці на запланаваныя рубяжы па выпуску прадукцыі са Знакам якасці. Вялікімі былі прастоі вагонаў пры выгрузцы на прадпрыемствах. Дапускаліся “пустыя” (без грузаў) прабегі аўтамабіляў. Мелі месца зрывы планавых паставак прадукцыі па дагаворных абавязацельствах, а таксама прыпіскі аб'ёмаў выкананых работ [10, с. 16–19].

Прадпрыемствы Віцебшчыны не выканалі дзяржаўнае заданне па росце аб'ёмаў вытворчасці ў 10-й пяцігодцы на 8,5 і прадукцыйнасці працы на 9,5 пункта. Тлумачэнне гэтаму, часткова слушнае, – высокая цэнтралізацыя і бюракратычная сістэма размеркавання фондаў: не была забяспечана прадугледжаная Дзяржпланам СССР пастаўка камплектуючых і сыравіны з іншых рэгіёнаў СССР для заводаў каляровых тэлевізараў, бялкова-вітамінных канцэнтратаў, інструментальнага; прадпрыемстваў мяса -малочнай і харчовай прамысловасці. Такая ж сітуацыя назіралася на цэлым шэрагу прадпрыемстваў рэспублікі.

***2. Прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, сувязь на этапе 1981–1985-х гг.*** У 11-й пяцігодцы прамысловыя прадпремствы Беларусі шукалі шляхі павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Робіцца спроба на пашырэння брыгаднай формы арганізацыі працы. Сталі найбольш поўна ўжываць дынамаўскі, шчокінскі, вазаўскі і злобінскі метады, як найлепшыя тыпы кіравання працоўнымі калектывамі. У 1986 г. колькасць рабочых на прамысловых прадпрыемствах рэспублікі, занятых брыгаднай формай гаспадарання, складала 78,3%.

Найбольш паспяхова на вытворчасці выкарыстоўвалася брыгадная форма арганізацыі працы, якая ўкаранялася з пачатку 70-х гг. на Волжскім аўтамабільным заводзе. Яе навізна заключалася ў тым, што ўсе члены брыгады працавалі па адзіным нарадзе. Каэфіцыент працоўнага ўкладу даваў магчымасць размяркоўваць агульны заробак брыгады паміж працоўнымі згодна са ступенню актыўнасці, праяўленай кожным з іх у працэсе працы. Такі варыянт арганізацыі працы заахвочваў працоўных да засваення і сумяшчэння сумежных прафесій і аперацый, што дазваляла фармаваць у брыгадзе ўстойліва вытворчы рэжым, высокі вынік і стабільнасць працоўнага калектыву.

Высокія паказчыкі ў вытворчасці прадукцыі, звязаныя з укараненнем брыгаднай формы арганізацыі працы, меліся ў аб’яднанні “Гомсельмаш”. На завяршэнні пяцігодкі тут брыгадную форму арганізацыі працы прымянялі 46 калектываў з ахопам больш за 2 тыс. чалавек [11, с. 59**].**

Репозиторий ВГУ

Базавым прадпрыемствам у галіне Міністэрства хімічнай прамысловасці СССР па распрацоўцы і ўкараненні сістэмы арганізацыі і аплаты працы па брыгаднай сістэме, з улікам асаблівасцей гэтай галіны было зацверджана Наваполацкае аб'яднанне «Палімір». У 1981 г. на прадпрыемстве было сфарміравана 194 брыгады, у тым ліку 84 комплексныя, з ахопам больш за 3,5 тыс. чалавек, што складала 91,4% усіх працуючых. Укараненне брыгаднай сістэмы ў аб'яднанні кіравалася аддзелам працы і заработнай платы і камітэтам прафсаюза. Брыгады ў аб'яднанні сталі цэнтрамі выхавання працуючых [12, с. 389]. Дзякуючы шырокаму ўкараненню гэтага метаду ў брыгадах усталяваўся, як і варта было чакаць, спрыяльны маральны клімат і ўстойлівы вытворчы рэжым. Перавага новага падыходу дазволіла прадпрыемству трывала стаць на шлях інтэнсіўнага развіцця.

Вызваліўшы каля 25% працуючых, аб'яднанне павялічыла аб'ёмы выпуску таварнай прадукцыі. У аб'яднанні выпрацоўвалася каля 40% агульнасаюзнай нітраакрылавай кіслаты і валакна нітрону, 20% поліэтылена. У 1982 г. калектыў аб'яднання «Палімір» стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 60-годдзя СССР. Яму ўручаны пераходзячы Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

У 1985 г. ў складзе дзяржразліковых брыгад на прадпрыемстве працавала 93,7% рабочых. Пры значным скарачэнні прамысловага персаналу аб'ём прамысловай прадукцыі тут быў павялічаны больш чым на 12 млн рублёў, звыш за палову вырабаў выпускалася з дзяржаўным Знакам якасці [13, с. 43–44]. Укараненне брыгаднай формы працы, стабільнае развіццё прадпрыемства варта шмат у чым аднесці на рахунак яго генеральнага дырэктара Л.В. Наважылава. Высокая кампетэнтнасць у кіраванні вытворчым калектывам Льва Вітальевіча атрымала высокую адзнаку. У 1985 г. яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Значнае паляпшэнне гаспадарчай дзейнасці з пераходам на брыгадную форму было заўважана на Барысаўскім заводзе пластмасавых вырабаў. Тут браўся на ўзбраенне як вопыт прадпрыемстваў краіны, так і свайго інструментальнага цэха, які яшчэ ў 1972 г. перайшоў на брыгадную форму арганізацыі працы, якая сведчыла аб значнай эфектыўнасці: да 1984 г. аб’ём вытворчасці павялічыўся на 48,8%, пры скарачэнні колькасці працуючых на 28,8%. Сярэдняя зарплата вырасла ў 1,4 раза, пры росце прадукцыйнасці працы ў 2 разы. Пераход на брыгадную форму арганізацыі працы спрыяў паляпшэнню гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства: у 1984 г. рост аб’ёмаў вытворчасці ў параўнанні з папярэднім 1983 г. тут склаў 17,8%, прадукцыйнасць працы вырасла на 18,2%, колькасць прагульшчыкаў скарацілася ў 2 разы. Рубяжы 11-й пяцігодкі па росту вытворчасці і прадукцыйнасці працы калектыў прадпрыемства выканаў амаль на 6 месяцаў раней запланаванага [12, с. 389].



Репозиторий ВГУ

Трэба адзначыць, што на гэтым, як і на папярэдніх этапах, наша рэспубліка з'яўлялася рэгіёнам СССР для праверкі эфектыўнасці новых элементаў гаспадарчага механізма. З кастрычніка 1983 г. тут праводзіўся эксперымент па ўзмацненні эканамічнай адказнасці прадпрыемстваў і арганізацый Міністэрства сувязі рэспублікі за вынікі работы, больш поўнае задавальненне гаспадаркі і насельніцтва ў адпаведных паслугах. У 1984 г. ва ўмовах эксперымента працавалі прадпрыемствы электратэхнічнай і лёгкай прамысловасці, у 1985 г. – харчовай і мяса-малочнай , шэраг прадпрыемстваў машынабудавання і Міністэрства бытавога абслугоўвання.

Усяго ў новых умовах у рэспубліцы дзейнічалі больш за 400 суб'ектаў гаспадарання, на долю якіх прыходзілася каля 40% агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці рэспублікі і амаль увесь аб'ём бытавых паслуг, што аказваліся насельніцтву.

У БССР пастаянна ішла праца па паглыбленні спецыялізацыі і павышэнні канцэнтрацыі вытворчасці за кошт стварэння вытворчых аб'яднанняў. У 1985 г. у рэспубліцы працавала 231 аб'яднанне, у іх склад уваходзілі больш за 900 прадпрыемстваў.

Эфектыўным падыходам да ўдасканалення тэхналагічнага працэсу, арганізацыі працы і кіравання ўсе гады гэтай пяцігодкі адрознівалася дзейнасць працоўнага калектыва вытворчага аб'яднання “Маналіт”. Вытворчы вопыт лепшых рабочых тут станавіўся здабыткам усіх працаўнікоў, шырока ўкараняўся комплексна – тэхналагічны метад абслугоўвання абсталявання, развіваліся перадавыя прыёмы арганізацыі працы. У 1985 г. адну траціну новага абсталявання ў вытворчым аб'яднанні выраблялі ўласнымі сіламі. Заслуга ў такой важнай справе належыла створаным тут творчым брыгадам па паскарэнні тэрмінаў распрацоўкі і ўкаранення новага абсталявання (брыгады фармаваліся з інжынераў і рабочых-рацыяналізатараў).

Дзейнасць транспартных арганізацый ў 11- й пяцігодцы скіроўвалася на нарошчванне перавозак грузаў і павышэнне якасці абслугоўвання пасажыраў. Асноўны цяжар па перавозцы грузаў у гэты час прыходзіўся на Беларускую чыгунку, дзе працавала больш за 100 тыс. чалавек. Чыгунка мела на тэрыторыі рэспублікі шырокую разгалінаваную сетку. Эксплуатацыйная даўжыня чыгуначных дарог БССР у 1985 г. складала 5540 км. На галоўным напрамку чыгуначнага шляху (з Усходу на Захад) праводзілася элетрыфікацыя. У 1981 г. са здачай электрыфіцыраванага ўчастка Барысаў – Орша адкрыўся скразны рух цягнікоў на электрычнай цяге ад Масквы да Мінска.

Беларуская чыгунка мела ў сваім складзе 6 адзяленняў і забяспечвала больш за палову пастаянна ўзрастаючага грузаабароту рэспублікі і амаль столькі ж ў перавозцы пасажыраў. На чыгуначным транспарце Беларускай дарогі паступова ішло абнаўленне парку рухомага складу, быў зроблены поўны пераход на цеплавозную і электравозную цягу. Назіраўся пастаянны



Репозиторий ВГУ

рост узроўню механізацыі пагруза –разгрузачных работ, павелічэнне аб'ёму кантэйнерных і пакетных перавозак**.** Па ўсім тэхналагічным цыкле перавозак чыгуначнікі наладзілі ўзаемаўвязку працы з прадпрыемствамі аўтамабільнага транспарту. Забяспечваючы ўнутраныя патрэбы, чыгуначнікі Беларусі ажыццяўлялі вялікі аб'ём транзітных перавозак, у тым ліку ў замежныя краіны.

У 1985 г. на Беларускай чыгунцы быў паспяхова праведзены шырокамаштабны эксперымент па павялічэнні прадукцыйнасці працы. Пасля пераходу на распрацаваную эканамістамі сістэму аплаты працы (выкананне аб'ёмаў работ меншай колькасцю работнікаў за кошт аўтаматызацыі і механізацыі вытворчасці, а таксама за кошт сумяшчэння абавязкаў) на прадпрыемствах Беларускай чыгункі было вызвалена для іншых галін народнай гаспадаркі каля 12 тыс. работнікаў. Эксперымент, які ўключаў асобныя элементы рыначных адносін, даў добрыя вынікі: вытворчасць працы ўзрасла на 18-20%, зарплата чыгуначнікаў – на 16–17% [14, с.266**]**. Пры аналізе матэрыялаў аб укараненні эксперымента, першае, што прымушае звярнуць увагу, – гэта непасрэдны ўдзел асноўнай часткі чыгуначнікаў у вырашэнні вытворчых праблем. Тысячы чыгуначнікаў актыўна ўключыліся ў выяўлене праблемных месцаў у працэсе вытворчасці. Асобныя прапановы былі настолькі смелымі, што ўяўляліся нават не рэальнымі для прымянення. Такім стаў пачын, прапанаваны машыністам лакаматыўнага дэпо Магілёў В. Качмаровым, вадзіць грузавыя цягнікі без памочніка машыніста. Сам ён упершыню ў краіне перайшоў на эксплуатаванне грузавых цягнікоў без памочніка машыніста яшчэ ў пачатку 70-х гг. У 1989 г. па гэтым прынцыпе на Беларускай чыгунцы працавалі больш за 1700 машыністаў [15, с. 191, 192].

Настойлівымі былі ў рэалізацыі эканамічнага эксперымента, паказвалі прыклады добрасумленнай працы дарожны майстар Асіповіцкай дыстанцыі пуці А. Прановіч, аглядчык вагоннага дэпо Маладзечна П. Юхневіч, манеўровы дыспетчар станцыі Гродна С. Грынявіцкі, саставіцель паяздоў станцыі Мінск –Таварны Ф. Амельчанка і многія іншыя.

Побач з чыгуначнікамі, праблемамі перамяшчэння грузаў і насельніцтва займаліся аўтамабілісты. Штогод аўтагаспадаркі папаўняліся новымі камфартабельнымі аўтобусамі, больш моцнымі грузавымі аўтамабілямі, насельніцтва набыло вялікую колькасць легкавых аўтамабіляў у асабістае карыстанне**.** Аўтобусныя паркі былі створаны ў Мінску, Брэсце , Баранавічах. У Мінску, Наваполацку, Віцебску былі ўзведзены аўтавакзалы. Адбылося аб'яднанне дробных ведамственных гаспадарак у буйныя гаспадарча – разліковыя прадпрыемствы. У 1985 г. на аўтамабільны транспарт прыпадала каля 40% грузаабароту, які ў параўнанні з 1970 г. павялічыўся больш чым у 2 разы. Павялічвалася працягласць аўтамабільных магістраляў з цвёрдым пакрыццём. Перавозка пасажыраў за 15 год узрасла з 1117 млн чалавек да 1921 млн [15, с. 111].



Репозиторий ВГУ

Трывалае месца ў жыцці насельніцтва Беларусі заняў паветраны транспарт. Ён абслугоўваў больш за 100 ліній. У гэты час быў зроблены пераход ад выкарыстання поршневых самалётаў да сучасных турбавінтавых і турбарэактыўных авіялайнераў. У першай палове 80-х гг. пачаў працаваць міжнародны аэрапорт Мінск-2.

Што тычыцца рачнога транспарту, то ў Беларусі ён не меў такога значэння, як у іншых рэгіёнах СССР. У 1985 г. на яго тут прыпадала толькі 2,4 % грузаабароту.

У 1984 г. у сталіцы Беларусі быў уведзены метрапалітен, будаўніцтва якога пачалося ў 1977 г. Будоўля такіх складаных аб’ектаў у рэспубліцы ажыццяўлялася ўпершыню, таму яго ўзвядзенню надавалася асобая ўвага. 11 сакавіка 1977 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР прынялі спецыяльную пастанову “Аб мерах па арганізацыі будаўніцтва метрапалітэна ў г. Мінску”. Згодна з пастановай усе партыйныя, савецкія і гаспадарчыя арганізацыі абавязваліся аказываць усялякую дапамогу якаснаму будаўніцтву аб’екта і своечасоваму яго ўвядзенню у эксплуатацыю [16, с. 40–46].

Будаўніцтва метрапалітэна вялося з дапамогай усіх гарадоў краіны, дзе быў вопыт распрацоўкі дакументацыі і будаўніцтва такіх аб’ектаў. Выдатна справіўся з пастаўленымі задачамі ў час будаўніцтва метрапалітэна калектыў Мінскметрабуда. 24 сакавіка 1984 г. па падрыхтаванай лініі прайшоў першы выпрабавальны цягнік, а 29 чэрвеня адбыўся пуск гэтай (першай) лініі метро. Мінск стаў дзявятым горадам у СССР, дзе працавала падземная чыгунка. Для насельніцтва горада і яго наведвальнікаў былі створаны зручнасці дабірацца на працу, наведваць культурныя і гандлёвыя цэнтры. Вялікая група метрабудаўцаў за працоўныя поспехі была ўзнагароджана ордэнамі і медалямі і прысваеннем ганаровых званяў Беларускай ССР.

Трэба аддаць належнае сувязістам рэспублікі. Пошта, тэлеграф, тэлефон, радыё, тэлебачанне ў асноўным задавальнялі ўзрастаючыя патрабаванні насельніцтва. Лісты, пасылкі, грашовыя пераводы прыходзілі да адрасатаў своечасова. Тут дзяржаўная цэнтралізаваная сістэма фукнкцыянавала амаль што бездакорна. Магчыма, не даставала высокай тэхнічнай абсталяванасці на тэлеграфе, назіралася адставанне ад развітых краін у якасці і колькасці тэлефонаў на 10 тыс. жыхароў. У той жа час колькасна пашыралася радыё і тэлебачанне: з 1965 г. па 1985 г. колькасць радыёкропак вырасла ў 3 разы, тэлевізараў – у 8 разоў.

Вывучаючы пытанне аб развіцці прамысловых, транспартных і будаўнічых арганізацый ў 11-й пяцігодцы, трэба звярнуць асаблівую ўвагу на працу прамысловасці Віцебскай вобласці. Зазначым, што ў гады гэтай пяцігодкі асноўная ўвага тут звярталася на павышэнне прадукцыйнасці працы. За кошт гэтага эканамічнага фактару за 1980–1985 гг. неабходна было атрымаць тры чвэрці прыросту аб'ёмаў вытворчасці. Высокія рубяжы



Репозиторий ВГУ

намецілі станкабудаўнікі, якія займалі вядучую ролю ў тэхнічным пераўзбраенні іншых галін. Ім трэба было павялічыць выпуск прадукцыі на 33,3%, змяніць структуру выпускаемай прадукцыі, распрацаваць і асвоіць вытворчасць больш дасканалых, высокапрадукцыйных станкоў, аснашчаных лічбавым праграмным кіраваннем і мікра – ЭВМ.

Ужо ў першы, 1981 г. пяцігодкі, з заданнем па аб'ёмах вытворчасці і рэалізацыяй прадукцыі справіліся ўсе, без выключэння, прадпрыемствы вобласці. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці вырасла на 5,3%, замест прадугледжаных 3,4%, звыш плана было выпушчана прадукцыі на 16 млн рублёў. Але крытычны падыход да стану прамысловай вытворчасці паказаў (пра гэта гаварылася на сходзе актыву абласной партыйнай арганізацыі), што ў працы партыйнага і савецкага апарату па кіраўніцтву галінамі гаспадарчага комплексу прысутнічаюць элементы канцэлярска – бюракратычнага стылю, адсутнічае канкрэтная персанальная адказнасць кадраў за даручаныя ўчасткі дзейнасці. Справа ў тым, што ў канцы лістапада 1981 г. прамысловасць вобласці аказалася ў ліку адстаючых. 25 прадпрыемстваў вобласці не выканалі планаў 11-ці месяцаў, не адгрузілі спажыўцам прадукцыю на суму 75млн рублёў. І толькі пасля праведзеных нарад з кіраўніцтвам адстаючых прадпрыемстваў у партыйных і дзяржаўных органах, у асобных выпадках з аргвысновамі ў адносінах да кіраўнікоў прадпрыемстваў, былі вызначаны шляхі выкаранення негатыўных з’яў. У наступныя месяцы цякучага года неабходны рытм на вытворчасці быў забяспечаны. З заданнем па вытворчасці і пастаўкамі прадукцыі спажыўцам справіліся ўсе без выключэння прадпрыемствы вобласці.

У 1982 г. у працоўных калектывах разгарнулася падрыхтоўка годнай сустрэчы гістарычнай для краіны падзеі – 60-годдзя ўтварэння СССР. Ініцыятыву масквічоў па разгортванні спаборніцтваў у гонар гэтай даты пад дэвізам: “Гонар і пашана – па працы!” падтрымалі многія працоўныя калектывы рэспублікі. Абавязкі, у якіх вызначылі свае дзеянні па ўдасканаленні арганізацыі працы пад дэвізам: “Узорны парадак на вытворчасці – норма кожнага дня”, прынялі калектывы Полацкага лакаматыўнага дэпо, фабрыкі “Сцяг індустрыялізацыі”, аршанскага ільнокамбіната, цэха № 16 вытворчага аб'яднання “Маналіт”, дэпутацкая група завода імя Кірава, якую ўзначальваў расточнік В.С. Крыцкі. Бюро абласнога камітэта партыі рэкамендавала партыйным, савецкім, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям распаўсюдзіць гэтую ініцыятыву на іншыя прадпрыемствы, а правядзенне арганізатарскай і ідэалагічнай працы строга ўвязваць з мерамі па ўдасканаленні гаспадарчага механізма. На працягу гэтага года ў працы прамысловых прадпрыемстваў вобласці назіралася стабільнасць. Аб'ёмы вытворчасці і прадукцыйнасць працы апынуліся вышэй планавых. За кошт росту прадукцыйнасці працы было атрымана 72% прыросту прамысловай вытворчасці. Скарацілася колькасць адстаючых прадпрыемстваў.



Репозиторий ВГУ

Нарошчвалі аб'ёмы выкананых работ будаўнікі. За два гады яны ўвялі ў дзеянне асноўных фондаў у 1,3 разы больш, чым за адпаведны перыяд 10-й пяцігодкі. Выканалі план уводу жылля, школьных і дашкольных устаноў, аб'ектаў аховы здароўя [17, с. 9]. Лепшай будаўнічай арганізацыяй, якая мела высокія вынікі, у гэтыя гады быў трэст № 28 "Віцебскдзяржжылбуд". План будаўніча – мантажных работ 1982 г. калектыў трэста завяршыў яшчэ 8 снежня і дадаткова пабудаваў аб'ектаў на 1,5 млн рублёў. На завяршэнні 1982 г. удзельная вага прамысловай вытворчасці ў вобласці складала больш за 70% яе сукупнага валавога грамадскага прадукта. Гадавы аб'ём прамысловай прадукцыі ўтрымліваў ужо 4 млрд рублёў. За адзін месяц яе выпускалася ў вобласці больш, чым за ўвесь 1940 год . Гэта ў 230 разоў больш, чым у дарэвалюцыйны час.

Дасягнутыя вынікі ў развіцці прамысловасці за 1982 г. вывелі цэлы шэраг працоўных калектываў у лік пераможцаў Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва. Горад Орша, Чыгуначны раён г. Віцебска, калектывы Віцебскага лакаматыўнага дэпо і завода "Эвістар" былі адзначаны як лепшыя ў маштабах рэспублікі. Аднак 10 прадпрыемстваў вобласці ў гэты год не змаглі выканаць план па рэалізацыі прадукцыі і 11 – па вытворчасці працы. Хоць удзельная вага іх у цэлым была невысокай (каля 6%), але дзяржава недаатрымала ад іх прадукцыі на 5 млн рублёў.

У наступныя гады з ужываннем дэмакратычных, вядома ж, і камандна-адміністратыўных метадаў, часам, са скарыстаннем «штурмаўшчыны», адсталыя прадпрыемствы ўдалося вывесці на ўзровень выканання даведзеных заданняў. Ужо ў пачатку жніўня 1985 г. прамысловасць вобласці па тэмпах развіцця выйшла на кантрольныя лічбы пяцігодкі [18, с. 1]. Усе калектывы лёгкай, мяса-малочнай прамысловасці і бытавога абслугоўвання вобласці дабіліся высокіх тэмпаў росту вытворчасці працы, выканалі ў поўным аб'ёме дагаворныя абавязкі перад спажыўцамі [19, с. 1]. Справіліся з планавымі заданнямі па асноўных тэхніка-эканамічных паказчыках станкабудаўнічыя прадпрыемствы, працоўныя калектывы транспарту, сувязі, будаўніцтва.

Нельга не адзначыць плённую працу ў гэтыя гады калектыву Віцебскага спецыяльнага канструктарскага бюро зубашліфавальных і заточных станкоў (СКБ ЗШ і ЗС): 65%, спраектаваных тут у 1982 г. станкоў, гарантавала павышэнне прадукцыйнасці працы ў паўтара – два разы. Па выніках працы за 1982 г. калектыў канструктарскага бюро заняў другое месца сярод аналагічных устаноў Міністэрства станкабудаўнічай прамысловасці СССР. Цеснае супрацоўніцтва канструктараў са станкабудаўнічымі заводамі дазволіла стварыць і ўкараніць у серыйную вытворчасць комплекс высокапрадукцыйнага, высокадакладнага абсталявання. За творчую працу вялікай групе работнікаў канструктарскага бюро СКБ ЗШ і ЗС, аршанскага станкабудаўнічага завода "Чырвоны



Репозиторий ВГУ

барацьбіт”, віцебскага завода імя Кірава была прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларускай ССР за 1982 г. у галіне навукі і тэхнікі [20, с. 1].

У наступныя гады пяцігодкі калектыў канструктарскага бюро, разам са станкабудаўнічымі заводамі рэспублікі, стварыў і засвоіў выпуск новага пакалення высокааўтаматызаванага абсталявання з шырокім укараненнем мікрапрацэсарнай тэхнікі. 85% станкоў гэтай серыі была ўдастоена дзяржаўнага Знака якасці. Поспех канструктараў і станкабудаўнікоў рэспублікі быў настолькі значным, што многія рабочыя, ІТР і служачыя гэтай галіны ў 1985 г. былі зноў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Беларускай ССР у галіне навукі і тэхнікі [4, с. 17].

Уключэнне інтэнсіўных фактараў у перыяд 1985 г. дазволіла ліквідаваць на прамысловых прадпрыемствах вобласці 1500 неэфектыўных працоўных месцаў і каля 900 адзінак састарэлага абсталявання. Інтэнсіфікацыя вытворчасці забяспечыла перавод на механізаваную працу каля 54 тыс. працоўных, занятых ручной працай. За кошт гэтага, а таксама за кошт удасканалення арганізацыі працы, за гэтую пяцігодку ў цэлым умоўна было вызвалена 20 тыс. працуючых, асвоена вытворчасць 960 новых вырабаў. У 2,5 разы павялічаны выпуск прадукцыі вышэйшай катэгорыі якасці. Стабільна устойліва развіваліся прамысловыя прадпрыемствы абласнога цэнтра. Тут увесь прырост прадукцыі быў атрыманы за кошт росту прадукцыйнасці працы. Такія паказчыкі вызначылі тое, што Віцебск на завяршэнні 1985 г. у чарговы, восьмы раз стаў пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва “За высокую эфектыўнасць і якасць работы ў адзінаццатай пяцігодцы”. Такой жа адзнакі ўдастоіліся працоўныя калектывы станкабудаўнічага завода імя Кірава, швейнага аб'яднання “Рассвет”, Лукомльскай ДРЭС, вытворчага аб'яднання “Палімір”, дарожна-будаўнічага трэста № 1 Міністэрства будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог, Полацкае вытворчае лесанарыхтоўчае аб'яднанне.

Самаадданая праца і актыўная грамадская дзейнасць вылучылі ў лік передавікоў і наватараў вытворчасці вялікі атрад рабочых станкабудавання, транспарту, лёгкай прамысловасці і іншых галін. У іх ліку Героі Сацыялістычнай Працы М.В. Анібраева, А.С. Казлоў, кавалеры ордэнаў Працоўнай Славы ІІ і ІІІ ступені Л.П. Улаховіч, О.В. Федуковіч, Г.М. Хвашчоў, Н.А. Віташкевіч, кавалер ордэна Чырвонага Сцяга А.М. Марынічава. Высокімі вытворчымі вынікамі ў працы праславіліся ткачыхі вытворчага аб'яднання “Шкловалакно” С.В. Цура, і Т.А. Есінава, размотчыца гэтага ж прадпрыемства Г.К. Барэйка, ткачыха дыванновага камбіната Н.К. Хоцькіна, токар завода імя Камінтэрна Б. Н. Дзякін і токар-расточнік М.С. Цітоў, рабочая вытворчага аб'яднання “Кераміка” Е.І. Бальшакова, машыніст – інструктар Віцебскага лакаматыўнага дэпо Я.Т. Чарвякоў і многія іншыя [4, с. 19].

Рэпазіторый ВДУ

Абагульняючы сказанае, трэба падкрэсліць, што з сярэдзіны 60-х гг. да 1985 г. (уключна) прадпрыемствы рэспублікі ўдасканальвалі практыку гаспадарання і кіравання, арыентаваліся на якасныя паказчыкі, вялі тэхнічную пераасnастку, працавалі рэнтабельна. Разам з тэхнічным удасканальваннем вытворчасці ішло будаўніцтва новых аб'ектаў і пашырэнне існуючых прадпрыемстваў. Адбывалася канцэнтрацыя вытворчасці і рабочай сілы. Да сярэдзіны 80-х гг. у БССР былі створаны буйныя тэрытарыяльна-галіновыя прамысловыя комплексы, у якіх налічвалася каля 1490 прадпрыемстваў, больш паловы з якіх уваходзілі ў склад вытворчых і навукова – вытворчых аб’яднанняў. Прыкладаліся намаганні па ўдасканаленні метадаў працы і яе аплаты. Ішло ўкараненне брыгаднага падраду. За 1971–1985-я гг. на развіцце індустрыяльнага комплексу было накіравана капіталаўкладанняў у 3 разы больш, чым у папярэдняе пятнаццацігоддзе. Усё гэта спрыяла таму, што валавы грамадскі прадукт у 1985 г., у параўнанні з 1970 г., у БССР павялічыўся на 248%, прадукцыя прамысловасці – больш чым у 3 разы, прадукцыйнасць працы ў прамысловасці – у 2,3 раза, у тым ліку вытворчасць сродкаў вытворчасці – у 3,3, вытворчасць прадметаў спажывання – у 2,6 раза.

Істотны ўплыў на развіццё прамысловасці ў разглядаемыя гады аказвала транспартная сістэма. Галоўны цяжар перавозак прыходзіўся ў гэты час на чыгуначны транспарт. На яго долю на завяршэнні 11-й пяцігодкі прыходзілася больш за 52% грузавых і каля 40% пасажырскіх перавозак.

Хаця сярэднегадавыя тэмпы росту нацыянальнага даходу ў БССР, у гэтай пяцігодцы, ў параўнанні з дзевятай, знізіліся на 2,7%, прадукцыя прамысловасці амаль у два разы, прадукцыйнасць працы з 7,4% да 5,3%, але, параўноўваючы гэтыя ж паказчыкі ў дзесятай і адзінаццатай пяцігодках, трэба казаць не аб спадзе, а аб значным іх росце: Так, сярэднегадавы прырост нацыянальнага даходу ў 11-й пяцігодцы ў Беларусі склаў 5,6% (у 10-й пяцігодцы ён раўняўся – 5,2%), сярэднегадавы прырост прадукцыйнасці працы ў 11-й пяцігодцы супраць 10-й, таксама меў прырост – ад 4,2% да – 5,3%.

Відавочна, што ў СССР, які аб’ядноўваў 15 саюзных рэспублік, пачынаючы з сярэдзіны 70-х гг., адбывалася значнае запавольванне тэмпаў прыросту важнейшых паказчыкаў эфектыўнасці працы. Так, сярэднегадавы нацыянальны даход СССР у 9-й пяцігодцы складаў 5,7%, у 10-й -4,3, у 11-й – 3,6%. Назіраўся і спад прадукцыйнасці працы ад 4,5% у 9-й пяцігодцы да 3,1% у 11-й. Прыведзеныя лічбы – сведчанне таго, што эканамічнае развіццё Беларускай ССР на этапе 1970–1985-х гг. адрознівалася, у адносінах да агульнасаюзнага прамысловага комплексу, высокай прадукцыйнасцю працы, дынамізмам ва ўзвядзенні і пашырэнні індустрыяльных прадпрыемстваў, у выкарыстанні працоўных і матэрыяльных рэсурсаў. У БССР у гэтыя гады практычна завяршыўся

працэс **фарміравання індустрыяльнага грамадства, быў зроблены трывалы пераход у постіндустрыяльнае грамадства.** Гаспадарчы комплекс БССР меў у сярэдзіне 80-х гг. разгалінаваную структуру і глыбокі падзел працы. Была закладзена добрая аснова для збліжэння вытворчасці сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання. Характэрнай рысай беларускага грамадства ў гэты час была практычна поўная забяспечанасць вытворчасці неабходнымі кваліфікаванымі кадрамі. Павышэнне свайго адукацыйнага і прафесійнага ўзроўню людзі расцэньвалі як патрэбу асабістага самаўдасканалення, задавальнення сваіх духоўных запытаў, бачылі ў гэтым магчымасць зрабіць кар'еру. Адбывалася гэта за кошт прадуманасці і паслядоўнасці пры рэалізацыі вызначаных праграмных установак кіраўнікамі рэспубліканскага і мясцовага партыйнага і савецкага апарата. Творчы настрой пошуку ў развіцці эканомікі і сацыяльнай сферы, прынцыповасць пры вырашэнні пытанняў, якія тычацца абароненасці чалавека працы, што меліся ў вышэйшым кіраўніцтве рэспублікі, перадавалася партыйным, савецкім і гаспадарчым кіраўнікам у абласцях, гарадах і раёнах.

Добра бачна, што адчувальныя вынікі, атрыманыя на этапе сярэдзіны 60-х – сярэдзіны 80-х гг., немагчыма ўявіць без значнага ўплыву прынятых у 1965 г. пастаноў аб дэцэнтралізацыі кіравання і ўвядзенне дзяржразліковых таварна-грашовых механізмаў. Укараненне прадугледжаных рэформай палажэнняў прывяло да якасных змен у дзейнасці прамысловага комплексу БССР. Таму многія гісторыкі і эканамісты не робяць высноў аб тым , што эканоміка рэспублікі перыяду 1965–1985-х гг. знаходзілася ў крызісе. Яны сцвярджаюць (і гэтыя думкі можна прызнаць за праўдзівыя), што ў СССР рэформа сярэдзіны 60-х гг. не змагла істотна змяніць папярэдні парадак гаспадарчых сувязяў, якія склаліся на аснове доўгатэрміновых тэндэнцый цэнтралізаванай планавай сістэмы. Рэформа слаба закранула камандна-адміністрацыйную сістэму міністэрстваў і ведамстваў, не раскрыла ў поўнай меры магчымасці дзяржразліковых адносін. Неразвітасць формаў уласнасці і адсутнасць дастатковай гаспадарчай ініцыятывы прадпрыемстваў не спрыялі правядзенню карэнных эканамічных пераўтварэнняў. Нягледзячы на даволі высокія паказчыкі росту прамысловай вытворчасці, наша краіна мела сур’ёзнае адставанне ад перадавых дзяржаў ва ўкараненні ў вытворчасць дасягненняў навукова – тэхнічнага прагрэсу. Павялічвалася спажыванне сыравіны і паліва, захоўвалася высокая доля ручной працы. Асобныя прадпрыемствы не выконвалі планаў па выпуску прадукцыі са Знакам якасці. Шмат сіл і сродкаў ішло на дасягненне парытэту з ЗША ў ваеннай вобласці: выдаткі на развіццё ваенна-прамысловага комплексу ў СССР дасягалі 25% валавога нацыянальнага прадукту (у ЗША – 7–8%). Такое развіццё не спрыяла росту эфектыўнасці савецкай эканомікі ў параўнанні з эканомікай вядучых краін Захаду. І ўсё ж захады па ўкараненні новага ў

спалучэнні са старымі падыходамі давалі магчымасць эканоміцы рэспублікі (пра што будзе сказана ў наступнай тэме) да 1990 г. развівацца адносна высокімі і ўстойлівымі тэмпамі.

**Спасылкі**

1. Российский государственный архив новейшей истории (далее РГАНИ). – Ф. 17. – Оп. 145. – Д. 516.
2. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 136. – Д. 78.
3. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 18. – Д. 367.
4. Мандрик, И.В. Планы и реалии промышленного развития Витебщины в период 1976–1985гг. / И.В. Мандрик // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М.Машерова»: сборник научных трудов.– Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2014. – Т.18 .
5. Мандрик, И.В. Железнодорожный транспорт Беларуси: кадровая политика, общественно – политическая жизнь (1971–1991): дисс. докт. ист. наук / И.В. Мандрик. –Минск, 2004. – 230 с.
6. Народное хозяйство Белоруской ССР: стат. ежегодник. – Минск, 1975.
7. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 135. – Д. 19.
8. ГАВО. – Ф. 1. –Оп. 148. – Д. 80.
9. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 148. – Д.8.
10. ГАВО. –Ф. 1. – Оп. 151. – Д.2.
11. Об улучшении планирования и усилении воздействия хозяйственного механизма на повышение эффективности производства и качества работы: Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР от 12 июля 1979 года. – М., 1979.
12. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш. ]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. –728 с.; іл.
13. Партийная жизнь. – 1985. – № 17.
14. Мандрик, И.В. Белорусская железная дорога в 70–80-х глдах XX столетия: исторический, социально-экономический и политический аспекты. – Витебск: УПП «Витебская областная типография», 2003. –296 с.
15. Народнае хозяство Белорусской ССР в 1985 г. – Мн.., 1986.
16. НАРБ. – Ф. 4. – Оп. 117. – Д. 29.
17. Материал в помощь идеологическому активу. – Витебск, 1983. – 25 с.
18. Віцебскі рабочы. – 1986. – 18 янв.
19. Віцебскі рабочы. – 1986. – 2 февр.
20. Віцебскі рабочы. – 1983. – 1 янв.

## ТЭМА 8. **Сельская гаспадарка БССР у другой палове 60-х – першай палове 80-х гг.**

*1. Накірункі эвалюцыі вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы.*

*2. Умацаванне матэрыяльна –тэхнічнай базы і кадравае забеспячэнне вескі.*

***1. Накірункі эвалюцыі вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы.*** У папярэднім матэрыяле было паказана, што ад 1953 г. да сярэдзіны 60-х гг. сельская гаспадарка краіны знаходзілася ў значна горшым

Репозиторий ВГУ

становішчы чым прамысловы комплекс. На сакавіцкім Пленуме ЦК КПСС (1965 г.) былі названы прычыны адставання сельскай гаспадаркі. Яны заключаліся ў недастатковым уліку, а часта і парушэннях эканамічных законаў, а таксама прынцыпу суадносін грамадскіх і асабістых інтарэсаў калгаснікаў. Стратэгічным накірункам эвалюцыі вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы рашэннем Пленума была вызначана новая сістэма планавання і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, ажыццяўленне канцэнтрацыі вытворчасці ў цеснай звязцы з міжгаспадарчай кааперацыяй і аграпрамысловай інтэграцыяй.

Згодна з рашэннямі, прынятымі партыйным камітэтам, і распрацаванымі дзяржаўнымі органамі мерапрыемствамі , паслабляўся кантроль над калгасамі, устанаўліваліся цвёрдыя заданні закупак сельскагаспадарчай прадукцыі на шэраг гадоў наперад з павышэннем закупачных цэн. Звышпланавыя нарыхтоўкі прадукцыі дзяржава набывала ў гаспадарках з 50% надбаўкай да ўстаноўленага кошту. Адмяняліся абмежаванні прысядзібнай вытворасці , зніжаліся падаткі на сялянскае падвор’е. Зноў, як і ў 1953 г. , калгасам і саўгасам спісалі даўгі, павялічылі дзяржаўныя інвестыцыі [1, с. 258]. На развіццё сельскай гаспадаркі сталі дацiраваць з дзяржаўнага фонду па 70 руб. на кожнага жыхара краіны. Пры гэтым распаўсюджвалася ацэнка працы па яе канчатковых выніках праз гаспадарчы разлік. З пачатку 1969 г. было рэкамендавана ўвесці мінімальную гарантаваную аплату працы калгаснікаў – 60 руб. у месяц [2, с. 23].

Абапіраючыся на пастанову сакавіцкага (1965 г.) Пленума, у БССР ажыццяўлялася шырокая праграма мабілізацыі аграрыяў на ўстойлівае развіццё сельскай гаспадаркі. За 1966–1970-я гг. у сельскую гаспадарку Беларусі было ўкладзена 1,4 млрд руб. Разгарнуліся меліярацыйныя работы, было асушана больш за 900 тыс. гектараў забалочаных зямель. У 1985 г. плошча меліяраваных земляў (пераважна на Палессі) была даведзена да 2,8 млн га. Асушаныя землі давалі амаль адну трэць усёй прадукцыі раслінаводства і 40% кармоў. Высокімі ўраджаямі на асушаных землях адзначаліся ў гэты перыяд калгасы “Аснежыцкі” Пінскага, “40 гадоў Кастрычніка” Столінскага ,”Прагрэс” Гродзенскага раёнаў. Павышэнне эфектыўнасці сельскай гаспадаркі кіраўніцтва краіны звязвала з канцэнтрацыяй вытворчасці. У жывёлаводстве быў узяты курс на паскоранае будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў. Жывёлагадоўчыя комплексы па вытворчасці мяса і малака ўведзены ў калгасах імя С.М. Кірава і імя Чырвонай Арміі Віцебскага, “Рассвет” Кіраўскага раёнаў, у саўгасах “Днепр” Аршанскага , “Новае Палессе” Салігорскага раёнаў. У 1980 г. у Беларусі дзейнічалі 7 комплексаў і буйных фермаў па вытворчасці ялавічыны, 30 –свініны , 34 – малака, аснашчаных новай тэхнікай і прагрэсіўнымі на той час тэхналогіямі. Праз пяць год іх колькасць дасягнула адпаведна 94, 97 і 40. Аб эфектыўнасці працы буйных комплексаў сведчаць наступныя вынікі: у 1974 г. на вытворчасць 1 ц мяса



Рэпазіторый ВДУ

буйной рагатай жывелы затрачвалася 43 чалавека-гадзіны, свініны 30, малака 10, а на жывёлагадоўчых комплексах гэты паказчык быў у 2,5–3 разы ніжэй, а сабекошт прадукцыі ў 2–2,5 разы стаў меншым за агульнарэспубліканскія паказчыкі. Спецыялізацыя і канцэнтрацыя сельскагаспадарчай вытворчасці адбывалася за кошт узбуйнення часткі калгасаў і ператварэння асобных калгасаў у саўгасы. За восьмую пяцігодку ў саўгасна-дзяржаўную форму ўласнасці перайшло 135 калгасаў. У 1970 г. у БССР налічвалася 2206 калгасаў , тады як у 1965 г. – 2347.

Рашэнні сакавіцкага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС аказалі станоўчы ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці. На карце вобласці ў гэты час зноў паявілася 6 раёнаў(Дубровенскі, Расонскі, Ушацскі, Чашнікцкі,

Шаркаўшчынскі і Шумілінскі раёны, якія былі скасаваны ў 1962 г. Састаяліся раённыя партыйныя канферэнцыі і сесіі саветаў дэпутатаў, на якіх адбылося выбранне кіраўнічых структур [3, с. 45]. Працаўнікі вёскі актыўна ўключыліся ў правядзенне работ па паляпшэнні ўрадлівасці зямлі. Адкрыты школы перадавога вопыту па ўкараненні гаспадарчага разліку. У 1965 г. агратэхнічнай вучобай у калгасах і саўгасах вобласці было ахоплена 17614 чалавек, працавалі вучэбныя камбінаты, створаныя пры аддзяленнях “Сельгастэхніка”, школы практычнага вопыту па перападрыхтоўцы калгасных брыгадзіраў [4, с. 15]. Згодна з абласной праграмай меліярацыі зямель, за 1966–1970-я гг. на Віцебшчыне асушана 147,6 тыс. гектараў зямель (для параўнання: за ўсе папярэднія гады толькі 103,7тыс. га. [5, с. 48]. Вытворчыя фонды калгасаў і саўгасаў вобласці ўзраслі за пяцігодку на 31,4%, энергаўзброенасць у разліку на аднаго работніка павялічылася на 25%, аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі вырас на 34,8%; грашовыя даходы калгасаў – на 69,8%. Гэтыя вынікі аказаліся вышэй сярэднерэспубліканскіх. Ураджайнасць збожжавых за 5 гадоў вырасла з 11,5 ц да 16 ц з гектара. Узводзіліся фермы, машынныя двары і майстэрні , будавалася жыллё. У калгасах і саўгасах павялічвалася пагалоўе жывёлы.

Калгасы імя Кірава Віцебскага раёна, імя Сільніцкага Полацкага раёна, саўгасы “Янова” Сенненскага, імя Шмырова Віцебскага раёна, імя Леніна Талачынскага і іншыя засяродзіліся на паглыбленні спецыялізацыі сваіх гаспадарак (развіцці жывёлагадоўлі) на аснове міжгаспадарчай кааперацыі. У выніку працоўныя калектывы мелі высокую эканамічную эфектыўнасць, а працаўнікі – вялікі пакет сацыяльных ільготаў і гарантый. Пяцігадовы план дзяржаўных закупак усіх асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі быў перавыкананы [5, с. 14]. Аплата працы калгаснікаў з 1960 г. па 1970 г. узрасла ў 2,7 раз. Па эфектыўнасці развіцця сельскай гаспадаркі восьмая пяцігодка ў галіне апынулася лепшай, чым усе папярэднія. Гаспадарчая дзейнасць і сацыяльнае развіццё ў вёсцы станоўча адбілася на харчовым забеспячэнні насельніцтва вобласці. У ЦК КПБ

Рэпазіторый ВДУ

праца партыйных, савецкіх органаў, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый Віцебскай вобласці па выкарыстанні рычагоў гаспадарчай рэформы атрымала высокую адзнаку.

У той жа час вынікі ўкаранення эканамічнай рэформы ў калгасах і саўгасах Віцебшчыны, як і ў рэспубліцы ўвогуле , гэтага і наступнага часу сведчылі аб тым, што рэформа не раскрыла ў поўнай меры магчымасці для самастойнай і ініцыятыўнай дзейнасці сельскіх працоўных калектываў. Павольна і нераўнамерна адбываўся ўздым жывёлагадоўлі. Будаўніцтва буйных комплексаў не заўсёды прыводзіла да росту прадукцыі, эфектыўнасць іх у асобных выпадках была невысокай. Адным з фактараў, якія стрымлівалі развіццё жывёлагадоўлі, з'яўляўся недахоп кармоў і іх невысокая якасць. Забяспечанасць кармамі ў зімовы перыяд не перавышала 60–70%, вельмі павольна вырашаліся пытанні будаўніцтва кормапрадпрыемстваў [6, с. 48].

Не адказваў патрабаванням і пастаянна ўзрастаючы запыт сельскага насельніцтва ў бытавым абслугоўванні. У 1970 г. на тэрыторыі 162 калгасаў і 16 саўгасаў вобласці не было стацыянарных камбінатаў бытавога абслугоўвання [7, с. 51]. З цяжкасцю вырашаліся іншыя аспекты сацыяльнага развіцця вёскі. Так, за дзясятую пяцігодку планавалася пабудаваць за кошт грамадскіх фондаў калгасаў і саўгасаў вобласці 762,8 тыс. квадратных метраў жылля, а фактычна пабудавана 732,5 тыс м кв, выкананне плана склала толькі 96%. Вельмі абвостранай заставалася праблема будаўніцтва ўнутрыгаспадарчых дарог, асабліва пад'ездаў да фермаў і машынных двароў, добраўпарадкавання сельскіх вуліц, а таксама ўпарадкавання працягласці працоўнага дня, прадастаўлення работнікам выходных дзён і адпачынкаў.

У пачатку 1980-х гг. у краіне стала ажыццяўляцца аграпрамысловая інтэграцыя. У маі 1982 г. ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову “Аб паляпшэнні кіравання сельскай гаспадаркай і іншымі галінамі аграпрамысловага комплексу”. Згодна з пастановай былі створаны раённыя і абласныя аграпрамысловыя аб’яднанні. У БССР было створана 6 абласных і 117 раённых аграпрамысловых аб’яднанняў (РАПА). У іх склад уваходзілі ўпраўленні сельскай гаспадаркай райвыканкамаў, калгасы , саўгасы, прадпрыемствы і арганізацыі Белсельгасхіміі, будаўнічыя арганізацыі Мінсельбуда, дарожна –эксплуатацыйныя ўпраўленні Міндарбуда, мясакамбінаты, малочныя , пладова – агародніцкія прадпрыемствы, ільнозаводы, рыбхозы, лясгасы, іншыя арганізацыі, якія непасрэдна абслугоўвалі сельскую гаспадарку. Кіраўніцтва РАПА ажыццяўлялі саветы, якія ў межах іх кампентэнцыі з’яўляліся органамі дзяржаўнага кіравання. Для ўзмацнення ролі партыйных арганізацый на РАПА па рашэнні майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС у РК КПБ былі створаны сельгасаддзелы. Паўсюдна ішло ўкараненне ўнутрыгаспадарчага дзяржразліку. Калі ў 1982 г. на прынцыпах брыгаднага падраду ў

Рэпазіторый ВДУ

Віцебскай вобласці працавалі 18 вытворчых брыгад і 74 механізаваныя звяны, то ў 1986 г. ужо 719 брыгад і 64 звяны [8, с. 10].

Апагеем удасканалення працы аграпрамысловага комплексу з'явілася стварэнне Дзяржаўнага аграпрамысловага камітэта (Дзяржаграпрама). У снежні 1985 г. у Беларусі на базе міністэрстваў сельскай гападаркі, харчовай, мясной і малочнай, пладоваагароднай прамысловасці, дзяржаўнага камітэта па вытворча – тэхнічнаму забеспячэнні сельскай гаспадаркі быў утвораны Дзяржаграпрам БССР.

Значную частку выдаткаваных дзяржавай і ўласных сродкаў сельгаспрадпрыемствы скарыстоўвалі на вырашэнне сацыяльных праблем вёскі. Па сучасных на той момант праектах забудоўваліся вёскі і мястэчкі, ствараліся будынкі новых школ, бальніц, культурна – асветніцкіх устаноў. У многіх вёсках з'явіліся добраўпарадкаваныя вуліцы, пракладаліся вадаправоды, цэнтральнае ацяпленне, газ, каналізацыя і іншыя зручнасці.

Наладжвалася функцыянаванне прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. Заказы на паслугі можна было аформіць не толькі на комплексных прыёмных пунктах, але і ў сябе дома, па месцы працы, па тэлефоне. Станоўчыя прыклады гаспадарчых адносін і належнага клопату аб сацыяльна –бытавым стане насельніцтва вёскі магчыма прыводзіць па кожнай вобласці рэспублікі. У сярэдзіне 80-х гг. большасць вёсак калгаса "Расвет" Кіраўскага, калгаса імя Сільніцкага Полацкага раёна былі звязаны асфальтавымі дарогамі з цэнтральнай сядзібай, мелі сучасныя магазіны, клубы, бібліятэкі, сталоўкі, лазні. Тут, насуперак канцэпцыі "перспектыўных" і "неперспектыўных" вёсак, сур'ёзных праблем з задавальненнем камунальна – бытавых патрэб жыхароў дробных паселішчаў не існавала. Дзякуючы клопату аб насельніцтве невялікіх вёсак у гэтых гаспадарках забяспечвалася рацыянальнае выкарыстанне зямлі і працоўных рэсурсаў.

***2. Умацаванне матэрыяльна –тэхнічнай базы і кадравае забеспячэнне вёскі.*** Перыяд 1965–1985 гг. харрактарызаваўся пастаянным узрастаннем капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку рэспублікі. За 1971–1985-я гг. капіталаўкладанні ў развіццё сельскай гаспадаркі склалі 21919 млн руб, што ў 3,7 раза пераўзыходзілі ўзровень папярэдніх 15 гадоў. Так, за перыяд з 1959 г. па 1965 г. (часы сямігодкі) доля дзяржаўнага фінансавання сельскагаспадарчай галіны складала 58%, а ў восьмай пяцігодцы дзяржава ўклала ў аграрны сектар 56% [9, с. 208–209]. Да гэтага часу ўзраслі магчымасці развіцця аграрных гаспадарак за кошт уласных сродкаў. За кошт уласных магчымасцей калгасы і саўгасы вялі будаўніцтва, набывалі сельскагаспадарчую тэхніку, мінеральныя ўгнаенні.

За 1980–1985-я гг. асноўныя вытворчыя фонды гаспадарак Беларусі выраслі ў 1,4 раза, фондаўзброенасць працы – у 1,5 раза. Сельскагападарчыя прадпрыемствы аснашчаліся новай тэхнікай. Расла іх

фондаўзброенасць і энергаўзброенасць. За гады 11-й пяцігодкі сельская гаспадарка атрымала больш за 75 тыс. трактароў , каля 49 тыс. грузавых аўтамабіляў, 18 тыс. зернеўборачных камбайнаў, значную колькасць іншай тэхнікі [1, с. 407]. У сярэдзіне 70-х гадоў на кожную гаспадарку прыпадала прыкладна 37 трактароў, 10 збожжаўборачных камбайнаў. Ручная праца (даенне кароў, выдаленне навозу і г.д.) замянялася машынамі і механізмамі. Выкарыстоўвалася ўжо і сельскагаспадарчая авіяцыя. У шырокіх памерах развівалася хімізацыя і меліярацыя. З укараненнем эканамічных метадаў гаспадарання ў беларускай вёсцы адбываліся пазітыўныя змены, ішла стабілізацыя працоўных калектываў, расла адказнасць працаўнікоў за якасць выконваемай работы.

У маштабах рэспублікі назіраўся станоўчы дэмаграфічны працэс. Прасочвалася тэндэнцыя скарачэння сыходу людзей з вёскі. У калгасы і саўгасы вярталіся маладыя спецыялісты і кваліфікаваныя работнікі. Сярод іх было шмат людзей, якія раней пакінулі вёску. Адбывалася гэта дзякуючы той працы, якая вялася па пераўтварэнні ўсіх бакоў жыцця сялянства. Умацоўвалася зканоміка гаспадарак, ішло будаўніцтва жылля, школ, дзіцячых дашкольных устаноў, клубаў, дарог з цвёрдым пакрыццём, паляпшалася медыцынскае, гандлёвае і бытавое абслугоўванне. Энергаўзброенасць сельскай гаспадаркі БССР на аднаго работніка з 1965 г. па 1985 г. узрасла амаль утрая (з 12,7 л.с. да 32,6 л.с.). У 1985 г. на вёсцы выкарыстоўваўся 1 млн электраматораў, спажывалася ў год 46 млрд квт гадзін электраэнергіі ( гэта ў 36 разоў болей чым у 1960 г.).

Мэтанакіравана вырашалася праблема будаўніцтва памяшканняў для захоўвання тэхнікі ў Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай вобласці. У Гомельскай вобласці толькі за адзін 1981 г. было пабудавана і рэканструявана 14 машынных двароў і рамонтных майстэрняў, 9 нафтабаз. У 1982 г. тут налічвалася 441 майстэрня і 216 тыпавых нафтабаз. У Гродзенскай вобласці за 1984 г. уведзена 26 машынных двароў, 16 рамонтных майстэрняў, 17 нафтабаз. Такія ж зрухі адбываліся ў іншых рэгіёнах рэспублікі. У 1985 г. у параўнанні з 1976 г. забяспечанасць рамонтнай базай, машыннымі дварамі і магчымасцямі захоўвання тэхнікі ўзрасла ў 3–4 разы [10, с. 141–142].

Перавод сельскай гаспадаркі на індустрыяльную аснову патрабаваў падрыхтаваных кіраўнікоў і спецыялістаў. Іх рыхтавалі ВНУ і сярэднія навучальныя ўстановы. Па колькасці падрыхтаваных спецыялістаў СССР і БССР апярэджвалі многія краіны свету. У сярэдзіне 70-х гг. у кожным калгасе і саўгасе працавала не меньш за 20 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

За перыяд 70–80-х гг. у БССР вырасла плеяда таленавітых арганізатараў сельскагаспадарчай вытворчасці. Лепшымі старшынямі ў краіне ў гэтыя гады з’яўляліся двойчы Героі Сацыялістычнай працы У. Ралько (калгас “Аснежыцкі”, Пінскі раён), К. Арлоўскі (калгас

Рэпазіторый ВДУ

“Рассвет”, Кіраўскі раён), В. Бядуля (калгас “Савецкая Беларусь”, Камянецкі раён) , а таксама Героі Сацыялістычнай працы – Я. Кімстач (калгас імя Сільніцкага, Полацкі раён), Л. Сіроткіна (калгас XVIII партз’езда, Талачынскага раёна) і шмат іншых. Многія гаспадаркі мелі ўстойлівыя паказчыкі збору зернавых (да 30 ц), бульбы (да 200 ц) з аднаго гектара, надояў малака (больш 5 тыс. літраў на карову), а таксама іншай сельскагаспадарчай прадукцыі. Сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі было шмат сумленных, адданых сваёй справе людзей, якія мелі для таго часу высокія паказчыкі. Аператар машыннага даення калгаса імя Жданава Брэсцкага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Л.Брызга надойвала больш за 5,5тыс кг малака на 1 карову. З задавальненнем яна перадавала свой вопыт другім. У Брэсцкай вобласці разгарнуўся рух за атрыманне ў год ад кожнай каровы 4 тыс. і больш кілаграмаў малака. Рух за высокія надоі стаў распаўсюджвацца ў іншых абласцях БССР. У 1986 г. 39 даярак рэспублікі атрымалі па 6 тыс. кг малака ад каровы. Пяцітысячную адзнаку перавысілі ў гэтым годзе 215, чатырохтысячную – 1429 чалавек [1, с. 415].

У плане скіраванасці на інтэнсіўны шлях развіцця вёска БССР была прыкладам для іншых рэгіенаў. Вытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў у гаспадарках Беларусі была наладжана лепш, чым у СССР увогуле. Пры 1,7% агульнай па СССР плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў і 2,7% ворнай зямлі ў БССР у першай палове 80-х гг. выраблялася 5,7–5,8% аб’ёму мяса, 15–16% бульбы, чвэрць ільнопрадукцыі ад аб’ёмаў іх вытворчасці ў СССР. У 1988–89 гг. збор збожжа ў рэспубліцы на душу насельніцтва раўняўся 832 кг (для параўнання, у ЗША – 842), вытворчасць мяса – 117 (ЗША – 122), малака – 726 (ЗША – 268), бульбы – 1085 (ЗША – 65). Доля Беларусі ў пастаўках мяса ў агульнасаюзны фонд складала 12%, малака – 14%[ 11, с. 241].

Важная ўнутрыпалітычная задача вырашалася ў краіне ў сувязі з рэалізацыяй харчовай праграмы, прынятай майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС. Адным з напрамкаў павелічэння выпуску прадукцыі сельскай гаспадаркі стала стварэнне прамысловымі прадпрыемствамі падсобных гаспадарак. Найбольш паспяхова вырашаліся гэта задача на прадпрыемствах ваенна –прамысловага комплексу. “Маяком” у стварэнні дадатковай для сябе прадукцыі сельскай гаспадаркі быў наваполацкі завод “Вымяральнік”. За 1981–1985-я гг. калектыў завода выдзеліў на будаўніцтва сельскагаспадарчых аб’ектаў 702 тыс. руб. і больш чым на 100 тыс. руб. закупіў тэхнікі і сельскагаспадарчага інвентару. Быў уведзены адкормачны комплекс на 260 галоў буйной рагатай жывёлы, ферма на 100 галоў, 6 жылых дамоў , сталовая на 45 пасадачных месцаў. У 1983 г. гаспадарка завода рэалізавала 1164 ц малака і 737 ц мяса, у 1984 г. адпаведна 1530 ц і 992 ц Вопыт кіраўніцтва завода быў ухвалены Віцебскім абкамам партыі і аблвыканкамам.

Рэпазіторый ВДУ

На Гомельшчыне стварэннем падсобнай гаспадаркі паспяхова займаўся працоўны калектыў аб’яднання Беларуснафта. У Светлагорскім раёне на базе населенага пункта Хутар быў утвораны саўгас “Нафтавік”, а ў Рэчыцкім раёне была ўзята ў арэнду вучэбная гаспадарка тэхнічнага вучылішча. Пасля ўводу ў дзеянне цяплічнага комплексу амаль у 2 тыс. кв м працаўнікі прадпрыемства змаглі набываць ніжэй за дзяржаўны кошт свежую агародніну, малако, мяса, сыры , свежую рыбу. Колькасць прамысловых прадпрыемстваў, якія наладзілі дзейнасць сваіх сельскіх гаспадарак, пастаянна павялічвалася. У 1987 г. іх колькасць ад 1114 у 1983. узрасла да 1900.

Значны ўклад у выкананне харчовай праграмы ўносілі прыватныя гаспадаркі калгаснікаў, рабочых саўгасаў і служачых. Для ўладкавання прыватных гаспадарак калгаснікам выдаваліся крэдыты, што стала вынікам нарошчвання і продажу дзяржаве прадукцыі сельскай гаспадаркі. У 1984 г. на долю асабістых гаспадарак рэспублікі прыпадала 53% усяго аб’ёму вытворчасці бульбы, 48% агародніны, 5% мяса жывёлы і птушкі, больш за 30% малака, 20% воўны і амаль 50% яек [12, с. 246].

Аднак, нягледзячы на цэлы шэраг захадаў дзяржавы, у тым ліку частыя змены структуры кіравання, усё тыя ж прычыны: няпоўная самаініцыятыўнасць гаспадарання, безгаспадарчасць, слабая зацікаўленасць сялян у атрыманні добрых вынікаў, высокія затраты на вытворчасць прадукцыі перашкаджалі атрымаць адэкватныя канчатковыя вынікі ў гэтай галіне гаспадаркі. Асобныя сельскія гаспадаркі рэспублікі аказваліся нерэнтабельнымі. У пачатку 80-х гг. такіх гаспадарак налічвалася 1475, што складал амаль палову ад іх агульнай колькасці [13, с. 21].

Вялікімі намаганнямі значную частку з іх да 1984 г. удалося вывесці з ліку адстаючых (нерэнтабельнымі засталося толькі 111 гаспадарак). У 1986 г., у параўнанні з 1982 г., гэтыя гаспадаркі атрымлівалі ўжо прыбытак. Аб’ёмы закупак малака ў іх выраслі на 37,5%, жывёлы і птушкі – на 28,3%, продаж буйной рагатай жывёлы вагой больш за 400 кг павялічыўся ў 2,7 раза.

І ўсё ж значная частка сельскіх жыхароў рэспублікі на гэтым этапе яшчэ была схільная да міграцыі. Прычыны гэтага, на думку навукоўцаў, якія вывучалі ў той час міграцыйныя настроі насельніцтва ў адным з раёнаў Віцебскай вобласці (Шумілінскім), зводзіліся да незадаволенасці насельніцтва характарам і ўмовамі працы, адсутнасцю або дрэннай працай дзіцячых дашкольных устаноў, агульнаадукацыйных школ, медыцынскіх устаноў, незадаволенасць работай транспарта, забеспячэннем таварамі паўсядзённага попыту [14, с. 22].

Нявырашанай праблемай вёскі на працягу ўсіх гадоў заставалася замацаванне спецыялістаў, жывёлаводаў і механізатараў. Насельніцтва ў вёсцы старэла. У 1981 г. на 100 сем’яў калгаснікаў у Віцебскай вобласці прыпадала 80 пенсіянераў і непрацаздольных [15, с. 49]. У студзені 1985 г. у БССР налічвалася 38 тыс. жывёлаводаў перадпенсійнага і пенсійнага

ўзросту, замену якім знайсці ў бліжэйшы час было вялікай праблемай [4, с. 18]. Назіралася высокая змяняемасць механізатарскіх кадраў. Нізкім тэхнічным узроўнем і ненадзейнасцю ў эксплуатацыі вызначалася пастаўляемая ў вёску тэхніка. Не адпавядаў патрабаванням часу ўзровень кампетэнтнасці галоўных спецыялістаў калгасаў і саўгасаў. Так , у сярэдзіне 80-х гг. 28% спецыялістаў рэспублікі гэтага прызначэння не мелі вышэйшай адукацыі. Больш за 4,5 тыс. участкаў, брыгад і фермаў узначальвалі практыкі [16, с. 63]. Вялікая колькасць прадукцыі страчвалася ў выніку безгаспадарчасці падчас уборкі ўраджая і яго захоўвання.

Не ўдалося пазбегнуць сур'ёзных недахопаў пры правядзенні меліярацыі. Часам яна вялася някомплексна і няякасна.Марудна нарошчваліся магутнасці па больш глыбокай перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, выпуску паўфабрыкатаў, харчовай прадукцыі з бульбы, агародніны. Прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы СССР (з улікам страт ад безгаспадарчасці) была амаль у 4 разы ніжэйшай, чым у краінах з рыначнай эканомікай.

Такім чынам, вывучэнне стану ў сельскай гаспадарцы рэспублікі на этапе другой паловы 60-х – першай паловы 80-х гг. дае падставу казаць, што партыйныя і савецкія органы краіны рабілі захады па ўдасканаленні кіравання і планавання гэтай галіны. Эвалюцыя вытворчых адносін на вёсцы, умацаванне матэрыяльна –тэхнічнай базы і кадравае забеспячэнне галіны садзейнічала паступоваму павышэнню эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. У БССР налічвалася нямала гаспадарак , якія шляхам выкарыстання дасягненняў навукі і передавога вопыту атрымлівалі нядрэнныя вынікі. Рэспубліка па вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў была ў ліку перадавых. Аднак дабіцца ад калгаснікаў і рабочых саўгасаў сапраўднай зацікаўленасці ў выніках працы, ініцыятывы і прадпрымальнасці не ўдалося.

**Спасылкі**


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. –728 с.; іл.

2. Зборнік законаў БССР. – 1969. – № 4.

3. Дементей, Н.И. Уроки жизни /Н.И. Дементей. – Мн.: БЕЛТА, 2005. – 272 с.

4. Смяховіч, М.У. Спецыялісты масавых прафесій у сельскай гаспадарцы Беларусі (1953–1985) / М.У. Смяховіч // Учёные записки УО "ВГУ им. П.М. Машерова": сборник научных трудов. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2017. – Т. 23. –192 с.

5. Яснов, В.А. Деятельность областной партийной организации по развитию сельского хозяйства / В.А. Яснов// История Витебской областной партийной организации: традиции и преемственность: тезисы докл. научн.–теорет. конф. – Витебск, 16 окт. 1987. – С. 47–50.

6. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 154. – Д. .9


Репозиторий ВГУ

7. Цандо, П.Н. Забота о выполнении планов социального развития, росте благосостояния трудящихся / П.Н. Цандо // История Витебской областной партийной организации: традиции и преемственность: тезисы докл. научн.-теорет. конф. – Витебск, 16 окт. 1987. – С. 47–50.
8. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 154. – Д. 9.
9. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1975: стат.ежегодник. Мн., 976.
10. Государственный архив общественных организаций Гомельской области (ГАОО ГО). – Ф. 144. – Оп. 160. – Д. 70.
11. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі). – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – 276 с.
12. Хусаинов, Ю.М. На пути к большому хлебу / Ю.М. Хусаинов. Мн., 1985.
13. РДАНГ. – Ф. 5. –Оп. 90. – Д. 400.
14. Мандрик, И.В. Миграция. Как её уменьшить? / И.В. Мандрик // Сельское хозяйство Белоруссии. – 1988. – № 5. – С. 22–23.
15. НАРБ. – Ф. 48. – Оп. 14. – Д. 2814.
16. Марчанка, И.Е. Белорусская ССР: Курсом перестройки / И.Е. Марченко, В.И. Новицкий. – Мн., 1989.

## ТЭМА 9. **Змены ў сацыяльна-бытавой сферы БССР ва ўмовах НТР (1966–1985 гг.)**

*1. Дэмаграфічная сітуацыя, сацыяльная і нацыянальная структура насельніцтва .*

*2. Жыццёвы ўзровень народа.*

*3. Палітычная сістэма, працэсы дэмакратызацыі.*

**1. Дэмаграфічная сітуацыя, сацыяльная і нацыянальная структура насельніцтва.** Прыступаючы да вывучэння гэтага пытання, неабходна адзначыць, што як і ў папярднія гады , у рэспубліцы назіраліся істотныя змены ў колькасным і якасным складзе насельніцтва**.** З 1966 г. па 1986 г. насельніцтва БССР павялічылася на 1,3 млн чалавек (або на 16,5%). Па дадзеным статыстыкі ў сярэдзіне 70-х гг. Беларусі ўдалося выйсці на даваенны ўзровень па агульнай колькасці насельніцтва, а на 1.01.1986 г. насельніцтва БССР складала 10 млн 400 тыс.чалавек. У Віцебскай вобласці на гэты час пражывала 1397 тыс. жыхароў [1, с. 440].

Індустрыялізацыя і хуткае развіццё прамысловасці прывялі да таго, што ў 1960 г. рабочыя ў сацыяльным складзе сярод занятага насельніцтва складалі 45%, служачыя – 14,6%. У далейшым гэтыя сацыяльныя групы мелі тэндэцыю да хуткага росту. У 1985 г. рабочы клас дасягнуў 60%, а служачых налічвалася ўжо 25,4%. У той жа час доля калгаснікаў сярод занятага насельніцтва знізілася з 40% у 1966 г. да 14,6% у 1988 г.

Нягледзячы на даволі высокі ўзровень змяншэнне колькасці калгаснікаў увогуле, асобныя прафесійныя групы наадварот мелі тут тэндэнцыю да росту. Гэта, перш за ўсё, механізатарскія кадры: трактарысты-машыністы , трактарысты, камбайнеры, шафёры. Значныя

змяненні ва ўмовах працы адбываліся на жывёлагадоўчых фермах, яны таксама пераходзілі на механізаваны спосаб вытворчасці. Але індустрыяльныя метады на вёсцы прыжываліся марудна. На калгасных палетках і фермах сельскаму насельніцтву даводзілася займацца некваліфікаванай цяжкай працай, якая не прываблівала да сябе моладзь, што імкнулася да ведаў, мела цягу да тэхнікі. У 1970 г. на тысячу занятых у грамадскай вытворчасці калгаснікаў было 63 чалавекі з вышэйшай, незакончанай вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і сярэдняй агульнай адукацыяй ( сярод рабочых гэты паказчык быў больш чым у тры разы вышэй – 211) [2, с. 63–66].

З развіццём вытворчасці былі звязаны істотныя змены колькасці і складу работнікаў у прамысловых галінах. Іх шэрагі значна папоўніліся і абнавіліся, пераважна моладдзю. На пачатку 70-х гг. сярэднегадавая колькасць рабочых і служачых у БССР дасягнула 1585,8 тыс. чал. Назіралася масавае далучэнне да працы на прадпрыемствах і ўстановах жанчын. Жанчыны складалі больш за 50% ад усіх працоўных рэспублікі. У 1982 г. у гандлі і грамадскім харчаванні, ахове здароўя іх доля дасягала 82%, а ў народнай адукацыі – 75%. У гістарычнай навуцы гэтыя змяненні звязваюць з аб’ектыўнымі працэсамі ў развіцці грамадства ва ўмовах навукова- тэхнічнага прагрэсу. Прамысловыя, транспартныя і будаўнічыя арганізацыі патрабавалі папаўнення кантынгента работнікаў, што і адбывалася на практыцы. Вядома, што акрамя асноўнай, жанчыны выконвалі амаль усю хатнюю працу. Такое становішча ўскладняла сямейныя адносіны і дэмаграфію.

Істотныя змены адбыліся на гэтым гістарычным этапе ў характары працы ўсіх катэгорый насельніцтва. Пад уздзеяннем НТР частка рабочых вызвалялася ад цяжкай фізічнай працы: да пачатку 80-х гг. каля 70% прамысловых рабочых выкарыстоўвалі механізацыю і аўтаматызацыю. Натуральна, што такія ж працэсы адбываліся і на вёсцы. Назіраецца ў гэтыя гады вялікі рост работнікаў у галіне даследчыцкай, канструктарскай, тэхналагічнай і кіруючай дзейнасці (галіны невытворчай сферы).

Адметнае месца ў асяроддзі людзей разумовай працы займала навуковая інтэлігенцыя. Для гэтай сацыяльнай групы назіраўся высокі тэмп колькаснага росту. У 1970 г. ва ўстановах навукі і і навуковага абслугоўвання рэспублікі працавалі 17,4 тыс. чалавек з вышэйшай адукацыяй, тады як у 1957 г. іх было 3,5 тыс. [3, с. 237].

Колькасна і якаснага прырастала навуковая інтэлігенцыя: з 1960 г. да 1970 г. колькасць кандыдатаў навук павялічылася з 2013 да 5564, а людзей са ступенню доктара навук – з 181 да 425. Найбольш значнае колькасць дактароў навук працавала ва ўстановах медыцынскага, сельскагаспадарчага і тэхнічнага профіляў. Сярод гісторыкаў у 1960 г. налічвалася 6 чалавек са ступенню доктара , а ў 1970- 32. У канцы 1985 г. кандыдатаў навук у БССР было 13,2 тыс., а дактароў навук – 1 тыс.

Репозиторий ВГУ

Паводле колькасці кандыдатаў навук гісторыкі саступалі эканамістам і філолагам, а па дактарах навук –толькі эканамістам.

Нацыянальны склад насельніцтва ў пасляваенны час у асноўным адпавядаў тым працэсам, якія адбываліся ў СССР, а менавіта, інтэрнацыяналізацыі саюзных рэспублік. На час правядзення Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1970 г. на тытульную нацыю ў БССР прыпадала 81% яе жыхароў, а паводле перапісу 1979 г. на фоне росту агульнай колькасці беларусаў (з 7290 да 7568 тыс.) іх удзельная вага састаўляла - 79,4%. Нязначнае падзенне ўдзельнай вагі беларусаў у рэспубліцы было звязана з будаўніцтвам аб’ектаў саюзнага падпарадкавання і накіраваннем сюды спецыялістаў і рабочых з іншых рэгіёнаў.

***2. Жыццёвы ўзровень народа.*** Тэарэтычна сацыяльная палітыка савецкай дзяржавы заўседы была скіравана на павышэнне дабрабыту насельніцтва. Зусім слушна дэкларавалася, што паляпшэнне ўмоў жыцця грамадзян краіны магло адбывацца не інакш, як з улікам нацыянальнага даходу. (Нацыянальны даход – ёсць наваствораны грамадскі прадукт у галінах матэрыяльнай вытворчасці, за выключэннем спажытых у працэсе вытворчасці сродкаў (матэрыялаў, электрычнай энергіі, і г.д.).

З развіццём асноўных сфер матэрыяльнай вытворчасці нацыянальны даход СССР і БССР на гэтым этапе кожны год прырастаў прыкладна на 8 - 10% , што дазваляла дзяржаве рабіць пэўныя крокі да павышэння жыццёвага ўзроўню народа.

Асноўнай крыніцай даходаў занятага насельніцтва з’яўлялася заработная плата. Дзяржава клапацілася аб тым, каб заработная плата стымулявала працоўных да высокапрадукцынай працы. На пачатку 60-х гг. у краіне праведены мерапрыемствы па ўпарадкаванні заработнай платы. Былі павялічаны заробкі нізкааплатным работнікам. У выніку чаго ў БССР ўдзельная вага асоб з заработнай платай да 60 руб. у месяц зменшылася ў параўнанні з аналагічным паказчыкам 1959 г. у 2,1раза.

Праяўляўся клопат аб паляпшэнні дабрабыту сялян. На пачатку 1958 г. ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі рашэнне аб адмене з 1 студзеня 1958 г. абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў з асабістых вясковых гаспадарак, а таксама пастановы аб павышэнні закупачных цэн, змяншэнні падаткаў на сялянскі двор , што садзейнічала росту даходаў калгасаў і іх працаўнікоў [4, с. 66].

З другой паловы 60-х гг. па ўсёй краіне для працаўнікоў калгасаў была ўведзена гарантаваная штомесячная аплата працы. Паступальнае развіццё народнай гаспадаркі, сацыяльная палітыка дзяржавы прывялі да паляпшэння дабрабыту працоўных рэспублікі. Сярэдняя заработная плата рабочых і калгаснікаў штогод прырастала на 3–4%. У цэлым па народнай гаспадарцы БССР заработная плата складала: у 1965 г. 80,9 руб., у 1966 г. – 85,1 руб. , у 1967г. – 89,3 руб., у 1968 г. – 97,3руб., у 1969 г. – 101,8руб.,

Репозиторий ВГУ

у 1970 г. – 106,4 руб. У 1985 г. па СССР яна склала 173 руб., мінімальная – 70 руб.

Паступовы рост даходаў насельніцтва адбываўся не толькі з павелічэннем зарплаты, але і за кошт грамадскіх фондаў спажывання. Дзяржаўныя датацыі, якія вылучаліся з грамадскіх фондаў спажывання для задавальнення патрэбаў людзей, – гэта даволі вялікія сродкі. Яны выкарыстоўваліся на фінансаванне дзіцячых клубаў, спартыўных секцый, на змяншэнне кошту пуцёвак у дамы адпачынку, санаторыі. Значныя сродкі з грамадскіх фондаў спажывання атрымлівалі іншыя групы працоўных, а таксама незанятае ў народнай гаспадарцы насельніцтва – пенсіянеры, навучэнцы, дзеці дашкольнага ўзросту. З гэтых фондаў кожнаму рабочаму і служачаму штомесячна дадавалася да зарплаты ў 1965 г. – 32 руб., у 1970 г. – 39 руб. [5, с. 229]. У наступныя гады датацыі з грамадскіх фондаў істотна ўзрасталі. У 1984 г. у разліку на кожнага жыхара выплаты і ільготы з грамадскіх фондаў спажывання склалі ў сярэднім 508 руб. Штомесяц з гэтых фондаў кожны рабочы і служачы атрымліваў дадаткова да сваёй заработнай платы прыкладна 75 руб. [6, с. 30].

У выніку за 1970–1985-я гг. савакупны даход на члена сям'і рабочых і служачых у год (з разлікам ільгот ад грамадскіх фондаў спажывання) у СССР павялічыўся з 1021 руб. у 1970 г. да 1625 руб. у 1985 г.; у калгаснікаў адпаведна – з 697 руб. да 1334 руб.

Пры гэтым кошты на большасць прадуктаў харчавання і прамысловыя тавары масавага попыту заставаліся стабільнымі, а на хлеб, бульбу, гародніну, цукар – вельмі нізкімі. Насельніцтву надаваліся вялікія ільготы па квартплаце, за карыстанне грамадскім транспартам, на харчаванне ў працоўных сталовых і знаходжанне ў дамах адпачынку.

За 70-я – першую палову 80-х гг. адбылося выраўноўванне памераў савакупнага даходу сямей гараджан і сялян. Зблізіліся і асноўныя артыкулы расходаў гараджан і сялян на харчаванне , набыццё нехарчовых тавараў, культурна – бытавых паслуг. На харчаванне трацілася ў рабочых і сялянскіх сем'ях да 32–35% савакупнага даходу, на культбытавыя паслугі ў гарадах – 22–23%, на вёсцы – 15–16%.

Адбыліся за гэты перыяд значныя зрухі ў сферы пенсійнага забеспячэння. У 1985 г. у БССР пенсіі і дапамогі выплачваліся 2,1 млн чал. (у 1979 г. колькасць асоб , для якіх пенсія з'яўлялася асноўнай крыніцай існавання складала 1,6 млн чал.) [7, с. 19].

У БССР даходы насельніцтва перавышалі сярэдні ўзровень, які склаўся да гэтага часу ў СССР. Тут матэрыяльныя і культурныя запыты чалавека задавальняліся паўней. Насельніцтва Беларусі лепш забяспечвалася харчовымі і прамысловымі таварамі. У выпуску прадукцыі лёгкай прамысловасці БССР саступала толькі Латвіі і Эстоніі. У 1975 г. продаж найважнейшых тавараў народнага спажывання ўсім катэгорыям насельніцтва павялічыўся ў параўнанні з 1965 г. у 2,4 раза, нехарчовых

Рэпазіторый ВДУ

тавараў – у 2,6 раза. На даволі высокім узроўні было ў гэты час спажывання каларыйных прадуктаў харчавання: мяса на аднаго чалавека ў сярэднім прыходзілася 70 кг, малака і малочных прадуктаў – 395 кг, яек – 319 шт., цукру – 44 кг. Істотна ўзраслі ўклады гарадскога і сельскага насельніцтва ў ашчадных касах.

З кожным годам паляпшаліся жыллёвыя ўмовы жыхароў рэспублікі. За 1956–1965-я гг. новыя кватэры атрымалі 3,1 млн чалавек, ці 36% насельніцтва. Для насельніцтва Віцебшчыны ў гарадах і рабочых пасёлках за 1966–1970-я гг. (8-ая пяцігодка) пабудавана каля 3 млн квадратных метраў жылля, 233 новыя школы, 77 дашкольных устаноў, 300 прадпрыемстваў гандлю [8, с. 63].

У 9-й пяцігодцы ў вобласці пабудавана і здадзена ў эксплуатацыю 3 млн 57 тыс. квадратных метраў агульнай жылой плошчы, уведзена ў строй дзеючых 89 школ на 42,6 тыс. вучнёўскіх месцаў. У вёсках за кошт дзяржаўных сродкаў узводзілася жыллё, установы народнай адукацыі, культуры, навукі, быту. Вялікая ўвага надавалася аздараўленню працаўнікоў вёскі і членаў іх сем'яў. Штогод па бясплатных і ільготных пуцёўках у санаторыі і дамы адпачынку, пансіянаты, турыстычныя базы накіроўваліся сотні работнікаў. У Бешанковіцкім, Глыбоцкім, Докшыцкім, Дубровенскім, Лёзненскім, Аршанскім, Полацкім, Сенненскім, Ушацкім раёнах, у аб'яднанні «Віцебскхлебпрам» функцыянавалі школьныя лагеры. У іх у летні перыяд аздараўлялася штогод больш за 3 тыс. дзяцей сельскіх працаўнікоў.

Статыстыка сведчыць: за 1970–1985-я гг. больш за 6 млн жыхароў рэспублікі атрымалі дзяржаўныя ці пабудавалі асабістыя кватэры, а за 1960–1985-я гг. у БССР палепшылі жыллёвыя ўмовы амаль 10 млн чалавек. Але задаволіць патрэбы насельніцтва ў добраўпарадкаваным жыллі дзяржава не змагла. У 1989 г. амаль 30% жыхароў Беларусі, і больш усяго адзінокіх людзей, чакалі вырашэння жыллёвай праблемы.

Як бачна, развіццё асноўных сфер матэрыяльнай вытворчасці дазваляла дзяржаве рабіць пэўныя крокі для пастулальнага росту матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню насельніцтва рэспублікі. Само сабой зразумела, што пры больш паспяховым развіцці сельскай гаспадаркі паказчыкі ўзроўню жыцця насельніцтва Беларусі маглі б быць значна вышэйшымі. Аднак планы і мэты вывядзення краіны і грамадства на якасна новы ўзровень цалкам не стасоўваліся. СССР, у меншай ступені Беларусь, працягваў развіццё на экстэнсіўнай аснове, а інтэнсіўнае развіццё вельмі слаба падпарадкоўвалася планавай каманднаадміністрацыйнай сістэме. Шмат дзе на прадпрыемствах пераважала ручная вытворчасць. Не выкарыстоўваўся належным чынам прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці. Сур'ёзным абмежаваннем пры матэрыяльным забеспячэнні насельніцтва было тое, што вытворчасць не была зарыентавана ў бок чалавека. Да сярэдзіны 80-х гг. прыярытэтнае развіццё надавалася вытворчасці групы "А", у той час як вытворчасць

прадметаў спажывання (група “Б”) адставала і не забяспечвала ў поўнай меры патрэбы насельніцтва. У канцы 70-х – пачатку 80-х гг. адчувалася недаацэнка развіцця матэрыяльнай базы сацыяльна-культурнай сферы, назіраўся "астаткавы прынцып" выдаткавання рэсурсаў на гэтыя мэты.

***3. Палітычная сістэма, працэсы дэмакратызацыі***. Пасля смерці Сталіна, асабліва пасля XX з’езда партыі (адбыўся 14–25.02.1956 г.) у грамадска-палітычным жыцці краіны пачалі браць верх дэмакратычныя тэндэнцыі, адбылася прыкметная лібералізацыя, "адліга”. Спынены рэпрэсіі, праведзена частковая рэабілітацыя, людзі больш свабодна выказвалі свае думкі.

Рабіліся спробы павышэння ролі Саветаў дэпутатаў працоўных (такую поўную назву Саветы мелі да 1977 г., пасля гэтай даты яны называліся Саветы народных дэпутатаў), як сапраўдных органаў народаўладдзяя. Было імкненне надаць ім у поўным аб’ёме ўласцівыя для іх уладныя функцыі па развіцці эканомікі і сацыяльнай сферы. Былі пашыраны правы абласных, гарадскіх і раённых Саветаў. Ім было нададзена права накіроўваць значныя сродкі на фінансаванне жыллёвага будаўніцтва, камунальнай гаспадаркі, на добраўпаракаванне населеных пунктаў за кошт атрыманых даходаў і звышпланавых назапашванняў. У склад Саветаў усё больш і больш уключалася рабочых і калгаснікаў. Гэта азначала далучэнне працоўных да дзяржаўнага кіравання. Напрыклад, у складзе мясцовых Саветаў БССР у пачатку 70-х гг. было каля 30,7% рабочых, а ў 1980 – 41% [9, с. 130].

Па розных напрамках дзейнасці Саветы стваралі камісіі: у 1970 г у БССР створана 10360 пастаянных камісій мясцовых Саветаў, у іх уваходзіла 67093 дэпутаты, 87% агульнай колькасці выбраных у Саветы дэпутатаў. Многія пастаянна дзеючыя камісіі імкнуліся выконваць свае абавязкі так, каб насельніцтва адчувала карысць ад іх работы.

Важнае месца ў палітычнай сістэме СССР адводзілася прафсаюзам. Да 1985 г. прафсаюзныя арганізацыі мелі ў сваёй структуры 6 абласных саветаў прафсаюзаў, 23 – рэспубліканскія, 79 – абласных , 796 гарадскіх і раённых галіновых камітэтаў. У прафсаюзе састаяла 5,4 млн чалавек, у тым ліку 660 тыс. калгаснікаў (калгаснікі атрымалі права на стварэнне сваіх прафсаюзных арганізацый толькі ў 1964 г.). Рэспубліканскі прафсаюз работнікаў сельскай гаспадаркі на 1.01. 1986 г. налічваў 4787 пярвічных арганізацый і 1556054 сябры [10, с. 42].

Важнае месца ў палітычнай сістэме краіны адводзілася моладзі. Камсамол Беларусі ў 1985 г. налічваў у сваіх радах 1млн 516тыс. юнакоў і дзяўчат. З 1970 г. прырост членаў ЛКСМБ саставіў каля 400 тыс. чалавек. Важным накірункам дзейнасці ЛКСМБ з’яўляўся ўдзел у працоўным выхаванні моладзі праз шматлікія формы: арганізацыю камсамольска – маладзёвых брыгад, шэфства пры ўзвядзенні і асваенні важнейшых

Репозиторий ВГУ

новабудоўляў. Толькі за 1981–1985 гг. больш за 173 тыс. чалавек прайшлі школу студэнцкіх атрадаў.

У якасці пярвічнага звяна палітычнай сістэмы Канстытуцыя БССР вызначала працоўныя калектывы. Яны ж аб’яўляліся пярвічным звяном і эканамічнай сістэмы. На падняцце ролі працоўных калектываў у эканамічным і палітычным жыцці грамадства быў скіраваны Закон СССР “Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі” прыняты ў чэрвені 1983 г. Новым, у параўнанні з раней дзеючымі ўстаноўкамі, было палажэнне аб тым, што адміністрацыя прадпрыемстваў мела права перадаваць праекты вытворчых планаў на зацвярджэнне дзяржаўнымі органамі толькі пасля прыняцця іх сходамі працоўных калектываў [11, с. 33–46].

Авангардам грамадства, пачынаючы з Кастрычніцкай рэвалюцыі, прызначалася быць (згодна з Канстытуцыяй 1936 г. арт. 126; 1978 г. арт. 6,7) палітычнай арганізацыі – КПБ–КПСС. Кіруючая ў краіне партыя валодала развітой цэнтралізацыяй, згуртаванасцю і дысцыплінаванасцю, супрацьстаяла любой спробе фракцыянавання, дзейнічала па-за парламенцкім полем. Адбываўся пастаянны рост членаў КПБ. У 1985 г. у КПБ налічвалася 667980 членаў і кандыдатаў. Рабочыя ў складзе партыі займалі 45,4%, сяляне (калгаснікі) – 16,3%. У Віцебскай абласной арганізацыі ў гэты час налічвалася 2467 пярвічных партыйных арганізацый, у іх састаяла 100285 членаў і 3341 кандыдат [12, с. 143–144]. У кіраўніцтве краінай дзейнасць партыі, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый цесна перапляталіся, але дамінуючай сілай у іх сумеснай працы з'яўлялася партыя. Партыйныя арганізацыі прымалі рашэнні па кожным важным пытанні. Рашэнням дзяржаўнага кіраўніцтва часта папярэднічалі рэзалюцыі цэнтральнага кіраўніцтва партыі ці палітычнага органа, рашэнням мясцовых Саветаў – рэзалюцыі адпаведных камітэтаў партыі.

КПСС прыняла на сябе адказнасць за ўсё, што адбывалася ў краіне. Яна была поўная рашучасці ўтрымліваць уладу, ніколі і ні пры якіх абставінах не адмаўляцца ад яе, знаходзіцца ў авангардзе, заставацца кіруючай і накіравальнай сілай грамадства.

Як вышэй заўважана, КПБ–КПСС была арганізацыяй, якая на працягу доўгага перыяду аддавала перавагу функцыі гаспадарчага кіравання. Такі падыход для палітычных арганізацый не з’яўляецца верным [13, с. 47].

Галоўнай задачай кіруючай партыі краіны з’яўляецца распрацоўка новых ідэй з вызначэннем перспектыў развіцця грамадства, разгортвання ўнутраных, уласцівых яму сацыяльных сіл і патэнцыяльных магчымасцей у развіцці краіны. Гэта значыць, што ад КПБ-КПСС, як урадавай партыі, патрабавалася самой удасканальвацца ў адносінах да грамадства апераджальнымі тэмпамі, перш за ўсё ў тэарэтычнай і арганізацыйна-ідэалагічнай дзейнасці: пастаянна ўдасканальваць формы і метады сваёй дзейнасці ў падняцці ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню сваіх членаў. Праз



Рэпазіторый ВДУ

развіццё ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і самадзейнасці палітычная арганізацыя павінна была прывіць сваім членам , а праз іх – усім працоўным, творчыя і ініцыятыўныя адносіны да вытворчай і грамадска – палітычнай дзейнасці.

Аднак у сярэдзіне 70-х гадоў становіцца прыкметным, што неспрыяльныя тэндэнцыі, якія праяўляліся ў эканоміцы, сацыяльна-палітычнай сферы краіны, былі напрамую звязаны са станам самой партыі. Існуючыя ўнутрыпартыйныя адносіны, формы і метады кіравання развіццём народна-гаспадарчага комплексу патрабавалі карэнных змен.

Кіраўніцтва КПСС спазнялася з адзнакай і вырашэннем накапіўшыхся супярэчнасцей, не ўсвядоміла таго, што адбывалася ці магло адбыцца ў грамадстве пры яго далейшым развіцці. Прычыны тут розныя, але часцей за ўсё яны былі звязаны са звышцэнтралізацыяй кіраўніцтва сваімі структурамі, недаацэнкай тэарэтычнай дзейнасці, з парушэннем свайго якаснага складу, зместам і метадамі працы. Не садзейнічалі падтрымцы аўтарытэту КПБ-КПСС шырокае распаўсюджанне бюракратызму, памылкі ў правядзенні кадравай палітыкі, а часам і падаўленне іншадумства.

Кіраўніцтва КПСС, навуковыя ўстановы партыі на змаглі аб'ектыўна асэнсаваць сітуацыю, знайсці шляхі пераадолення крызісных з'яў. Аб негатыўных праявах развіцця самой партыі, сацыяльна – эканамічным развіцці краіны пастаянна ўказвалася ў партыйных дакументах. Але ў дзейнасці партыйных камітэтаў па кіраўніцтву эканомікай, грамадскім жыцці, глыбокіх дэмакратычных перамен не адбывалася [14, с. 93]. У партыйных камітэтаў і выканаўчай улады паявілася імкненне да прывычных, самых лёгкіх цэнтралізаваных формаў кіраўніцтва. Верх узялі інерцыя, імкненне адмахнуцца ад таго, што не ўкладвалася ў прывычныя схемы. Грамадска-палітычнае жыццё (дзейнасць Саветаў, прафсаюзаў, камсамолу, іншых грамадскіх арганізацый, развіццё ўсіх галін культуры) адчувальна несла на сабе такія негатыўныя рысы, як бюракратызм , аўтарытарнасць, фармалізм, адсутнасць сапраўднай галоснасці. На пачатку 70-х гг. гэтыя рысы "абагачаюцца" паветрам дабрадушнасці, усёдаравальнасці, неабавязковасці выканання прынятых рашэнняў.

З кожным годам сістэма кіравання праз дзяржаўны апарат станавілася больш разгалінаванай. У рэшце рэшт кіруючы апарат да 1985 г. павялічыўся амаль да 100 саюзных і 800 рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, якія фактычна падмянялі сабой нармальны рыначны механізм, дыктавалі сваю волю і ў эканамічнай, і ў палітычнай вобласці. Чыноўнікі мелі магчымасці размяркоўваць фонды і рэсурсы згодна свайму погляду. Народная гаспадарка стала адчуваць на сабе негатыўныя вынікі неўпарадкаванасці механізма кіравання, што ўсё больш і больш вяло да стагнацыі ўсяго гаспадарчага комплексу.

У Беларусі аўтарытарны і бюракратычны стыль кіравання некалькі змягчаўся прадбачнасцю і адноснай самастойнасцю вышэйшага

Рэпазіторый ВДУ

кіраўніцтва рэспублікі (пры К.К. Мазураве, П.М. Машэраве) у выкананні рашэнняў цэнтра. Але рэфармаванне палітычнай сістэмы і кіраўніцтва галінамі народнай гаспадаркі і тут ажыццяўлялася супярэчліва і непаслядоўна. Агульная атмасфера ў краіне, у партыі дазваляла мясцоваму кіраўніцтву дзейнічаць толькі з невялікімі адхіленнямі ад устаноўленага цэнтрам парадку.

**Спасылкі**


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.; іл.

2. Вестник статистики. – 1982. – № 2.

3. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1968 г. – Мн., 1969; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1970 г. Мн., 1971.

4. Реальные доходы и жизненный уровень трудящихся. – Мн., 1968.

5. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1970 году. – Мн., 1971.

6. Сельское хозяйство Белоруссии. – 1986. – №1.

7. Статистический ежегодник. – Мн., 1990.

8. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 122. – Д. 77.

9. Коммунистическая партия Белоруссии. – Мн., 1988.

10. Профессиональные союзы Беларуси: энциклопедия в 2 т. / под общ. ред. докт. экон. наук Л.П. Козика .// УО ФПБ «Международный университет «МИТСО». – Т. 1. –Мн., :2011.– 895с.; т. 2, 2012. – 895 с.

11. Справочник партийного работника. – М., 1984. – Вып. 24, ч. 2.

12. ГАВО. Ф.1– Оп.158.–Д.73. с.143–144 .

13. Мандрик, И.В. Особенности развития КПСС в 70–80-х годах/ И.В. Мандрик // История политических партий в вузовском курсе политической истории. Проблемы теории, методологии, методики. Всесоюзная научно методическая конференция: тез. докл. и сообщ. Июнь 1991 года. – Вып. 2. – М.: Изд-во «Прометей», 1991. – 180 с.

14. Мандрик, И.В. Развитие железнодорожного транспорта республики в 1970–1991 гг.: состояние, проблемы, уроки: монография / И.В. Мандрик. – Витебск: Изд-во УО «ВГТУ», 2003. – 218 с.


## ТЭМА 10. **Стан адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва ў перыяд 1956–1980-х гг**.

*1. Перабудова ў галіне адукацыі, навукі. Вынікі.*

*2. Стан літаратуры і мастацтва.*

***1. Перабудова ў галіне адукацыі, навукі. Вынікі.*** Пасля ліпеньскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС у краіне наступае павольнае развіццё дэмакратычных нормаў, а пасля XX з'езда ў жыцці беларускага грамадства адбываліся больш істотныя змены. У 1956 г. рэабелітаваны работнікі адукацыі і навукі, у тым ліку і былы міністр асветы Саевіч. Ствараецца дэмакратычная сістэма народнай адукацыі. Школьныя праграмы, вучэбныя планы і падручнікі прыводзіліся ў адпаведнасць з дасягненнямі навукі і



Репозиторий ВГУ

тэхнікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу. Хуткімі тэмпамі расла сетка агульнаадукацыйных школ і колькасць вучняў у іх, адкрываліся школы-інтэрнаты, школы рабочай і сельскай моладзі. Існавала рэальная магчымасць для моладзі атрымаць адукацыю.

Да канца 50-х – пачатку 60-х гг. была ў асноўным ліквідавана непісьменнасць і малапісьменнасць дарослага насельніцтва, уведзена ўсеагульнае абавязковае сямігадовае навучанне. У 1956 г. была адменена плата за навучанне ў старэйшых класах сярэдняй школы, а таксама ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

У канцы 50-х гг. праведзена перабудова народнай асветы. З 1959 г. была ўведзена абавязковая 8-гадовая адукацыя. У 1965/66 навучальным годзе ў 8-годках налічвалася больш за 700 тыс. дзяцей, а ў 9–11 класах – больш за 300 тыс. З 1956 г. па 1965 г. сярэднюю адукацыю атрымалі прыкладна 600 тыс. жыхароў рэспублікі.

Галоўным напрамкам рэфармавання сістэмы адукацыі прызнаецца максімальнае набліжэнне яе да практычных задач грамадства. У снежні 1958 г. у Маскве прымаецца закон “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай асветы ў СССР”. Аналагічны дакумент прымаецца 8 красавіка 1959 г. на сесіі Вярхоўнага Савета БССР. Вызначаючы недахопы ў практычнай дзейнасці агульнаадукацыйнай школы: ”пэўны адрыў навучання ад жыцця, слабую падрыхтоўку выпускнікоў да практычнай дзейнасці”, пастаўлена задача “так перабудаваць сістэму народнай адукацыі, каб савецкая сярэдняя, прафесійна – тэхнічная і вышэйшая школа адыгрывала больш актыўную ролю ва ўсёй стваральнай дзейнасці савецкага народа”. Увага надавалася на “неабходнасць правільных суадносін у сярэдняй школе агульнай, політэхнічнай і прафесійнай адукацыі, заснаванай на разумным спалучэнні працы і навучання з адпачынкам і нармальным фізічным развіццём падрастаючага пакалення” [1, с. 5–6].

У працэс навучання старшакласнікаў уключалася праца на вытворчасці. На прадпрыемствах ствараліся вучэбныя цэхі і ўчасткі, у школах – майстэрні па апрацоўцы металу, дрэва, навучанні швейнай і іншай справе. Калгасы перадалі школам трактары, аўтамабілі. Для тэарэтычнага і практычнага навучання выдзяляліся спецыялісты прадпрыемстваў, кваліфікаваныя рабочыя і калгаснікі.

Адначасова з політэхнізацыяй школ праводзіліся і іншыя перабудовы: 7-мі гадовыя школы пераводзіліся ў 8-мі гадовыя; 10- ці гадовыя – у 11-ці гадовыя, малакамплектныя пераводзіліся ў буйныя.

У школах замацавалася ў гэтыя гады вялікая колькасць таленавітых настаўнікаў. У Віцебскай вобласці большасць настаўнікаў былі выпускнікамі Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава (такую назву ВНУ насіла да 1982 г.).

Рэпазіторый ВДУ

Атрымаў у гэты час развіццё новы тып агульнаадукацыйных навучальных устаноў –школы інтэрнаты. Першыя 7 такіх устаноў з’явіліся ўжо ў 1956 г. Да 1965 г. іх колькасць узрасла да 120, дзе навучалася 41 тыс. дзяцей [2, с. 92]. Адкрыццё школ-інтэрнатаў працягвалася і надалей. Маламаёмасныя сем’і і сем’і, у якіх адсутнічаў бацька ці маці, пасылалі для навучання сюды сваіх дзяцей за сімвалічную плату.

На працягу ўсяго адзначанага часу ў краіне дзейнічала сістэма вячэрніх і завочных школ. З 1958/59 навучальнага года ішоў паступовы рост школ і вучняў такой формы адукацыі. У 1969/70 навучальным годзе колькасць навучэнцаў у завочных і вячэрніх школах хоць і знізілася, але заставалася яшчэ істотнай. Тут атрымлівалі адукацыю 132 тыс. чалавек, што складала прыкладна каля 10% ад усіх школьнікаў.

Галоўным дасягненнем у народнай адукацыі 1966–1985-х гг. трэба лічыць пераход да ўсеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі. Пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 24 снежня 1966 г. вызначыла першачарговую задачу – ажыццяўленне ўсеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі ўсіх дзяцей школьнага ўзросту. У 1967/68 навучальным годзе школа вярнулася да дзесяцігадовага тэрміна навучання. У 1977 г. у сярэдняй школе вучыліся 98,3%, хлопчыкаў і дзяўчынак.

Назіраецца хуткі рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва і, у першую чаргу, моладзі. За 40–80-я гг. у асноўным было ажыццёўлена ўсеагульнае базавае навучанне моладзі. Калі ў 1965 г. сярэднюю адукацыю атрымалі 50 тыс., то ў 1988 г. – ужо 170 тыс. чалавек. У 1959 г. на 1 тыс. чалавек насельніцтва Беларусі сярэднюю (поўную і няпоўную) адукацыю мелі 303 чалавекі, у 1985 г. – 666 чалавек.

Вучэбныя планы і падручнікі больш адпавядалі патрабаванням жыцця, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, яны пераарыентоўваліся на разумовае развіццё вучняў і прадукцыйную працу ў вытворчым працэсе**.** Вядзецца паглыбленне працоўнага навучання, ствараюцца міжшкольныя камбінаты.

Працэсы, што адбываліся ў адукацыі на этапе 1956–1985-х гг., магчыма ахарактарызаваць як перыяд устойлівай тэндэнцыі росту школьнікаў у сярэдняй школе 9–10 (11) класаў: з 1958/59 навучальнага года па 1970/71 навучальны год колькасць вучняў павялічылась з 1195 тыс. да 1730 тыс. (у 1,4 раза), а вучняў 9–10 (11) класаў –з 93 тыс. да 200 тыс. (больш чым у 2 разы). На этапе 1976–1985-х гг. у народнай асвеце БССР адбыўся поўны пераход да абавязковай усеагульнай сярэдняй адукацыі.

Пачынаючы з 1976 г. узмацняецца ўвага да развіцця дашкольных дзіцячых устаноў. Ім надавалася роля першаснага звяна ў сістэме адукацыі.На іх базе павінна была весціся падрыхтоўка дзяцей шасцігадовага ўзросту да школы. У сувязі з гэтым у краіне хуткімі тэмпамі вялося будаўніцтва дашкольных устаноў. Сведчанне таму – статыстычныя дадзеныя : калі ў 1970 г. забяспечанасць дашкольнымі ўстановамі складала



Репозиторий ВГУ

30%, то ў 1985 г. яна дасягнула 67%. З 1986/87 навучальнага года ўсе дзеці праходзілі падрыхтоўку ў дзіцячых садах і школах, пачыналі тут навучанне па праграме першага класа адзінаццацігадовай школы [3, с. 117].

Вопыт паказваў, што агульнаадукацыйная школа мела правільны накірунак для павышэння якасці вучэбнага працэсу, але яна мела і свае хібы. Так, у сярэдзіне 50-х гг. паявіліся праблемы з роднай мовай. Кіраўніцтва рэспублікі, абапіраючыся на ўстаноўкі цэнтра “на збліжэнне і зліццё нацыянальных культур”, не праяўлялі належнага клопату аб выкладанні прадметаў на беларускай мове ў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школе. У 11-ым артыкуле закона, прынятага ў БССР, “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём” было запісана, што “навучанне ва ўсіх школах БССР ажыццяўляецца на роднай мове вучняў. Бацькі маюць права вырашаць у школу з якой мовай навучання аддаваць сваіх дзяцей”. Тут указвалася: “Вывучэнне рускай мовы ў школах з беларускай мовай навучання , а таксама вывучэнне беларускай мовы ў школах з рускай або іншай мовай навучання праводзіцца па жаданні бацькоў”. Такая ўстаноўка з улікам недастатковай самасвядомасці беларусаў прывяла да таго, што вучні агульнаадукацыйных школ абыякава ставіліся да вывучэння беларускай мовы, у выніку адбыўся масавы перавод іншых прадметаў на рускую мову.

Не ўдалося, як прадугледжвалася дакументамі, якасна ўвязаць адукацыйна-выхаваўчы працэс школы з вытворчым навучаннем. Прычынай гэтаму была недастатковая забяспечанасць школ матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі, а таксама недахоп кваліфікаваных майстроў вытворчага навучання.

У 1984 г. на красавіцкім Пленуме ЦК была зноў пастаўлена задача павысіць якасць адукацыі, працоўнага і маральнага выхавання ў агульнаадукацыйных школах і вучылішчах праз выкараненне фармалізму ў ацэнцы вынікаў працы настаўнікаў і навучэнцаў, палепшыць падрыхтоўку школьнікаў да грамадска-карыснай працы, замацаваць сувязь адукацыі з жыццём, палепшыць якасць школьных праграм і падручнікаў.

Адбываліся ў гэты час перамены ў сістэме працоўных рэзерваў. Не будзе лішнім адзначыць, што папаўненне працоўнага класа ў рэспубліцы вялося ў гэты час з улікам патрэбаў прамысловасці, транспарту і будаўнічых арганізацый у большай меры праз гэтую сістэму. На аснове закона “Аб узмацненні сувязі школы з жыццём” у канцы 50-х – пачатку 60-х гг. адбываецца перабудова школ працоўных рэзерваў. Уведзены адзіны тып гарадскіх і сельскіх прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, пашыраецца іх сетка і колькасць. Чыгуначныя, будаўнічыя вучылішчы, вучылішчы механізацыі сельскай гаспадаркі працоўных рэзерваў, прафтэхшколы, школы фабрычна – заводскага навучання ператварыліся ў дзённыя і вячэрнія гарадскія прафтэхвучылішчы з тэрмінам навучання ад 1 да 3-х гадоў, а сельскія прафтэхвучылішчы з тэрмінам ад 1 да 2-х гадоў (тэрмін залежыў ад складанасці прафесіі). На пачатку 60-х гг. на



Рэпазіторый ВДУ

Беларусі было больш за 100 прафесійна-тэхнічных і сельскіх прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. Штогод тут атрымлівалі рабочую прафесію 32 тыс. чалавек. Да 1965 г. у рэспубліцы з'явілася яшчэ 10 устаноў такога тыпу. У 1965 г. у 110 рамесных вучылішчах навучалася 49 тыс. вучняў. За 1956–1960-я гг. выпуск з вучылішчаў склаў 111,6 тыс. чалавек. З 1961 па 1965 г. была падрыхтавана прыкладна такая ж колькасць кваліфікаваных рабочых. За 1966–1970-я гг. у вучылішчах усіх тыпаў падрыхтавана 247,9 тыс. чалавек, прычым у 1970 г. больш чым у 1965 г. у 1,7 раза [4, с. 240].

У кастрычніку 1970 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР "Аб мерах па далейшым развіцці прафесійна – тэхнічнай адукацыі моладзі". З гэтага часу падрыхтоўка рабочых для розных сфер вытворчасці павялічвалася яшчэ больш. Перавагай з'яўлялася тое, што, знаходзячыся ў ведамственным падпарадкаванні, вучылішчы мелі цесныя сувязі з прадпрыемствамі на якіх іх выпускнікам прыходзілася працаваць па завяршэнні вучобы. Так, чыгуначнікі рэспублікі мелі свае вучылішчы і дарожна-тэхнічныя школы. Беларуская чыгунка штогод працаўладкоўвала на свае прадпрыемствы больш за тысячу выпускнікоў вучылішчаў і школ прафесійна –тэхнічнага навучання [5, с. 48].

З 1969 г. пачаўся паступовы перавод прафтэхвучылішчаў у навучальныя ўстановы, дзе рабочыя акрамя прафесі набывалі яшчэ і сярэднюю адукацыю. У 1969 г . такіх ГПТВ у БССР было 12, у 1970 г. – 21, а да сярэдзіны 80-х гг. яны амаль што ўсе сталі такімі.

Акрамя таго, працоўнае папаўненне рыхтавалася непасрэдна на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах. Тут па індывідуальнай і брыгаднай сістэме на ўласнай базе вялася падрыхтоўка кадраў. Як прыклад, сіламі прадпрыемстваў Беларускай чыгункі пад канец 1965 г. было падрыхтавана 1303 машыністы цеплавозаў і 825 іх памочнікаў [6, с. 192]. Калгасы і саўгасы рэспублікі навучылі для сябе за 1956–1960-я гг. 86,3 тыс., за 1961–1965 гг. – 116 тыс., за адзін 1970 г. – 30, 5 тыс. работнікаў [7, с. 234**]**.

Высокімі заставаліся тэмпы падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў у Віцебскай вобласці. За кароткі тэрмін (1966–1968 гг.) вучылішчы сістэмы прафтэхадукацыі тут выпусцілі больш за 22 тыс. маладых рабочых. Непасрэдна на вытворчасці толькі за адзін 1968 г. у вобласці было падрыхтавана 21 тыс. рабочых, павысілі кваліфікацыю 45 тыс. рабочых [8, с. 14]. Асаблівую ўвагу росту майстэрства рабочых і кіраўнікоў, удасканаленні іх прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў надавалі прадпрыемствы Першамайскага, Кастрычніцкага і Чыгуначнага раёнаў г.Віцебска. Дзеля гэтага тут рэгулярна праводзіліся Дні майстра, Саветы наватараў, наладжана работа "Клуба дзелавых сустрэч".

На больш якасны ўзровень паднялося прафесійна-тэхнічнае навучанне моладзі ў 70–80-х гг. У 1985 г. 226 ПТВ вялі навучанне на ўзроўні сярэдняй адукацыі. 88% выпускнікоў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў

побач з прафесіяй рабочага, спецыяліста сельскай гаспадаркі атрымлівалі і сярэднюю адукацыю.

У вырашэнні задач падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі важнае месца займалі сярэднія-спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. З мэтамі каардынацыі іх працы і паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў з сярэдняй – спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй у 1959 г. у БССР было створана адпаведнае міністэрства (Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі). У дадзеныя гады адбываўся хуткі рост колькасці ўстаноў і навучэнцаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У 1965 г. у БССР налічвалася 122 установы такога тыпу (у 1946г. іх было 94), дзе атрымлівалі падрыхтоўку 122 тыс. чалавек. У 1970/1971 навучальным годзе лік сярэдніх спецыяльных устаноў узрос да 128, найбольшую частку сярод іх займалі тэхнікумы і вучылішчы прамысловасці і будаўніцтва, якіх налічвалася 33, сельскагаспадарчага профілю – 28, аховы здароўя – 21, асветы і мастацтва – 26. Агульная колькасць навучэнцаў складала 146,1 тыс. чалавек.У далейшым сетка ўстаноў сярэдняй-спецыяльнай адукацыі працягвала расці: у 1985/1986 навучальным годзе іх у БССР было 139, дзе праходзілі падрыхтоўку 160,5 тыс. чалавек [9, с. 549].

Разам са станоўчым вырашэннем задачы пашырэння і паляпшэння сістэмы падрыхтоўкі кадраў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, на працягу ўсяго вывучаемага часу ў рэспубліцы развівалася вышэйшая школа. Паступова пашыралася сетка дзённага, вячэрняга і завочнага навучання. Асобы з вытворчасці і пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі мелі ільготныя ўмовы паступлення ў ВНУ. Узрасталі маштабы і профіль падрыхтоўкі спецыялістаў. У 1958 г. пачаў дзейнічаць Гродзенскі медыцынскі, у 1961 г. – Магілёўскі машынабудаўнічы, у 1964 г. Мінскі радыётэхнічны, у 1965 г. – Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці. У 1965 г. у Беларусі працавала 27 вышэйшых навучальных устаноў. Тут навучалася больш за 60 тыс. чалавек, г.зн. у 2 разы больш чым у 1950 г. У Белдзяржуніверсітэце налічвалася 10 тыс. студэнтаў. Настаўнікаў у гэты час рыхтавалі 7 педінстытутаў і 10 педвучылішчаў.

На пачатку 70-х гг. у Беларусі дзейнічала 28 ВНУ, дзе навучалася 137,3 тыс. студэнтаў. На гэты час на 1 тыс. насельніцтва ў БССР прыходзілася 148 студэнтаў (па СССР гэты паказчык быў большым – 187 чалавек). Увядзенне ў Беларусі вялікай колькасці новых прамысловых прадпрыемстваў стварала дэфіцыт інжынерных кадраў, асабліва ў галіне машынабудавання, вылічальнай тэхнікі, аўтаматызаваных сістэм кіравання. Сітуацыя патрабавала адкрыцця новых вышэйшых навучальных устаноў. На гэтыя мэты з дзяржаўнага бюджэту былі выдаткаваны сродкі. З 1 студзеня 1973 г. на базе тэхналагічнага факультэта Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута пачаў працаваць Беларускі тэхналагічны інстытут, дзе па 7 спецыяльнасцях навучалася 1200 студэнтаў. З 1974 г. на базе філіяла Беларускага тэхналагічнага інстытута шматпрофільную



Репозиторий ВГУ

падрыхтоўку інжынераў разгарнуў Наваполацкі політэхнічны інстытут. За 1981–1985-я гг. тут падрыхтавана 4200 спецыялістаў, 80% з іх былі размеркаваны на прадпрыемствы БССР [10, с. 549]. З 1 верасня 1975 г. адкрыўся Мінскі інстытут культуры. З 1 студзеня 1980 г. вышэйшая школа папоўнілася яшчэ адной навучальнай ўстановай- Гомельскім каапературыўным інстытутам. У 1985/86 навучальным годзе ў 33-х ВНУ БССР навучалася 181,9 тыс. студэнтаў [11, с. 219]. Назіраўся пастаянны рост колькасці людзей з вышэйшай адукацыяй. На пачату 90-х гг. патрэбнасці народнай гаспадаркі і культуры ў кадрах з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй былі цалкам забяспечаны.

У кіраўніцтва рэспублікі было жаданне прыдаць навукова-даследчым работам планавы прынцып у іх распрацоўцы і ўкараненні. З гэтай нагоды ў 1956 г. у сістэме Міністэрства сельскай гаспадаркі і меліярацыі было створана 6 галіновых навуковых устаноў. У чэрвені 1957 г. на базе сектара мовазнаўства інстытута літаратуры і сектара этнаграфіі і фальклора інстытута гісторыі пачаў дзейнічаць інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Распрацоўваліся праграмы, устанаўліваліся канкрэтныя заданні навуковым калектывам, выдзяляліся крыніцы фінансавання, на прадпрыемствах ствараліся штатныя і няштатныя службы па ўкараненню НТП.

Навукоўцы Беларусі вялі фундаментальныя даследаванні ва ўсіх галінах, у тым ліку ў хімічнай і геалагічнай. Новыя ўраўненні кінетыкі рэакцый з удзелам цвёрдых рэчываў вынайшаў Б. Фадзееў. Геалагічную навуку значна пашырылі сваімі працамі Т. Багамолаў, К. Лукашоў, А. Махнач, Г. Гарэцкі. Ужо ў 1956 г. АН БССР устанавіла кантакты са 107 замежнымі ўстановамі 28 краін свету [12, с. 319]. У жніўні 1961 г. быў створаны камітэт Савета Міністраў БССР па каардынацыі навукова-даследчых работ (да гэтага часу кіраванне навукай у краіне фактычна ажыццяўлялі міністэрствы і ведамствы).

Спрыяла развіццю навуковых даследаванняў добрае фінансаванне. У 1960 г. доля нацыянальнага даходу ў СССР на патрэбы навукі складала 2,7%, а ў 1975 г. ужо 4,6%. Такі рост быў нават больш высокім, чым у вядучых заходніх краінах [13, с. 19].

На прамысловых прадпрыемствах БССР дзейнічала шырокая сетка навукова-даследчых арганізацый. У 1985 г. налічвалася 2,5 тыс. лабараторый, канструктарскіх выпрабавальна-эксперыментальных падраздзяленняў, больш за 60 аддзяленняў механізацыі і аўтаматызацыі. Аднак распрацаваныя навукай і творчасцю людзей тэхніка і тэхналогія своечасова ў вытворчасць не ўкараняліся. Зацягваліся тэрміны ўкаранення навуковых распрацовак. І хоць на працягу разгледжанага намі часу прымалася вялікая колькасць спецыяльных пастаноў, дзе намячаліся новыя падыходы да арганізацыі навукова-даследчых прац і перадачы іх вынікаў у народную гаспадарку, зрухі адбываліся невялікія. Укараненне вынікаў

Репозиторий ВГУ

даследчых работ у практыку заставалася слабым звяном у ланцугу навуковай вытворчасці сацыялістычнай дзяржавы.

***2. Стан літаратуры і мастацтва.*** З сярэдзіны 50-х гг. у сувязі з актывізацыяй грамадскага жыцця новыя працэсы адбываюцца ў літаратурнай творчасці. У маі 1958 г. была прынята пастанова ЦК, у якой выпады супраць творчай інтэлігенцыі, выкладзеныя ў пастановах 40-х гг., былі прызнаны памылковымі. Для большасці пісьменнікаў, мастакоў, скульптараў, іншых творцаў пачынаецца плённы перыяд. Цяпер людзям творчай працы не ставіліся , як раней, перашкоды ў выбары тэм , абавязковай іх скіраванасці на паказ толькі пазітыўнага ў жыцці грамадства. Яны атрымалі магчымасць адлюстроўваць жыццё ў большай адпаведнасці з рэальнымі фактамі. Нягледзячы на сур'ёзнае захворванне працягваў працу Я. Колас. У 1954 г. ён напісаў трэцюю кнігу палескіх аповесцей "На ростанях".

Робяць перагляд сфармуляваных раней канцэпцый сваіх твораў М. Лынькоў, У. Караткевіч, П. Броўка, К. Крапіва, С. Шушкевіч і іншыя. У творах, падрыхтаваных на гэтым этапе, бесканфліктнасці, схематычнасць замяняецца адлюстраваннем агульначалавечых, маральна-этычных каштоўнасцей.

Разнастайнай і цікавай стала дзейнасць тэатральных установ рэспублікі. У 1985 г. БССР мела 17 тэатраў. Прызнанымі цэнтрамі тут былі Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы і Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Я. Коласа. Ствараліся новыя тэатры: Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача (1956), Бабруйскі музычна – драматычны тэатр (1962), Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі (1965–1970), Брэсцкі і Гомельскі абласныя тэатры лялек (1968).

Сапраўднымі кумірамі для аматараў тэатральнага мастацтва былі народныя артысты СССР Г. Глебаў, П. Малчанаў, Б. Платонаў (тэатр імя Я. Купалы), народныя артысты БССР М. Звездачотаў, А Радзялоўская, Ц. Сяргейчык, А. Трус, Ф. Шмакаў, А. Шэлег (тэатр імя Я. Коласа).

Нямалымі былі дасягненні ў развіцці архітэктуры і выяўленчага мастацтва.У сталіцы, абласных цэнтрах, у шэрагу гарадоў рэспублікі з'явіліся арыгінальныя адміністрацыйна – службовыя, культурна – асветніцкія, відовішчныя збудаванні. Гэта Палацы культуры трактарнага завода і камвольнага камбіната, кінатэатры "Піянер" і "Партызан" у Мінску, будынак цырка ў Гомелі, навучальныя карпусы БДУ і інжынерна – будаўнічага інстытута ў Брэсце, бібліятэка АН БССР, гасцініца "Юбілейная", Палац спорту і Палац воднага спорту ў Мінску. На канец 60-х гг. прыпадае ўзвядзенне такіх значных скульптурных мемарыяльных комплексаў, як "Хатынь", Курган Славы Савецкай Арміі на 21-м кіламетры шашы Мінск –Масква.

На палотнах мастакоў важнае месца займала патрыятычная тэматыка. М. Савіцкі прадставіў свае працы "1941год", "Партызаны. Блакада",

Репозиторий ВГУ

“Аршанскія партызаны”, “Віцебскія вароты”, “Легенда пра бацьку Міная”, ”Партызанская мадонна”. Шмат твораў было прысвечана правадырам рэвалюцыі, краявідам роднага краю.

Пазітыўныя зрухі назіраліся ў тэатральна –музычным мастацтве. Прыхільна сустрэлі гледачы оперу Ю. Семянякі “Зорка Венера”, балеты Я. Глебава ”Выбранніца”, “Мара” і “Альпійская балада”. У поўным аб’ёме выявіўся талент Ю. Семянякі ў песенным жанры “Квітней Беларусь”, “Беларусь –мая песня, “Славім мы свой край любімы” .

Зразумела, духоўная творчасць часоў " адлігі " не змагла пераадолець усе недахопы папярэдняга сталінскага перыяду. Але яна якасна абнавілася, набыла другое дыханне, узнялася на ўзровень гістарычных абагульненняў, паказу супярэчнасцей у сапраўдным паўсядзённым жыцці.

На больш якасны ўзровень літаратурная творчась пісьменнікаў падымаецца ў 1970-я – першай палове 1980-х гг. Саюз пісьменнікаў БССР на пачатку 1986 г. налічваў 372 чалавекі (у пачатку 1971 г. ён налічваў 227 сяброў) [12,с.486]. Старэйшае пакаленне літаратараў папаўнялася маладымі творцамі. Надзвычай плённа працавалі І. Чыгрынаў, І. Навуменка, В. Быкаў, І. Шамякін і іншыя. І. Чыгрынаў свае творы “Плач перапёлкі” (1970), “Апраўданне крыві” (1976), “Свае і чужыя” (1983) прысвяціў жыццю, подзвігу і трагедыі народа ў вогненныя гады. Гэтай жа тэматыкай аб’яднаны раманы І. Навуменкі “Сасна пры дарозе” (1962), “Сорак трэцці” (1974).

У кароткі тэрмін адна за другой з’яўляюцца “партызанскія” аповесці В. Быкава “Сотнікаў” (1970), “Абеліск” (1971), “Воўчая зграя” (1974),”Пайсці і не вярнуцца”(1978), “Знак бяды” (1982). У 1982 г. твор В. Быкава “Знак бяды” атрымаў Ленінскую прэмію, у гэтым жа годзе яму было прысвоена ганаровае званне Народнага пісьменніка Беларусі, а ў 1984 г. – Героя Сацыялістычнай Працы [14, с. 426].

Значнае месца ў шэрагу літаратараў, якія прысвяцілі свой талент супярэчлівым праблемам , што назіраліся ў савецкім грамадстве, належыць І. Шамякіну. Яго раманы “Снежныя зімы” (1970), “Атланты і карыяты” (1974), “Вазьму твой боль” (1979), “Петраград – Брэст” (1983) падабаліся чытачам. Плённая творчасць пісьменніка была адзначана прысваеннем яму высокіх званняў Народнага пісьменніка БССР (1972) і Героя Сацыялістычнай Працы (1981).

Надзвычай плённым у літаратурнай творчасці аказаўся гэты час для М. Танка. За выдадзеныя шматлікія творы ў 1974 г. яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Яго зборнік “Нарачанскія сосны” у 1978 г. адзначаны Ленінскай прэміяй.

Прыкметнай з’явай беларускай паэзіі ў гэты час заставалася творчасць П. Панчанкі, М. Лужаніна, К. Кірыенкі, С. Грахоўскага, В. Вітка, М. Аўрамчыка і іншых паэтаў.

Рэпазіторый ВГУ

У драматургіі на этапе 70–80-х гг. натхнёна працавалі К. Губарэвіч (“Галоўная стаўка”, “Далекая песня”, “А куды ж нам падзецца?”, а таксама А. Макаёнак (“Каб людзі не журыліся”, “Лявоніха на арбіце”, ”Зацюканы апостал”.

У пачатку 80-х гг. у поўны голас заявіў аб сабе малады драматург А. Дудараў. Адна за другой выходзяць яго п’есы “Выбар” (1979), “Парог” (1981), “Апошні злёт” (1982), “Вечар” (1983), “Радавыя” (1984). Творчая праца таленавітых драматургаў садзейнічала паляпшэнню рэпертуару тэатраў, якіх у 1985 г. у БССР налічвалася 17 (у 1970 г. тэатраў было14). У 1975 г. у Мінску пачаў дзейнічаць тэатр музычнай камедыі, у 1980 г. – маладзёжны тэатр. Даволі паспяхова вырашаліся ў гэты час пытанні пастаноўкі твораў нацыянальных пісьменнікаў. Купалаўцы адзначыліся пастаноўкай спектакляў “Таблетку пад язык”(А. Макаёнак), “Радавыя” (В. Быкаў). Коласаўцы паставілі спектаклі “Снежныя зімы” (І. Шамякін), “Апошні шанец”(В. Быкаў), “Званы Віцебска”(У. Караткевіч). У 1977 г. тэатру імя Я. Коласа было нададзена званне акадэмічнага, што сведчыла аб прызнанні плённай працы яго калектыва. Трэба адзначыць, што ў далейшай сваёй дзейнасці тэатр апраўдваў гэта званне. У 1986 г. на конкурсе драматургіі пад дэвізам “Наш сучаснік” спектакль“Апошні журавель” (А. Дудараў і А. Жук), пастаўлены трупай тэатра, быў прызнаны лепшым [15, с. 8, 12].

Характарызаваўся перыяд 70–80-х гг і новымі тэндэнцыямі ў развіцці музычнага мастацтва. Пашыраўся Саюз кампазітараў БССР. У 1985 г. ён налічваў 65 творцаў. У 1971 г. пачаўся творчы шлях Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі.Тут раскрыліся вакальныя здольнасці народнай артысткі БССР Н. Гайда, заслужаных артыстаў рэспублікі Ю. Лазоўскага, К. Лосева, В. Фаменка і іншых спевакоў. У песенным жанры актыўна працавалі кампазітары І. Лучанок, У. Буднік, Э. Ханок, Л. Захлеўны, В. Іваноў. Вялікую працу па папулярызацыі народных традыцый і фальклору праводзілі Дзяржаўны аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам І. Жыновіча, Дзяржаўны народны хор на чале з Г. Цітовічам, харавая капэла, якую узначаліў Р. Шырма, вакальна – інструментальны ансамбль “Песняры” (з 1985 г. Дзяржаўны беларускі эстрадны ансамбль “Песняры”) пад кіраўніцтвам У. Мулявіна. Карысталіся папулярнасцю вакальна –інструментальныя ансамблі ”Сябры” (створаны А. Ярмоленка ў 1974 г.) і ансамбль “Верасы” пад кіраўніцтвам В. Раімчыка

У тэатры оперы і балета на высокім прафесійным узроўні пастаўлены оперы Дз. Смольскага “Сівая легенда” (1978), “Францыск Скарына” (1980), Ю. Семянякі “Новая зямля”(1982), С. Картэса “Джардана Бруна”(1979).

Важнай формай раскрыцця творчых схільнасцей чалавека з’яўлялася развіццё мастацкай самадзейнасці. За 1970–1985-я гг. у краіне былі створаны сотні новых хораў, аркестраў, мастацкіх агітбрыгад, ансамбляў, іншых калектываў.



Рэпазіторый ВДУ

Высокай запатрабаванасцю ў насельніцтва рэспублікі карысталася кіно. Толькі за 1976–1985-я гг. у БССР уведзена 29 кінатэатраў. У 1985 г. у рэспубліцы налічвалася 7377 кінаўстановак, з іх 6193 абслугоўвалі сельскае насельніцтва (356 кінаўстановак былі перасоўнымі) [12, с. 504].

Паляпшалася забеспячэнне насельніцтва тэле –і радыёвяшчаннем. З верасня 1974 г. пачалася трансляцыя праграм рэспубліканскага каляровага тэлебачання, у 1978 г. уступіла ў эксплуатацыю першая чарга рэспубліканскага тэлецэнтра. Значны рост мела ў гэтыя гады забяспечанасць насельніцтва тэлевізарамі і радыёпрыемнікамі. Калі ў 1970 г. на 100 сямей прыходзілася 40 тэлевізараў, то ў 1988 г. – 92, радыёпрыемнікаў адпаведна – 51 і 80. Нароўні з тэлебачаннем і радыёвяшчаннем спадарожнікам насельніцтва рэспублікі быў друк. У 1970 г. у БССР выходзіла 175 газет і 102 часопісы, у 1985 г. выпускалася 212 газет і 107 часопісаў [16, с. 212].

Як бачна, на працягу пасляваенных гадоў развіццё нацыянальнай культуры было зарыентавана на выхаванне насельніцтва ў рамках марксісцка – ленінскай ідэалогіі. З сярэдзіны 50-х гг. літаратура, тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва краіны знаходзіліся ва ўмовах наступіўшай “адлігі”. Творчасць навукоўцаў і мастакоў вызваляецца ад жорсткага кантролю. Адукацыя, навука, літаратурная і іншыя віды творчасці ўнасілі значны ўклад у духоўнае ўзбагачэнне людзей, выпрацоўку іх эстэтычных густаў, далучэнне да лепшых дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры.

**Спасылкі**


1. Закон “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў Беларускай ССР”. – Мн., 1959.
2. Кісялёў,Р.Я. Школа савецкай Беларусі / Р.Я. Кісялёў. – Мн., 1968.
3. НАРБ. – Ф. 42. – Оп. 7. – Д. 2528.
4. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1970 году: стат. сб. – Мн., 1971.
5. Архив Белорусской железной дороги (АБЖД). – Ф. 1041. – Оп. 5. – Д. 2553.
6. Лыч, Л.М. Аднаўленне і развіцце чыгуначнага транспарту Беларускай ССР (верасень 1943–1970 гг.) / Л.М. Лыч. – Мінск, 1976. – 311 с.
7. Народнае хозяйство Белорусской ССР. – Мн., 1975.
8. ГАВО. – Ф. 1. – Оп. 119. – Д. 55.
9. Народное хозяйство СССР за 70 лет: юбил. Стат. Ежегодник. – М., 1987.
10. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт : Вытокі, гісторыя станаўлення і дзейнасць (да 40–годдзя заснавання). – Наваполацк, 2008.
11. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г.: стат. ежегодник. – Мн., 1987.
12. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т.6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л.Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.; іл.
13. Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. сл.: у 6 т. – Мн., 1992. – Т. 1.
14. Вестник АН России. – 1995. – №8.
15. Мастацтва Беларусі. – 1987. –№ 1.
16. Народное хозяйство Белорусскай ССР в 1985г.: стат. ежегодник. – Мн., 1986.




Репозиторий ВГУ

ТЭМА 11. **Неабходнасць кардынальных змен, пошукі шляхоў паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны**

*1. Палітыка “перабудовы”, асаблівасці яе правядзення ў БССР.*

*2.Пераход да рыначных адносін.*

*3. Крызісны стан у развіцці краіны.*

***1. Палітыка “перабудовы”, асаблівасці яе правядзення ў БССР.*** У папярэднім змесце ВМК было сказана, што на этапе 1966–1985-х гг. развіццё БССР было звязана з фарміраваннем індустрыяльнага грамадства на аснове механізацыі і аўтаматызацыі прамысловасці, сельскай гападаркі з улікам выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. З кожным годам прамысловасць прырастала, як колькасна так і якасна. У строй дзеючых былі ўведзеныя найбуйнейшыя прадпрыемствы станкабудавання, машынабудавання, электроннай і хімічнай галіны. Павялічваліся аб'ёмы прамысловай вытворчасці, на прадпрыемствах уводзілася больш прадукцыйная тэхніка і перадавыя тэхналогіі. Паказчыкі развіцця прамысловай вытворчасці і сельскай гаспадаркі Беларусі ў гэтыя гады былі аднымі з самых высокіх у СССР. Поспехі пры вырашэнні непасрэдных вытворчых задач шмат у чым вызначаліся ўсвядомленай зацікаўленасцю шырокіх слаёў працоўных у іх выкананні. Працоўнае самавыяўленне сотняў тысяч беларусаў было накіравана на дасягненне калектыўных мэтаў і вырашэнне дзяржаўных задач. Мільёны савецкіх людзей сумленна працавалі і сваёй працай памнажалі грамадскае багацце. Праз працу большасць рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых імкнуліся рэалізаваць свой чалавечы патэнцыял, раскрыць свае вытворчыя здольнасці. Аднак перабольшванне ролі цэнтралізаванага планавання ў кіраванні эканомікай, памылкі пры ўкараненні гаспадарчага разліку, – усе гэтыя і іншыя фактары абмяжоўвалі творчую моц чалавека, не дазвалялі яму рэалізаваць у поўнай меры свае таленты і здольнасці. На этапе 1976–1985-х гг. эканоміка СССР паступова губляла дынамізм, які назіраўся ў пасляваенны час. Мадэрнізацыя вытворчасці, укараненне прадукцыйнага абсталявання, эфектыўных тэхналогій тармазілася з-за кансерватыўнага кіравання. Стварaліся новыя кіраўнічыя структуры, разрастаўся іх апарат і ў той жа час пакутавала хуткасць і якасць прыняцця і рэалізацыі рашэнняў. Адсутнасць самастойнасці прадпрыемстваў у вырашэнні праблем вытворчасці змушала іх кіраўнікоў, пры прыняцці рашэнняў, весці ўзгадненне самых нязначных пытанняў у вышэйстаячых інстанцыях. На гэта сыходзіла шмат часу. Меўся значны разрыў па часе паміж распрацоўкай новай тэхнікі і ўкараненнем яе ў вытворчасць. Неразвітасць формаў уласнасці і адсутнасць дастатковай гаспадарчай ініцыятывы прадпрыемстваў стрымлівалі развіццё ініцыятывы працоўных. Частка дырэктараў прадпрыемстваў, каб спраўляцца з цяжкасцямі, падчас нерытмічнай іх працы, захоўвалі залішнюю працоўную сілу. Выбар лёгкіх рашэнняў, перавага ў кіраванні паліятыўнымі

Рэпазіторый ВГУ

мерамі, уплыў і магчымасці якіх да гэтага часу былі ўжо цалкам вычарпаныя, адмова ад намечаных радыкальных эканамічных пераўтварэнняў – усё гэта абумовіла не паскарэнне ў развіцці савецкай эканомікі, як прадбачылася дырэктывамі, а яе запаволенне.

У 1985 г. на красавіцкім пленуме ЦК КПСС быў прыняты курс на глыбінную перабудову ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства праз круты паварот да інтэнсіфікацыі вытворчасці. Дэлегаты XXVII з'езда КПСС (праходзіў 25.02– 6.03.1986 г.) абмеркавалі і прынялі дырэктыву, у якой намячалася забяспечыць да 2000 г. удваенне вытворчага патэнцыялу краіны пры яго карэнна якасным абнаўленні. Пры гэтым "перабудова", аб якой было аб'яўлена на гэтым форуме, павінна была праходзіць пры шырокай дэмакратыі і галоснасці. Задача па паскарэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў рамках сацыялістычнага выбару, сацыялістычных ідэалаў і каштоўнасцей была ўспрынята насельніцтвам з разуменнем. Вера ў сацыялістычныя ідэалы ў людзей у гэты час захоўвалася, таму высакародная мэта на новы перыяд знайшла станоўчы водгук у шырокім людскім асяроддзі. У большасці людзей было жаданне ў наступнай 12-й пяцігодцы пераадолець уласцівыя дзяржаўнаму сацыялізму дэфармацыі, больш поўна раскрыць патэнцыйныя магчымасці агульнанароднай уласнасці на сродкі вытворчасці, правесці дэмакратызацыю і рэфармаванне палітычных інстытутаў дзяржавы.

Максімальна арыентаваным на пераход да радыкальнай эканамічнай рэформы было і кіраўніцтва БССР. З улікам новых падыходаў у БССР была распрацавана комплексная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі на XII пяцігодку (прынята на XXX з'ездзе КПБ, 30–31.01.1986 г.). У праграме прадугледжвалася забяспечыць увесь прырост прадукцыі у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве за кошт інтэнсіўных фактараў, г. зн. шляхам павышэння прадукцыйнасці працы [1**]**.

Прыкметнай з'явай ажыццяўлення радыкальнай эканамічнай рэформы ў Беларусі стаў пераход да дэмакратычнай сістэмы кіраваня эканомікай і грамадскімі працэсамі. На аснове прынятага закона "Аб дзяржаўным прадпрыемстве", пастаноў аб карэннай перабудове кіравання эканомікай, пашыралася самастойнасць прадпрыемстваў і аб'яднанняў (яны перайшлі на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне), павысілася роля працоўных калектываў, развівалася самакіраванне (на прадпрыемствах былі створаны саветы працоўных калектываў), укараняліся прагрэсіўныя формы арганізацыі працы. У 1988 г. на ўмовах гаспадарчага разліку і самафінансавання ў БССР працавала ўся прамысловасць, аграпрамысловы комплекс, транспарт, гандаль, большасць будаўнічых арганізацый.

Рэспубліканская комплексная праграма з назвай "інтэнсіфікацыя" спрыяла таму, што многія калектывы ўзмацнілі работу па мадэрнізацыі вытворчасці, замене састарэлай тэхнікі на больш дасканалае абсталяванне.

Рэпазіторый ВДУ

Асноўныя вытворчыя фонды прадпрыемстваў у гэты перыяд узрасталі штогод прыкладна на 6%, вытворчасць абнаўлялася станкамі з лічбавым праграмным кіраваннем, робатамі, аўтаматычнымі лініямі, што стварала ўмовы для развіцця як галін матэрыяльнай вытворчасці, так і нарошчвання сацыяльнай сферы.

Станоўчым з'яўляўся профіль беларускай эканомікі. Гэта буйныя машынабудаўнічыя і станкабудаўнічыя прадпрыемствы, заводы па перапрацоўцы нафты. БССР у 1990 г. пастаўляла ў іншыя саюзныя рэспублікі 73% металаапрацоўчых станкоў , 81% грузавых аўтамабіляў, 74% трактароў, 72% хімічных валокнаў і ніцяў, 38% мінеральных угнаенняў, 40% прадукцыі лёгкай і харчовай прамысловасці [2, с. 288].

Многія прадпрыемствы мелі заказ абароннага ведамства. Такая структура прамысловасці, дзе БССР была рэспублікай выпускаючай экспартаарыентаваную прадукцыю завяршальнага цыкла, мела ў той час станоўчае значэнне для беларускага народа.

Значным дасягненнем эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1980-х гг. стала пераарыентацыя прамысловасці рэспублікі з выпуску сродкаў вытворчасці на выпуск тавараў народнага спажывання. Упершыню тавары народнага спажывання па аб'ёме сваёй вытворчасці сталі выпускацца апераджальнымі тэмпамі. Так, пры павелічэнні аб'ёмаў прамысловай прадукцыі за 1986–1990 гг. на 29%, сродкі вытворчасці (група А) узраслі на 27 %, а прадметаў спажывання (група Б) – на 35% [3, с. 256].

На ўзроўні папярэдняй XI пяцігодкі падтрымлівалася ў гэты час вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі. Прыняты новы прыкладны Статут калгаса, істотна пашырыў правы агульных сходаў калгаснікаў і саміх калгаснікаў ва ўпраўленні калектывамі. З гэтага часу вытворчая дзейнасць у калгасе (у тым ліку і выбары старшыняў гаспадарак) праходзілі толькі з адабрэння членаў калгаса на агульных сходах.

У параўнанні з іншымі рэспублікамі СССР у Беларусі, больш паспяхова развівалася эканоміка, меліся зрухі ў пераадоленні негатыўных наступстваў папярэдніх, як іх называлі, “застойных” гадоў. Недарма вядучыя эканамісты адзначалі БССР гэтага часу, як “палігон” для буйнамаштабных эканамічных эксперыментаў. Займаючы 0,9% тэрыторыі і 3,6% насельніцтва , БССР давала 4,2% нацыянальнага даходу СССР. Нават у апошняй XII-й савецкай пяцігодцы (1986–1990 гг.), калі ў СССР у цэлым нацыянальны даход меў нулявое значэнне, у БССР яго сярэднегадавы рост склаў 3,3% [4, с. 272]. Гэта дазволіла ажыццявіць шэраг мер , накіраваных на павышэнне дабрабыту насельніцтва. На завяршэнні 80-х гг. Беларусь па асноўных паказчыках на душу насельніцтва пераўзыходзіла сярэднія паказчыкі СССР і наблізілася да найбольш развітых у эканамічных адносінах прыбалтыйскіх рэспублік. Па вытворчасці нацыянальнага даходу рэспубліка займала 4-е месца пасля РСФСР, Латвіі і Эстоніі. Такое ж месца яна займала і па вытворчасці прамыс-

ловай прадукцыі. У 1990 г. у Беларусі было выраблена на душу насельніцтва тавараў народнага спажывання на 2268 рублёў супраць 1598 рублёў у цэлым па СССР. Харчовых тавараў было выпушчана на 622 рублі (СССР – 511 рублёў), нехарчовых тавараў – на 1433 рублі (СССР – 895 рублёў), мяса – 115 кг (у Расіі – 68 кг), малака – 727 кг (у Расіі – 376 кг).

Неблагія паказчыкі наглядаліся ў развіцці вышэйшай школы. Колькасць студэнтаў на 10 тыс. чалавек у Беларусі была большай, чым у іншых рэспубліках (акрамя Арменіі, Расіі і Грузіі) [3, с. 256].

Вось такімі вынікамі характарызавалася сацыяльна-эканамічнае становішча рэспублікі напрыканцы 80-х гг. Шырокі доступ да адукацыі, культуры, упэўненасць у заўтрашнім дні, у будучыні сваіх дзяцей – гэта найвялікшыя заваёвы савецкага перыяду, у тым ліку набытага ў часы перабудовы. Разам з тым сутыкненне старога і новага, унесенага перабудовай, ішло супярэчліва. У сувязі з адсутнасцю канкрэтнай, навукова-абгрунтаванай праграмы перабудовы і аднаўлення савецкага грамадства ў Беларусі таксама нарасталі цяжкасці і супярэчнасці эканамічнага і сацыяльнага характару.

Кіраўнікі цэнтральных міністэрстваў і ведамстваў не жадалі раставацца з напрацаванай раней сістэмай, працягваўся дыктат міністэрстваў ва ўстанаўленні планаў праз дзяржзаказ, які ахопліваў ад 80 да 100% выпускаемай прадукцыі. З мэтай павышэння якасці прадукцыі на прадпрыемствах была ўведзена дадатковая структура раўналежная з кантрольнай службай – дзяржпрыёмка. Гэтыя і іншыя механізмы старой каманднa –адміністратыўнай сістэмы не дазвалялі прадпрыемствам спаўна выкарыстоўваць свае правы.

Балюча ўдарыла па БССР і сур’езна ўскладніла становішча велізарнай масы яе жыхароў буйнейшая катастрофа на рэактары чацвёртага энергаблока Чарнобыльскай АЭС (26 красавіка 1986 г.) Агульная плошча тэрыторыі Гомельскай і Магілёўскай абласцей, забруджанай цэзіем-137 са шчыльнасцю вышэй 15 кі/кв.км складала 6,25тыс. кв. км. У гэтай зоне знаходзілася 515 населеных пунктаў, у якіх пражывала 156,4 тыс. чалавек, прычым 70 населеных пунктаў з насельніцтвам 12,5 тыс. размяшчаліся ў зоне забруджвання ад 40 кі/кв. км. і вышэй [5, с. 119].

Паўсталі пытанні эвакуацыі людзей з забруджаных тэрыторый, забеспячэння іх жыллём, дадатковае фінансаванне жыхароў населеных пунктаў, дзе ўзровень радыяцыі (як тады трактавалася) дапускаў пражыванне чалавека. Шмат сродкаў патрабавалася на дэзактывацыю забруджаных тэрыторый. Катастрофа на АЭС і нездавальняючы ход па ліквідацыі яе наступстваў у БССР набыў не толькі эканамічны, але і палітычны характар, выліўся ў крытыку партыйна-дзяржаўных улад, знізіў іх аўтарытэт сярод насельніцтва.



Репозиторий ВГУ

***2. Пераход да рыначных адносін.*** Як бачна захады па ўкараненні новага ў спалучэнні са старымі падыходамі давалі магчымасць эканоміцы Беларусі да 1990 г. развівацца адносна высокімі і ўстойлівымі тэмпамі. Меліся ўсе эканамічныя перадумовы для далейшага пад'ёму народнай гаспадаркі, культуры, але гэтага не адбылося. У былых саюзных рэспубліках яшчэ ў другой палове 80-х гг. выявілася імкненне забяспечваць сыравінай і прадукцыяй перш за ўсё ўласныя патрэбы. Знізіліся капітальныя ўкладанні ў базавыя галіны практычна ўсіх рэспублік, асабліва ў Расійскай Федэрацыі. Гэта прывяло да скарачэння здабычы нафты, вытворчасці металу, лесаматэрыялаў, цэменту. Адбыўся імклівы рост цэн і больш за ўсё на энерганосьбіты. Парушыліся ўзаемаразлікі паміж спажыўцамі. Наступіла разбалансаванасць эканомікі ўсіх рэспублік.

Кіраўніцтва БССР рабіла захады па прадухіленні абвальнага спаду вытворчасці і зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва. У кастрычніку 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову "Аб пераходзе БССР да рыначнай эканомікі", а таксама распрацаваную Саветам Міністраў рэспублікі праграму пераходу на рыначныя механізмы гаспадарання. Прадугледжвалася пачаць пераход да рынку з першага лістапада 1990 году [6, с. 533]. У праграме планавалася ажыццявіць пераход да рыначнай эканомікі за два гады, стабілізаваць за гэты час эканоміку, а ў далейшым прайсці шлях пераўтварэння канцэптуальнай (тэарэтычнай) мадэлі ў практычную (рэальную) мадэль, заснаваную на нарматывах рыначнай эканомікі. Меркавалася стварыць новую эканамічную сістэму, здольную забяспечыць дынамічнае развіццё народнай гаспадаркі і дасягнуць узроўню жыцця, як у развітых краінах.

Урадавая праграма пераходу да рынку ў БССР мела альтэрнатыву. Прадставілі свае "Асноўныя прынцыпы канцэпцыі пераходу БССР на рынкавую эканоміку" дэпутаты Вярхоўнага Савета рэспублікі ад апазіцыі – Беларускага Народнага Фронту. Вядучым элементам функцыянавання рынку ў іх праграме называлася высокая доля прыватнай уласнасці, у тым ліку і на зямлю. Дзяржаўны сектар, згодна з праграмай БНФ, у рыначных умовах не павінен быў перавышаць 30–40%. У праграме БНФ прапаноўвалася стварыць Балтыйска-Чарнаморскаю Садружнасць (асацыяцыю) з адзінай эканамічнай прасторай, куды б увайшлі Эстонія, Літва, Латвія, Беларусь, Украіна, Малдова [4, с. 277–278]. Большасць дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР выказаліся за прыняцце праграмы, распрацаванай урадавай камісіяй.

У аснову беларускай урадавай праграмы была пакладзена эканамічная дактрына, падрыхтаваная ў Маскве пад кіраўніцтвам акадэміка С.С. Шаталіна, Г. Яўлінскага [7]. У працы па распрацоўцы канцэпцыі гэтай праграмы прымалі ўдзел прадстаўнікі 13 рэспублік, у тым ліку ад БССР доктар эканамічных навук Л.П. Козік (да 2014 г. абіраўся старшынёй ФПБ). Праграма і канцэпцыя С.С. Шаталіна, Г. Яўлінскага



Репозиторий ВГУ

была апублікавана ў жніўні 1990 г., мела недасканаласці (аб чым казалі асобныя эканамісты і палітыкі), але ў той жа час яна атрымала прызнанне і падтрымку ў навуковай супольнасці і шырокай грамадскасці Расіі, Беларусі і інш. рэспублік. Сёння гісторыкі, а больш усяго людзі, маючыя непасрэдныя адносіны да эканомікі, лічуць, што паслядоўнае ўвасабленне гэтага дакумента адкрывала дарогу развіццю больш цывілізаваных (у параўнанні з тым, што адбылося) рыначных адносін. Перавагі прапанаванай праграмы заключаліся ў тым, што правядзенне радыкальнай рэформы праектавалася **на ўсёй тэрыторыі СССР пры захаванні цеснага эканамічнага саюза рэспублік** [7, с. 99]. Складальнікі праграмы меркавалі, што на працягу 500 дзён можна стварыць асновы рыначнай эканомікі, здольнай да самаразвіцця. У той жа час яны папярэджвалі аб небяспецы дэзінтэграцы эканамічнай сістэмы, якая склалася ў СССР [7, с. 37]. Пераход да рынку дазваляў, на погляд аўтараў, стварыць аснову для добраахвотнага аб'яднання суверэнных рэспублік у рамках абноўленага Саюза. Праграма арыентавала кіраўніцтва саюзных рэспублік на цесную каардынацыю дзеянняў і «на неабходнасць ўзгодненых дзеянняў, што дазволіла б спыніць працэс распаду міжрэспубліканскіх гаспадарчых сувязяў і не дапусціць зніжэнне дабрабыту народаў, якія ўваходзяць у эканамічны саюз». Галоўнай мэтай, прапанаванай аўтарамі рэформы і прынцыпаў новай эканамічнай сістэмы для рэспублік СССР, з'яўлялася эканамічная свабода грамадзян і стварэнне на гэтай аснове эфектыўнай гаспадарчай сістэмы, здольнай забяспечыць дынамічнае развіццё народнай гаспадаркі і годны ўзровень дабрабыту грамадзянам краіны, з пераадоленнем адставання ад іншых краін [7, с. 25].

Праграма пераходу да рыначных адносін у БССР прадугледжвала стварэнне асноў рыначнай эканомікі на працягу 1,5–2 гадоў. За гэты час вызначалася стабілізаваць эканоміку, правесці раздзяржаўленне, прыватызацыю, дэманапалізацыю ўласнасці на сродкі вытворчасці, развіваць прадпрымальніцтва, стварыць сістэму дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, рыначную інфраструктуру і механізмы яе дзейнасці. Мелася на ўвазе забяспечыць сацыяльную абарону насельніцтва: ўвядзенне мінімальнай аплаты працы, індэксацыю даходаў, дапамогу па беспрацоўі, па перакваліфікацыі, дапамогу маламаёмасным і шматдзетным сем'ям, пенсійнае забеспячэнне.

Рэалізацыя праграмы рыначных адносін у БССР, як і планавалася, пачалася з 1 лістапада 1990 года. Для ажыццяўлення праграмы пераходу да рынку спатрэбілася стварэнне ў рэспубліцы неабходнага мінімуму асноўных рыначных інстытутаў, нарматыўна-прававых дакументаў. Іх распрацоўка **ў** Беларусі вялася ў спешным парадку: 11 снежня 1990 г. быў прыняты закон “Аб уласнасці”, 14 снежня 1990 г. – закон “Аб нацыянальным банку”, “Аб прадпрыемстве” і “Аб арэндзе”. У законах

Рэпазіторый ВДУ

пазначаны прававыя рамкі для розных відаў дзейнасці і ўвядзенне ў прававыя адносіны паняццяў прыватнай і камунальнай уласнасці.

Пераход да рынку нараджаў у асобных палітыкаў і часткі насельніцтва веру ў магчымасць хуткай трансфармацыі незалежнай рэспублікі ў напрамку да фарміравання новай ліберальнай мадэлі грамадскага развіцця. Кіраўніцтва краіны спадзявалася, што рэалізацыя намечаных у праграме пераходу да рынку рубяжоў дазволіць у самы кароткі час спыніць спад вытворчасці, а да 1993 г. – дамагчыся яго росту. У дадатак да праграмы аб пераходзе да рынку ў 1991 г. была зацверджана "Дзяржаўная праграма па стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароне насельніцтва". Прыняты таксама мытны кодэкс, заканадаўства аб прадпрымальніцтве, аб дзяржпрадпрыемстве, аб праве ўласнасці на зямлю і інш. Да мая 1992 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў 153 новыя законы. На іх аснове ў 1991–1994-х г. адбывалася рэфармаванне адносін уласнасці, лібералізацыя гаспадарчых сувязяў.

Трансфармацыя эканамічнай сістэмы рэспублікі ў бок рыначных адносін праяўлялася пры передачы ў арэнду дробных прадпрыемстваў у сферы гандлю, грамадскага харчавання, камунальных паслуг, бытавога абслугоўвання, у стварэнні асацыяцый, сумесных прадпрыемстваў, акцыянерных таварыстваў. Ужо ў пачатку 1992 г. суб'ектамі недзяржаўных формаў уласнасці ў рэспубліцы з'яўляліся каля 5,5 тыс. кааператываў, амаль 2 тыс. малых прадпрыемстваў, больш за 200 сумесных прадпрыемстваў, 75 асацыяцый,15 акцыянерных таварыстваў, 5 канцэрнаў, 25 камерцыйных банкаў [8, с. 596]. Узніклі таварныя і фондавыя біржы, з'явіліся тысячы прыватных фірмаў, гандлевых кропак [8, с. 280]. Насельніцтву была прадастаўлена магчымасць выкупляць ва ўласнасць кватэры, набываць акцыі, аблігацыі і г.д.

У аграрным сектары эканомікі таксама былі зроблены пэўныя крокі па станаўленні рыначных адносін. На аснове Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі і закона "Аб праве ўласнасці на зямлю" праводзілася перарэгістрацыя калгасаў і саўгасаў, прадугледжвалася стварыць на іх базе высокапрыбытковыя прадпрыемствы капіталістычнага тыпу. Асобныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы былі пераўтвораны ў кааператыўныя і акцыянерныя прадпрыемствы і атрымалі новыя назвы. Стала стварацца прыватная ўласнасць у форме фермерскіх гаспадарак.

***3. Крызісны стан у развіцці краіны***. Аднака, на першым этапе рыначных пераўтварэнняў (1991–1995 гг.) народная гаспадарка БССР, у параўнанні з зканцом 80-х гадоў, мела больш страт, чым здабыткаў. Сітуацыя сведчыла аб наступленні крызісных з'яў. Парушэнне гаспадарчых сувязей у сістэме агульнасаюзнага падзелу працы адмоўна адбілася на канчатковых гаспадарчых выніках ужо ў 1991 г. Нацыянальны прыбытак рэспублікі за 1991 г., у параўнанні з 1990 г., скараціўся на 3%,

вытворчасць прамысловай прадукцыі – на 1,5%, сельскай гаспадаркі – на 3%. У 1992 г. востра праявіліся праблемы ў грашова-фінансавай сферы. Не вызначыўшы самастойнай эканамічнай палітыкі, працягваючы выкарыстоўваць рубель у якасці плацёжнага сродку, Беларусь трапіла ў поўную залежнасць ад эканамічнай сітуацыі ў Расійскай Федэрацыі. У 1992 г. нацыянальны даход знізіўся на 11% (у параўнанні з папярэднім 1991 г.), пры гэтым выпуск прадукцыі прамысловасці скараціўся на 4,4%, знешнегандлёвы абарот зменшыўся, у параўнанні з папярэднім, напалову і склаў толькі 1,8 млрд долараў ЗША.

Рэзка скарацілася (з 70% да 12–13 %) вытворчасць ваеннай прадукцыі на прадпрыемствах рэспублікі. Са 120 прадпрыемстваў рэспублікі, якія ў рознай ступені займаліся вытворчасцю прадукцыі абароннага прызначэння, ваеннымі заказамі ў сярэдзіне 1993 г. забяспечваліся толькі адзінкі.

Знізіўся аб'ём навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ, якія фінансаваліся па лініі Міністэрства абароны СССР. Балюча праходзіла канверсія і рэарганізацыя работы машынабудаўнічага і хімічнага комплексу. На высокатэхналагічных прадпрыемствах быў зроблены пераход на выпуск прасцейшага абсталявання і тэхнікі для розных галін гаспадаркі, а таксама тавараў народнага спажывання. Напрыклад, навукова-вытворчае аб'яднанне "Інтэграл" перайшло на выпуск лічыльнікаў банкнот, касавых апаратаў, сталоў касіраў, сервісных тэлефонных станцый, электронных сістэм кантролю для камбайнаў, блокаў і прыбораў для аўтамабіляў і пагрузчыкаў, электронных тэрмометраў, вымяральнікаў ціску крыві і шмат іншага. Мінскае вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі з 1992 г. пачало серыйную вытворчасць электронных аўтаматычных тэлефонных станцый "Квант", а з 1995 г. – тэлефонных станцый "Бэта". Адкрытае акцыянернае таварыства "Мінскі прыборабудаўнічы завод" забяспечвала 60% рынку краін СНД радыёвымяральнай апаратурай (асцылографы, вольтметры і інш.), 70% рынку электронных тавараў у Беларусі і 11% у Расіі (дазіметры, радыёметры, глюкометры, таймеры, шынкоўкі, мясарубкі, шкафы-грылі, рубанкі, пілы і інш.).

Разбурэнне эканамічнага адзінства рэспублік, якое склалася раней, рэзкі рост кошту нафты і прыроднага газу, што пастаўляліся з Расіі, прывялі да таго, што ў параўнанні з савецкім перыядам, беларускія прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы да 1995 г. рэзка знізілі эфектыўнасць сваёй працы. Асабліва рэзка і прыкметна паскорылася падзенне вытворчасці на прадпрыемствах зборачнага і канчатковага цыклаў, у навукаёмістых і працаёмкіх галінах. Да 1995 г. у станкабудаванні, машынабудаванні, трактарабудаванні падзенне вытворчасці склала да двух трацін. Інтэнсіўна зніжалася вытворчасць іншых відаў прамысловай прадукцыі і прадукцыі, прызначанай для задавальнення асабістых інтарэсаў насельніцтва. Валавы ўнутраны прадукт

Рэпазіторый ВДУ

рэспубліке за 1991–1995-я гг. скараціўся на 38%, прадукцыя прамысловасці – на 41%, прадукцыя сельскай гаспадаркі – на 27%, аб'ём капітальных укладанняў – на 60% [9, с. 166]. Спад прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці негатыўна адбіўся на працы транспартнага канвеера. Аб'ём перавозак грузаў у 1995 г. (у параўнанні з 1990 г.) усімі відамі транспарту паменшыўся з 1127,5 млн тон да 398,3 млн тон. Вядучы від транспарту рэспублікі – чыгуначны, які працаваў да гэтага часу ў напружаным і бесперабойным рытме, знізіў перавозкі грузаў на 74,4 млн тон, або больш чым на 38%.

Адзначаўся значны спад сельскай гаспадаркі: вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі знізілася за 1991–1995-я гг. больш чым у два разы. Вытворчасць мяса ў 1995 г. склала 380,3 тыс. тон супраць 889,1 тыс. тон у 1990 г. Вялізныя страты назіраліся ў вытворчасці алею, цукру, іншых прадуктаў.

З 1990 па 1995 гг. істотна скарацілася колькасць працаўнікоў, занятых у калгасах (з 602 тыс. чал. да 499 тыс. чал., у саўгасах, адпаведна з 313 тыс. да 182 тыс. чал.) [10, с. 355]. Не замацавалася на вёсцы як новая форма сельскагаспадарчай вытвочасці фермерская гаспадарка. У 1991 г. было зарэгістравана 6 тыс. фермерскіх гаспадарак, у сярэдзіне 1993 г. іх налічвалася 2658. Фермерская гаспадарка мела ў сярэднім па рэспубліцы каля 20 га зямлі, што стрымлівала развіццё таварнай вытворчасці ў вёсцы. Ураджайнасць збожжавых і бульбы ў фермераў была ніжэй, чым у калгасах і саўгасах. Многія фермерскія гаспадаркі аказаліся нерэнтабельнымі [11, с. 410–411]. З-за адсутнасці дзяржаўнай падтрымкі і матэрыяльных рэсурсаў (а часта з-за маральнай і фізічнай непадрыхтаванасці людзей да вельмі напружанай працы) паўсталі цяжкасці са збытам прадукцыі, колькасны рост фермерскіх гаспадарак запаволіўся, а некаторыя спынілі сваю дзейнасць. У 2010 г.на Беларусі захавалася толькі 2 тыс. фермерскіх гаспадарак.

Несуцяшальныя вынікі пераходу да рынку назіралася ва ўсіх абласцях краіны. Сведчанне гэтаму – стан народнагаспадарчага комплексу ў Віцебскай вобласці. Тут выпуск прамысловай прадукцыі першага «рыначнага» 1991 г. у супастаўных цэнах адносна 1990 г. зменшыўся на 3,5%. 49 вытворчых прадпрыемстваў (27,4% ад агульнай колькасці) не дадалі прадукцыі на 872,8 млн руб. Значна менш выпушчана станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем, машын і абсталявання для жывёлагадоўлі і кормавытворчасці, аўтамабільнага бензіну, дызельнага паліва, нафтабітуму, хімічных валокнаў і нітак, піламатэрыялаў, драўніна - валакністых пліт, вапняковой і даламітавай мукі, паперы і інш. вырабаў. Вытворчасць тавараў народнага спажывання харчовай групы знізілася ў цэлым на 8,2%, масла – на 13%, мяса – на 16%. Знізіўся выпуск прадукцыі і нехарчовых тавараў: тэлевізараў – на 4%, радыёпрыёмнікаў – на 11%, тканін – на 14%, панчошна-шкарпэткавых вырабаў – на 11%, дываноў і

дывановых вырабаў – на 31%. На 12% скараціліся перавозкі грузаў транспартам агульнага прызначэння. Значна менш атрымана ў гэты год збожжа (на 27%), вытворчасць мяса скарацілася на 14%. Насельніцтва недаатрымала розных вырабаў на 423,4 млн рублёў, з-за чаго на спажывецкім рынку меўся іх востры дэфіцыт. Агульная нестабільнасць і чаканае павышэнне коштаў у сувязі з абвешчанай іх лібералізацыяй выклікалі ажыятажны попыт на ўсе віды прадуктаў харчавання і тавараў для побыту. Што тычыцца коштаў на тавары і паслугі, яны, як адзначалася тады ў народзе, "схадзілі з розуму". У снежні 1991 г. у параўнанні з тым жа месяцам папярэдняга года на тавары народнага спажывання цэны выраслі ў 2 з лішнім разы, у тым ліку на прадукты харчавання – у 2,6 разы, на хлеб, хлебабулачныя і кандытарскія вырабы – амаль у 3 разы, на рыбу – у 5 разоў. На традыцыйна беларускі сельскагаспадарчы прадукт – бульбу – больш чым у 5 разоў! На нехарчовыя тавары – у 2,2 разы [12, с. 2]

У 1992 г. становішча ў эканоміцы вобласці не палепшылася. З-за рэзкага павышэння коштаў на энергарэсурсы (на адну тону нафты, напрыклад, цана ўзрасла амаль у 800 разоў) вобласць апынулася ў катастрафічным стане. У прамысловасці спад вытворчасці склаў 10,6%, а ў хімічнай – 50%. Аптовыя цэны прадпрыемстваў у параўнанні з папярэднім годам павялічыліся ў 30,6 раза. Цэны на тавары народнага спажывання і платныя паслугі насельніцтву ўзраслі ў 13 разоў. У службу занятасці звярнуліся 24,5 тысячы чалавек. Найбольшае напружанне назіралася ў сувязі з нестабільным забеспячэннем насельніцтва харчаваннем. Аб'ёмы паставак мяса і птушкі за кошт дзяржаўных рэсурсаў скараціліся на працягу года на 23%, малочных прадуктаў – на 8%, маргарынавай прадукцыі – на 37%, гародніны, цытрусавых – у 2 разы, садавіны – у 3 разы, продаж рыбы – на 36%. "Штарміла»" эканоміку вобласці і ў наступныя 1993–1995 гады [12, с. 10].

І так, бачна, што ў 70–80-я гады ў СССР і яго саюзных рэспубліках адбывалася паступовае зніжэнне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Патрабаваліся перамены, як тады гучала, наданне сацыялізму новага дыхання, вывад яго на вышэйшы ўзровень. Гэта і прадугледжвала ў тэарытычнай пастаноўцы палітыка перабудовы, якая начала праводзіцца з другой паловы 80-х гг. Але як аказалася, падчас правядзення рэфарміравання, не былі вызначаны мэты, задачы, канчатковыя вынікі, адсутнічала навукова абгрунтаваная праграма абнаўлення грамадства. Гарбачоўская "перабудова" не дасягнула сваёй мэты, яна ператварылася ў паслядоўны дэмантаж усёй сістэмы грамадскіх адносін і распад СССР. Адыгралі сваю роль і знешнія дырыжоры – кансультанты пад уплывам якіх аказаліся М. Гарбачоў, Б. Ельцын і іх паплечнікі [13, с. 547]. У канцы 1991 г. СССР быў аб'яўлен ліквідаваным, саюзныя рэспублікі абвешчаны суверэннымі дзяржавамі.



Репозиторий ВГУ

Пасля абвяшчэння суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь прымаліся меры па пераадоленні крызісу, які абвастраўся на гэтым этапе. На шляху пераходу ад планавай –дырэктыўнай сацыялістычнай гаспадаркі да рыначнай была праведзена частковая структурная перабудова эканомікі, рэарганізацыя суб'ектаў гаспадарання, канверсія прадпрыемстваў, рэфарміраванне адносін уласнасці. Але пераход да рынку ў сувязі з аб’ектыўнымі і суб’ектыўнымі прычынамі ажыццяўляўся неймаверна цяжка, супярэчліва, грамадства хварэла недахопам комплекснасці. Негатыўныя з’явы ў эканоміцы і сацыяльнай сферы на этапе 1991–1995-х гг. былі абумоўлены распадам адзінай эканамічнай прасторы СССР, а таксама і адсутнасцю вопыту пераходу ад планавага сацыялістычнага тыпу гаспадарання да рыначнага. Істотны спад вытворчасці ва ўсіх галінах і інфляцыя, пралікі папярэдняга этапу перабудовы прывялі народную гаспадарку рэспублікі да глыбокага эканамічнага крызісу.

**Спасылкі**

1. Матэрыялы XXX з’езда Камуністычнай партыі Беларусі. – Мн., 1986.

2. Государственное управление: практика и перспективы / под ред. В.В. Русаковича, В.М. Михеева, Э.М. Скобелева. – Мн.: Беларусь, 1999. – 320 с.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі). – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – 276 с.

4. Эканамічная гісторыя Беларусі: Курс лекцый / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.Ф. Шапавал і інш.: пад агул.рэд. В.І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1993.– 288 с.

5. Чернобыль, 26 апреля 1986. – декабрь 1991.

6. О переходе БССР к рыночной экономике/ Сборник законов БССР. – 1990. – № 29.

7. Переход к рынку, Концепция и программа. – М.: Архангельское, 1990.

8. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. –728 с.; іл.

9. Труд и занятость в Республике Беларусь. – Мн., 2002.

10. Народное хозяйство Республики Беларусь, 1995. – Минск, 1996.

11. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік: у 2 ч. – Ч. 2 Люты 1917 г. –2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464с.

12. Вытворчасць : скочванне ўніз: да вынікаў работы народнагаспадарчага комплексу Віцебшчыны за 1991 год // Віцебскі рабочы. – 1992. – 29 лют.

13. Мандрик, И.В. Независимая Беларусь: кризис в экономике, упадок в социальной сфере при переходе к рыночным отношениям в 1991–1995 гг. (на примере Витебской области) / И.В. Мандрик // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М.Машерова»: сборник научных трудов. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2016. – Т. 22. – С. 5–14.

14. Шумилов, М.И. История России: конец XIX – начало XXI века: учеб. пособие/ М.И. Шумилов, М.М.Шумилов. – 2-е изд., испр. и доп.– Ростов н/Д.: Феникс, 2005. – 637 с.

Репозиторий ВГУ

ТЭМА 12. **Пераадоленне крызісных тэндэнцый у эканоміцы Беларусі**

*1. Першы Усебеларускі народны сход, стабілізацыя эканомікі.*

*2. Рэалізацыя мэт і задач сацыяльнай палітыкі на Беларусі.*

***1. Першы Усебеларускі народны сход, стабілізацыя эканомікі.*** Пасля заявы аб дэнансацыі Саюзнага дагавора і ўтварэння СНД (8 снежня 1991 г. у Белавежскай пушчы) гаспадарка БССР ператварылася ў міжнародную эканамічную сістэму. Пераход да рынку на першапачатковым этапе не прынёс беларусам нічога, акрамя істотных страт. У рэспубліцы не знайшлося кіраўнікоў і спецыялістаў, якія б у кароткія тэрміны, у тых складаных умовах, змаглі арганізаваць сацыяльна – рыначную гаспадарку, здольную станоўча ўздзейнічаць на жыццё людзей. Істотны спад вытворчасці ва ўсіх галінах і інфляцыя, прывялі народную гаспадарку рэспублікі да глыбокага эканамічнага крызісу. Адрозненне ў дэкларацыях (абяцанні сацыяльных гарантый насельніцтву) і жыццёвых рэаліях (кратнае збядненне насельніцтва ў параўнанні з савецкім часам), не прывялі да ўмацавання іміджу ўлады. Давер народа да кіраўніцтва рэспублікі быў падарваны. Да лета 1994 г. у выбаршчыкаў ужо зацвердзілася меркаванне аб некампетэнтнасці дзяржаўных дзеячаў мінулага перыяду. Мандат на кіраўніцтва краінай у гэты складаны час быў перададзены іншым палітыкам. Пасля прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка 1994 г.), якая прадугледжвала ўвядзенне ў рэспубліцы прэзідэнцкай формы кіравання, 10 ліпеня 1994 г. насельніцтва зрабіла выбар, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны А.Р. Лукашэнка.

У складанай абстаноўцы, якая назіралася ў рэспубліцы да 1994 г., перад яе абноўленым кіраўніцтвам востра паўстала пытанне аб вывадзе краіны з глыбокага крызісу і выбару далейшага шляху развіцця. У перадвыбарнай платформе А.Р. Лукашэнка назваў галоўным кірункам у сваёй дзейнасці забеспячэнне суверэнітэту пры цесным саюзе з Расійскай Федэрацыяй, і аб бескампраміснай барацьбе з карупцыяй і злачыствам, дасягненне кансалідацыі грамадства і ўмацаванне дзяржавы, барацьбу з беднасцю і забеспячэнне ўстойлівага росту дабрабыту насельніцтва. Прааналізаваўшы стан эканомікі і вызначыўшы прычыны расчаравання людзей, Прэзідэнт палічыў неабходным правесці карэкціроўку ранейшага курсу, узвысіць дзяржаўную ўладу над прыватнымі інтарэсамі.

У кастрычніку 1994 г., з улікам новага бачання ўнутрыпалітычнага развіцця была распрацавана і зацверджана праграма неадкладных мер па выхаду эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу (зацверджана 30.09.1994 г.) [1, с. 2]. У праграме сістэмна вызначаны канцэпцыя і методыка аздараўлення абстаноўкі, прадугледжаны комплекс узаемазвязаных неадкладных мер, накіраваных на прыпынак спаду вытворчасці, тармажэнне інфляцыі, недапушчэнне далейшага падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Дзяржава мела намер стымуляваць эканамічны рост

Репозиторий ВГУ

праз жорстка цэнтралізаваныя метады кіравання эканомікай, адначасова паслабляючы сацыяльныя наступствы той грамадскай няроўнасці, якая непазбежна для пачатковага этапу рынчных адносін. Аб'ектыўная ацэнка абстаноўкі, разуменне таго, што пераўтварэнне варта праводзіць у адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і рэальнымі магчымасцямі краіны, і што для змены свядомасці людзей спатрэбіцца час, стала асновай прынятага рашэння: праводзіць рэфармаванне старой сістэмы паступова, укараняючы новыя рыначныя падыходы, не адкідваючы сацыялістычныя прыёмы і метады эфектыўнага кіравання і гаспадарання.

Важнай палітычнай падзеяй на этапе самастойнага развіцця рэспублікі стаў першы Усебеларускі сход (19–20 кастрычніка 1996 г.), на якім прысутнічала каля 5 тыс. чалавек. Сход абмеркаваў «Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гады», праект новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, а таксама пытанні, прапанаваныя Прэзідэнтам на рэспубліканскі рэферэндум. Тады ж была распрацавана і зацверджана "Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2010 года". У гэтых дакументах была ўлічана як уласная, так і расійская негатыўная практыка першых гадоў ліберальных рэформаў, прапанаваны больш эфектыўныя механізмы правядзення прыватызацыі, новыя тэрміны дэцэнтралізацыі і раздзяржаўлення. З усёй відавочнасцю тут разглядаўся курс на дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, што сведчыла аб падтрымцы палітычнага і эканамічнага курсу кіраўніка дзяржавы. Прыватызацыя стала праводзіцца пры непасрэдным удзеле і пад кантролем Прэзідэнта краіны, ажыццяўляўся свядомы падыход да перадачы дзяржмаёмасці ў прыватную ўласнасць. Вядучыя прамысловыя прадпрыемствы засталіся ў дзяржаўнай уласнасці, што дазволіла выкарыстоўваць іх у інтарэсах усяго беларускага народа, а не ў інтарэсах асобных суб'ектаў. Прыпынены дэмантаж буйной калгасна-саўгаснай вытворчасці, пры адмаўленні ад куплі-продажу зямлі сельскагаспадарчага прызначэння. Стаўка ў развіцці прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці зробленая на ўласныя сілы. З двух асноўных мадэляў рыначнай эканомікі, вядомых у сусветнай практыцы (ліберальнай і сацыяльнай арыентацыі), у Беларусі стала рэалізоўвацца мадэль сацыяльнай арыентацыі патэрналісцкага тыпу, якая грунтуецца на свабодным суіснаванні розных формаў уласнасці, моцнай і эфектыўнай сацыяльнай функцыі дзяржавы. Сцэнарый, па якім Беларусь з 1994 г. рухалася да рынку, у якім толькі часткова выкарыстоўваўся вопыт станаўлення рыначных адносін заходняга тыпу, быў выкладзены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на Другім эканамічным форуме ў 1998 г. у Санкт-Пецярбургу. Гаворачы пра шлях развіцця рэспублікі ў постсавецкі час, больш канкрэтна аб пошуку айчыннай эканамічнай мадэлі, А.Р. Лукашэнка падкрэсліў: "Рэформа- гэта ўдасканаленне таго, што створана, таму, што зламаць і стварыць новае ў нас няма ні часу, ні сродкаў. Ды і ці трэба гэта рабіць наогул?". Далей ён нагадаў, што ў

Беларусі ажыццяўляецца “фарміраванне сацыяльна арыентаванай, шматукладнай рыначнай эканомікі з раўнапраўным функцыянаваннем дзяржаўнай і прыватнай уласнасці з рознымі формамі гаспадарання-акцыянернай , калектыўнай, арэнднай” [2, с. 2].

Пазней (у 1999 г.) у сваім выступленні ў Маскве ў Дзяржаўнай Думе А.Р. Лукашэнка ў чарговы раз пацвердзіў, што ў Беларусі пасля абрання першага Прэзідэнта ў развіцці дзяржавы былі ўлічаны гістарычныя ўрокі мінулых радыкальных падыходаў да грамадскіх змен: “Мы з самага пачатку адмовіліся ад рэвалюцыйнай ломкі, аддаючы перавагу паступоваму рэфармаванню эканомікі, пераймаючы ўсё лепшае, што можа прапанаваць сусветны вопыт” [3, с. 1].

1995 год стаў паваротным у станаўленні беларускай эканамічнай мадэлі. Дзяржава паставіла пад свой кантроль рэгуляванне прапарцыянальнага развіцця дзяржаўных і недзяржаўных форм уласнасці, узаемаадносіны паміж гэтымі ўкладамі, падтрымку структурных прапорцый, якія забяспечваюць эканамічную стабільнасць, цэнаўтварэнне і выкарыстанне працоўных рэсурсаў, а таксама, што з'яўляецца самым галоўным, сацыяльна-эканамічную палітыку ў галіне аплаты працы і даходаў насельніцтва. Правільнасць такога падыходу ў кіраванні эканомікай і сацыяльнай сферай з боку беларускага кіраўніцтва ў крызісныя гады пацвярджае і сусветны вопыт. У 1933 г. прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт прапанаваў праграму выхаду з крызісу «Новы курс», якая прадугледжвала шырокае ўмяшанне дзяржавы ў эканоміку. Рэалізацыя прапанаванай праграмы з адладжаным дзяржаўным кіраваннем ажывіла амерыканскую эканоміку ў даволі кароткія тэрміны

У Беларусі падобны падыход прадэманстраваў на гэтым этапе, таксама сваю жывучасць. Ён актывізаваў вытворчую дзейнасць. Пасля катастрафічнага абвалу вытворчасці пачаўся яе ўздым. Большасць вядучых галін наладзілі стабільнасць у рабоце. З 1995 г. эканоміка Рэспублікі Беларусь увайшла ў стабілізацыйны перыяд з наступным штогадовым ростам. У 1996 г. упершыню адбыўся прырост валавога ўнутранага прадукту (у параўнанні з папярэднім 1995 г.) – на 3%, вытворчасці прамысловай прадукцыі – на 4%, спажывецкіх тавараў – на 9%, уводу жылля – на 35%. Сельскагаспадарчая вытворчасць павялічылася на 2%. З 1997 г. па 2000 г. рост аб'ёмаў вытворчасці складаў штогод ад 10 да 18% [4, с. 8]. Рост ВУП у 1997 г. склаў больш за 11%, у 1998 г. – 8,4%. У 2000 г. эканамічны рост паскорыўся: прырост ВУП склаў 8%, перавысіўшы ўзровень дакрызіснага і самага паспяховага для савецкай Беларусі 1990 г. У цэлым па большасці паказчыкаў першы пяцігадовы план (з 1996 г.быў пакладзены пачатак постсавецкім пяцігодкам) быў выкананы. Прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасць у 2000 г. перасягнула паказчыкі 1991 г. Але на завяршэнні 2000 г.заставалася яшчэ шмат стратных прадпрыемстваў і арганізацый [4, с. 10].

Репозиторий ВГУ

Больш паспяхова гаспадарка Беларусі развівалася ў 2001–2005-х гг. У гэты час не было ніводнага года без значнага прыросту валавога нацыянальнага прадукту. Павялічэнне ВУП у 2005 г. у параўнанні з 200 г. склала 43%. Выпуск прамысловай прадукцыі за пяць гадоў павялічыўся на 52%, сельскагаспадарчай – на 26% [5, с. 15]. Вынікі такога ўзроўню былі параўнальныя з лепшымі перыядамі савецкай эпохі. Рост паказчыкаў забяспечваўся галоўным чынам дзякуючы дасягненням прамысловасці, асабліва гэта тычылася трактарабудаўнічай, нафтаперапрацоўчай і хімічнай галіны. У ліку перадавых прадпрыемстваў у гэтыя гады знаходзіліся калектывы ВА "Мінскі трактарны завод", "БелАЗ", "МАЗ»", беларускае унітарнае прадпрыемства "Беларускі металургічны завод", большасць прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці. Тут змаглі ў кароткія тэрміны наладзіць выпуск прадукцыі, якая мела попыт на знешніх рынках.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці ўнутранага і знешняга парадку, стабільна працавала большасць галін гаспадарчага комплексу і ў наступныя гады. Паспяховым амаль па ўсіх паказчыках стаў першы год трэцяй пяцігодкі (2006 г.): аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі – павялічыўся на 11,3%, ВУП павялічыўся на 9,9%. У сельскай гаспадарцы прырост склаў 6,1%.

Эфектыўнай працай на гэтым этапе вызначаліся вядучыя экспартаарыентаваныя прадпрыемствы рэспублікі: Беларускі аўтазавод у Жодзіна, Салігорскі калійны камбінат, Наваполацкі і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы, Віцебскі тэлевізійны завод, вытворчае аб'яднанне "Атлант", Мінскі трактарны і аўтамабільны заводы і іншыя.

У сусветным маштабе вытворчасць вялікагрузных аўтамабіляў у Беларусі ў 2010 г. раўнялася 30%, мінеральных угнаенняў – 15%, трактароў – 6%. Толькі за студзень – красавік 2006 г.(у 60-гадовы свой юбілей) МТЗ выпусціў 16,6 тыс. трактароў [6, с. 3]. На многіх прадпрыемствах праводзілася рэканструкцыя, увод новых вытворчых магутнасцей. Пэўнае развіццё атрымаў прыватны сектар. Паводле дадзеных на 1.04.2008 г. у Беларусі налічвалася 51 тыс. малых прадпрыемстваў.

З ліку сродкаў пазітыўнага ўплыву на эканамічнае развіццё ў першае дзесяцігоддзе новага веку , несумненна, на першае месца трэба паставіць непасрэдна саміх вытворцаў, але ў той жа час варта прызнаць прысутнасць расійскага фактару: атрыманне ад Расіі энерганосьбітаў па ільготных цэнах і высокі таваразварот паміж дзяржавамі. Так, у 2006 г. за 1 тыс. куб. м газу Беларусь плаціла 47 дол. ЗША, у той час як для краін Заходняй Еўропы такая колькасць каштавала 120–130 дол. Таваразварот паміж Рэспублікай Беларусь і Расіяй меў у гэтыя гады пастаянную тэндэнцыю да росту. Толькі за 2007 г. ён павялічыўся на 30,7% і складаў 26,1 млрд амерыканскіх долараў. Параўнальна высокая якасць прамысловай прадукцыі дазваляла Беларусі весці гандаль з многімі іншымі краінамі(аб гэтым гаворка будзе ніжэй).

***2. Рэалізацыя мэт і задач сацыяльнай палітыкі на Беларусі.*** На этапе 1991–1995-х гг. Рэспубліка Беларусь, як сацыяльна арыентаваная дзяржава, нездавальняюча выконвала свае функцыі. Спад у вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, свабоднае цэнаўтварэнне парушылі сістэму сацыяльнай падтрымкі і гарантый для насельніцтва рэспублікі. Больш за ўсіх пацярпела эканамічна актыўнае насельніцтва, занятае ў рэальным сектары эканомікі, назіраўся вялікі разрыў у даходах насельніцтва. Рэзка знізіўся ранейшы (прымальны) савецкі жыццёвы ўзровень насельніцтва. Да 1994 г. заработная плата ў краіне вырасла не больш чым у 2 разы, а рознічныя цэны на тавары народнага спажывання і платныя паслугі насельніцтва павялічыліся прыкладна ў 10–15 разоў (!) [7, с. 416]. Гэта азначала, што беларусы сталі жыць значна горш, чым раней. Колькасць людзей, чые даходы складалі 60% і ніжэй за мінімальны спажывецкі бюджэт, у 1995 г. дасягнула 63% насельніцтва краіны. Цяжкай стратай для насельніцтва было абясцэньванне грашовых зберажэнняў. Большасці насельніцтва ўжо былі недаступныя для набыцця неабходныя тавары паўсядзённага ўжытку (халадзільнікі, тэлевізары, мэбля і інш.). Стала зразумела, што рынак аказаўся для Беларусі новай нязведанай справай, пераход да рынкавай эканомікі не апраўдаў чакаемых ад яго спадзяванняў. Хоць вынікі першых гадоў у Беларусі былі не такімі драматычнымі, як у Расіі (імгненнай абвальнай прыватызацыі ў краіне не назіралася, доля дзяржаўнай уласнасці заставалася даволі высокай), аднак яе эканоміка апынулася ў глыбокім крызісе: адбылося рэзкае падзенне вытворчасці, рост інфляцыі, зніжэнне прыбытку і , адпаведна, падатковых паступленняў, што істотна адбілася на некаторых складніках узроўню жыцця насельніцтва. Значная колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі аказалася беспрацоўнымі.

Але па меры ўмацавання эканамічнага стану ў рэспубліцы складваліся ўмовы для рэалізацыі мэт і задач дзяржавы, якая абвясціла’ сябе сацыяльнай. Улічваючы вопыт краін, якія з’яўляюцца сацыяльнымі па факту, Беларусь стала на шлях пабудовы сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі з захаваннем назапашанай папярэднімі пакаленнямі матэрыяльнай, высокаразвітай інфраструктуры і высокакваліфікаванага складу рабочых, інжынерна –тэхнічных работнікаў і служачых.

Усталяванне **ў** рэспубліцы сацыяльнай справядлівасці, павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва і скарачэнне малазабяспечанасці праводзілася праз такія рычагі, як рэгуляванне аплаты працы, пераразмеркаванне фінансавых сродкаў у форме рознай дапамогі, датацый, планавання і выпуск востра дэфіцытных спажывецкіх тавараў і г. д. Улада імкнулася стымуляваць эканамічны рост, адначасова змякчаючы сацыяльныя наступствы той грамадскай няроўнасці, якое непазбежна для пачатковага этапу рыначнай эканомікі. Цэны і тарыфы на паслугі насельніцтву набліжаліся да рэальных выдаткаў паэтапна. Канчатковыя

Рэпазіторый ВДУ

вынікі 1996–2000-х гг. сведчылі пра тое, што праграмныя ўстаноўкі на эфектыўную сацыяльную палітыку ў Рэспубліцы Беларусь, якая абвясціла сябе сацыяльнай дзяржавай, пры шырокамаштабным дзяржаўным умяшанні ў эканоміку і сацыяльную палітыку паспяхова рэалізоўваліся. На дадзеным этапе стабільна нарошчваўся патэнцыял нацыянальнай эканомікі, адпаведна, і база для правядзення эфектыўнай дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі. У краіне забяспечвалася харчовая бяспека, спыніўся працэс сацыяльнага расслаення насельніцтва. У людзей з'явілася ўпэўненасць у будучыні, узмацнілася імкненне да прадуктыўнай працы [8, с. 52].

Асноўную ролю ва ўздыме дабрабыту насельніцтва займала заработная плата. Рэальная зарплата, занятых у сферы вытворчасці, павялічылася за пяць год на 10% [4, с. 9], а ў далейшым мела тэндэнцыю да пастаяннага росту. За 2001–2005-я гг. сярэднямесячная заработная плата ў сярэднегадавым вылічэнні вырасла (у пераліку на амерыканскую валюту) ад 40 да 260 дол. Найбольш значнае павелічэнне яе ў параўнанні з папярэднім годам адбылося ў 2001 г. – на 30%. Сярэдні памер пенсій за гэты час (з улікам кампенсацыйных выплат) склаў 104 дол. У канцы 2005 г. аплата працы работнікаў сацыяльнай сферы (аховы здароўя, адукацыі, культуры) была набліжана да сярэднерэспубліканскага ўзроўню. Вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень мелі зарплату работнікі навукі і навуковага абслугоўвання, прамысловасці, транспарту, сувязі і будаўніцтва. У 2005 г. у краіне зафіксаваны самы нізкі ўзровень інфляцыі – 8% за ўвесь год. Пры нізкіх цэнах Рэспубліка Беларусь яшчэ больш апярэджвала краіны, якія ўваходзілі ў СНД па пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Удзельная вага малазабяспечанага насельніцтва ў агульнай колькасці жыхароў рэспублікі знізілася з 41,9% да 12,7%.

Рэльефна сацыяльная накіраванасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця вызначалася і ў наступныя пяць гадоў. У праграме развіцця краіны на 2006–2010-я гг. рэальныя грашовыя даходы, у тым ліку і зарплату, планавалася падняць на 50–55%, а ўзровень жыцця насельніцтва Беларусі наблізіць да сярэднееўрапейскага.

У першыя тры гады планы па ўстойлівым павышэнні ўзроўня жыцця насельніцтва выконваліся паспяхова. Пацвярджаецца гэта, перш за ўсё, ростам рэальнай заработнай платы, узросшымі магчымасцямі насельніцтва ў набыцці значных бытавых, прамысловых тавараў і высокакаларыйных прадуктаў. Так, у 2010 г. доля зарплаты і трансфертаў насельніцтву (абавязковых выплат пенсій, стыпендый, дапамог, кампенсацый) складала 34,3% выдаткаў бюджэту (у 2009 г. 31,5%). Інвеставанне сродкаў у прамысловую групу "Б" дазволіла задаволіць попыт насельніцтва на дэфіцытныя тавары і прадукты харчавання. Узраслі магчымасці насельніцтва ў назапашванні сямейных зберажэнняў, якія мелі патрэбу – у набыцці кватэр. Упершыню за ўсе постсавецкія гады на працягу аднаго 2006 г. было пабудавана больш за 4 млн кв. м жылля. Вытворчасць

Рэпазіторый ВДУ

спажывецкіх тавараў, без уліку прамысловых тавараў, павялічылася амаль на 10%. У разліку на душу насельніцтва спажывецкіх тавараў (халадзільнікі, тэлевізары, тканіны і абутак) у Беларусі выраблялася больш, чым у іншых краінах СНД. Рэальная зарплата ў бюджэтнай сферы ўзрасла больш чым на 20% (планавалася 6–7%). Рознічны таваразварот павялічыўся за 2006 г. на 17% [4, с. 21]. Насельніцтва набыло за гэты час значную колькасць аўтамабіляў. У 2008 годзе ў рэспубліцы знаходзілася ў асабістым карыстанні амаль 3 млн транспартных сродкаў.

Рост даходаў беларусаў садзейнічаў зніжэнню долі насельніцтва з даходамі ніжэй бюджэту пражытачнага мінімуму. Доля насельніцтва з даходамі ніжэй за бюджэт пражытачнага мінімуму ў 2006 г. не перавышала 12%. Дачыненне даходаў самых багатых жыхароў да даходаў самых малазабяспечаных у рэспубліцы ў канцы 2006 г. знаходзілася ў адносінах 5:1, што характарызавала даволі высокі ўзровень сацыяльнай справядлівасці.

Прыярытэтным напрамкам сацыяльнай палітыкі на гэтую пяцігодку стала развіццё сацыяльнай структуры вёскі. Для выканання Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі (прынята ў сакавіку 2005 г.) на базе цэнтральных гаспадарчых сядзіб або цэнтраў сельскіх Саветаў былі створаны аграгарадкі.

У рэспубліцы за 2005–2007-я гг. у 253 аграгарадках былі завершаны работы па ўзвядзенні найважнейшых аб'ектаў інфраструктуры. У Віцебскай вобласці ў 2005–2006-я гг. былі уведзены 63 аграгарадкі. Забяспечанасць насельніцтва ўстановамі камунальна-бытавога і сацыяльна-культурнага прызначэння тут мала чым адрознівалася ад тых, што меліся ў буйных гарадах [9, с. 228, 234]. Толькі ў адным Віцебскім раёне за 4 гады рэалізацыі гэтай праграмы пабудавана 438 дамоў і кватэр, добраўпарадкавана 14 з запланаваных 17 аграгарадкоў.

Павялічвалася доля ВУП за кошт сельскагаспадарчага сектара. За 2006–2010-я гг. дасягнута ўстойлівая дынаміка роста вытворчасці і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання. Валавы аб'ём вытворчасці зерня за гэты перыяд дасягнуў 38 млн тон, што ў 1,3 разы болей чым за 2001–2005-я гг. Ураджайнасць зернавых культур пераадолела 30 ц з гектара. Па вытворчасці мяса і малака ўзровень папярэдняй пяцігодкі перавышаны (адпаведна) ў 1,6 і 1,5 раза. Па вытворчасці найважнейшых відаў сельскагаспадарчай прадукцыі на душу насельніцтва Рэспубліка выйшла на лідыруючыя пазіцыі сярод краін СНД. Агульны аб'ём імпарту харчавання складаў менш за 10%, а экспарт сельскагаспадарчай прадукцыіі харчавання за 2006–2010-я гг. павялічыўся ў 2 разы і склаў у 2010 г. каля 3 млрд долараў.

На працягу ўсіх гадоў дзяржава прыкладала вялікія намаганні па прыцягненні насельніцтва да здаровага ладу жыцця. З дзяржаўнага бюджэту штогод вылучаліся значныя сродкі на будаўніцтва і рэканструкцыю спартыўных і культурна-асветных аб'ектаў. У 2010 г. у

Репозиторий ВГУ

рэспубліцы функцыянавала больш за 25,8 тыс. аб'ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння, у тым ліку 12 тыс. плоскасных спартыўных збудаванняў, 24 збудаванні са штучным лёдам. У строй уведзены лядовыя палацы ў гарадах Жлобін, Пружаны, Мазыр, Баранавічы, Бабруйск, Пінск, Ліда, Лунінец. Дзякуючы гэтаму, паводле афіцыйных звестак Белстата, каля 16% насельніцтва рэспублікі былі далучаны да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам [10, с. 6].

Дэмаграфічная сітуацыя на гэты час пакуль мела вынік са знакам мінус. Рэжым дэпапуляцыі, у якім краіна знаходзілася з 1994 г., прывёў да даволі значнага скарачэння насельніцтва рэспублікі. Асаблівую трывогу выклікалі сацыядэмаграфічныя паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці. Калі ў 1999 г. дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў у агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі было 21,2%, то ў 2005 г. – толькі 17,7% [11, с. 50]. За шэсць гадоў з 2001 г. да 2006 г. насельніцтва Віцебскай вобласці скарацілася за кошт уласнага змяншэння (перавышэнне смяротнасці над нараджальнасцю) на 64508 чалавек [12, с. 8]. Установы аховы здароўя імкнуліся пераламіць негатыўную тэндэнцыю. У 2005 г. каэфіцыент дзіцячай смяротнасці ў краіне (на 1000 нараджэнняў) зменшыўся ў параўнанні з 2000 г. з 11,3 да 6,4% [13, с. 63]. У 2007 г. назіралася самая высокая нараджальнасць за ўсе папярэднія 25 гадоў. Колькасць народжаных за гэты год вырасла на 7%, дзіцячая смяротнасць знізілася на 15%, матчына – на 2,7%, пасляаперацыйная смяротнасць пры экстраннай хірургічнай паталогіі – на 16% [14, с. 2]. Аднак на працягу 22 годоў (з 1994 па 2015) насельніцтва рэспублікі змяншалася і толькі ў 2016 г. адбыўся яго прырост на 518 чал. Нацыянальны статыстычны камітэт канстатаваў, што на 1 студзеня 2017 г. колькасць жыхароў Беларусі складала 9 млн 504,7 тыс. чалавек.

Значную ўвагу кіраўніцтва рэспублікі надавала зніжэнню беспрацоўя. У планах сацыяльна-эканамічнага развіцця былі закладзены досыць высокія выдаткі на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і працаўладкаванне насельніцтва, вялася сістэмная дзяржаўная палітыка па стварэнні працоўных месцаў. У 2010 г. краіна мела высокі ўзровень занятасці: колькасць занятага насельніцтва з 2006 г. па 2010 г. узрасла з 4 403 тыс. да 4649 тыс. чалавек. Узровень беспрацоўя на 1 снежня 2010 г. склаў толькі 0,7% (у 2002 г. беспрацоўных у краіне налічвалася 3%).

Важным вынікам тых мер, якія ажыццяўляліся ў гэтым кірунку, стала вырашэнне праблем сельскага і рэгіянальнага беспрацоўя. У параўнанні з 2005 г. колькасць беспрацоўных на вёсцы да 2010 г. знізілася больш чым у 15 разоў і практычна зраўнялася з колькасцю наяўных там вакансій. У 2015 г. рэгістрацыйнае беспрацоўе ў Рэспубліцы Беларусь знаходзілася ў межах менш за 1% – пры сацыяльна прымальным сусветным узроўні ў 3% эканамічна актыўнага насельніцтва.

Репозиторий ВГУ

Як бачна, беларуская мадэль з прамымі метадамі рэгулявання рыначнай эканомікі прывяла да пазітыўных змен у вырашэнні сацыяльных задач для насельніцтва рэспублікі. У краіне захоўвалася сістэма сацыяльнай абароны, намечаны меры па недапушчэнні рэзкай палярызацыі ў даходах людзей. Нават у складаным 2007 г., калі адбылося значнае павышэнне сусветных цэн на нафту і газ, сацыяльныя праграмы разглядаліся ў рэспубліцы ў якасці прыярытэтных. Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва за гэты год узраслі на 14,9%, а рэальная заработная плата – на 9,5%. З 2000 па 2008-я гг. назіраўся паступальны рост пакупніцкай здольнасці за кошт павышэння заработнай платы. У 2008 г. сярэднямесячная заработная плата работнікаў, занятых у гаспадарчым комплексе, вырасла да 500 амерыканскіх долараў. На прыстойным узроўні знаходзілася пенсійнае забеспячэнне. Пенсіі за два гады гэтай пяцігодкі павялічыліся на 40%. Сярэднямесячная пенсія ў канцы 2008 г. у пераліку на амерыканскую валюту складала 177 дол. (У Расіі – 154 дол.). Паколькі рыначныя адносіны ў сацыяльнай палітыцы сталі больш адчувальныя, узраслі выдаткі саміх грамадзян на важнейшыя віды паслуг, дзе раней меліся значныя датацыі дзяржавы. Так, аплата камунальных паслуг без датацый дзяржавы дасягала 50 і нават 70%. У дзяржавы з'явілася магчымасць вылучаць і выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі па іншых накірунках [15, с. 3]. У 2008 г. у эксплуатацыю было ўведзена 5,15 млн кв. м жылля, у 2010 г. – больш за 6,5 млн кв. м. Рэалізавана шырокая праграма па паляпшэнні сацыяльных умоў для жыхароў вёскі. У выніку сельскагаспадарчая вытворчасць рэспублікі па эфектыўным выкарыстанні вытворчых сіл перамясцілася ў лік перадавых краін [4, с. 16]. Устойлівы прырост прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі даваў падставу разлічваць на спрыяльнае развіццё эканомікі Беларусі ў бліжэйшай і далёкай перспектыве. У свядомасці насельніцтва ўкаранялася вера ў магчымасці дзяржавы забяспечваць годнае жыццё, ахову працы і здароўя людзей.

Меркавалася, што і ў далейшым будзе ажыццяўляцца прагрэсіўнае развіццё краіны за кошт росту прадукцыйнасці працы, укаранення новых тэхналогій і новых метадаў удасканалення вытворчасці і кіравання. Але ў 2008 г. прамысловасць рэспублікі трапіла ў складаную сітуацыю. Гэты год унёс істотныя змены ў станоўчую тэндэнцыю паспяховага вырашэння сацыяльных пытанняў насельніцтва рэспублікі, якая выразна абазначылася з 1995–1996-х гг. Глабальны сусветны фінансавы крызіс унёс карэктывы ў планы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Ужо летам 2008 г.быў відавочны спад аб'емаў вытворчасці, павялічылася вымушаная няпоўная занятасць работнікаў, узрасла інфляцыя.

2009 год паказаў, што сацыяльная палітыка ёсць вытворны прадукт не толькі ўнутранай палітыкі дзяржавы. Рэалізацыя дзяржаўных планаў па стварэнні годных умоў жыцця і творчага развіцця чалавека, стабільнае павышэнне дабрабыту насельніцтва краіны залежаць таксама ад знешняга

ўплыву, ад стану эканомік і паводзін суседніх краін. Рэспубліка Беларусь – невялікая па тэрыторыі і бедная прыроднымі рэсурсамі краіна – не можа быць эканамічна самадастатковай. Яна тысячамі нітак звязана са знешнім светам, яе прамысловы комплекс цесна пераплецены інтэграцыйнымі сувязямі з замежжам і больш за ўсе – з Расіяй. Ужо ў 2008 г., з-за падзення пакупніцкай здольнасці многіх імпарцёраў, у тым ліку расійскіх, рэспубліка сутыкнулася з праблемай экспарту. Многія прадпрыемствы па выніках года панеслі значныя страты. Трывожныя наступствы 2008 году сталі адчувальныя ўжо на самым старце наступіўшага 2009 г.: у пачатку студзеня адбылася дэвальвацыя беларускага рубля. Памяншэнне попыту на экспартныя пастаўкі асноўных відаў прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў прывяло да росту складскіх запасаў. Нягледзячы на прыкладзеныя намаганні па збыце выраблenай прадукцыі, затаваранасць заставалася вельмі высокай (на пачатак 2010 г. – 6 трлн руб. [16, с. 2].

Уплыў знешніх фактараў на эканоміку рэспублікі пасля 2008 г. негатыўна адбіўся на выкананні прагназуемых паказчыкаў сацыяльнай сферы. Дэвальвацыя беларускага рубля, рост коштаў прывялі да зніжэння пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Рэальная заработная плата (у сярэднім 500 долараў) пасля 2008 г. мела тэндэнцыю да зніжэння. Працоўныя пенсіі адставалі ад узроўню заробкаў. Пры гэтым цэны на харчовыя прадукты, сацыяльна значныя тавары сталі плаваючымі. Назіраліся высокая інфляцыя і зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

Разумеючы, што сацыяльная абарона – адна з найважнейшых функцый дзяржавы, кіраўніцтву краіны прыйшлося зноў звярнуцца да ўзмацнення адміністрацыйнага ўплыву на развіццё сацыяльнай сферы. За кошт субсідый дзяржава стала падтрымліваць прымальныя для насельніцтва цэны на спажывецкія тавары, на паслугі ЖКГ, на грамадскі транспарт. Дзяржаўныя датацыі толькі на аплату камунальных паслуг насельніцтву выраслі ў 2010 г. да 66%, у грашовым выражэнні гэта больш за 1 млрд долараў ЗША [15, с. 6]. У верасні 2010 г. Прэзідэнт рэспублікі А.Р. Лукашэнка, называючы гэтыя лічбы, адначасова зрабіў выснову, што такі падыход быў вымушанай і часовай мерай. Высновы Прэзідэнта з'яўляюцца вельмі актуальнымі. Уяўленне аб захаванні дасягнутага жыццёвага ўзроўню насельніцтва ў крызісны перыяд за кошт росту заработнай платы без уліку паказчыкаў, якія характарызуюць эфектыўнасць працы, – гэта «простае рашэнне», якое вядзе да негатыўных наступстваў. Падыход, калі налічваемая і выплачваемая на прадпрыемствах рэспублікі заработная плата, апярэджвае рост прадукцыйнасці працы, гэта не што іншае, як парушэнне аб'ектыўна дзеючых эканамічных законаў. Правядзенне дзяржавай мэтанакіраваных мерапрыемстваў па павышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва павінна цалкам узгадняцца з эфектыўнасцю функцыянавання эканомікі краіны, а заработная плата работнікаў галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі –

служыць стымулам узняцця іх цікавасці да павышэння эфектыўнасці працы.

У складаных умовах урад рэспублікі прымаў захады па адаптацыі эканомікі да існуючых умоў і ўзняцця дабрабыту насельніцтва. Як было адзначана ў выступах кіраўніка дзяржавы, у перспектыве ў Рэспубліцы Беларусь будзе і ў далейшым рэалізоўвацца ўласная беларуская мадэль сацыяльнай палітыкі (з перавагай элементаў сацыял-дэмакратычнай мадэлі). Мэтай сацыяльнай палітыкі дадзенай мадыфікацыі застаецца далейшы рост узроўню жыцця насельніцтва краіны за кошт ўстойлівага развіцця эканомікі.

Згодна з Канцэпцыяй сацыяльна – эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2015 г. (прынята ў 1998 г.), на трэццім этапе эканамічнага развіцця 2010–2015-я гг. у Беларусі неабходна было забяспечыць стварэнне асноў постіндустрыяльнага грамадства, а ўзровень жыцця насельніцтва прыблізіць да узроўню грамадзян развітых дзяржаў. У гэтым і іншых дакументах урада падкрэслена, што ўнутраная палітыка дзяржавы ў галіне лібералізацыі аплаты працы будзе захоўвацца ў поўнай адпаведнасці з эфектыўнасцю гаспадарання. Галоўным фактарам павышэння ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, фарміравання ў рэспубліцы грамадства сацыяльнай справядлівасці пры такой сацыяльнай палітыцы павінна стаць заработная плата. Падобны падыход магчыма прызнаць рацыянальным, ён вядзе да павышэння адказнасці саміх грамадзян за свой дабрабыт. У сацыяльнай дзяржаве можа быць жыццёвай адна формула: “Максімум выгод за максімальна высокапрадукцыйную працу”. Менавіта заработнай плаце належыць роля стымулятара прагрэсіўнага эканамічнага развіцця і павышэння эфектыўнасці нацыянальнай эканомікі.

Такім чынам, разглядаючы эфектыўнасць сацыяльнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь пры пераходзе да рынкавых адносін важна адзначыць, што істотны спад вытворчасці на этапе 1991–1995-х гг. ва ўсіх вытворчых галінах прывялі народную гаспадарку рэспублікі да глыбокага эканамічнага крызісу. Адбылося кратнае збядненне насельніцтва ў параўнанні з савецкім часам. Жыхары рэспублікі заставаліся незадаволенымі такім становішчам і склаўшайся сацыяльнай палітыкай. З 1996 г. крызісныя тэндэнцыі ў эканоміцы рэспублікі паступова пераадольваліся, адбываўся рост дабрабыту насельніцтва. Памер ВУП на душу насельніцтва па парытэту пакупніцкай здольнасці на душу насельніцтва з 2000 г. па 2010 г. павялічыўся ў 2,6 разы – з 5083 дол. да 13.864 дол. [17, с. 18]. Доля насельніцтва з даходамі ніжэй бюджэту пражытковага мінімуму за шэсць гадоў (2002–2008) знізілася больш чым у пяць разоў. Нават у самых складаных для краіны 2008–2015 гг. айчынная эканоміка хоць і не дасягнула запланаванага ўзроўню росту, але змагла, у адрозненне ад большасці іншых краін, не дапусціць яго рэзкага спаду [18, с. 17]. У 2012 г. рэальная заработная плата ў адносінах да папярэдняга года



Репозиторий ВГУ

вырасла амаль на 22%. Кожная чацвертая беларуская сям’я, згодна з ддзенымі даследавання, палепшыла сваё матэрыяльнае становішча. Сярэдні памер пенсій на прыканцы 2012 г. склаў 1 млн 886 тыс. руб. (у эквіваленце 220 дол.). Больш паловы апытаных указалі на тое, што іх матэрыяльнае становішча застаецца стабільным [19, с. 5].

Дадзеныя вынікі – перш за ўсе заслуга саміх непасрэдных вытворцаў , а таксама сведчанне таго, што дзяржаўныя кіраўнічыя структуры рэспублікі мелі ў гэты час у сваім арсенале антыкрызісныя механізмы, здольныя ўтрымаць канкурэнтназдольнасць нацыянальнай эканомікі і яе сацыяльную накіраванасць**.** Несумненна, пазітыўны ўплыў на эканамічнае развіццё Беларусі аказваў расійскі фактар. Атрыманне энерганосьбітаў па ільготнаму кошту і сталая тэндэнцыя да росту таваразвароту з суседскай краінай дазваляла большасці вядучых галін прамысловасці працаваць стабільна.

Беларуская дзяржава імкнулася забяспечваць усталяваны гарантаваны мінімальны памер аплаты працы, дзяржаўных пенсій, ажыццяўляла падтрымку сям'і, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, інвалідаў і пажылых грамадзян, развівала сістэму сацыяльных службаў. Але паколькі жыццёвыя стандарты, памеры выдаткаў на сацыяльныя мэты залежаць ад эканамічных вынікаў, сацыяльныя патрэбы грамадзян рэспублікі на гэтым этапе забяспечваліся яшчэ не ў поўнай меры.

**Спасылкі**

1. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь от 30.09.1994 № 3249–XII «О программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса» // Советская Белоруссия. – 1994. – 2 ноября.

2. Советская Россия. – 1998. – 25 июня.

3. Выступление А.Г. Лукашенко в Госдуме Российской Федерации // Советская Россия. – 1999. – 31 окт.

4. Медведев, Р.Н. Белорусская крепость / Р.Н. Медведев // Беларуская думка. 2009. – № 12.

5. Устремленность в будущее: Беларусь, 1995–2008. – Мн.,2009.

6. Минскй курьер. – 2006.і– 30 мая.

7. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск: Современная школа, 2011.

8. Мандрык, І.У. Гістарычная абумоўленасць будаўніцтва ў Беларусі сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі: пазначаны курс, складанасці, вынікі: манаграфія/ І.У. Мандрык. – Віцебск: ВДУ імя П.М.Машэрава, 2017. – 156 с.

9. Саковіч, В.С. Сельское хозяйство Республики Беларусь в 1980–2007 гг.:тэндэнция развития / В.С. Саковіч. – Мінск, 2008.

10. Первый год новой пятилетки: основные ориентиры социально–экономического развития страны в 2011 г. – Минск, 2011.

11. Республика Беларусь: энциклопедия. – Минск: Беларуская энцыклапедыя, 2005. – Т. 1.

12. Мандрик, И.В. Социальная безопасность и роль профсоюзов в ее обеспечении/ И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – № 2(20).

13. Республика Беларусь в цифрах. – Минск, 2006.

Репозиторий ВГУ

14. Медицинский вестник. – 2008. – 7 февр.
15. Лукашенко, А.Г. Наша цель – создать обновленный облик Беларуси. Выступление Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко на VI съезде Федерации профсоюзов Беларуси // СБ. Беларусь сегодня. – 2010. – 18 сент.
16. СБ. Беларусь сегодня. – 2010. – 23 янв.
17. Дачковский, А.А. Экономический рост в Республике Беларусь: состояние, проблемы, перспективы / А.А. Дачковский // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2011. – № 1.
18. Таранова, А.В. Матэрыяльны дабрабыт і сацыяльна–эканамічная няроўнасць насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь: сацыялагічны аспект / А.В. Таранова // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2010. – № 1.
19. Александров, А.Доходы и расходы./ А. Александров // СБ. Беларусь сегодня. – 2013. – 20 марта.

## ТЭМА 13. **Новыя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі**

*1. Працэсы дэмакратызацыі грамадска –палітычнага жыцця.*
*2. Пераход рэспублікі да палітычнай і эканамічнай самастойнасці.*

***1. Працэсы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.*** Разглядаючы дадзенае пытанне, асобую ўвагу трэба звярнуць на тое, што з абвяшчэннем “перабудовы” у краіне адбывалася дэмакратызацыя грамадска –палітычнага жыцця. Узрастала роля Саветаў народных дэпутатаў, грамадскіх арганізацый. Выбары ў мясцовыя і рэспубліканскія партыйныя і савецкія кіруючыя органы сталі праводзіцца на альтэрнатыўнай аснове. Прадпрыемствы атрымалі большую самастойнасць у вызначэнні аб'ёмаў і наменклатуры вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі.

Дапускаўся палітычны плюралізм. Хутка фарміравалася палітычная апазіцыя. У 1986–1987-я гг. у рэспубліцы узнікла 7 тыс. аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах, якія ўключалі каля 1 млн чалавек. У Мінску ў 1987 г. дзейнічала 97 грамадска-палітычных аб'яднанняў і клубаў. Актыўна заявілі пра сябе такія аб'яднанні і клубы, як “Талака”, “Альтэрнатыва”, “Тутэйшыя” “Современник”, “Світанак” у Мінску, “Паходня” ў Гродна, “Узгор'е” ў Віцебску, “Талака” у Гомелі і Магілёве. Спачатку палітычныя пытанні ў праграму клубаў і аб'яднанняў не ўключаліся. Тут гаворка ішла пра дэфармацыі сацыялізму, неабходнасць пабудовы сапраўднага сацыялізму, адраджэння нацыянальнай культуры. Аднак прыкладна з другой паловы 1987 г. у дзейнасці клубаў і арганізацый усё больш і больш пачынае праяўляцца цэнтралізацыя і палітызацыя [1, с. 261]. У 1988 г. ствараецца штаб палітычнай апазіцыі – Беларускі народны фронт “Адраджэнне”. Яго праграма і статут мелі адкрыта антысавецкую і антыэсэсэраўскую накіраванасць. Спасылаючыся на класікаў марксізму, разгарнулася крытыка кіраўніцкіх структур КПБ–КПСС і афіцыйных канцэпцый гісторыі краіны. Пазней паявіліся патрабаванні адмены шостага артыкула Канстытуцыі СССР (аб

Рэпазіторый ВГУ

партыйным кіраўніцтве грамадствам), што з'яўлялася звычайнай палітычнай барацьбой за заваяванне ўлады. У чэрвені – ліпені 1990 г. на канферэнцыі БНФ, а затым на яго II з'ездзе ў сакавіку 1991 г. прагучала ідэя аб аддзяленні БССР ад СССР і абвяшчэнні яе поўнай незалежнасці.

Дысідэнтскі рух разам са справядлівым пратэстам супраць двайных стандартаў у жыцці грамадства, крытыкай кіруючай партыі і савецкіх уладных структур за бюракратычныя метады ў кіраванні, заідэлагізаванасць, за замоўчванне сапраўднага стану радыяцыйнага забруджвання (яго ўплыву на стан здароўя людзей) пасля Чарнобыльскай катастрофы, нёс немала дэструктыўнага. З удзелам апазіцыі практычная работа па правядзенні эканамічных рэформ, тапілася ў словаспрэчках, якія трансліраваліся ў прамым эфіры.

У рэспубліцы сталі ўзнікаць новыя палітычныя партыі, фарміравалася шматпартыйная сістэма. У лістападзе 1990 г. прайшоў устаноўчы з’езд аб’яднанай дэмакратычнай партыі (АДП). Праграма АДП прадугледжвала будаўніцтва дэмакратычнай дзяржавы з прыярытэтам агульначалавечых каштоўнасцей.

У лютым 1991 г. створана Беларуская сялянская партыя. Яна выступала за ажыццяўленне зямельнай рэформы, стварэнне фермерскіх гаспадарак, пераўтварэнне калгасаў і саўгасаў у асацыяцыі і акцыянерныя таварыствы. У дакументах партыі вылучана патрабаванне за вяртанне сялянам права ўласнасці на зямлю. Угэтым жа годзе створана Беларуская сацыял дэмакратычная грамада (БСДГ). У яе склад увайшла група народных дэпутатаў, навукоўцаў і пісьменнікаў. БСДГ заявіла аб будаўніцтве свабоднага і дэмакратычнага грамадства, заснаванага на прынцыпах свабоды, роўнасці, прыярытэту права, з дапамогай рэформ. У чэрвені 1990 г. была заснавана Нацыянал –дэмакратычная партыя Беларусі. Згодна з уставам гэта чыста беларуская арганізацыя. Яе членам мог стаць любы грамадзянін Беларусі, які валодаў беларускай мовай і ўсвядамляў сябе беларусам.

Група дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР санкцыянавала стварэнне Партыі Народнай Згоды (ПНЗ). У кароткія тэрміны ПНЗ стала даволі шматлікай, яе рады папаўняліся за кошт навукоўцаў і інжынерна – тэхнічных работнікаў. Пасля 3 лютага 1993 г., калі X сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адмяніла жнівеньскую пастанову “Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ-КПСС, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь” створана партыя камуністаў Беларусі (ПКБ). Гэта партыя аб’ядноўвала прыхільнікаў сацыялістычнага выбару ў развіцці дзяржавы, пры гэтым за вытворчасць, заснаваную на рыначных формах уласнасці.

У сярэдзіне 1993 г. рэгістрацыю прайшлі 12 партый і 7 грамадска – палітычных рухаў. На завяршэнні 2001 г. у Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі зарэгістравана 18 палітычных партый і 866 грамадскіх аб’яднанняў [2, с. 94].



Рэпазіторый ВДУ

Плюралізм думак і поглядаў, барацьба праз сродкі масавай інфармацыі захлёствалі праз край, узмацнялі цэнтрабежныя намеры, паглыблялі хаос. Пры вялікай актыўнасці на хвалі галоснасці адбываліся выбары народных дэпутатаў СССР (сакавік 1989 г.) і выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы. У сакавіку 1990 г. у барацьбу за 310 месц у беларускі парламент уступілі 1769 чалавек. На безальтэрнатыўнай аснове выбары прайшлі толькі ў 20 выбарчых акругах. З першага тура было выбрана 98 дэпутатаў. Паўторныя туры (іх было 6) далі магчымасць сфарміраваць Вярхоўны Савет БССР. Але 11 дэпутатскіх месцаў заставаліся вакантнымі да канца 1991 г. [3, с. 558]. У маі 1990 г. Старшынёй Вярхонага Савета БССР абраны М.І. Дземянцей, першым яго намеснікам – С. С. Шушкевіч.

"Перабудова," якая пачалася нібыта для паскарэння ў развіцці сацыялізму, хутка набыла неарганізаваны, стыхійны характар, разбурала жыццёва неабходныя краіне сацыяльныя і эканамічныя структуры, спрыяла не паляпшэнню функцыявання эканомікі, а толькі ўзмацняла супярэчнасці эканамічнага і сацыяльнага характару і вяла да глыбокага крызісу, які назіраўся ў пачатку 90-х гг.

Спроба кіраўніцтва СССР стварыць абноўлены Саюз не ўдалася, рэспублікі, дзе гэтыя працэсы накіроўваліся апазіцыйнымі сіламі, адна за адной аб'яўлялі аб сваім суверэнітэце. Першай рэспублікай, якая заявіла аб скасаванні саюзнага дагавора 1922 г. была Грузія. Вярхоўны Савет гэтай рэспублікі заявіў аб гэтым 9 сакавіка 1990 г. 11 сакавіка 1990 г. прыняты акт аб аднаўленні незалежнасці Літоўскай ССР, 30 сакавіка гэта ж зрабілі ў Эстонскай ССР, а 4 мая 1990 г. – у Латвійскай ССР. М. Гарбачоў падпісаў Указ аб выхадзе іх са складу СССР.

Вярхоўны Савет СССР рабіў спробы прыпыніць гэты працэс. 26 красавіка 1990 г. быў прыняты Закон "Аб размежаванні паўнамоцтваў паміж Саюзам СССР і суб'ектамі федэрацый". Згодна з ім статус былых аўтаномій павышаўся да статуса саюзных рэспублік. Замест 15 саюзных рэспублік у Саюз СССР павінны былі ўваходзіць 35 суб'ектаў, але ўжо без права выхаду з яго [4, с. 2]. Аднак, 12 чэрвеня 1990 г. была прынята дэкларацыя аб суверэнітэце Расіі. Пасля чаго парад сувернітэтаў працягваўся: 20 чэрвеня аб гэтым аб'явіў Узбекістан, 23 чэрвеня – Малдова, 16 ліпеня – Украіна.

У такой складанай палітычнай і эканамічнай сітуацыі Вярхоўны Савет БССР **27 ліпеня 1990 г**. таксама прыняў Дэкларацыю аб суверэнітэце БССР. У Дэкларацыі аб'яўлялася аб незалежнасці БССР у знешніх адносінах і імкненні стварыць прававую дзяржаву.

Казахская ССР суверэнітэт не аб'яўляла. Вярхоўны Савет гэтай рэспублікі звярнуўся да Вярхоўных Саветаў усіх рэспублік аб фарміраванні абноўленага Саюза Суверэнных рэспублік. У БССР гэты зварот быў успрыняты станоўча: 19 лютага 1991 г. Вярхоўны Савет БССР

Репозиторий ВГУ

прыняў пастанову “Аб канцэпцыі новага саюзнага дагавора”. Пастанова прызнавала мэтазгодным уваходжанне БССР у склад СССР з улікам пераўтварэння яго ў сапраўдную дэмакратычную прававую дзяржаву [5, с. 13, 15].

17 сакавіка 1991 г. у 9 рэспубліках СССР быў праведзены рэферэндум (народнае галасаванне) па пытанні аб захаванні СССР як федэрацыі суверэнных рэспублік. За захаванне абноўленага Саюза выказалася 112 млн чал., або 76,4% ад усіх яго ўдзельнікаў. У БССР у рэферэндуме ўдзельнічала 6 126983 чал. (83,3%), лік выказаўшыхся за захаванне СССР склаў 5069313 чал., або – 82,7%. Большасць грамадзян (за абноўлены саюз савецкіх рэспублік) прагаласавалі ва ўсходніх абласцях рэспублікі: Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай [6, с. 186].

У красавіку 1991 г. кіраўніцтва 9 рэспублік (Расіі, Украіны, Беларусі , Узбекістана, Казахстана, Азербайджана, Кіргізіі, Таджыкістана, Туркменіі) падпісалі з Прэзідэнтам СССР М. Гарбачовым дагавор аб недапушчэнні дэстабілізацыі на месцах і аб прыняцці новага саюзнага дагавора, праект якога быў хутка падрыхтаваны і надрукаваны ў сродках масавай інфармацыі. Але падзеі далейшага часу і тыя, што адбыліся 19–21 жніўня 1991 г.у Маскве, памянялі сітуацыю ў краіне. Новы саюзны дагавор так і не быў прыняты.

***2. Пераход рэспублікі да палітычнай і эканамічнай самастойнасці.*** Маскоўскія падзеі 19–21 жніўня 1991 г. яшчэ і сёння маюць розныя адзнакі. Адны, больш усяго палітыкі і асобныя гісторыкі, называюць іх путчам, накіраваным на звяржэнне існуючага дзяржаўнага ладу. Шмат і тых людзей, якія кажуць, што дзеянні ДКНС былі скіраваны на выратаванне вялікай дзяржавы і савецкага ладу. Як адзначае тагачасны старшыня Вярхоўнага Савета БССР Мікалай Дземянцей, большасць народных дэпутатаў праяўлялі “здравый смысл и не поддержали крикунов, выступавших против подписания договора . Все мы в то время были убеждены, что государство жило и будет жить, и события в Москве – это замах на его устои” [7, с. 145].

Якой бы адзнакі па дадзенай праблеме не прытрымліваліся сёння гісторыкі і палітыкі, адзначым, галоўнае: падзеі 19–21 жніўня 1991 г. прывялі да распаду СССР. Да канца жніўня парламенты шэрагу рэспублік прынялі пастановы аб дзяржаўнай незалежнасці. У БССР таксама было прынята некалькі законаў замацаваўшых яе суверэнітэт. 25–26 жніўня 1991 г. нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”, а таксама закон “Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР”, згодна з якім на тэрыторыі рэспублікі спынялася

Репозиторий ВГУ

падпарадкаванне гаспадарчага жыцця саюзным міністэрствам і ведамствам.

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў закон аб назве Беларускай ССР, у адпаведнасці з якім яна стала называцца **Рэспубліка Беларусь (РБ)**.

18 кастрычніка 1991 г. прыняты Закон "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь”. Тады ж былі абвешчаны законы “Аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь” і “Аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Бларусь”. Старшынёй Вярхоўнага Савета быў выбраны, прарэктар БГУ, прафесар С. Шушкевіч.

Маруднасць і непаслядоўнасць у вырашэнні палітычных пытанняў у цэнтры і на месцах, нарастаючая разбалансаванасць гаспадаркі, спазненне з вырашэннем сацыяльных праблем у ходзе перабудовы, недастатковы аўтарытэт часткі партыйных кадраў спрыялі ўзмацненню настрою незадаволенасці ў грамадстве дзейнасцю Кампартыі Беларусі. Радыкальная апазіцыя выкарыстала дадзеную сітуацыю для дыскрыдытацыі савецкага ладу. Памылкі асобных кіраўнікоў (больш за ўсё ў Палітбюро ЦК КПСС) выдаваліся за ўсеагульную некампетэнтнасць і бяздарнасць партыйных работнікаў, а недахопы ў развіцці сацыяльна-эканамічнай і духоўна-маральнай сферы – за катастрофу краіны. Прафесійна змярцвелае вышэйшае партыйнае кіраўніцтва, камітэты кіруючай партыі ды і радавыя камуністы аказаліся не гатовымі для барацьбы за захаванне партыі, дзяржаўнага і грамадскага ладу. Кіраўнікі Вярхоўнага Савета БССР і народныя дэпутаты Беларусі, большасць, з якіх з'яўляліся камуністамі, у гэтай складаных абставінах, як яны пазней прызналі самі, не праявілі прынцыповасці і прынялі пастанову аб прыпыненні дзейнасці Кампартыі Рэспублікі. У выніку адбыўся зыход з арэны КПБ як палітычнага кіраўніка рэспублікі.

Заключным актам у працэсе распаду СССР з'явілася прыняцце 8 снежня 1991 г. Віскулёўскага пагаднення “Аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў”. 25 снежня 1991 г. М. Гарбачоў аб’явіў аб складанні з сябе паўнамоцтваў Прэзідэнта СССР. “Перабудова” з яе галоснасцю, якая пачалася пад благабачнай падставай паскарэння ў развіцці сацыялізму, на справе ператварылася ў дэмантаж усёй сістэмы існаваўшых грамадскіх адносін і распаду СССР. З гэтага часу перастаў існаваць Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Усе 15 саюзных рэспублік сталі самастойнымі дзяржавамі. Гэту падзею, як і развал КПСС, асобныя палітыкі і навукоўцы адносяць да ліку трагічных падзей сусветнай гісторыі XX ст. Адбыўся разрыў цэласнай краіны, былі адкінутыя сацыялістычныя ідэалы, закончылася існаванне біпалярнага свету з раўнавагай палітычных і ваенных сіл паміж СССР і ЗША. Захад і ЗША актыўна падтрымлівалі разбурэнне савецкай дзяржавы.

Новыя абставіны, якія наступілі ў рэспубліцы пасля аб’яўлення незалежнасці, патрабавалі прыняцця новага асноўнага закона краіны. У чэрвені 1990 г. была ўтворана канстітуцыйная камісія начале са старшынёй

Рэпазіторый ВГУ

Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М.І. Дземянцеем. Праца па распрацоўцы праекта канстытуцыі праходзіла ва ўмовах унутрыпарламенцкай барацьбы. У час распрацоўкі праекта ў адстаўку зышлі старшыні канстытуцыйных камісій М. Дземянцей і С. Шушкевіч. Пасля дэталёвага абмеркавання і ўліку заўваг 13-я сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання **15 сакавіка 1994 г**. аднагалосна прыняла новую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Яе падпісаў старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі М. Грыб.

Згодн з прынятай Канстытуцыяй Рэспубліка Беларусь аб’яўлялася рэспублікай з прэзідэнтскай формай кіравання. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 1996 г.) абвясціла Беларусь **унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай** [8, с. 3]. У Асноўным законе дзяржавы прапісана, што сацыяльная дзяржава арыентуецца на высокі жыццёвы ўзроўвень насельніцтва і рэальнае забеспячэнне праў і свабод грамадзян. Артыкул 2 Канстытуцыі ўсталёўвае, што “чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы”. Дзяржава адказная перад грамадзянамі “за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы”, а ў арт. 21 удакладняецца: “Забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшай мэтай дзяржавы”. У арт. 60 падкрэслены абавязак дзяржаўных органаў, службовых і іншых асоб, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабоды асобы, паляпшэнні матэрыяльнага становішча насельніцтва.

15 красавіка 1994 г. у Беларусі пачалася кампанія па выбарах прэзідэнта. У спаборніцтва за гэта пачэснае месца ўступілі 7 чалавек, прадстаўнікі розных палітычных сіл, у тым ліку дырэктар саўгаса “Гарадзец” Шклоўскага раёна, народны дэпутат, старшыня ўтворанай у красавіку 1993 г. камісіі па барацьбе з карупцыяй А.Р. Лукашэнка. У другі тур, які адбыўся 10 ліпеня 1994 г. выйшлі А. Лукашэнка, набраўшы ў першым туры 44,8% галасоў выбаршчыкаў і В. Кебіч з 17,3% галасоў. У галасаванні другога тура прынялі ўдзел 5278331выбаршчыкаў, што склала 70,6% ад іх агульнай колькасці. За А. Лукашэнку прагаласавалі 80,34% ад колькасці тых, хто галасаваў, за В. Кебіча 17% [3, с. 634]. 20 ліпеня 1994 г. Прэзідэнт Рэспулікі Беларусь прынёс прысягу. Урад В. Кебіча пайшоў у адстаўку, другі ў гісторыі незалежнай Беларусі ўрад узначаліў М. Чыгір. У рэспубліцы ў рамках Канстытуцыі ў цэнтры і на месцах створана скразная вертыкальная структура выканаўчых і распарадчых арганізацый. Адным з важнейшых дзяржаўных інстытутаў улады стала Адміністрацыя Прэзідэнта .

З пераходам на прэзідэнцкую форму кіравання паміж прэзідэнцкай і парламенцкай галінамі ўлады сталі ўзнікаць супярэчнасці, што ў



Рэпазіторый ВДУ

наступным прывяло да канстытуцыйнага крызісу. Сутнасць канфлікту заключалася ў розных уяўленнях аб шляхах і сродках развіцця краіны.

Важным этапам барацьбы паміж урадавымі коламі і апазіцыяй сталі парламенцкія выбары 1995 г. 14 мая гэтага года ў адзін дзень з парламенцкімі выбарамі адбыўся, ініцыіраваны прэзідэнтам, рэспубліканскі рэферэндум. Вынесеныя на рэферэндум пытанні (аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай; аб увядзенні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь; аб адабрэнні дзеянняў прэзідэнта, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй; аб унясенні змен у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі, атрымалі падтрымку грамадзян.

Прайшоўшы ў лістападзе 1996 г. чарговы рэферэндум, унёс змены ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія ўзмацнілі нормы, звязаныя з правамі і абавязкамі Прэзідэнта. За змены, прапанаваныя прэзідэнтам, прагаласавалі 70,5% грамадзян , унесеных у спісы для галасавання, тады як за прапановы дэпутатаў фракцыі камуністаў і аграрыяў – толькі 7,9%.

28 лістапада 1996 г. Прэзідэнт падпісаў новую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. З гэтага часу Дзень незалежнасці стаў у рэспубліцы адзначацца 3 ліпеня (раней ён святкаваўся 27 ліпеня).

Замест заканадаўчага аднапалатнага Вярхоўнага Савета ў складзе 260 дэпутатаў, быў сфарміраваны двухпалатны парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь – у складзе Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў, выбіраемых народам) і Савета Рэспублікі (па 8 чалавек, выбіраемых ад кожнай вобласці і г. Мінска і 8 чалавек прызначаецца Прэзідэнтам). Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года, пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, не мае судзімасці, членам Савета Рэспублікі – грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 гадовага ўзросту.

Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу рэспублікі Беларусь адбываюцца праз кожныя чатыры гады. У гэтыя ж тэрміны фарміруецца новы склад Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь – найвышэйшы прадстаўнічы і заканадаўчы орган Беларусі. Толькі за першыя пяць годоў сваей працы Нацыянальны сход прыняў больш за 500 законаў, у тым ліку 19 кодэксаў [1, с. 263].

На выбарах 9 верасня 2001 г. А.Р. Лукашэнка быў абраны ў другі раз прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (75,62% галасоў). А пасля таго, як 17 кастрычніка 2004 г. на ўсенародным рэферэндуме ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь былі ўнесены змены, якія знялі абмежаванні на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў, А.Р. Лукашэнка ўдзельнічаў у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2006 г., 2010 г. і 2015 г., дзе атрымліваў

Рэпазіторый ВДУ

перамогу. На выбарах прэзідэнта , а таксама і дэпутатаў Нацыянальнага сходу пастаянна прысутнічалі прадстаўнікі міжнародных і рэгіянальных арганізацый. Большасць назіральнікаў адзначаюць празрыстасць і дэмакратычнасць выбарчай сістэмы Беларусі.

**Спасылкі**


1. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ МІПСА, 2009. – 276 с.
2. Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 1.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с. іл.
4. Известия. – 1990. – 4мая.
5. Ведамасці Вярхоўнага Савета БССР. – 1991. – № 9.
6. Современная Беларусь: энцикл. справ: в 3 т. – Т. 1. Страна, Население. Внутренняя и внешняя политика. – Минск, 2006.
7. Дементей, Н.И. Уроки жизни / Н.И. Дементей. – Мн.: БЕЛТА, 2005. – 272 с.
8. Конституция Республики Беларусь от 15 марта 1994 г. (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканском референдуме от 24.11.1996, в ред. решения республиканского референдума от 17.11.2004 № 1/0) // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 05.01.1999. – № 1. – 1/0; 02.12.2004. – № 188. – 1/6032.


## ТЭМА 14. **Пашырэнне палітычных, эканамічных і культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі**

*1. Шматвектарнасць знешнепалітычнага курсу Беларусі.*

*2. Гандлёва –эканамічныя адносіны з краінамі свету.*

***1. Шматвектарнасць знешнепалітычнага курсу Беларусі.*** Пасля распада СССР на месцы былых савецкіх рэспублік узніклі новыя незалежныя дзяржавы. У Беларусі таксама быў прыняты шэраг дакументаў, дэкларыруючых яе суверэнітэт. Для разгляду вызначанага пытання важна ўказаць на закон “Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР” і дэкларацыі “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”. Згодна з гэтымі дзяржаўнымі дакументамі на тэрыторыі рэспублікі спынялася падпарадкаванне гаспадарчага і знешнепалітычнага жыцця саюзным міністэрствам і ведамствам. Беларусь, як запісана ў Дэкларацыі (арт. 1): “суверэнная дзяржава, якая ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад’емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу” [1, с. 148].

Репозиторий ВГУ

На 46-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1991 г.) у выступленні міністра замежных спраў рэспублікі быў абвешчаны статус Беларусі як без'ядзернай нейтральнай дзяржавы, якая ажыццяўляе шматвектарную знешнюю палітыку. Такі статус паклаў пачатак новаму этапу ў знешнепалітычнай дзейнасці рэспублікі. Са снежня 1991 г. пачаўся працэс міжнароднага прызнання Беларусі. Першымі дыпламатычныя адносіны з рэспублікай устанавілі Украіна (27 снежня 1991 г.) і ЗША (28 снежня 1991 г.). У 1992 г. дыпламатычныя адносіны ўстаноўлены з Расіяй, Казахстанам, пераважнай большасцю краін Еўропы і Лацінскай Амерыкі, Кітаем , Японіяй, Індыяй , Турцыяй, Канадай, Ізраілем, Рэспублікай Карэяй, КНДР, Манголіяй, В'етнамам, Егіптам, Аўстраліяй, Новай Зеландыяй.

Да сярэдзіны 1994 г. вядучую ролю ў распрацоўцы, прыняцці і рэалізацыі рашэнняў у сферы знешняй палітыкі рэспублікі адыгрывалі яе Вярхоўны Савет і Савет Міністраў. Прынятая ў 1994 г. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь вызначыла асноўныя напрамкі знешняй палітыкі дзяржавы і падцвердзіла, што Беларусь як суверэнная дзяржава ў зносінах з іншымі краінамі свету ажыццяўляе шматвектарную палітыку. Міжнародная дзяржаўная палітыка Беларусі зыходзіць з прынцыпу роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права.

З выбраннем першага прэзідэнта менавіта ён атрымаў паўнамоцтвы выступаць у якасці гаранта рэалізацыі асноўных напрамкаў знешняй палітыкі дзяржавы, прадстаўляць краіну ў адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. Вядучым органам, які ажыццяўляе каардынацыю знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасць краіны, з'яўляецца Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

З часу аб'яўлення суверэнітэта Беларусь пашырыла свой удзел у арганізацыях сістэмы ААН. У 1992 г. у Мінску створана Прадстаўніцтва ААН. Наша краіна з'яўляецца членам 13 спецыялізаваных устаноў гэтай арганізацыі. Адным з галоўных прыярытэтаў дзейнасці беларускай дыпламатыі ў ААН стала мабілізацыя міжнароднай падтрымкі ў вырашэнні праблемы вынікаў Чарнобальскай катастрофы. Беларусь уключана ў "Міжустаноўчую праграму міжнароднага садзейнічання тэрыторыям, пацярпеўшым у выніку Чарнобальскай катастрофы". З 29 пунктаў, якія прадугледжваліся праграмай і атрымалі падтрымку экспертаў, 13 – датычалася Беларусі. У 1999 г. у Беларусі пры падтрымцы МАГАТЭ ажыццяўлялася рэалізацыя шасці праектаў на суму звыш 1 млн дол. ЗША, найбольш значным з якіх быў праект "Рэабілітацыя тэрыторый, якія пацярпелі ад Чарнобальскай катастрофы".

У краіне дзейнічае Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. У рамках ЮНЕСКА для Беларусі былі распрацаваны праграмы "Генетычная спадчына", "ЮНЕСК – Чарнобыль", "Чалавек і

Репозиторий ВГУ

біясфера”. З 1994 г. Міжнародная арганізацыя аховы здароўя ажыццяўляе на беларускай тэрыторыі міжнародны праект “шчытападобная залоза”.

Набыццё незалежнасці дазволіла Беларусі далучыцца ці пашырыць дыялог з шэрагам міжнародных арганізацый. У студзені 1992 г. Беларусь падпісала Парыжскую хартыю для новай Еўропы і стала членам НБСЕ (з 1995 г. – АБСЕ). У верасні 1992 г. Рэспубліка Беларусь атрымала статус спецыяльна запрошанага члена Савета Еўропы . У 1999 г. рэспубліка мела членства ў 37 міжнародных універсальных і 11 рэгіянальных міжнародных арганізацыях [2, с. 3]. У межах падрыхтоўкі да ўступлення ў еўрапейскія структуры Беларусь ратыфікавала шэраг міжнародна – прававых актаў у галіне правоў чалавека. У 1995 г. у Мінску адкрыта прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па бежанцах, у 1996 г. – пастаяннае прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па мігрантах.

У кастрычніку 1995 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выступіў на спецыяльным урачыстым пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН (сесія прысвечана 50-годдзю гэтай арганізацыі), дзе выклаў пазіцыі кіраўніцтва краіны па ключавых праблемах міжнародных адносін. Яшчэ адно выступленне Прэзідэнт Беларусі А.Р. Лукашэнка зрабіў на Спецыяльным пленарным пасяджэнні 60-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 15 верасня 2005 г. У сваёй прамове ён падкрэсліў, што Арганізацыя Аб’яднаных Нацый не ўпоўнай меры выконвае свае абавязкі падтрымання міру і бяспекі, і прапанаваў, як і ў ранейшым сваім выступленні, краінам – членам ААН больш паважліва ставіцца да прынцыпу шматпалярнасці , свабоды выбару шляху развіцця для кожнай дзяржавы.

Рэспублікай Беларусь быў вынесены на разгляд Генеральнай Асамблеі ААН праект рэзалюцыі ”Прадухіленне распрацоўкі і вытворчасці новых відаў зброі масавага знішчэння: справаздача Канферэнцыі па раззбраенні”. Рэзалюцыя атрымала падтрымку і была прынята 8 снежня 2005 г.

Па стану на 1999 г. Рэспубліку Беларусь прызналі 137 дзяржаў свету, з іх 124 устанавілі з ёю дыпламатычныя адносіны. У далейшым сетка дыпламатычных прадстаўніцтваў у Беларусі мела тэндэнцыю да павялічэння. У 2004 г. дыпламатычныя адносіны з рэспублікай устанавілі 160 краін свету. На яе тэрыторыі дзейнічала 35 пасольстваў, 8 консульстваў і генконсульстваў, 12 прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый, 82 пасла былі акрэдытаваны па сумяшчальніцтву. У 2017 г. сетка дыпламатычных і консульскіх устаноў прадстаўляла інтарэсы Рэспублікі Беларусь у 58 дзяржавах (з улікам акрэдытацыі паслоў па сумяшчальніцтву – у 117). У Беларусі ажыццяўлялі сваю дзейнасць 48 пасольстваў, 4 аддзяленні пасольстваў, 3 гандальпрадстаўнітв, 40 консульскіх устаноў замежных дзяржаў, 17 прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый [3]. У 2009 г. Еўрасаюз падключыў Беларусь да ініцыятывы “Усходняга партнёрства”. Рэспубліка Беларусь прапанавала выкрасліць вайну з жыцця народаў і краін і ўсе спрэчныя пытанні

Рэпазіторый ВДУ

вырашаць за сталом перагавораў. Наша краіна добраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі і не далучаецца да ваенна – палітычных блокаў [4, с. 504].

Не зусім складна наладжваўся дыпламатычны дыялог Беларусі з ЗША. З 2001 г. па 2010 г. абодва бакі не змаглі знайсці аснову для нармалізацыі двухбаковых адносін. Увядзенне амерыканскай адміністрацыяй у 2007 г. эканамічных санкцый у адносінах да канцэрна Белнафтахім прывяло да скарачэння беларускага экспарту ў гэтую краіну, што сказалася на ўзрастанні дысбалансу гандлёвага абароту паміж дзяржавамі на карысць ЗША.

З абвяшчэннем суверэнітэту ўсе рэспублікі адчулі на сабе негатыўныя з'явы, звязаныя з разбурэннем эканамічнай, ваенна – палітычнай і культурна – моўнай прасторы, якая ў СССР складвалася дзесяцігоддзямі. Адбылося імклівае разрушэнне адзінага народнагаспадарчага комплексу. Кіраўніцтва былых саюзных рэспублік аб'ясняла гэта дыстанцыраваннем , як яны лічылі, ад "імперскага" цэнтра. Вельмі хутка грамадзяне новых дзяржаў, аб чым распавядалася ў ранейшых раздзелах, адчулі масу бытавых нязручнасцей ад новых межаў і мытняў. Стала зразумела, што, атрымаўшы самастойнасць, рэспублікам неабходна на аснове раней назапашанага вопыту ўзгадняць і падтрымліваць кааператыўныя сувязі. Беларусь стала краінай постсавецкай прасторы, дзе гэту неабходнасць усвядомілі не толькі "нізы" але і "вярхі" на самам высокім дзяржаўным узроўні. Грамадскі запрос на ўзнаўленне адносін з рэспублікамі былога СССР знайшоў сваё паслядоўнае ўвасабленне ў палітычнай і эканамічнай практыцы Вядучая роля ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы належыла Расійскай Федэрацыі і Беларусі.. У Беларусі быў прыняты курс на ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з былымі рэспублікамі як са самастойнымі краінамі, і, ў першую чаргу – з Расійскай Федэрацыяй. У жніўні 1990 г. з РСФСР быў падпісаны Дагавор аб палітычным, эканамічным і культурным супрацоўніцтве. У снежні гэтага ж года ўступіў у дзеянне Дагавор аб асновах адносін паміж Украінай і Беларуссю, у пачатку 1991 г. – Дагавор аб супрацоўніцтве з Казахстанам. У снежні 1991 г. па рашэнні кіраўніцтва краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў Мінск стаў афіцыйным месцам знаходжання каардынацыйных органаў (СНД) і, такім чынам, набыў статус сталіцы Садружнасці. Кіраўнікі 11 краін – членаў СНД абмеркавалі фінансава – эканамічныя і ваенна – стратэгічныя пытанні дзейнасці Садружнасці. 14 лютага 1992 г. у Мінску была падпісана дэкларацыя аб прытрымліванні прынцыпаў супрацоўніцтва ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў, пагадненне аб узгодненасці дзеянняў у правядзенні эканамічных рэформаў, пагадненне аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнасцей дзяржавам іх паходжання.

22 студзеня 1993 г. на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у Мінску прыняты Статут СНД.



Рэпазіторый ВГУ

З 1996 г. беларуска-расійскія адносіны сталі будавацца на аснове заключанага Дагавора аб стварэнні Садружнасці Расіі і Беларусі. Паміж дзвюма краінамі дзейнічае прыняты 23 мая 1997 г. Статут Саюза Беларусі і Расіі. Наступным крокам двухбаковых адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй стаў Дагавор ад 8 снежня 1999 г. аб стварэнні **Саюзнай дзяржавы**. Дагавор прадугледжвае стварэнне агульнай прававой базы Саюза, фарміраванне адзінай эканамічнай, абароннай і гуманітарнай прасторы ў мэтах паляпшэння жыцця грамадзян дзвюх дзяржаў. І хаця працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы складваецца няпроста (у яго ёсць нядобразычліўцы), прынятыя рашэнні часам слаба падмацоўваюцца практычнымі крокамі, але Дагавор аб Саюзнай дзяржаве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб’ектыўна адпавядае інтарэсам двух брацкіх народаў. Аб неабходнасці далейшага ўмацавання Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі заявіў у інаўгурацыйным выступленні 21 студзеня 2011 г. Прэзідэнт Рэспублікі А. Р. Лукашэнка.

Значныя вынікі ў інтэграцыі дасягнуты ў адносінах паміж Расіяй, Беларуссю и Казахстанам. Неабходнасць эканамічнай інтэграцыі гэтых краін прывяла ў 2010 г. да стварэння паміж імі Мытнага Саюза, а 18 лістапада 2011 г. Расія, Беларусь і Казахстан падпісалі Дэкларацыю аб Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, канчатковая мэта якой – стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза, у які ўвайшло яшчэ некалькі быўшых рэспублік СССР.

***2. Гандлёва-эканамічныя адносіны з краінамі свету.*** Прыступаючы да высвятлення гэтага пытання, трэба звярнуць асобую ўвагу на тое, што эканоміка Рэспублікі Беларусь па сваёй структуры , маштабам вытворчасці яшчэ з савецкіх часоў з’яўлялася экспартаарыентаванай. Амаль усе прадпрыемствы з высокімі экспартна – імпартнымі магчымасцямі захаваліся тут і пасля распаду СССР. Так, у 2010 г. вытворчасць вялікагрузных аўтамабіляў складала 30% ад таго , што выпускалася ў той час у свеце, мінеральных угнаенняў – 15%, трактароў – 6%. Асноўным гандлёвым партнёрам Рэспублікі Беларусь і пасля аб’яўлення незалежнасці з’яўлялася Расія, доля якой у знешнеганлёвым абароце ў 1992 г. была на ўзроўні 60%. З гэтай краіны рэспубліка імпартавала галоўным чынам паліўна – энергетычныя рэсурсы, металы, машыны і абсталяванне.

Аснову беларускага экспарту ў Расію складалі транспартныя сродкі (аўтамабілі, трактары, веласіпеды), прамысловае абсталяванне, хададзільнікі, тэлевізары, тэкстыльныя вырабы, сельскагаспадарчая прадукцыя. Больш за ўсё знешняга гандлю прыпадала на Маскву, Санкт-Пецярбург, Цюменскую вобласць. Таваразварот паміж дзяржавамі за 2011 г. склаў 38 млрд дол., а за 2012 г. – 44 млрд дол. У 2012 г. БелАЗ больш за 60% сваёй прадукцыі накіраваў у Расію. Гэта сотні аўтамабіляў грузапад’ёмнасцю ад 45 да 360 тон [5, с. 3]. Знешнегандлёвы абарот з

Рэпазіторый ВДУ

Расіяй пастаянна ўзрастаў, з улікам росту сусветных цэн на нафту і газ, перавага тут была на баку Расійскага экспарту. У сувязі з чым у тавараздвароце з гэтай краінай Беларусь мае значную долю адмоўнага знешнегандлёвага сальда.

Надзейным партнёрам у знешнеэканамічных сувязях для Беларусі быў Казахстан. Эфектыўныя адносіны наладзілі з гэтай рэспублікай прадпрыемствы і арганізацыі Беларусі, у тым ліку і Віцебшчыны. Напрыклад, у 2010 г. знешнегандлёвы абарот Віцебскай вобласці з рэгіёнамі Казахстана павялічыўся да папярэдняга ўзроўню ў 10 разоў і склаў больш за 250 млн дол. Тэндэнцыя да павелічэння гандлю паміж суб’ектамі гаспадарання Віцебскай вобласці і рэгіёнамі Казахстана мелася і ў далейшым. Станоўчае сальда ў гандлі з Казахстанам мелі Глыбоцкі, Лепельскі, Полацкі малочныя камбінаты, Верхнядзвінскі масласырзавод. Экспартавалі сваю прадукцыю ў Казахстан прамысловыя прадпрыемствы “Саюзкабель”, “Віцебскія дываны”, Пастаўскі мебельны цэнтр. У значных памерах вяліся пастаўкі ў гэтую краіну абутку, ільняных тканін, іншай прадукцыі, якая карысталася попытам у казахаў.

Аснову імпарту ў Беларусь з Казахстана складалі нафтапрадукты, у выніку чаго тут таксама, як і з Расіяй, назіралася адмоўнае для Віцебшчыны сальда [6, с. 1]. Кіраўніцтва вобласці імкнулася да забеспячэння станоўчага сальда ў знешнім гандлі праз рост экспарту тавараў і паслуг з прамысловых прадпрыемстваў, пашырэння паставак у замежжа сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання, але дасягнуць раўнавагі ў знешнім гандлі у гэты час не ўдалося.

З 1997 г. Беларусь паступова пашырала аб'ём знешняга гандлю з іншымі краінамі свету. Развіццё шматвектарнай знешнепалітычнай стратэгіі знайшло сваё месца ў гандлёвым абароце з Нідэрландамі, Германіяй, Кітаем, Польшчай, Латвіяй, Літвой, Азіяцкімі і Афрыканскімі краінамі. У 2002 г. найбольшы знешнегандлёвы абарот Беларусь мела з Германіяй – 6,1%, Латвіяй – 3,3%, Польшчай – 2,9%, Літвой – 2,1%. У 2011 г. Германія па знешнегандлёваму абароту з Рэспублікай Беларусь перамясцілася на трэццяе месца : пасля Расіі і Нідэрландаў. На пачатку 2018 г. найважнейшымі гандлёвымі партнёрамі нашай рэспублікі з’яўляліся Расія, Украіна, Злучанае Каралеўства, Кітай і Германія. За імі, згодна Белстата, знаходзіліся Польшча, Нідэрланды, Літва, Турцыя, Італія.

Ажыццяўляліся знешнеэканамічныя сувязі Беларусі і праз стварэнне сумесных прадпрыемстваў. Прадпрыемствы з выключна замежным капіталам у Рэспубліцы Беларусь мелі ў 2001 г. ЗША – 162, Германія – 148.

А ўсяго ў гэты час знешніх прадпрыемстваў на тэрыторыі рэспублікі налічвалі 67 краін. На 1 студзеня 2002 г.у Беларусі было зарэгістравана 2415 прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі. Найбольшая колькасць сумесных прадпрыемстваў было з Польшчай – 201, Расіяй – 189, Германіяй

Репозиторий ВГУ

– 176. У 2010 г. у Беларусі дзейнічала каля 400 прадпрыемстваў з нямецкім капіталам і 80 прадстаўніцтваў нямецкіх фірм.

Вядучы гаворку пра дадзенае пытанне, нельга забывацца пра функцыянаванне свабодных эканамічных зон ”Брэст”, “Мінск”,”Віцебск”, ”Гомель і інш. Прадпрыемствы свабодных эканамічных зон станоўча ўплывалі на экспартную дынаміку рэспублікі. Так, тавары прадпрыемстваў Віцебскай вобласці ў 2013 г. экспартаваліся на рынкі 78 дзяржаў. Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі вобласці ў гэты час з’яўляліся Расія, Кітай, Германія, Польшча, Італія , Нідэрланды. З кожным годам у замежжы ўзрастаў попыт на беларускую прадукцыю хімічнай прамысловасці, мяса-малочнай галіны . Толькі прадпрыемствы Віцебскай вобласці экспартавалі тавараў больш за 400 найменняў. Сярод іх кабельная прадукцыя, вецерынарныя прэпараты, торф, станкі , паліэцілен, сыры , піламатэрыялы, цэгла, запасныя часткі для сельскагаспадарчых машын. Да сябе Віцебшчына завозіла па імпарту палімеры, металы, каўчук, тканіну, адзенне, фармакалагічную прадукцыю і інш. З КНР на Віцебшчыну ў гэтыя гады паступала звыш 400 таварных пазіцый [7, с. 3].

Знаходзячыся на скрыжаванні шляхоў паміж Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем, Беларусь надавала вялікую ўвагу развіццю шляхоў зносін. Праз Беларусь праходзіць прамы чыгуначны шлях ад Масквы да Берліна. Па ім наладжаны скарасны і звышскарасны пасажырскі рух.

Як бачна, Рэспубліка Беларусь з самага пачатку сваей незалежнасці адкрыта для эканамічнага супрацоўніцтва з замежнымі краінамі, у той жа час, маючы велізарны вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны і інтэлектуальны патэнцыял, стаўка ў краіне робіцца на ўласныя сілы і сродкі. Іншаземныя інвестыцыі прыцягваюцца ў тым выпадку, калі яны даюць эканамічную выгаду беларускаму народу і адпавядаюць яе нацыянальным інтарэсам.

**Спасылкі**


1. Ведамасці Вярхоўнага Савета БССР. – 1991. – № 28 .
2. Беларусь. Факты: справ. – Мн., 2000.
3. Федоров, В. В карьер. Союз Беларусь Россия.
4. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2010 г.: вучэб. дапам / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік; пад рэд. Я.К. Новіка. – 3-е выд., папр. – Мінск: Выш. шк., 2011. – 512 с.
5. Обзор итогов внешней политики Республики Беларусь и деятельности Министерства иностранных дел в 2017 году. /Сообщение официального сайта Министерства иностранных дел Рэспублики Беларусь.
6. Новости придвинья. Казахстан стал ближе // Віцебскі рабочы. – 2011. – 28 мая.
7. Тихонов А. Экспорт: реалии и перспективы // Витебские вести. – 2014. – 1 февр.


Репозиторий ВГУ

ТЭМА 15. **Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на мяжы XX–XXI стст.**

*1. Сістэма адукацыі, роля навукі ў інфармацыйным грамадстве: поспехі і праблемы.*

*2. Навука, літаратура, выяўленчае мастацтва, архітэктура, спорт.*

***1. Сістэма адукацыі, роля навукі ў інфармацыйным грамадстве: поспехі і праблемы.*** У краінах, якія ўступілі ў XXI ст. у постіндустрыяльнае і інфармацыйнае грамадства, эканоміка стала ўсё больш залежнай ад ведаў. Імклівы прагрэс у развіцці ўсіх галін навукі і тэхнікі тут грунтуецца на эксплуатацыі ідэй, тэхнічны прагрэс забяспечваюць спецыялісты з высокім узроўнем ведаў, уменняў і навыкаў. У айчыннай гісторыяграфіі існуе добрая традыцыя казаць аб тым, што Рэспубліка Беларусь яшчэ ў савецкі час увайшла ў лік дзяржаў з высокім узроўнем пісьменнасці насельніцтва.

З набыццём незалежнасці пытанне аб стварэнні спрыяльнага асяродку для развіцця нацыянальнай адукацыі засталося прыярытэтным. Узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва ў рэспубліцы да 2015 г. падняўся амаль да магчымага максімума (99,6%). Па гэтым паказчыку Беларусь апярэджвае многія развітыя краіны [1, с. 11].

З абвяшчэннем суверэнітэту рэспублікі 29 кастрычніка 1991 г. быў прыняты Закон аб адукацыі. У ім выкладзена канцэпцыя, якая прадугледжвае свабодны доступ да любой ступені адукацыі, гарантыі стварэння ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў кожнага чалавека, шматварыянтнасць зместу і форм навучання.

Вялікая ўвага надаецца дзіцячаму дашкольнаму выхаванню. У 1991 г. у рэспубліцы налічвалася больш за 4,5 тыс. дзіцячых дашкольных установаў, у якіх выхоўвалася 444,3 тыс. дзяцей. У апошнія гады ствараюцца сямейныя дзіцячыя садкі, садкі санаторнага тыпу на кааператыўнай аснове, вячэрнія і прагулачныя, выхаднога дня, цэнтры развіцця дзіцяці і інш.

У 1996 г. у Рэспубліцы Беларусь працавала 5007 установаў агулнаадукацыйнай школьнай сістэмы, у іх навучалася 1597,8 тыс. чалавек. На 1 студзеня 2009 г. у Беларусі ўстаноў такой формы навучання стала значна меней. Змяншэнне іх колькасці да 3821 звязана з закрыццём многіх сельскіх школ у сувязі са скарачэннем сельскага насельніцтва [2, с. 186].

Навацыяй у адукацыйнай справе незалежнай рэспублікі стала пашырэнне новых навучальных структур. З 1998 г. пачалася рэформа агульнаадукацыйных устаноў. Зроблены пераход школ на 12-гадовае навучанне, у тым ліку абавязковае 10-гадовае. Узніклі новыя формы навучальных устаноў: у 2009 г. у Беларусі працавала 198 гімназій, 3 5 ліцэяў.

Репозиторий ВГУ

У 2008 г. было прынята рашэнне прыпыніць рэформу па пераходзе да 12-гадовага навучання і ажыццяўляць сярэднюю адукацыю моладзі ў 11-гадовай школе.

Сення агульнаадукацыйная школа ў Беларусі складаецца з трох ступеней: пачатковая (4 гады), асноўная ці базавая школа (5 гадоў), старэйшая школа (2 гады). Паляпшэнню ведаў вучняў паспрыяла наяўнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы, забяспечанасць настаўніцкімі кадрамі, інфарматызацыя навучальнага працэсу, выданне вучэбна – метадычнай літаратуры і, як адзначалася ў выдадзеных тады дакументах, увядзенне 10-бальнай сістэмы ацэнкі ведаў. На ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі штогод адбываліся змены, праводзілася рэструктурызацыя школьнай сеткі ў бок яе змяншэння. У першую чаргу гэты працэс быў звязан са змяншэннем колькасці дзяцей школьнага ўзросту і, як следства, выпускнікоў базавай і сярэдняй школы.

У Віцебскай вобласці назіралася тая ж тэндэнцыя. На калегіі абласнога ўпраўлення адукацыі гаварылася аб гэтай праблеме як негатыўнай. Падкрэслівалася, што напачатку 2014 г. на тэрыторыі вобласці працавала 500 школ і 635 устаноў дашкольнай адукацыі (у параўнанні з папярэднімі гадамі іх колькасць скарацілася), у бягучым годзе прадстаяла закрыццё яшчэ 15 базавых і некалькіх сярдніх школ [3, с. 2].

У суверэннай рэспубліцы захавалася (з незначным скарачэннем) шырокая сетка прафесійна-тэхнічных вучылішчаў (ПТВ). 238 ПТВ Беларусі мелі больш за 132 тысячы навучэнцаў. У прафесійна – тэхнічных вучылішчах з атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы праходзілі падрыхтоўку па 420 прафесіях. Падрыхтоўка рабочых рознага профілю ў вучылішчах вялася на базе сярэдняй адукацыі і на аснове базавага навучання (тут разам з прафесіяй вучні атрымлівалі сярэднюю адукацыю). 12 ПТВ аб'явілі сябе вышэйшымі прафесійнымі ўстановамі.

Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы забяспечвалі, як і ў савецкі час, падрыхтоўку кадраў сярэдняга звяна для ўсіх галін гаспадаркі і культуры. Частка тэхнікумаў была пераўтворана ў каледжы, дзе адначасова вялася падрыхтоўка спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі і спецыялістаў павышанага ўзроўню, якія мелі магчымасць паступаць адразу на 3-ці курс вышэйшых навучальных устаноў. Падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне ажыццяўлялі 149 тэхнікумаў і іншых сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, у іх ліку 27 каледжаў. Колькасць навучэнцаў у 1997/1998 навучальным годзе тут складала каля 130 тысяч чалавек. Але наступствы дэмаграфічнай сітуацыі, увядзенне платнага навучання, іншыя фактары, прыводзілі да недабору ў сярэднія спецыяльныя ўстановы вучняў нават на бюджэтныя месцы. Праяўляліся тут і недапрацоўкі ўрада краіны, міністэрстваў і ведамстваў, функцыяй якіх з'яўляецца прагназаванне і своечасовае вырашэнне гэтых задач. Да 2015 г. прапарцыянальнасць у падрыхтоўцы спецыялістаў сярэдняй

Рэпазіторый ВДУ

спецыяльнай кваліфікацыі з іншымі ўзроўнямі была парушана неапраўдана высокім колькасным ростам студэнтаў вышэйшай школы. Гэта абцяжарыла працу па сацыяльнай арыентацыі і набору моладзі ў навучальныя ўстановы, якія рыхтавалі спецыялістаў сярэдняга звяна, а таксама рабочых масавых прафесій.

У рэспубліцы на этапе 1991–2015-х гг. функцыянавала шырокая сетка вышэйшых навучальных устаноў. У 90-я гады многія ВНУ былі пераўтвораны ў акадэміі і ўніверсітэты. У 2001 г. мелася 43 дзяржаўных і 14 недзяржаўных ВНУ. У іх навучалася 281742 чал., з іх у дзяржаўных – 254,1 тыс., у недзяржаўных – 36,6 тыс. чал. У ВНУ працавала 18824 выкладчыкаў, у тым ліку 1040 дактароў і 7315 кандыдатаў навук [4, с. 7]. У 2009 г. у ВНУ навучалася больш за 420 тысяч студэнтаў, у тым ліку ў дзяржаўных 360 тыс. [5, с. 10]. ВНУ сталі ажыццяўляць цесную інтэграцыю з сярэднімі навучальнымі установамі. Многія з іх уключылі ў свае структуры ліцэі. Такая сувязь пры падрыхтоўцы моладзі дае магчымасць у далейшым выпускнікам ліцэяў удасканальваць свае веды ў вышэйшай школе па скарочаным тэрміне навучння .

На гэтым этапе развіцця беларуская дзяржава прызнала і ўзаконіла дзейнасць недзяржаўных навучальнх устаноў. У пачатку1990-х гг. у Беларусі пачалі сваю працу дзясяткі недзяржаўных ВНУ, адкрылі свае філіялы і прадстаўніцтвы расійскія ўстановы. Па афіцыйных дадзеных, да 2000 г. толькі ў Віцебскай вобласці было адчынена 8 недзяржаўных фарміраванняў, заявіўшых аб выкананні задач падрыхтоўкі спецыялістаў на ўзроўні вышэйшай школы. Гэта – філіялы Міжнароднага недзяржаўнага інстытута працоўных і сацыяльных адносін (адкрыўся ў 1994 г. у Віцебску), інстытута Сучасных ведаў у Віцебску (1996 г.). Пазней з'явіліся два філіялы Беларускага камерцыйнага інстытута кіравання ў Оршы і Полацку, тры ц'ютарскіх пункты дыстанцыйнай адукацыі Сучаснага Гуманітарнага інстытута (Масква), вучэбна –кансультацыйны пункт Санкт – Пецярбургскага тэхналагічнага ўніверсітэта сэрвісу ў Віцебску, Оршы і Наваполацку. На першапачатковым этапе свайго развіцця па ўзроўню якасці вучэбнага працэсу недзяржаўныя ўстановы адставалі ад дзяржаўных. Матэрыяльная база, выкладчыцкі склад, навукова – метадычнае забеспячэнне і сам навучальны працэс былі далёкімі ад дасканаласці. Ад вялікай колькасці ўзнікшых устаноў на выдачу дыплома аб вышэйшай адукацыі, атдачы ў галінах гаспадарчага комплексу рэспублікі не адбылося. Пры ўважлівым кантроле з боку органаў дзяржаўнага кіравання вытрымалі экзамен і атрымалі атэстацыю толькі тыя ўстановы, якія строга кіраваліся існуючай у рэспубліцы нарматыўнай базай. У 2015 г. на Віцебшчыне заставалася толькі адна ўстанова недзяржаўнай ВНУ – Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта "МІПСА" [6, с.189–195].

Репозиторий ВГУ

На 1 студзеня 2015 г. у Беларусі функцыянавала 53 ВНУ, дзе навучалася больш за 400 тыс. студэнтаў. Па колькасці студэнтаў у разліку на 10 тыс. насельніцтва Беларусь выйшла на ўзровень вышэй сярэднееўрапейскага (больш 400 чалавек). З фармальнага пункту гледжання на краіну з насельніцтвам у дзевяць з паловай мільёнаў чалавек – гэта абсалютны сусветны рэкорд.

З ростам масавасці, які стаў адчувальным з 1994 г., у вышэйшай школе сталі відавочнымі слабыя месцы. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка, адукацыя, стаўшы масавай і лёгкадаступнай, у чымсьці згубіла былы аўтарытэт [7, с. 2]. Калі ў самы бліжэйшы час не адрэгуляваць сітуацыю, то падобная дыспрапорцыя, як падкрэсліў Прэзідэнт на працоўнай сустрэчы са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу (у той час акадэмікам А. Рубінавым), можа ў канчатковым выніку нанесці шкоду эканоміцы краіны [8, с. 2].

Такая выснова кіраўніка дзяржавы заснавана на рэальным становішчы. Сапраўды, за масавасцю вышэйшай школы хаваюцца сур'ёзныя праблемы. Неапраўдана завышаны колькасны рост студэнтаў вышэйшай школы, што адлюстроўвалася сітуацыяй 2013 г. (467студэнтаў на 10 тыс. насельніцтва), парушала прапарцыянальнасць у падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай кваліфікацыі, абцяжарвала працу па сацыяльнай арыентацыі і набору моладзі ў навучальныя ўстановы, якія рыхтавалі рабочых масавых прафесій [9, с. 3]. Адначасова стваралася сітуацыя перагружанасці студэнцкай аўдыторыі, адбывалася зніжэнне такога важнага крытэрыю адукацыйнага працэсу, як забяспечанасць ВНУ прафесарскім складам адносна студэнцкага кантынгенту.

Выкарыстоўваючы лёгкавагавасць выпрабавальнай сістэмы, значная частка людзей улівалася ў студэнцкую аўдыторыю абсалютна не гатовымі і, што больш важна, з адсутнасцю зацікаўленасці ў развіцці сваіх пазнавальных здольнасцей. У такім варыянце адсутнічаў сацыяльны заказ на адукаванасць. Меліся сур'ёзныя цяжкасці ў працаўладкаванні выпускнікоў ВНУ. Дастаткова вялікая колькасць выпускнікоў не была запатрабавана на рынку працы, шмат тых, хто не змог рэалізаваць сябе з карысцю для сям'і і грамадства. Перанасычаным аказаўся рынак працы эканамістамі, менеджарамі, юрыстамі. Значная частка выпускнікоў вышэйшай школы займалася пошукам працы самастойна, знаходзілася па-за полем зроку службы занятасці. Такое становішча зніжала прэстыж вышэйшай школы, дэфармавала сістэму стымулаў вучэбнага працэсу ў ёй, аслабляла прафесійна-кваліфікацыйны ўзровень выпускаемых спецыялістаў, якія з'яўляюцца асноўным фактарам сацыяльна-эканамічнага і культурна-тэхнічнага росту грамадства ў сучаснасці і будучыні.

На Рэспубліканскім педагагічным савеце ( праходзіў у Мінску 22–23 жніўня 2017 г.), гучалі слушныя думкі, што шляхі вырашэння

Рэпазіторый ВГУ

наспелых праблем вышэйшай школы знаходзяцца ва ўдасканаленні сістэмы адбору моладзі для вучобы ў вышэйшых навучальных установах.

Развіццё вышэйшай школы краіны павінна ўлічваць сусветныя працэсы і тэндэнцыі. У краінах Еўрапейскага саюза і ў Японіі прызнана, што не больш за 40% выпускнікоў агульнаадукацыйных школ здольныя фундаментальна асвойваць праграму вышэйшай школы [10, с. 4]. У нашай краіне гэтыя дадзеныя, хутчэй за ўсё, аналагічныя. Такая ж частка выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы (а хутчэй, крыху больш, чым у Японіі) не гатовыя да канцэнтраваных дзеянняў і пераадолення цяжкасцяў у статусе студэнта.

Згодна з фундаментальнымі дакументамі, Рэспубліка Беларусь трымае арыенцір на перадавыя краіны, дзе маецца пастаянная нацэленасць на паскоранае развіццё эканомікі за кошт доўгатэрміновых фактараў, да якіх ставяцца новыя высокія тэхналогіі. Тады, у дадзеным кантэксце, больш правільным падыходам да дзейнасці вышэйшай школы можа быць арыентацыя не на колькасныя, а на якасныя паказчыкі, на высокі канчатковы вынік, на фарміраванне глыбокіх і трывалых ведаў, высокай кампетэнтнасці ў сваіх выпускнікоў.

Сёння, як і раней, актуальным пытаннем вышэйшай школы з'яўляецца адбор ва ўстановы такога тыпу таленавітай моладзі. На першым месцы пры камплектаванні студэнцкай аўдыторыі павінен быць (і аб гэтым заяўлена на педагагічным савеце 2017 г.) прагноз запатрабаванасці спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў гаспадарчым і сацыяльна-культурным комплексе як на цяперашнім этапе, так і на вядомую перспектыву. Змена тэхналагічнага ўкладу ў краіне на больш высокі патрабуе аператыўнай распрацоўкі і штогадовага абнаўлення Міністэрствам адукацыі нацыянальнай сістэмы спецыяльнасцей і спецыялізацый з улікам адаптаванасці прафесійных кваліфікацый у бізнес-асяроддзе.

Задача дзяржавы – забяспечыць у рэальнасці атрымання ўсімі грамадзянамі Беларусі якаснай адукацыі, пастаяннага абнаўлення ведаў з мэтай іх эфектыўнага прымянення ў навуковай і практычнай дзейнасці. Патрабуецца падняць на некалькі парадкаў вышэй паказчыкі ўзроўню ведаў, набытых навучэнцамі ў сярэдняй школе і абітурыентамі на ўступных іспытах, чым тыя, якія існавалі на працягу апошніх 10–15 гадоў. Толькі такі падыход (гэта пацвярджаецца сусветнай практыкай) з'яўляецца паказчыкам гатоўнасці маладога чалавека да пастаяннай высокай нагрузкі, самаўдасканалення праз усвядомленае стаўленне да навучальнага працэсу.

***2. Навука, літаратура, выяўленчае мастацтва, архітэктура, спорт.*** Разгляд гэтага пытання рэкамендуецца пачаць з разгляду стану навукі. Заўважана, што на пачатку 1990-х гг. цэнтрам беларускай навукі, як і ў папярэднія гады, заставалася Нацыянальная акадэмія навук. У 1991 г. АН БССР была пераіменавана ў Акадэмію навук Беларусі, у 1997 г. ей

Репозиторий ВГУ

прысвоены статус Нацыянальнай. Цяжкае эканамічнае становішча краіны пачатку 90-х гг. адмоўна адбілася на фінансавым забеспячэнні гэтай і іншых навуковых устаноў. Эфектыўнасць дзейнасці ўстаноў навукі Беларусі значна знізілася. Зменшыўся лік навуковых работнікаў, скараціўся лік маладых спецыялістаў, што прывяло да так званага старэння навукі.

Дзяржаўныя органы прымалі ў гэты час меры па падрымцы навукі. З 1991 г. пачаў сваю дзейнасць Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў. Ён аказваў, на конкурснай аснове, фінансавую падтрымку навуковым калектывам і асобным вучоным. У 1992 г. быў створаны Дзяржаўны патэнтны камітэт, у 1993 г. – дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіям. У 1994-95 гг. праведзена праца па фарміраванні нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі і атэстацыі навукова-педагагічных кадраў. У 1994 г. створана Вышэйшая атэстацыйная камісія (ВАК) Рэспублікі Беларусь, рэарганізаваны і адчынены саветы па абароне кандыдатскіх і доктарскіх дысертацый.

У 1993 г. Вярхоўным Саветам Рэспублікі прыняты закон “Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі”, згодна з якім адказнасць за развіццё фундаментальных навуковых даследаванняў у рэспубліцы ўскладзена на АН Беларусі. Адбылася структурная рэарганізацыя Акадэміі навук, пачалі дзейнічаць новыя навуковыя ўстановы. У 1992 г. была створана Акадэмія аграрных навук Рэспублікі (з 2002 г. у складзе Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі). На 1.01.2005 г. у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі працавала 15957 чал., навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі займаліся 6259 навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку 586 дактароў і 2046 кандыдатаў навук. Персанальны склад Акадэміі: 93 акадэміка, 128 членаў – карэспандэнтаў, 3 ганаровыя і 15 замежных членаў. Узначальвалі Нацыянальную акадэмію ў суверэннай Беларусі акадэмікі В.П. Платонаў (з 1987 па 1992 гг.), Л.М. Сушчэня (1992–1997), А.П.Вайтовіч (1997-2001), М.У. Мясніковіч з 2001 па 2010 г.**,** з 2011 па 2012 – А.М. Русецкі, з кастрычніка 2013 г. – В.Р. Гусакоў.

У 2002 г.быў падняты статус і пашыраны функцыі Савета па каардынацыі фундаментальных даследаванняў , ён атрымаў назву – Савет па каардынацыі фундаментальных і прыкладных даследаванняў.

Стратэгічнай мэтай Нацыянальнай акадэміі з’яўлялася стварэнне спрыяльнага асяродку для развіцця высокіх тэхналогій, якія могуць забяспечваць паскоранае развіццё эканомікі рэспублікі, рост канкурэнтназдольнасці прадукцыі, павышэння якасці жыцця насельніцтва.

Ад навуковых даследаванняў у асобных галінах вытворчасці краіна дабілася станоўчых вынікаў. Гэта назіраецца ў такой важнай галіне эканомікі, як сельская гаспадарка. Вырасла ўраджайнасць амаль усіх сельскагаспадарчых культур, прадукцыйнасць у жывёлаводстве. Удалося стварыць шэраг сучасных машын і агрэгатаў для механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці.



Рэпазіторый ВДУ

Важкі ўклад у навуковыя даследаванні ўносілі вышэйшыя навучальныя ўстановы. У пачатку XXI ст. вучоныя ВНУ удзельнічалі ў 45 з 48 праграм, уключаных у лік дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў. Калектывы навучальных устаноў стварылі свае кафедры на прадпрыемствах, дзе на дагаварной аснове вядуць навукова-тэхнічныя распрацоўкі, укараняюць іх у вытворчы працэс.

Установы Міністэрства адукацыі ўдзельнічаюць у праектах міжнародных фондаў, падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, метадычных указанняў, якія ўкараняюцца ў вучэбны і выхаваўчы працэс.

На буйных прадпрыемствах краіны (ВА Мінскі трактарны завод, БелАЗ, БелАўтаМАЗ, Мінскі завод калёсных цягачоў, "Беларускі металургічны завод" і інш. ) склаліся фірменныя навуковыя калектывы, якія ў сваім складзе маюць даследчыя лабараторыі, што дазваляе ўдасканальваць тэхніка-эксплуатацыйныя характырыстыкі выпускаемай прадукцыі ў самыя кароткія тэрміны.

Калектывы ВНУ пашыраюць міжнародныя сувязі. Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава падпісаў пагадненне і вядзе супрацоўніцтва з Наўгародскім дзяржаўным універсітэтам імя Яраслава Мудрага, Расійскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя А. Герцэна, Фондовым універсітэтам горада Хільдесхама (ФРГ), універсітэтам у Зялёнай Гуры, універсітэтам у Беластоку (Польшча).

Але неабходна адзначыць, што стратэгія інавацыйнага развіцця адукацыі, навукі ў рэспубліцы мела сур'ёзныя недахопы. Навукова – тэхнічная палітыка суверэннай дзяржавы ва ўмовах фарміравання і функцыявання рынку на этапе 1991–2015-х гг. не змагла забяспечыць у поўнай меры выхад гаспадарчага комплексу краіны на якасна новы ўзровень. Рэспубліка не дабілася ў гэты час рашучых зрухаў у дзейнасці навуковых кадраў і інтэнсіфікацыі вытворчасці за кошт навукова-тэхнічных мерапрыемстваў.

З разбурэннем саюзных гаспадарчых і навуковых сувязей рэзка скарацілася фінансавая падтрымка навукі і адукацыі. Калі ў 1990 г. расходы на развіццё навуковай сферы ў БССР складала прыкладна 2,6% нацыянальнага даходу, то за апошнія 20 гадоў вылучаемыя сродкі на навуку знаходзіліся на ўзроўні не больш 1% ад валавога ўнутранага прадукта [11, с. 6]. Такі стан з'яўляецца вельмі трывожным, ён растлумачвае наша адставанне ад перадавых краін. Без фінансавага ўлівання ў адукацыю і навуку дарэмна чакаць інавацыйнага развіцця краіны і мадэрнізацыі яе эканомікі. Пры такіх адносінах не будзе станоўча вырашацца і дэмаграфічная сітуацыя. Так, вядомы расійскі дзяржаўны дзеяч і палітык, акадэмік Яўген Прымакоў, падвяргаючы крытыцы ўрад Расійскай Федэрацыі, назваў становішча з фінансаваннем навукі ў сваёй краіне крызісным. У 2013 г. дзяржаўныя і прыватныя выдаткі на навуку ў



Репозиторий ВГУ

Расіі на аднаго даследчыка складалі 39 тысяч, у той час як у Кітаі – 74 тысячы, у ЗША – 293 тысячы долараў [12, с. 79–80].

Становішча, калі з 6 тыс. вызначальных тэхналогій, якія выкарыстоўваліся ў 2011 г. у эканоміцы Рэспублікі Беларусь, 79% адносіліся да традыцыйных, 15,8% – да новых і толькі 5,2% – да высокіх, хутчэй за ўсё, хаваецца ў тых жа прычынах, што і ў Расіі – недастатковым фінансаваннем навуковых даследванняў [13, с. 67]. Прадукцыйнасць працы ў 2012 г. (тыс. дол. на чалавека) у Беларусі ў сярэднім па эканоміцы была толькі каля 14 тыс., у той час як у ЗША яна раўнялася 105,7 тыс. дол., у Германіі – 81,2 тыс., у Нарвегіі 192,8 тыс. дол. [14, с. 3].

Сур'ёзнае адставанне ад вядучых краін у гэтым найважнейшым паказчыку, які найбольш поўна характарызуе эфектыўнасць вытворчасці, пацвярджае, што сёння эканоміка Беларусі мае вострую патрэбу ў высокай кваліфікацыі спецыялістаў тэхнічных спецыяльнасцяў, здольных распрацоўваць і ўкараняць у вытворчасць новыя высокія тэхналогіі. Пэўныя меры дзяржава павінна прыняць пры вызначэнні аплаты працы работнікаў навукі і адукацыі. Яе ўзровень на этапе 1991–2015-х гг. значна адставаў ад сярэдняга заробку работнікаў галін прамысловасці [15, с. 2]. Такое становішча прыводзіла да так званай “унутранай уцечкі розуму”, калі вучоныя,таленавітыя настаўнікі пераходзілі у іншыя сферы дзейнасці, ці з’язджалі за мяжу.

Змены ў сацыяльна –эканамічным і грамадска –палітычным жыцці Беларусі знайшлі сваё адлюстраванне ў распрацаванай праграме развіцця ўсіх форм нацыянальнай культуры. У 1994 г. у Саюзе пісьменнікаў Беларусі састаяла 454 пісьменнікі. Адкрыта заяўленая пазіцыя, высокае гуманістычнае гучанне характэрна для шматлікіх твораў В. Быкава, І. Шамякіна, Н. Гілевіча, Я. Брыля, А. Дударава, С. Грахоўскага, Ф. Аляхновіча. Значнае месца сталі займаць асабістыя думкі творцаў, на паверхню выйшлі раней забароненыя працы А. Гаруна, М. Гарэцкага, У. Дубоўкі, В. Ластоўскага і працы беларускіх літаратараў замежжа.

Плённа працавалі беларускія пісьменнікі М. Лужанін, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, А. Лойка, Ю. Свірка. У апошнія гады ў Беларусі з’явілася шмат новых імён. Свае першыя кнігі надрукавалі А. Наварыч, А. Казлоў, А. Федарэнка, браты Дэбішы. Паэтычны зборнік “Люстэрка для самотнай” падрыхтавала Р. Баравікова.

Як бачна за апошнія гады пісьменнікі і паэты стварылі творы высокага літаратурнага ўзроўню. За мяжой былі перакладзены і выдадзены творы вядучых пісьменнікаў Беларусі. У той жа час нельга не заўважыць, што творчасць пісьменнікаў у асноўным асвятляе больш мінулае, праблемы ж сённяшняга дня застаюцца пакуль па- за межамі іх раскрыцця.

З набыццём незалежнасці з’явілася шмат гістарычных работ з новым падыходам. Складанасці гістарычнага шляху краіны агучылі М. Касцюк**,**



Репозиторий ВГУ

А. Каваленя, П. Брыгадзін, У. Арлоў, Л. Лыч, І. Саракавік, П. Петрыкаў, А. Літвін, Я. Новік, іншыя навукоўцы.

Важную ролю ў павышэнні ўзроўню адукацыі і культуры беларускага грамадства адыгрываў у гэты час друк. У пачатку 90-х гг. у рэспубліцы дзейнічала 11 дзяржаўных выдавецтваў. Адкрылі сваю дзейнасць прыватныя выдавецтвы. Правы на выдавецкую дзейнасць мелі 719 фірм, малых прадпрыемстваў і асобных грамадзян. У 1996 г. у Беларусі было выдадзена 3809 кніг і брашур агульным тыражом 59,1 млн экзэмпляраў. У 2007 г. выданнем кніг займаліся больш за 600 суб'ектаў гаспадарання. Імі надрукавана каля 12,5 тыс. найменняў кніг тыражом 49 млн экз. [16, с. 2].

Дэмакратычныя працэсы ў грамадстве садзейнічалі актывізацыі творчасці мастакоў. Плённа працавалі мастакі М. Савіцкі, А. Анікейчык, П. Дурчына, У. Стэльмашонак, Г. Вашчанка і інш.

На Беларусі мелася 24 прафесійныя тэатры, у тым ліку 1 – оперы і балета, 15 – драмы і музычнай камедыі, 8 – дзіцячых і юнага гледача. Вядучымі тэатрамі з'яўляюцца Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа, Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі. Аснову рэпертуару беларускіх тэатраў складае драматургія беларускіх аўтараў, руская і замежная класіка. Назавём тут пастаноўку тэатра імя Я. Купалы "Князь Вітаўт" – А. Дударава, "Крык на хутары, або страсці па Аўдзею" – У. Бутрамеева, "Звон не малітва" – І. Чыгрынава, "Ідылія" – В. Дуніна – Марцінкевіча. У тэатры Я. Коласа адзначым пастаноўкі "Хам " – Э. Ажэшкі, "Залёты" – В. Дуніна-Марцінкевіча.

Адметнай вехай на шляху развіцця беларускай оперы з'явілася пастаноўка У. Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха", якая адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

Вялікая роля ў выхаванні грамадзян рэспублікі надаецца музеям і бібліятэкам. У 1993 г. быў прыняты зкон "Аб ахове гістарычна – культурнай спадчыны". Па няпоўных падліках у 2015 г. у краіне працавала больш за 150 музеяў, каля 14 тысяч публічных бібліятэк. Вядучае месца сярод музеяў займае Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі (былы дзяржаўны музей БССР). Больш за 60 гадоў функцыянуе Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (зараз размешчаны ў новым будынку).

Самым высокім патрабаванням адпавядае новая Нацыянальная бібліятэка. Унутраная планіроўка, наяўнасць неабходнай колькасці абсталявання, сучасных тэхнічных сродкаў дазваляюць на належным узроўні забяспечваць усе патрэбы наведвальнікаў.

Беларусь мае культурныя сувязі са многімі краінамі свету. Шырокае кола дзеячаў культуры з розных краін наведвае нашу краіну з гастролямі, адкрыццём персанальных выстаў, фестываляў ды іншых мерапрыемстваў, якія праводзяцца тут штогод. Творчыя калектывы, асобныя выканаўцы

Репозиторий ВГУ

рэспублікі ажыццяўляюць паездкі за мяжу, прапагандуюць беларускую нацыянальную культуру. Традыцыяй стала правядзенне музыкальных фестываляў “Музычная палессе “, “Музы Нясвіжа”, “Мінская вясна”, “Залаты шлягер у Магілёве”. Шырокае прызнанне атрымаў штогадовы “Славянскі базар у Віцебску”. Важнасць культурных сувязей з іншымі краінамі свету заключаецца ў тым, што рэспубліка ўваходзіць у сусветную супольнасць і прызнаецца ёю.

На працягу ўсіх гадоў дзяржава прыкладала вялікія намаганні па прыцягненні насельніцтва да здаровага ладу жыцця. З дзяржаўнага бюджэту штогод вылучаліся значныя сродкі на будаўніцтва і рэканструкцыю спартыўных аб'ектаў. Для прыцягнення насельніцтва да заняткаў фізічнай культурай і спортам на прадпрыемствах і ўстановах створаны клубы і калектывы фізічнай культуры, працуюць спартыўныя секцыі. У краіне функцыянуюць больш за 230 стадыёнаў, столькі ж басейнаў, каля 5 тыс. спартыўных залаў, дзясяткі тысяч адкрытых спартыўных пляцовак, 24 спартыўныя збудаванні са штучным лёдам. За апошнія гады былі ўведзены ў строй лядовыя палацы ў гарадах Жлобін, Пружаны, Мазыр, Баранавічы, Бабруйск, Пінск, Ліда, Лунінец. Паводле афіцыйных звестак Белстата, у 2010 г. амаль 16% насельніцтва краіны былі далучаныя да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам [17, с. 6]. Па многіх відах спорту зборныя каманды краіны паспяхова выступаюць на міжнародных спаборніцтвах і Алімпійскіх гульнях.

Беларусь пасля аб’яўлення аб незалежнасці, як і ў папярэдні час, характарызавалася сваёй поліканфесійнасцю. У сярэдзіне 2013 г. тут было зарэгістравана 25 рэлігійных канфесій і накірункаў. Агульны лік іх арганізацый і абшчын налічвае больш за 3 тысячы. Першае месца па колькасці абшчын і вернікаў займае Беларуская праваслаўная царква. Адміністратыўна Беларускі Экзархат падзяляецца на 11 епархій, дзейнічаюць 34 праваслаўныя манастыры, 14 брацтваў і 10 сястрыцтваў, 6 духоўных навучальных устаноў. У прыходах БПЦ працавала больш за паўтары тысячы святароў. Для веруючых адкрыта 1407 праваслаўных храмаў, яшчэ 162 узводзілася [18, с. 3].

Да ліку традыцыйных рэлігій на тэрыторыі Беларусі адносіцца і каталіцкая царква. Цяпер у 4 каталіцкіх епархіях 427 абшчын, 359 храмаў. Зарэгістраваны ў Беларусі таксама ўніяцкія абшчыны (у 2004 г. іх налічвалася 13). У 1996 г. уніяты адзначылі 400-гадовы юбілей Брэсцкай царкоўнай уніі.

Расце колькасць абшчын пратэстанцкіх плыняў, зарэгістравана 27 іудзейскіх і 23 мусульманскія абшчыны**.** Пастаянная цесная сувязь паміж свецкай дзяржавай і царквой, якая афіцыйна аддзелена ад дзяржавы, садзейнічае ўсталяванню талерантнасці, міру і ўзаемаразумення паміж вернікамі розных канфесій, а таксама палітычнай і этнаканфесійнай стабільнасці.

У заключэнні адзначым , што на завяршэнні 1990-х гг. і ў наступіўшым XXI ст., як ніколі раней у развіцці грамадства, узмацнілася роля ведаў і навукова –тэхнічнага прагрэсу. Укладанні сродкаў у адукацыю насельніцтва прызнавалася беларускім грамадствам найбольш надзейнай і выгаднай інвестыцыяй у чалавечы капітал. Адным з галоўных фактараў у гэтым працэсе была агульнаадукацыйная школа. Беларуская дзяржава вылучала на адукацыю значныя сродкі (каля 5–5,5% ВУП). У рэспубліцы развівалася сетка школ для таленавітых людзей, існавала, такой і засталася, сістэма правядзення прадметных алімпіяд, практыкуюцца новыя методыкі навучання і выхавання. Шырокая сетка ўстаноў прафесійнай адукацыі давала магчымасць весці падрыхтоўку рабочых масавых прафесій для прамысловасці, транспарту, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі.

Спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай падрыхтоўкай ажыццяўлялі коледжы і вучылішчы. Нягледзячы на негатыўныя з’явы ў дэмаграфічным становішчы, пашыралася сетка ВНУ, усё больш масавым станавілася навучанне ў вышэйшай школе. Прымаліся меры па паляпшэнні арганізацыі, каардынацыі ў дзейнасці навуковых устаноў. Але разам з гэтымі захадамі ў краіне наспявалі супярэчнасці. Недастаткова адладжанай з боку дзяржаўных органаў аказалася сістэма сацыяльнай арыентацыі моладзі, што прывяло да парушэння прапарцыянальнасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай кваліфікацыі, а таксама рабочых масавых прафесій. Не даведзенай да лагічнага завяршэння заставалася праблема аб стаўленні дзяржавы да таго сацыяльнага пласта людзей, якія займаюцца інтэлектуальнай працай. У выніку праца настаўніка, педагога сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы, без якога і гаворкі быць не можа ні пра якую культуру, абясцэньвалася, губляла свой прэстыж. Нельга не заўважыць, што змястоўныя, арыянтаваныя на развіццё творчых здольнасцей чалавека формы правядзення вольнага часу нярэдка падмяняліся пасіўнай яго тратай, шкоднымі і небяспечнымі для духоўнага і фізічнага здароўя чалавека звычкамі. Гэта ўказвае на неабходнасць тэрміновага прыняцця комплекснай дзяржаўнай праграмы развіцця культуры. Самае галоўнае, каб у дадзеных дакументах былі прапісаны механізмы вырашэння перакладу дэклараваных палажэнняў аб развіцці нацыянальнай культуры на ўзроўні патрабаванняў грамадства і дзяржавы, у плоскасць практычных дзеянняў усіх галін дзяржаўнай улады ў супрацоўніцтве з грамадскімі інстытутамі.

Паколькі эфектыўнасць культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы ў многім вызначаецца кадравым складам працаўнікоў галіны, патрабуюцца захады па сцвярджэнні сацыяльнай справядлівасці і сапраўднага аўтарытэту ў грамадстве ў адносінах да людзей, якім адводзіцца вядучая роля ў рэалізацыі прыярытэтнага напрамку ўнутранай палітыкі краіны. У гэтым кантэксце патрабуецца таксама прыняцце закона аб сацыяльным статусе выкладчыка. З надзяленнем педагога, народнага настаўніка

Репозиторий ВГУ

належным для яго статусам, узрасце эфектыўнасць нацыянальнай сістэмы адукацыі і выхавання маладога пакалення, што і стане асновай здольнай забяспечыць высокую якасць адукацыі, захаваць і прымножыць у сваіх выпускнікоў традыцыйна ўласцівыя беларускаму народу духоўныя і маральныя ідэалы.

**Спасылкі**


1.Мандрик, И.В. Актуальные проблемы белорусской экономической модели развития. / И.В. Мандрик // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М.Машерова»: сборник научных трудов. – Витебск: ВГУ имени П.М.Машерова, 2014. – Т. 17. – С. 5–16.

2. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Мн., 2009.

3. Степаненко О. Реструктуризации не избежать // Витебские вести. – 23 лют. –2014.

4. Беларускі гістарычны часопіс. – 2001. – № 6.

5. Зданович, В.М. Законодательное обеспечение высшей щколы: проблемы, перспективы // Вышэйшая школа. – 2009. – №6.

6. Мандрык, І.У. Стварэнне недзяржаўных ВНУ ў 90-х гг. ХХ ст.: станоўчыя рысы і праблемы / І.У. Мандрык //Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2010. – 255 с.

7. Лукашенко, А.Г. Завтра твоей страны / А.Г. Лукашенко // Советская Белоруссия. – 2013. – 30 окт.

8. По сообщениям пресс-службы президента Республики Беларусь // Советская Белоруссия. – 2013. –10 сент.

9. Кучерова, М. Знания стоят дорого // Советская Белоруссия. – 2013. – 28 марта.

10. Маскевич, С. Проходные баллы строят по ранжиру / С. Маскевич // Советская Белоруссия. – 2013. – 27 февр.

11. Сюльжина, А. Плоды невиданных идей/ А. Сюльжина, И. Кириленко// Советская Белоруссия. – 2013. – 10 окт.

12. Мандрык, І.У. Гістарычная абумоўленасць будаўніцтва ў Беларусі сацыяльна арыентаванай мадэлі рыначнай эканомікі: пазначаны курс, складанасці, вынікі: манаграфія/ І.У. Мандрык. – Віцебск: ВДУ імя П.М.Машэрава, 2017. – 156 с.

13. Оргиш, В.Беларусь : постиндустриальный шок неизбежен?! / В.Оргиш // Народная воля. – 2016. –29 сак.

14. Бертош, Е.В.Воздействие международного трансфера на национальную экономику: теоретический и практический аспект/ Е.В. Бертош // Весн. БДУ. Сер. 3. – 2012. – № 1.

15. Будкевич, В. Интервью с зам. Министра образования Респ. Беларусь / В. Будкевич // Беларускі час. – 2013. – 1–7 сак.

16. Літаратура і мастацтва. – 2008.– 39 лют.

17. Первый год пятилетки: основные ориентиры социально-экономического развития страны в 2011 г. – Мн., 2011.

18. Галина Улитенок. Права граждан соблюдены // Советская Белоруссия. – 2013. –18 июля.


Репозиторий ВГУ

# III. МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ПА ВЫВУЧЭННІ ПЫТАННЯЎ, ВЫЗНАЧАНЫХ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

СЕМІНАР 1. **Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1944–1955 гг.**

1. БССР пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Праблемы першых пасляваенных гадоў.

2. Аднаўленне дзейнасці арганізацый, якія ўваходзяць у палітычную сістэму грамадства

3. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі ў пасляваенны час:

а) аднаўленне прамысловасці, стварэнне новых галін;

б) аднаўленне калгасна-саўгаснай сістэмы.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** рэпарацыі, канфрантацыя палітычных сістэм, выканаўчыя органы ўлады, дзяржаўны бюджэт, прадукцыйнасць працы, заканадаўчыя органы ўлады, кантрыбуцыя, міліярацыя, мілітарызм, нейтральная дзяржава, пакт, прамысловасць лёгкая, прамысловасць цяжкая, рэформа.

**Рэферат.** Аднаўленне прамысловасці БССР ў 1944–1950 гг. (на прыкладах Віцебскай вобласці).

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэм.**

1. Ахарактарызуйце змены, якія адбыліся ў свеце пасля завяршэння Другой сусветнай вайны.

2. Прааналізуйце стан народнай гаспадаркі Беларусі пасля выгнання захопнікаў з яе тэрыторыі.

3. Якія задачы стаялі перад краінай у гады першай пасляваеннай пяцігодкі (у агульным ліку чацвёртай)?

4. Назавіце тыя галіны прамысловасці, якім аддавалася перавага ў аднаўленчым перыядзе ў Рэспубліцы і Віцебскай вобласці.

5. Пакажыце прыклады напружанай, творчай працы рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, сялян, навукоўцаў па аднаўленню галін народнай гаспадаркі, устаноў адукацыі, культуры. Адзначце ролю вераснёўскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС.

6. Прывядзіце ў якасці прыкладу фактычны матэрыял, які сведчыць аб дасягненнях Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 40 – сярэдзіне 50-х гг.

7. Якія рысы грамадска-палітычнага жыцця ў СССР сталі вядучымі ў 40-х – пачатку 50-х гадоў? 8. Вызначце ролю КПБ – КПСС у аднаўленні народнай гаспадаркі.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. – Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 280–316.



Репозиторий ВГУ

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 23–130.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык. – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 232–242.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 255–268.

5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

СЕМІНАР 2. **Аднаўленне ў галіне культуры БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**

1. Пасляваенны стан матэрыяльнай базы і кадравага складу ўстаноў народнай адукацыі.

2. Аднаўленне і развіцце агульнаадукацыйнай школы, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. Дзейнасць Акадэміі Навук БССР

3. Літаратура, мастацтва, тэатр, культурна –асветніцкія ўстановы на этапе 1944–1955-х гг.

4. Узмацненне культа асобы Сталіна, ідэалагічнае ўмяшанне ў дзейнасць творчай інтэлігенцыі

**Вядучыя (апорныя) паняцці**: культ асобы, рэпрэсіі, Галоўліт, “пакланенне і нізкапаклонства перад Захадам”, грамадскія навукі, касмапалітызм, нацыянальны фактар, прафесійныя веды, навука, літаратура, мастацтва, мастацкая самадзейнасць.

**Тэма рэферата:** Сістэма адукацыі і яе стан у Віцебскай вобласці (1945–1955 гг.).

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы**

1. Пакажыце стан адукацыйных устаноў пасля вызвалення рэспублікі і намаганні ўлад і працоўных па іх аднаўленні**.**

2. Пакажыце дасягненні беларускіх навукоўцаў у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

3 Вызначце і пакажыце асаблівасці развіцця літаратуры, мастацтва на этапе 1945–1950-х гг.

4. Назавіце праблемы пасляваеннага часу ў развіцці адукацыі, навукі, літаратуры.

**Літаратура:**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. – Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 317–341.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 141–180.

Рэпазіторый ВДУ

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) // І.У. Мандрык. – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 246–250.
4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 270–278.
5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

СЕМІНАР 3. **Эканамічныя рэформы ў прамысловасці, на транспарце і ў сельскай гаспадарцы: прычыны іх нязначных вынікаў**

1. Змест і ход укаранення эканамічных рэформ, накіраваных на павышэнне кіраўніцтва прамысловасцю і стымулявання прамысловага развіцця БССР ў 60-я – першай палове 80-х гг.

2. Аграрная палітыка дзяржавы. Вынікі эканамічных рэформ, накіраваных на пад'ём сельскай гаспадаркі.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** валюнтарызм, дэмакратызацыя, лібералізм, міліярацыя, навукова тэхнічны прагрэс, рэформа, рэвалюцыя навукова-тэхнічная, мадэрнізацыя, эвалюцыя.

**Рэферат:** Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Віцебшчыны ў 1965–1966 гг.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы**

1. У чым бачыцца вам сэнс палітычнай "адлігі"?

2. Пакажыце станоўчыя вынікі аграрнай палітыкі дзяржавы ў 1954–1959 гг.

3. Раскажыце аб сацыяльна-эканамічных рэформах другой паловы 1960-х гг. у прамысловасці рэспублікі.

4. Назавіце найбуйнейшыя новабудоўлі 60-х гг. у БССР (асобна спыніцеся на тых, што ўвайшлі ў гэты час ў дзеянне на тэрыторыі Віцебскай вобласці).

5. Прааналізуйце сацыяльна- эканамічнае развіццё рэспублікі ў гады восьмай пяцігодкі. Знайдзіце фактары эфектыўнага ўздзеяння на станоўчыя вынікі.

6. Пакажыце роль чыгуначнага транспарту ў вырашэнні буйнамаштабных дзяржаўных задач рэспублікі.

7. Патлумачце, што ўключае ў сябе галіновы комплекс з назвай "Сувязь".

8. Пакажыце станоўчыя і адмоўныя бакі ў развіцці сувязі на Беларусі ў 1970-х гг.

9. Растлумачце, якія прычыны стрымлівалі развіццё сельскагаспадарчага комплексу ў вывучаемы перыяд.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. – Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 292–316.

Репозиторий ВГУ

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. калегія. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 191–264.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) // І.У. Мандрык.– Віцебск: УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 240–242.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 273–278.

5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

СЕМІНАР 4. **Сацыяльная палітыка і культурнае жыццё ў БССР у 60-х – першай палове 80-х гг.**

1. Дэмаграфія, сацыяльная і нацыянальная структура насельніцтва Беларусі на вызначаным этапе.

2. Змены ў матэрыяльным і бытавым становішчы насельніцтва.

3. Галоўныя дасягненні і праблемы ў нацыянальна-культурнай сферы Беларусі.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** бюракратызм, дэмаграфія, быт чалавека, матэрыяльны ўзровень жыцця, сацыяльная структура насельніцтва, нацыянальная структура насельніцтва, культура.

**Рэферат:** Сацыяльная структура насельніцтва Віцебскай вобласці на прыканцы 70-х гг.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы**

1. Прасачыце змены сацыяльнай структуры ў БССР. Растлумачце іх сутнасць.

2. Пакажыце і адзначце ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва рэспублікі.

3. Прасачыце праблемы ў развіцці вытворчасці сродкаў спажывання і бытавога забеспячэння насельніцтва.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. – Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 311–316.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд.кал.: М.Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 264–308.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) // І.У. Мандрык. – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 246–253.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им.А.А.Кулешова, 2005. – С. 271–279.

5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

Рэпазіторый ВДУ

СЕМІНАР 5. **Беларускае грамадства ў часы перабудовы**

1. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, яе ўздзеянне на эканоміку, сацыяльную сферу і маральна-псіхалагічны стан насельніцтва.

2. Пошук шляхоў па ажыццяўленні кардынальных змен у эканоміцы і грамадска – палітычным жыцці. Аслабленне пазіцый КПБ-КПСС.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** галоснасць, інтэнсіўныя фактары развіцця эканомікі, мадэрнізацыя, плюралізм, перабудова, экстэнсіўныя фактары развіцця эканомікі.

**Рэферат:** Беларускае грамадства ў часы перабудовы: на прыкладзе Віцебскай вобласці (1985–1990 гг.)

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння.**

1. Ахарактарызуйце становішча ў сацыяльна-эканамічным развіцці СССР і БССР на завяршэнні 1980-х гг.

2. Якімі прычынамі абумоўлена палітыка перабудовы?

3. Пакажыце этапы ажыццяўлення палітыкі перабудовы, прамежкавыя і канчатковыя яе вынікі.

4. Пакажыце як праходзіла ўстанаўленне галоснасці ў краіне і якія змены адбыліся ў духоўным жыцці беларусаў у 1985–1990-х гг.

5. Ахарактарызуйце дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія складалі грамадска-палітычную сістэму ў СССР. Якая роль у гэтай сістэме адводзілася КПСС?

6. Чаму, на Ваш погляд, КПБ-КПСС не справілася з негатыўнай сітуацыяй, якая склалася ў краіне ў другой палове 80-х – пачатку 90-х гг.?

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. – Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 370–378.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 543–571.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык. – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 254–260.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 281–283.

5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

СЕМІНАР 6. **Беларусь ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту: пераход да рыначнай эканомікі**

1. Распад СССР, стварэнне СНД.

2. Распрацоўка праграмы пераходу да рыначных адносін. Пачатковы этап яе ўкаранення (1991–1995 гг.).

3. Негатыўныя тэндэнцыі ў гаспадарчым комплексе, сацыяльнай і дэмаграфічных сферах (1991–1995 гг.).

Рэпазіторый ВГУ

4. Прэзідэнцскія выбары 1994 г. А.Р. Лукашэнка – першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** апазіцыя парламенцкая, арэнда, дэкларацыя, дэнансацыя, канстытуцыя, падзел працы, прававая дзяржава, мецэнат, наемная праца, унітарная дзяржава, рэспубліка, шматпартыйная палітычная сістэма.

**Рэферат:** Этапы пераходу БССР да суверэнітэту і незалежнасці.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы**

1. Прааналізуйце ход выбараў першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
2. Пакажыце асноўныя напрамкі і сутнасць выбарчай праграмы А.Р. Лукашэнкі ў 1994 г.
3. Пакажыце ход і этапы фарміравання прэзідэнцскай палітычнай сістэмы.
4. Пералічыце асноўныя дакументы, якія надаюць Рэспубліцы Беларусь дзяржаўны суверэнітэт, указваюць на яе палітычную і эканамічную самастойнасць.
5. Назавіце прыкметы дзяржаўнага суверэнітэту краіны.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. – Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 378–394.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т.5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 587–622.
3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык. – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. –261–263.
4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 284–294.
5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

СЕМІНАР 7. **Рэспубліка Беларусь – сацыяльна арыентаваная дзяржава**

1. Прыняцце рэспублікай новай назвы, сімволікі, падрыхтоўка і зацверджанне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
2. Пераход Рэспублікі Беларусь да рэгулюемай рыначнай эканомікі.
3. Прамысловасць, сельская гаспадарка рэспублікі ў 1996–2015-х гг.
4. Развіццё адукацыі, навукі, культуры (1991–2015 гг.).

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** апазіцыя парламенцская, мецэнат, наёмная праца, сацыяльна-арыянтаваная дзяржава, ідэалогія, канстытуцыя, прэзідэнцская рэспубліка, права, рэферэндум, федэралізм, культура.

**Рэферат.** Эканамічныя сувязі прамысловых прадпрыемстваў Віцебскай вобласці з расійскімі рэгіёнамі (2005–2010 гг.)

Репозиторий ВГУ

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы**:

1. Пакажыце працэс афармлення і канстытуцыйнага ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

2. Ахарактарызуйце этапы фарміравання суверэннай беларускай дзяржаўнасці і дайце ацэнку дадзенаму працэсу, як якасна новаму этапу айчыннай гісторыі.

3. Назавіце гістарычную абумоўленасць пабудовы ў Беларусі сацыяльнай дзяржавы.

4. Прасачыце эвалюцыю форм дзяржаўнага кіравання ў Рэспубліцы Беларусь.

5. Пакажыце змест і сутнасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

6. Адзначце сучасныя дасягненні духоўнай культуры Рэспублікі Беларусь ва ўзаемасувязі з культурна–гістарычнай спадчынай беларускага народа.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. Ч. 2 / пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 401–434.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 5. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн.: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – С. 653–663.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык. – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 261–267.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. – Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 295–296.

5. Іншая літаратура па тэме вызначаецца ў час лекцыі і напярэдадні семінарскіх заняткаў.

Репозиторий ВГУ

# IV. Д А Д А Т К І

ДАДАТАК 1

**План-каляндар самастойнай працы студэнтаў (4 курс)***

1. Падрыхтоўка рэфератаў студэнтамі па выбранай тэме (на працягу семестра).

2. Кансультацыі падчас падрыхтоўкі рэфератаў (на працягу семестра па вызначаным графіку).

3. Кансультацыі і праверка хода падрыхтоўкі рэфератаў (на працягу семестра).

4. Напісанне кантрольнай работы па тэме: "БССР у другой палове 50–60-х гадоў" (лістапад 2018 г.)

5. Напісанне кантрольнай работы па тэме:"Беларускае грамадства ў часы перабудовы" (студзень 2019 г.).

6. Напісанне эсэ на тэму, вызначаную прафесарам(на працягу семестра).

7. Засваенне студэнтамі апорных (вядучых) паняццяў (кантроль за якасцю засваення ажыццяўляецца прафесарам на працягу семестра на практычных занятках і калёквіумах).

8. Выкананне навукова-даследчых работ (згодна з асабістымі схільнасцямі студэнтаў). Тэматыка выбраных кірункаў даследавання вызначаецца на другім тыдні семестра).

9. Удзел студэнтаў у навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца на факультэце, у ВНУ(кастрычнік 2018 г. – сакавік 2019г.).

10. Індывідуальнае суразмоўніцтва па пройдзеным матэрыяле, адпрацоўка нізкіх адзнак, прапушчаных лекцый і семінарскіх заняткаў (згодна з абставінамі на працягу семестра).

11. Тэсціраванне па модулях (снежань 2018, студзень2019 г.)

* На працягу семестра ў план самастойнай работы могуць быць унесены нязначныя змены.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТАК 2

**Кантрольныя пытанні да экзамену**

1. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943–1944 гг. Правядзенне аднаўленчых работ на вызваленай тэрыторыі.
2. БССР пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Праблемы першых пасляваенных гадоў.
3. Новая растаноўка палітычных сіл у свеце і Беларусь пасля Другой сусветнай вайны.
4. Разгортванне дзейнасці партыйных, савецкіх органаў, грамадскіх арганізацый.
5. Ліквідацыя антысавецкага падполля на тэрыторыі Беларусі.
6. Аднаўленне і развіццё прамысловасці, транспарту і камунальнай гаспадаркі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945–1955 гг.). Пачатак стварэння новай структуры прамысловасці.
7. Аднаўленне сельскай гаспадаркі ў пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945–1955 гг.). Спробы пераадолення крызісных з'яў у сельскай гаспадарцы.
8. Матэрыяльнае і бытавое становішча насельніцтва Беларусі ў пасляваенныя гады (1945–1955 гг.).
9. Падрыхтоўка і правядзенне калектывізацыі заходнебеларускай вёскі.
10. Супярэчнасці грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі ў 1945–1955 гг. Першыя спробы дэмакратызацыі пасля смерці Сталіна.
11. Аднаўленне сістэмы адукацыі ў 1945–1955 гг. Адкрыццё новых навучальных устаноў.
12. Аднаўленне навуковых устаноў, дзейнасць Акадэміі навук БССР, развіццё навуковых даследаванняў у 1945–1955 гг. Ідэалагічны і адміністрацыйны ўціск у адукацыі і навуцы.
13. Літаратура і мастацтва ў пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945–1955 гг.). Ідэалагічнае ўмяшанне ў дзейнасць творчай інтэлігенцыі.
14. Выхад БССР на міжнародную арэну. Дзейнасць рэспублікі ў міжнародных арганізацыях, міжнародныя сувязі.
15. Пачатак разгортвання сусветнай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Капітальнае будаўніцтва і тэхнічнае пераўзбраенне прамысловасці, транспарту, сувязі ў другой палове 1950-х – пачатку 1960-х гг. Асаблівасці прамысловага развіцця БССР. Прычыны пагаршэння эканамічнай сітуацыі.
16. Дэмаграфічная сітуацыя, змяненні ў сацыяльнай і нацыянальнай структуры беларускага грамадства ў 50–60-я гг.
17. Прамысловасць БССР у 1965–1984 гг. Гаспадарчая рэформа 1965 г. і яе вынікі. Стварэнне ў рэспубліцы новых галін прамысловасці, буйных вытворчых комплексаў і прамысловых аб'яднанняў. Прычыны зніжэння тэмпаў прамысловай вытворчасці на рубяжы 1970–1980-х гг.

Репозиторий ВГУ

18. Становішча ў сельскай гаспадарцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. Пошукі шляхоў выхаду з крызісу.
19. Ажыццяўленне эканамічнай рэформы 1965 г. у сельскай гаспадарцы. Індустрыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1970-я гг. Паглыбленне спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскай гаспадаркі.
20. Харчовая праграма і яе вынікі. Развіццё сельскай гаспадаркі рэспублікі ў 1980-я гг.
21. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1950–1980-я гг. Эвалюцыя і стагнацыя партыйна-савецкай сістэмы кіравання.
22. Матэрыяльнае становішча насельніцтва БССР у 1955–1960-я гг.
23. Адукацыя і навука ў сярэдзіне 1950 – сярэдзіне 1980-х гг.
24. Галоўныя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры ў сярэдзіне 1950-х – сярэдзіне 1980-х гг.
25. Архітэктура і выяўленчае мастацтва, музыка, тэатр і кіно ў сярэдзіне 1950-х – сярэдзіне 1980-х гг. Абмежаванасць нацыянальна-культурнага жыцця ў Беларусі.
26. Жыццёвы ўзровень народа ў 70–80-я гг. Заработная плата. Грамадскія фонды спажывання.
27. Сацыяльна-эканамічны крызіс другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гг. Пошукі шляхоў рэфармавання эканомікі. Праблемы пераходу да рынačных адносін.
28. БССР у другой палове 1980-х гг. Палітыка "перабудовы" і асаблівасці яе правядзення ў БССР. Новыя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі ў другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг. Крызіс аднапартыйнай сістэмы. Стварэнне новых палітычных партый і рухаў.
29. бвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь (1990–1995 гг.).
30. Асаблівасці і цяжкасці ажыццяўлення эканамічнай рэформы, пераход да рыначных адносін.
31. Распад СССР, стварэнне СНД. Уплыў гэтых працэсаў на эканамічнае і сацыяльнае жыццё Беларусі.
32. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Станаўленне прэзідэнцкай палітычнай сістэмы. Новая рэдакцыя Канстытуцыі (1996 г.)
33. Распрацоўка і прыняцце праграмы па вывадзе эканомікі Рэспублікі Беларусь з крызісу пасля абрання А.Р. Лукашэнкі Прэзідэнтам у 1994 г.
34. Прэзідэнцкія выбары 1994 г. А.Р. Лукашэнка – першы Прэзідэнт РБ.
35. Пераадоленне крызісных тэндэнцый у эканоміцы ў другой палове 90-х гг. Рэалізацыя канцэпцыі "Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг."
36. Беларускі варыянт сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі: сутнасць, станаўленне, вынікі.
37. Развіццё інтэграцыйных працэсаў Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй і іншымі краінамі СНД.

Репозиторий ВГУ

38. Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст.
39. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь у другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст.
40. Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.
41. Развіццё культуры і навукі ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1980-х гг. – пачатку XXI ст. Дасягненні і супярэчнасці нацыянальна-культурнага адраджэння.
42. Этапы фарміравання беларускай дыяспары. Асноўныя цэнтры беларускай эміграцыі, іх дзейнасць. Уклад беларусаў замежжа ў сусветную навуку і культуру. Узаемаадносіны беларускай дзяржавы з беларусамі свету.

ДАДАТАК 3

## Тэставыя заданні па тэме “Беларусь у пасляваенны час (1945–2015 гг.)”

**1. БССР падпісала статут ААН у:**
a) 1944 г.;
b) 1945 г.;
c) 1948 г.;
d) 1955 г.

**2. Савет эканамічнай узаемадапамогі быў зацверджаны у:**
a) 1947г.;
b) 1949г.;
c) 1951г.;
d) 1953г.

**3. “План Маршала” – гэта:**
a) праграма мірнага суіснавання паміж дзяржавамі;
b) праграма аднаўлення і развіцця Еўропы;
c) праграма разбраення;
d) праграма нарошчвання ваеннага патэнцыялу.

**4. Рэнтабельнай сельская гаспадарка пасля вайны стала:**
a) у сярэдзіне 50-х гг.;
b) у сярэдзіне 60-х гг.;
c) у сярэдзіне 70-х гг.;
d) у сярэдзіне 80-х гг.

**5. Апераджальнымі тэмпамі ў БССР у пасляваенны час расла:**
a) лёгкая прамысловасць;
b) цяжкая прамысловасць;
c) сельскагаспадарчая вытворчасць;
d) вытворчасць тавараў народнага спажывання.

Рэпазіторый ВГУ

**6. Сістэма сацыялізму ў свеце склалася ў:**

a) 20-я гг. ХХ ст.;
b) 30-я гг. ХХ ст.;
c) 40-50-я гг. ХХ ст.;
d) 60-я гг. ХХ ст.

**7. Галіны прамысловасці, якія пачалі развівацца ў БССР у першыя пасляваенныя гады:**

a) хімічная і нафтахімічная;
b) аўтамабіле- і трактарабудаванне;
c) электратэхнічная;
d) лесаперапрацоўчая і гарбарная.

**8. Адзіная форма гаспадарання на зямлі, якая існавала ў БССР у пасляваенны час:**

a) сельская абшчына;
b) хутарская гаспадарка;
c) калгасная сістэма;
d) фермерская гаспадарка.

**9. Прыняцце БССР у лік краін-заснавальніц ААН перш за ўсё засведчыла прызнанне:**

a) БССР як рэспублікі ў складзе СССР;
b) БССР як суверэннай, незалежнай дзяржавы;
c) вялікага ўкладу БССР у разгром фашызму, панесеных людскіх ахвяр і матэрыяльных страт;
d) перадачы Польшчы шэрагу раёнаў Беласточчыны.

**10. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) І. Шамякін | 1) “Глыбокая плынь” |
| b) А. Куляшоў | 2) “Сцяг брыгады” |
| c) К. Чорны | 3) “Млечны шлях” |
| d) І. Мележ | 4) “Мінскі напрамак” |

**11. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) Я. Цікоцкі | 1) “Алеся” |
| b) К. Крапіва | 2) “Мілы чалавек” |
| c) С. Станюта | 3) “Паўлінка” |
| d) А. Багатыроў | 4) “Надзея Дурава” |

**12. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) фабрыкаванне справы СВБ | 1 |
| b) узвядзенне Манумента Перамогі ў Мінску | 4 |
| c) адмена картачнай сістэмы забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання | 2 |
| d) пачатак выпуску прадукцыі МТЗ | 3 |

**13. Інтэнсіўны шлях развіцця гаспадаркі звязаны з:**

a) ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў;
b) павелічэннем колькасных паказчыкаў вытворчасці;
c) памяншэннем прадукцыйнасці працы;
d) захаваннем энергазатрат на адзінку вытворчасці.

Репозиторий ВГУ

**14. Будаўніцтва Салігорска, Наваполацка, Светлагорска сведчыла аб працэсе:**

a) інтэнсіфікацыі;
b) спецыялізацыі;
c) экстэнсіфікацыі;
d) урбанізацыі.

**15. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) “абаронка” | 1) ваенны-прамысловы комплекс |
| b) хімізацыя | 2) унясенне ў глебу штучных угнаенняў |
| c) “адкормачны цэх” | 3) мясная і малочная жывёлагадоўля |
| d) “хрушчоўка” | 4) кватэра ў панэльным доме |

**16. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) пачатак стварэння аграпрамысловага комплексу | 4 |
| b) увядзенне пашпартоў для калгаснікаў | 2 |
| c) увядзенне пашпартнай сістэмы ў СССР | 1 |
| d) пачатак правядзення так званай касыгінскай рэформы | 3 |

**17. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) пачатак стварэння ў БССР буйных жывёлагадоўчых комплексаў | 3 |
| b) увядзенне саўнаргасаў | 2 |
| c) выпуск першых у БССР самазвалаў | 1 |
| d) прыняцце ў СССР “Харчовай праграмы” | 4 |

**18. Пасаду першага сакратара ЦК КПБ з 1956 г. займаў:**

a) К. Мазураў;
b) М. Патолічаў;
c) Ц. Кісялёў;
d) П.Машэраў.

**19. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) “брэжнеўскі застой” | 4 |
| b) “хрушчоўская адліга” | 3 |
| c) Беларусізацыя | 1 |
| d) Сталіншчына | 2 |

**20. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) прыняцце “Канстытуцыі развітога сацыялізму” | 4 |
| b) прыняцце праграмы будаўніцтва камунізму ў СССР | 2 |
| c) правядзенне XX з’езду КПСС | 1 |
| d) пачатак дзейнасці П.М. Машэрава на пасадзе Першага сакратара ЦК КПБ | 3 |

**21. Кінарэжысёр, які экранізаваў раманы “Людзі на балоце”, “Подых навальніцы”:**

a) Б. Сцяпанаў;
b) Ю. Тарыч;
c) У. Корш-Саблін;
d) В. Тураў.

**22.С кульптар, адзін з аўтараў помніка Якубу Коласу на аднайменнай плошчы ў Мінску:**

a) А.Глебаў;

Репозиторий ВГУ

b) А.Анікейчык;
c) З.Азгур;
d) С.Селіханаў.

**23. Аповесць У. Караткевіча:**

a) “Дзікае паляванне караля Стаха”;
b) “Кар’ер”
c) “Сэрца на далоні”;
d) “Глыбокая плынь”.

**24. Навучальныя установы, навучанне ў якіх было арыентавана на падрыхтоўку рабочых:**

a) тэхнікумы;
b) інстытуты;
c) прафесійна-тэхнічныя вучылішчы;
d) ліцэі.

**25. Дзяржаўнай мовай у сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 80-х гг. у БССР з’яўлялася:**

a) руская;
b) беларуская;
c) руская і беларуская;
d) беларуская і польская.

**26. Метад сацыялістычнага рэалізму ў першую чаргу патрабаваў:**

a) паказу пачуццяў чалавека, звязаных з яго асабістым жыццём;
b) усебаковага адлюстравання асаблівасцей нацыянальна-культурнага жыцця;
c) асэнсавання рэалій жыцця, звязаных з сацыялістычным будаўніцтвам;
d) асвятлення ўсёй праўды аб мінулай вайне.

**27. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) “Альпійская балада” | 1) В. Быкаў |
| b) “Птушкі і гнёзды” | 2) Я. Брыль |
| c) “Людзі на балоце” | 3) І. Мележ |
| d) “Сэрца на далоні” | 4) І. Шамякін |

**28. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) “Знак бяды” | 1) В. Быкаў |
| b) “Хатынская аповесць” | 2) А. Адамовіч |
| c) “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” | 3) У. Караткевіч |
| d) “Калючая ружа” | 4) Ю. Семяняка |

**29. Прыняцце рэспубліканскай праграмы “Інтэнсіфікацыя” азначала магчымасць дасягнення росту вытворчасці за кошт:**

a) павелічэння колькасці працоўных, прадпрыемстваў, фінансавых сродкаў;
b) павелічэння прадукцыйнасці працы і паляпшэння якасці прадукцыі;
c) поўнай адмовы ад дзярэжаўнага фінансавання;
d) раздзяржаўленне эканомікі.

**30. Прыватызацыя – гэта:**

a) метад планавага цэнтралізаванага вядзення гаспадаркі;
b) перадача ці продаж у прыватную ўласнасць часткі дзяржаўнай маёмасці;
c) узмацненне кантролю з боку дзяржавы за якасцю выробленай прадукцыі;
d) пераход прадпрыемстваў да самафінансавання.

Репозиторий ВГУ

**31. “Курс XX з’езда” пачаў ажыццяўляцца з:**
a) 1953 г.;
b) 1956 г.;
c) 1961 г.;
d) 1965 г.

**32. Праявай палітычнага валюнтарызму з’яўляецца:**
a) улік важнейшых заканамернасцей у грамадска-палітычным жыцці;
b) пераадоленне і крытыка культу асобы;
c) ігнараванне аб’ектыўных законаў грамадскага развіцця і ператварэнне ролі кіруючай асобы ў вызваленчую;
d) выкананне прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму.

**33. Тэрмін, які сведчыць аб працэсе адноснай дэмакратызацыі грамадства:**
a) культ асобы;
b) рэпрэсіі;
c) рэабілітацыя;
d) таталітарны палітычны рэжым.

**34. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) “адліга” | 1) палітычны валюнтарызм |
| b) “сталіншчына” | 2) таталітарызм |
| c) дэмакратызацыя | 3) шматпартыйнасць |
| d) “застой” | 4) кансерватызм |

**35. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) І. Сталін | 1) таталітарызм |
| b) Л. Брэжнеў | 2) стагнацыя |
| c) К. Мазураў | 3) палітыка “адлігі” |
| d) А. Чарвякоў | 4) рэабілетацыя |

**36. “Адліга” у палітычным жыцці БССР наступіла ў:**
a) 1952 г.;
b) 1953 г.;
c) 1954 г.;
d) 1955 г.

**37. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі быўзроблены у:**
a) 1964 г.;
b) 1965 г.;
c) 1966 г.;
d) 1963 г.

**38. Рэарганізацыя кіравання прамаслывасцю (пераход да саўнаргасаў) адбылася ў:**
a) 1954 г.;
b) 1956 г.;
c) 1957 г.;
d) 1958 г.

**39. Рэарганізацыя сістэмы кіравання народна-гаспадарчым комплексам у 1957 г. заключалася ў пераходзе да:**
a) галіновага прынцыпу;
b) тэрытарыяльнага прынцыпу;

Репозиторий ВГУ

c) абласнога прынцыпу;
d) аўтаномнага прынцыпу.

**40. Галоўным напрамкам рэформы 1965г. было:**

a) падбор і растаноўка кіруючых кадраў;
b) паляпшэнне работы ВНУ;
c) узмацненне эканамічных метадаў кіравання;
d) умацаванне матэрыяльнай базы культурных устаноў.

**41. На XXII з'ездзе КПСС была прынята праграма:**

a) калектывізацыі;
b) індустрыялізацыі;
c) сацыялізму;
d) будаўніцтва камунізму.

**42. М.У. Гусараў, М.С. Патолічаў, К.Т. Мазураў – гэта:**

a) кіраўнікі Міністэрстваў і ведамстваў;
b) дэпутаты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў;
c) першыя сакратары ЦК КПБ;
d) прадстаўнікі ААН.

**43. Гаспадарчая рэформа А. Касыгіна пачалася ў:**

a) 1963 г.;
b) 1965 г.;
c) 1966 г.;
d) 1967 г.

**44. Званне "Горад-герой" Мінск атрымаў у:**

a) 1968 г.;
b) 1974 г.;
c) 1978 г.;
d) 1980 г.

**45. З 1965 г. па 1980 г. Кампартыю Беларусі ўзначальваў:**

a) П.М. Машэраў;
b) К.Т. Мазураў;
c) П.К. Панамарэнка;
d) В.Ф. Купрэвіч.

**46. Аднаўленне добрага імя і правоў рэпрэсаваных – гэта:**

a) рэпатрыяцыя;
b) рэабілітацыя;
c) ратыфікацыя;
d) рэпарацыя.

**47. Аўтарам раманаў "Каласы пад сярпом тваім", "Чорны замак Альшанскі" з'яўляецца:**

a) Я. Брыль;
b) І. Шамякін;
c) А. Маўзон;
d) У. Караткевіч.

**48. Вядучым відам транспарту ў БССР у 70–80-х гг. з'яўляўся:**

a) аўтамабільны;
b) чыгуначны;

Репозиторий ВГУ

c) паветраны;
d) трубаправодны.

**49. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС адбылася 26 красавіка:**

a) 1980 г.;
b) 1982 г.;
c) 1986 г.;
d) 1988 г.

**50. Палітыка перабудовы бярэ пачатак ў:**

a) 1981 г.;
b) 1984 г.;
c) 1985 г.;
d) 1986 г.

**51. Ініцыятарам палітыкі перабудовы стаў генеральны сакратар ЦК КПСС:**

a) М.С. Хрушчоў;
b) Л.І. Брэжнеў;
c) Ю.У. Андропаў;
d) М.С. Гарбачоў.

**52. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР набыла статус канстытуцыйнага закона:**

a) 27 ліпеня 1990 г.;
b) 25 жніўня 1991 г.;
c) 15 сакавіка 1994 г.;
d) 10 ліпеня 1994 г.

**53. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынята:**

a) 27 ліпеня 1990 г.;
b) 19 верасня 1991 г.;
c) 15 сакавіка 1994 г.;
d) 10 ліпеня 1994 г.

**54. Новая назва дзяржавы – "Рэспубліка Беларусь" і новая дзяржаўная сімволіка былі зацверджаны:**

a) 27 ліпеня 1990 г.;
b) 19 верасня 1991 г.;
c) 15 сакавіка 1994 г.;
d) 10 ліпеня 1994 г.

**55. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята:**

a) 27 ліпеня 1990 г.;
b) 19 верасня 1991 г.;
c) 15 сакавіка 1994 г.;
d) 10 ліпеня 1994 г.

**56. А.Р.Лукашэнка ўпершыню быў абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у:**

a) снежні 1991 г.;
b) лістападзе 1993 г.;
c) маі 1994 г.;
d) ліпені 1994г.

Репозиторий ВГУ

**57. Дагавор аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі быў падпісаны:**

a) 2 красавіка 1996 г.;
b) 2 красавіка 1997 г.;
c) 8 снежня 1999 г.;
d) 15 кастрычніка 2001 г.

**58. Дагавор аб старэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі быў падпісаны:**

a) 2 красавіка 1996 г.;
b) 2 красавіка 1997 г.;
c) 8 снежня 1999 г.;
d) 15 кастрычніка 2001 г.

**59. Прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца:**

a) Савет Міністраў;
b) Канстытуцыйны суд;
c) Камітэт дзяржаўнага кантролю;
d) Нацыянальны сход РБ.

**60. Ніжняй палатай беларускага парламента з'яўляецца:**

a) Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ;
b) Нацыянальны сход;
c) Вярхоўны Савет;
d) Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ.

**61. У Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ выбіраецца:**

a) 100 дэпутатаў;
b) 110 дэпутатаў;
c) 115 дэпутатаў;
d) 120 дэпутатаў.

**62. Рэферэндум, на які выносілася пытанне аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, адбыўся:**

a) 14 мая 1995 г.;
b) 24 лістапада 1996 г.;
c) 24 мая 1998 г.;
d) 17 кастрычніка 2004 г.

**63. Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь святкуецца:**

a) 15 сакавіка;
b) 25 сакавіка;
c) 3 ліпеня;
d) 27 ліпеня.

**64. Аўтарам гістарычных раманаў "Меч князя Вячкі", "След ваўкалака" з'яўлецца:**

a) М. Савіцкі;
b) Л. Дайнека;
c) М.Чаргінец;
d) Р. Барадулін.

**65. Звання "Героя Беларусі" першым быў удастоены:**

a) П. Клімук;

Репозиторий ВГУ

b) М. Чаргінец;
c) У. Карват;
d) П. Пракаповіч.

**66.У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі (пасля Рэферэндуму 18 лістапада 1996 г.) Рэспубліка Беларусь стала:**

a) парламенцскай;
b) прэзідэнцкай;
c) унітарнай;
d) дэмакратычнай.

**67. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2001–2005 гг. прынята на:**

a) I Усебеларускім з’ездзе;
b) II Усебеларускім з’ездзе;
c) III Усебеларускім з’ездзе;
d) шляхам рэферэндуму.

**68. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. прынята ў:**

a) 2002 г.;
b) 2004 г.;
c) 2005 г.;
d) 2006 г.

**69. Пастанова “Аб стварэнні ўзброеных сіл Рэспублікі Беларусь” была прынята:**

a) 15 верасня 1990 г.;
b) 20 верасня 1991 г.;
c) 25 верасня 1992 г.;
d) 27 верасня 1992 г.

**70. Эканамічнымі прыярытэтамі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 1996–2000 гг. былі названы:**

a) індустрыялізацыя, экспарт, харчаванне;
b) экспарт, жыллё, харчаванне;
c) жыллё, НТП, харчаванне;
d) харчаванне, умацаванне дэмакратыі, экспарт.

**71. Першая сесія Парламенцкага сходу Расіі і Беларусі адбылася ў:**

a) 1994 г.;
b) 1995 г.;
c) 1996 г.;
d) 1997 г.

**72. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка выступіў на спецыяльным урачыстым пасяджэнні ААН у:**

a) 1994 г.;
b) 1995 г.;
c) 1996 г.;
d) 1997 г.

Репозиторий ВГУ

**73. Пагадненне аб стварэнні Садружнасці незалежных Дзяржаў (СНД) была падпісана:**

a) 5 снежня 1991 г.;
b) 8 снежня 1991 г.;
c) 9 снежня 1991 г.;
d) 10 снежня 1991 г.

**74. У СНД у снежні 1991 г. аб'ядналіся дзяржавы:**

a) Грузія, Беларусь, Расія;
b) Беларусь, Казахстан, Расія;
c) Україна, Беларусь, Казахстан;
d) Беларусь, Расія, Україна.

**75. Каардынацыйныя органы СНД знаходзяцца ў**:

a) Маскве;
b) Алма-Аце;
c) Мінску;
d) Кіеве.

**76. Інфляцыя – гэта:**

a) выкарыстанне матэрыяльнай зацікаўленасці працоўных шляхам павелічэння заробку;
b) устанаўленне цвердага курса нацыянальных грошай у адносінах да замежнай валюты;
c) абясцэньванне грошай у выніку выпуску іх у абарот без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў;
d) увядзенне гаспадарчага разліку.

**77. Тэрмін, які сведчыць аб новых формах гаспадарання на зямлі:**

a) калгас;
b) саўгас;
c) фермерская гаспадарка;
d) закупка дзяржавай сельскагаспадарчых прадуктаў.

**78. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) Імпарт | 1) увоз тавараў |
| b) Экспарт | 2) вываз тавараў |
| c) цяжкая прамысловасць | 3) вытворчасць сродкаў вытворчасці |
| d) лёгкая прамысловасць | 4) вытворчасць прадметаў народнага спажывання |

**79. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) Белавежскае пагадненне | 1) стварэнне СНД |
| b) правядзенне рэферэндуму | 2) захаванне абноўленага СССР |
| c) працэс інтэграцыі | 3) утварэнне Саюза Беларусі і Расіі |
| d) жнівеньскі путч | 4) супрацiўленне палітыцы перабудовы |

**80. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) утварэнне мытнага саюза Беларусі і Расіі | 4 |
| b) заканчэнне 12-й пяцігодкі | 2 |
| c) распад СССР | 3 |
| d) аварыя на Чарнобыльскай АЭС | 1 |

Рэпазіторый ВГУ

**81. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

a) выбары народных дэпутатаў БССР паводле новага Закона аб выбарах 3
b) прыпыненне дзейнасці КПБ 4
c) пачатак курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і дэмакратызыцыю палітычнага жыцця ў СССР 1
d) першыя свабодныя і альтэрнатыўныя выбары народных дэпутатаў СССР 2

**82. Суверэнітэт – гэта:**

a) ажыццяўленне заканадаўчай улады толькі цэнтральнымі(вышэйшымі) органамі;
b) форма добраахвотнага саюза паміж дзяржавамі;
c) палітычная незалежнасць і самастойнасць дзяржаўнай улады, якая не дапускае замежнага ўмяшальніцтва;
d) падпарадкаванне мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання цэнтральным.

**83. Прэзідэнцкая форма рэспублікі канстытуцыйна была ўведзена ў Беларусі ў:**

a) 1990 г.;
b) 1994 г.;
c) 1995 г.;
d) 1996 г.

**84. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

a) ратыфікацыя Белавежскага пагаднення
b) дэнансацыя дагавора аб утварэнні СССР
c) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь
d) увядзенне прэзідэнцкай формы рэспублікі
e) стварэнне Саюза Беларусі і Расіі
f) абвяшчэнне Дня яднання народаў Беларусі і Расіі
g) дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце
h) абвяшчэнне Беларусі нейтральнай дзяржавай

**85. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

a) рэферэндум па пытанні аб захаванні СССР 1
b) дагавор паміж Расіяй і Беларуссю аб стварэнні Супольніцтва Суверэнных Рэспублік 4
c) дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 2
d) стварэнне Саюза Беларусі і Расіі 3

**86. Аўтар адноўленага крыжа Ефрасінні Полацкай:**

a) М. Басалыга;
b) В. Ластоўскі;
c) У. Арлоў;
d) М. Кузьміч.

**87. Аўтар оперы “Дзікае паляванне караля Стаха”:**

a) В. Скорабагатаў;
b) У. Караткевіч;
c) А. Мдзівані;
d) У. Солтан.

Репозиторий ВГУ

**88. Аўтар цыкла карцін, прысвечаных чарнобыльскай трагедыі:**

a) Л. Шчамялёў;
b) У. Стальмашонак;
c) М. Савіцкі;
d) А. Кішчанка.

**89. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) І. Шамякін | 1) “Злая зорка” |
| b) С. Алексіевіч | 2) “Цынкавыя хлопчыкі” |
| c) Р. Барадулін | 3) “Міласэрнасць плахі” |
| d) В. Быкаў | 4) “Сцюжа” |

**90. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| a) У. Бутрамееў | 1) “Казімр Лышчынскі” |
| b) І. Мысліцына | 2) “Крыж Ефрасінні Полацкай” |
| c) А. Дудараў | 3) “Князь Вітаўт” |
| d) В. Елізараў | 4) “Страсці (Рагнеда)” |

**91. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) прыняцце Закона аб адукацыі | 2 |
| b) прысуджэнне мастаку Г. Вашчанку звання “Чалавек года” | 4 |
| c) першае правядзенне Шагалаўскіх дзён у Віцебску | 3 |
| d) прыняцце Закона “Аб мовах у Беларускай ССР” | 1 |

**92. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

| | |
|---|---|
| a) Пачатак разгортвання галоснасці | 3 |
| b) Першы выхад у свет “Кароткай гісторыі Беларусі” В. Ластоўскага | 1 |
| c) Прыняцце Закона “Аб культуры ў Беларускай ССР” | 2 |
| d) Наданне рускай мове статусу дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь разам з беларускай | 4 |

ДАДАТАК 4

## Тлумачэнні асноўных (апорных) паняццяў

1. **“Абласнікі”** – прадстаўнікі беларускага нацыяльна-дэмакратычнага руху на Беларусі ў пач. XX ст., якія самавызначэнне беларускіх зямель бачылі ў якасці вобласці ў складзе Расіі.

2. **Аброк** – від сялянскай павіннасці за карыстанне зямлёй феадала. Аброк прадуктамі (дзякла) – натуральная даніна, аброк грашыма – чынш. У X–XIII стст. збор натуральнай даніны з насельніцтва называўся палюддзем.

3. **Абшчына** – устойлівая форма арганізацыі жыцця і дзейннасці людзей. Узнікла ў першабытную эпоху як родавая абшчына – арганізацыя кроўных родзічаў, якія былі звязаны агульнасцю свайго паходжання па мацярынскай або бацькоўскай лініі. У IX–XIII стст. адбываецца фарміраванне суседскай (сельскай) абшчыны, якая з'яўлялася арганізацыяй сельскага насельніцтва. Яе члены лічыліся свабоднымі людзьмі, жылі асобнымі сем’ямі, якія карысталіся асобнымі ўчасткамі зямлі (зямельнымі надзеламі) пры існаванні калектыўнага (абшчыннага) землеуладання. У славян сельская абшчына называлася «верв».

Репозиторий ВГУ

З другой паловы XII да канца XVIII ст. абшчына (грамада) аб'ядноўвала насельніцтва асобнай вёскі і была асабліва распаўсюджана ва ўсходніх раёнах Беларусі. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі ў дзяржаўных уладаннях уводзілася сістэма сельскага абшчыннага кіравання. Сялянская абшчына працягвала існаваць пасля адмены ў 1861 г. прыгоннага права. З пачатку XX ст. у ходзе Сталыпінскай аграрнай рэформы ажыццяўляўся ўказ аб выхадзе сялян з абшчыны і паступова адбываўся пераход сялян ад абшчыннага да падворнага землеўладання. У выніку суцэльнай калектывізацыі ў 30-я гг. XX ст. сялянская абшчына была ліквідавана.

4. **"Адліга" –** лібералізацыя ў грамадска-палітычным жыцці СССР пасля 1953 г.

5. **Аднапартыйная сістэма** – заканадаўчае замацаванне за адной партыяй статусу кіруючай.

6. **Адраджэнне** – назва перыяду асаблівага развіцця духоўнай культуры і росквіту мастацтваў, станаўлення навук, узнікнення кнігадрукавання ў краінах Еўропы ў XIV–XVI стст. Для характарыстыкі гэтага перыяду ў Еўропе звычайна выкарыстоўваюць назву Рэнесанс. Беларускім Адраджэннем з' яўляецца перыяд з XVI да пачатаку XVII ст., звязаны перш за ўсё з дзейнасцю Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў.

7. **Айкумена** – склад вобласцей, заселеных старажытным чалавекам.

8. **Акупацыйны рэжым –** сістэма палітычных, эканамічных, ваенных і ідэалагічных мер, накіраваных на ліквідацыю савецкага грамадска-дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, заняволенне і знішчэнне беларускага народа.

9. **Акупацыя** – захоп войскамі адной дзяржавы тэрыторыі (або часткі тэрыторыі) іншай дзяржавы з усталяваннем уласнай адміністрацыі і законаў.

10. **Амністыя** – памілаванне, дараванне віны. Напрыклад, расійскі імператар Аляксандр I дараваў магнатам і шляхце ўдзел у вайне 1812 г. на баку французскіх войскаў пры ўмове іх вяртання з-за мяжы ў двухмесячны тэрмін.

11. **Анархія** – стан бязладдзя, пры якім падзеі адбываюцца стыхійна, неарганізавана, існуе беспарадак. Палітычная анархія была характэрна ў канцы XVIII ст. для Рэчы Паспалітай у сувязі з існаваннем «залатых» шляхецкіх вольнасцей, правіла «ліберум вета» і слабасцю каралеўскай улады.

12. **Анексія** – далучэнне з дапамогай сілы або ў выніку нераўнапраўнага дагавору адной дзяржавай тэрыторыі другой дзяржавы.

13. **Антрапагенез** – працэс станаўлення чалавека.

14. **Апазіцыя парламенцкая** – група дэпутатаў, погляды якіх не супадаюць або супярэчаць думкам парламенцкай большасці ці ўладзе.

15. **Археалогія** – навука аб старажытнасцях, якая вывучае жыццё людзей па рэчавых гістарычных крыніцах.

16. **Арэнда** – часовае карыстанне маёмасцю за вызначаную плату.

17. **Асадніцтва** – засяленне былымі польскімі вайскоўцамі заходнебеларускіх зямель у час іх знаходжання ў складзе Польшчы (1921–1939).

18. **Асветнік** – дзеяч, які садзейнічае пашырэнню асветы і ведаў. У гісторыі Беларусі гэта князь-кніжнік Ізяслаў, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Ф. Скарына, В. Цяпінскі і інш.

Рэпазіторый ВДУ

19. **Асветніцтва** – перыяд пашырэння асветы, развіцця навук у Заходняй Еўропе ў XVII–XVIII стст. Сведчаннем распаўсюджвання ідэй Асветніцтва ў Беларусі была дзейнасць у 1773–1794 гг. Адукацыйнай камісіі, творчасць Сімяона Полацкага, Казіміра Лышчынскага, Ільі Капіевіча і інш. Гэта эпоха, для якой характэрна імкненне змяніць і палепшыць становішча грамадзян шляхам асветы і выхавання.

20. **Асіміляцыя** – працэс далучэння пэўных этнічных груп да асноўнага этнасу (народу). Характэрны для гісторыі амаль што ўсіх народаў, у т. л. і беларусаў. У старажытнасці асіміляцыя адбывалася ў працэсе пранікнення (рассялення) народаў на новых тэрыторыях. Напрыклад, асіміляцыя ў V–VIII стст. славянскіх і мясцовых балцкіх плямён, якая прывяла да славянізацыі (аславяньвання) некаторых балцкіх плямён.

21. **Аўтаномія** – самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады або шырокае ўнутранае самакіраванне, якое надаецца асобнай тэрыторыі ці народу, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы. Так, напрыклад, Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) у 1906 г. выступала за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі.

22. **Аўтарытарны палітычны рэжым** – рэжым, пры якім улада сканцэнтравана ў руках аднаго чалавека (лідэра) ці групы людзей (пануючай эліты) або ў выканаўчым органе, што зніжае ролю прадстаўнічых і судовых органаў і вядзе да сістэматычнага парушэння дзеючага заканадаўства, у т. л. Канстытуцыі. Тыповыя прыкметы – празмерны цэнтралізм улады, безумоўнае паслушэнства, абмежаванне дзелавой і палітычнай актыўнасці людзей. Звычайна ўсталёўваецца ва ўмовах палітычнага крызісу, дзяржаўнага перавароту або грамадзянскай вайны.

23. **Баяры** – служылыя людзі, феадалы, якія першапачаткова атрымлівалі зямлю (памесце) па месцы вайсковай службы, толькі пры ўмове яе выканання. Пачынаючы з XV ст. сталі выслужваць або выкупаць зямлю ў асабістую ўласнасць. З канца XV ст. вайскова-служылых людзей у ВКЛ сталі называць шляхтай.

24. **Беларусізацыя** – афіцыйная палітыка беларускага ўрада ў сферы нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў 1924-1929 гг.

25. **Брацтвы** – рэлігійна-палітычныя арганізацыі праваслаўнага, пераважна мяшчанскага насельніцтва ў ВКЛ, якія ўзніклі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Займаліся асветай і кнігадрукаваннем на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах, супрацьстаялі прапольска-каталіцкай палітыцы.

26. **Бронзавы век** – перыяд першабытнага ладу, на працягу якога прылады працы, вырабляемыя з бронзы, пераважалі над прыладамі з іншых матэрыялаў.

27. **«Буферная дзяржава»** – дзяржава, тэрыторыя якой выкарыстоўваецца ў якасці пагранічнай зоны паміж варагуючымі краінамі ў мэтах недапушчэння вырашэння іх канфлікту ўзброеным шляхам. Напрыклад, Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел), якая існавала ў 1919 г., разглядаецца гісторыкамі як «буферная дзяржава» паміж Савецкай Расіяй і Польшчай.

28. **«Ваенны камунізм»** – палітыка ў гады грамадзянскай вайны ў савецкай Расіі (1919–1921), звязаная з адменай прыватнага гандлю і абмежаваннем таварна-грашовых адносін, пераходам сістэмы размеркавання ў

Репозиторий ВГУ

рукі дзяржавы, увядзеннем харчразвёрсткі, нацыяналізацыяй прамысловасці, мілітарызацыяй эканомікі.

29. **Валока** – мера зямельнай плошчы, роўная 21,36 га. Уся зямля наразалася на валокі паводле аграрнай рэформы Жыгімонта II Аўгуста («Устава на валокі», 1557).

30. **Валюнтарызм** – палітычны кірунак, пры якім воля кіруючай асобы ці выканаўчых улад лічыцца вызначальнай асновай грамадскага развіцця. Валюнтарысцкай лічаць, напрыклад, палітыку масавай пасадкі кукурузы літаральна ва ўсіх раёнах Беларусі незалежна ад іх кліматычных умоў, якая праводзілася ў гады кіравання М.С. Хрушчова.

31. **Веча** – агульны сход дарослых мужчын, на якім вырашаліся найбольш важныя грамадскія і дзяржаўныя справы. Рашэнне прымалася па сіле крыку, які служыў сродкам тагачаснага галасавання. Веча існавала ў Навагрудку, Полацку, Ноўгарадзе.

32. **Волакі** – назва месца найбольшага збліжэння дзвюх суднаходных рэк Заходняй Дзвіны і Дняпра на шляху «з варагаў у грэкі», дзе па сушы валачылі (перацягвалі на катках і колах) судны або перавозілі выгружаныя з іх тавары.

33. **Вотчына** – зямельнае ўладанне, якое пераходзіла ў спадчыну ад бацькі да сына.

34. **Выканаўчы орган улады** – орган, які павінен праводзіць у жыццё выкананне законаў. Звычайна такім органам улады з'яўляецца Кабінет (Савет) Міністраў. Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе Савет Міністраў (урад). Да рэферэндума 1996г. Урад Рэспублікі Беларусь насіў назву Кабінет Міністраў.

35. **Вытворчая гаспадарка** – гаспадарка, якая забяспечвала патрэбы жыхароў дзякуючы пераважна такім заняткам, як земляробства і жывёлагадоўля, а не толькі выкарыстанню шляхам збіральніцтва і палявання таго, што было ў прыродзе.

36. **Гаспадарчы разлік** – метад гаспадарання, пры якім даходы, якія атрымлівае прадпрыемства ад рэалізацыі (продажу) сваёй прадукцыі, пакрываюць і перавышаюць яго выдаткі на вытворчасць гэтай прадукцыі.

37. **Генацыд** – дзеянні з мэтай поўнага ці частковага знішчэння той ці іншай нацыі (народа). Палітыку генацыду ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў праводзілі, у т. л. на тэрыторыі Беларусі, нямецка-фашысцкія захопнікі.

38. **Гета** – месцы пражывання яўрэйскага насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны, створаныя фашыстамі з мэтай масавага знішчэння яўрэяў, якіх яны адносілі да ніжэйшай расы.

39. **Гісторыя Беларусі** – гэта навука комплексная, інтэгральная, яна вывучае ўсю сукупнасць з'яў грамадскага жыцця на працягу ўсей гісторыі грамадства.

40. **Грамадзянская вайна** – вайна за ўладу ўнутры адной краіны паміж дзвюма палітычнымі групоўкамі. Вельмі часта набывае характар братазабойчай, бо ў ёй удзельнічаюць грамадзяне адной дзяржавы.

41. **Грамадзянская супольнасць** – тып узаемаадносін паміж дзяржавай і грамадствам, пры якім правы грамадзян абаронены законам і ўлада перадае частку сваіх функцый мясцовым органам самакіравання.

42. **Грамадска-эканамічная фармацыя** – гістарычна вызначаны тып грамадства, заснаваны на канкрэтным спосабе вытворчасці, які характэрызуецца



Рэпазіторый ВДУ

сваім эканамічным базісам, палітычнай, юрыдычнай, ідэалагічнай надстройкай, сваімі думкамі , грамадскай свядомасцю.

43. **Гулаг** – абрэвіятура (скарочаная назва) Галоўнага ўпраўлення лагерамі, якая ўжываецца як сімвалічная назва сталінскага рэпрэсіўнага рэжыму.

44. **Гуманізм** – вучэнне, якое сцвярджае высокую годнасць чалавека, прызнае яго права на зямное шчасце, свабоду чалавечай асобы, ідэалы чалавекалюбства. Рэнесансавы гуманізм узнік у эпоху Адраджэння ў XIV–XVI стст. На Беларусі дзеячам-гуманістам быў Ф. Скарына, які прапаведаваў наступны закон чалавечага жыцця: «...усё, што хочаце, каб вам рабілі людзі, дык тое рабіце вы ім».

45. **"Двоеўладдзе"** – адначасовае існаванне двух улад – Часовага ўрада (улады буржуазіі) і саветаў (улады рабочых, сялян, чырвонаармейцаў).

46. **"Двухвер'е**" – працяглы перыяд адначасовага суіснавання язычніцтва і хрысціянства;

47. **Дзяржава** – асноўная форма палітычнай сістэмы грамадства, якая арганізуе, накіроўвае і кантралюе сумесную дзей-насць і адносіны людзей, грамадскіх груп, класаў. Тэрытарыяльны, суверэнны саюз (аб'яднанне, супольнасць) грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці. Найбольш істотная прыкмета дзяржавы – наяўнасць публічнай улады, якая пашыраецца на ўсё грамадства і абапіраецца на сродкі і меры прымусу (армія, паліцыя, турма і інш.). Важным сродкам ажыццяўлення дзяржаўнай улады з'яўляецца права.

48. **Дзяржаўны бюджэт** – расклад грашовых даходаў і расходаў дзяржавы.

49. **Дружына** – княжацкае войска.

50. **Дыктатура** – неабмежаваная ніякімі законамі прымусовая ўлада адной асобы, групы людзей або партыі.

51. **Дысідэнты** – 1) тыя, хто выступае супраць афіцыйнай улады, 2) у Рэчы Паспалітай: некаталікі (праваслаўныя, уніяты).

52. **Дэкларацыя** – дзяржаўны і палітычны (канстытуцыйны) акт. Напрыклад, Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г.

53. **Дэмакратызацыя** – распаўсюджванне і замацаванне формаў дзяржаўнага ладу, заснаваных на прызнанні прынцыпу народаўладдзя, свабоды, роўнасці грамадзян.

54. **Дэнансацыя** – паведамленне адной дзяржавы другой аб скасаванні дзеяння падпісанага паміж імі дагавора.

55. **Евангелле** – агульная назва першых чатырох гістарычных кніг Новага Запавету (Бібліі) пра зямное жыццё і вучэнне Ісуса Хрыста. На Беларусі найстаражытнейшае – рукапіснае Тураўскае Евангелле (XI ст.). Першае друкаванае Евангелле на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах выдадзена В. Цяпінскім у XVI ст.

56. **Езуіты** – члены каталіцкага ордэна Таварыства Ісуса Хрыста, створанага ў XVI ст. для барацьбы з Рэфармацыяй. У ВКЛ дзейнічалі навучальныя ўстановы езуітаў – калегіумы. Рэктарам Віленскай езуіцкай акадэміі (першай вышэйшай навучальнай установы ў ВКЛ) быў езуіт П. Скарга – адзін з ініцыятараў Берасцейскай царкоўнай уніі.

Рэпазіторый ВДУ

57. **Епархія** – праваслаўная царкоўная акруга. Упершыню на тэрыторыі Беларусі заснавана ў 992 г. у Полацку. Гэтая дата лічыцца пачаткам гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі.

58. **Жалезны век** – перыяд першабытнага ладу, на працягу якога прылады працы выраблююцца з жалеза.

59. **Заканадаўчы орган улады** – орган, які распрацоўвае і прымае законы. Такім органам звычайна з'яўляецца парламент. Згодна з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г., прадстаўнічы і заканадаўчы орган у нашай рэспубліцы – Нацыянальны сход (парламент)Рэспублікі Беларусь

60. **Запрыгоньванне** – страта сялянамі права ўласнасці на зямлю і ператварэнне іх у залежных ад феадала. Афармлялася, напрыклад, у Судзебніку Казіміра 1468 г., Статутах ВКЛ. Так, у XIV–XV стст. у ВКЛ існавалі «непахожыя» сяляне, якім не дазваляўся пераход ад аднаго феадала да другога. У XVI ст. усе сяляне ператварыліся ў прыгонных, прымацаваных да зямлі, якую яны апрацоўвалі і неслі за карыстанне ёю пэўныя павіннасці перад феадаламі. Прыгоннае права было скасавана ў 1861 г. шляхам набыцця памешчыцкімі сялянамі асабістай свабоды і паступовага выкупу імі зямельных уладанняў.

61. **Заходнерусізм** – сістэма поглядаў, якая адмаўляе гістарычнасць беларусаў як самастойнага і самабытнага этнасу, атаясамлівае іх з вялікарускім этнасам. Галоўнай сваёй мэтай заходнерусізм у сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. лічыў барацьбу супраць польскага і каталіцкага ўплыву на беларусаў. З усталяваннем БССР заходнерусізм як сістэма поглядаў страціў свае пазіцыі, аднак яго ідэі засталіся ва ўсведамленні пэўнай часткі беларускага грамадства.

62. **Ідэалогія** – сістэма прававых, палітычных, маральных, філасофскіх, рэлігійных, мастацкіх поглядаў і ідэй, якія належаць асобе ці групе людзей або палітычнай партыі.

63. **Індаеўрапейцы** – шматлікія плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў, якія першапачаткова жылі ў Малой Азіі побач з Іранам. У Індыі і Іране яны называліся арыямі. Са сваёй прарадзімы яны рассяліліся на вялікай тэрыторыі Азіі і Еўропы прыкладна 3-1,5 тыс. гадоў да н.э. Пасля асіміляцыі (змяшэння) з мясцовымі плямёнамі на тэрыторыі Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі і Цэнтральнай Еўропы ўтварыліся плямёны славян, балтаў, германцаў.

64. **Індустрыялізацыя** – працэс пераходу ад ручной да машыннай працы і далейшай перабудовы вытворчасці на аснове высокапрадукцыйнай тэхнікі. У БССР праводзілася ў 1920-30-ыя гг. і была часткай адзінага працэсу індустрыялізацыі ў СССР. Асноўная ўвага надавалася развіццю лёгкай і харчовай прамысловасці, што было абумоўлена дастатковымі запасамі ў Беларусі мясцовай сыравіны, кадрамі, існуючымі традыцыямі. Ажыццяўлялася ў ходзе пяцігодак – пяцігадовых планаў развіцця народнай гаспадаркі (1928-1932, 1933-1937, 1938 – чэрвень 1941).

65. **Інтэграцыя** – працэс і вынік узаемасувязі, узаемадзеяння, збліжэння і аб'яднання ў адзінае цэлае якіх-небудзь частак, элементаў, у прыватнасці, краін і іх эканомік, сацыяльных і палітычных структур, партый, арганізацый і г. д. Аб працэсе інтэграцыі Беларусі і Расіі сведчаць утварэнне іх Саюза 2 красавіка 1997 г., падпісанне ў снежні 1999 г. Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

Рэпазіторый ВДУ

66. **Інтэнсіўныя фактары развіцця эканомікі – "**якасныя" фактары**,** якія забяспечваюць развіццё эканомікі: рост вытворчасці працы, выкарыстоўванне дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

67. **Інтэрвенцыя** – узброенае ўмяшанне адной дзяржавы ва ўнутраныя справы другой. Напрыклад, інтэрвенцыя Полыпчы супраць савецкай Расіі ў 1919–1920 гг., калі баявыя дзеянні праходзілі на тэрыторыі Беларусі (польска-савецкая вайна).

68. **Інтэррэкс** –найвышэйшая службовая пасада у Рэчы Паспалітай у бескаралеўскі перыяд, якую звычайна займаў біскуп польскага горада Гнезна.

69. **Інфляцыя** – абясцэньванне грошай у выніку выпуску іх у абарачэнне без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў. Падзенне пакупной здольнасці грошай.

70. **Кааліцыя** – аб'яднанне, саюз, пагадненне дзяржаў, палітычных партый, грамадскіх арганізацый для дасягнення агульных палітычных, ваенных, эканамічных мэт. Напрыклад, у час рэвалюцыі 1905–1907 гг. склаліся кааліцыйныя саветы, у якія ўваходзілі бальшавікі, меншавікі, эсэры, бундаўцы.

71. **Кааперацыя** – форма арганізацыі, пры якой адбываецца добраахвотнае аб'яднанне людзей для сумеснай працы, напрыклад, таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, гандлёвы кааператыў і г. д.

72. **Калабарацыянізм –** супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі.

73. **Калектывізацыя** – аб'яднанне дробных індывідуальных гаспадарак сялян у буйныя калектыўныя гаспадаркі. Суцэльная калектывізацыя ў БССР, звязаная са стварэннем калгасаў, праходзіла ў канцы 20-х – пачатку 30-х гг. ХХст., а таксама ў Заходняй Беларусі, якая ўз'ядналася з БССР у 1939 г., напярэдадні і пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны.

74. **Камінтэрн –** міжнародная арганізацыя рабочага класа, якая існавала ў 1919–1943 гг.

75. **Канстытуцыя** – Асноўны Закон дзяржавы. У Рэчы Паспалітай была прынята Канстытуцыя 3 мая 1791 г., якая абвясціла яе суверэнітэт як унітарнай дзяржавы, ліквідаваўшы падзел на Польскае каралеўства і ВКЛ. У час існавання БССР былі прыняты Канстытуцыі 1919, 1927, 1937, 1978 гг. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прынята 15 сакавіка 1994 г. На ўсенародным рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. у яе ўнесены змяненні і дапаўненні (новая рэдакцыя Канстытуцыі). Некаторыя гісторыкі адносяць да Канстытуцыі Статуты ВКЛ – звод законаў эпохі сярэдневечча, для якой яшчэ не характэрна фарміраванне канстытуцыйнага права.

76. **Кантрыбуцыя** – грошы або матэрыяльныя каштоўнасці, якія дзяржава-пераможца збірае з дзяржавы, якая панесла паражэнне ў вайне.

77. **Канфедэрацыя** – часовае аб'яднанне (ваенна-палітычны саюз) шляхты ў XVII–XVIII стст. у Рэчы Паспалітай з мэтай падтрымаць узброенай сілай тыя ці іншыя палітычныя патрабаванні. Пад канфедэрацыяй разумеецца таксама форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой некалькі дзяржаў – суб'екты канфедэрацыі, што ўтвараюць саюз, працягваюць валодаць шырокімі правамі, поўнасцю захоўваючы сваю незалежнасць, і аб'ядноўваюць свае намаганні для дасягнення пэўнай мэты. У адрозненне ад федэрацыі канфедэрацыя дзяржаў больш слабое аб'яднанне, якое ўяўляе сабой не адну новую суверэнную дзяржаву, а больш або менш устойлівую сукупнасць дзяржаў.

Рэпазіторый ВДУ

78. **Канфесія** – рэлігійны кірунак, веравызнанне (веравучэнне), прыналежнасць да пэўнай царквы. У хрысціянстве існуюць, напрыклад, каталіцкая, праваслаўная, уніяцкая канфесіі.

79. **Канфрантацыя дзвюх палітычных сістэм –** эканамічнае, палітычнае спаборніцтва дзвюх палітычных сістэм (сацыялістычнай і капіталістычнай) у другой палове 1940-1980-ыя гг.

80. **Канцэпцыі ўтварэння Вялікага княства Літоўскага** – розныя падыходы да пытання аб утварэнні ВКЛ.

81. **Касінеры** – сяляне, узброеныя косамі. Назва ўдзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі ў 1794 г., паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага ў 1863 г.

82. **Касцёл** – рымска-каталіцкі храм.

83. **Каталіцызм** – адзін з асноўных кірункаў у хрысціянстве. Аформіўся ў 1054 г. пасля падзелу хрысціянскай царквы. Каталіцкая царква мае адзіны сусветны цэнтр – Ватыкан, адзінага кіраўніка – папу рымскага. Распаўсюджванне каталіцтва на тэрыторыі Беларусі адбывалася паводле ўмоў Крэўскай уніі (пагаднення) 1385 г. На беларускіх землях пачалі ўзводзіцца касцёлы і кляштары. Каталіцызм стаў сродкам паланізацыі беларускай шляхты пасля Люблінскай уніі 1569 г. (стварэння Рэчы Паспалітай). У XVI ст. пышныя каталіцкія набажэнствы і царкоўныя традыцыі сталі аб'ектам крытыкі з боку прыхільнікаў Рэфармацыі.

84. **Класы грамадскія** – вялікія групы людзей, становішча якіх звязваюць з правам уласнасці, адносінамі да ўлады, месцам у падзеле працы. Вучэнне аб класах найбольш развіта ў марксізме.

85. **Князь** – першапачаткова правадыр племя, затым кіраўнік княства (дзяржавы).

86. **Контррэфармацыя** – грамадска-палітычны рух, накіраваны супраць зместу і вынікаў рэфармацыі.

87. **Культ асобы** – узвялічванне ролі аднаго чалавека, прыпісванне яму вызначальнага ўплыву на ход гістарычных падзей. Вядомы, напрыклад, культ асобы Сталіна.

88. **Культура –** дасягненні людзей ў матэрыяльнай і духоўнай сферах.

89. **Летапіс** – запіс падзей па гадах («летах»), пісьмовая гістарычная крыніца. Найбольш старажытны летапіс вядомы пад скарочанай назвай «Аповесць мінулых гадоў». Напісаны манахам Нестарам каля 1113 г.

90. **Лібералізм** – ідэйна-палітычнае вучэнне, якое ўзнікла ў канцы XVIII – пачатку XIX стст. Яго палітычныя і эканамічныя мэты – скасаванне феадальных парадкаў, абмежаванне манархіі, усталяванне парламенцкага ладу, ліквідацыя ці змякчэнне дзяржаўнага і грамадскага прымусу ў адносінах да асобы, абарона прыватнай уласнасці. Напрыклад, да ліберальна-буржуазнага лагера напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. належалі Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (кадэты), «Саюз 17 кастрычніка» (акцябрысты), аўтанамісты.

91. **«Ліберум вета»** – правіла, паводле якога рашэнне сойма лічылася не прынятым, калі супраць яго прагаласаваў хоць адзін дэпутат сойма. Сведчыла аб бязладдзі ў Рэчы Паспалітай у канцы XVII-XVIII стст.

92. **Мабілізацыя** – масавы набор мужчын у армію ў час вайны, чарговы прызыў на вайсковую службу юнакоў адпаведнага ўзросту.

Рэпазіторый ВГУ

93. **Магдэбургскае права** – права горада на самакіраванне, якое склалася ўпершыню ў XIII ст. у нямецкім горадзе Магдэбургу. Першай у ВКЛ магдэбургскае права атрымала Вільня (1387), а на тэрыторыі сучаснай Беларусі – Брэст (1390).

94. **Магістрат** – орган гарадскога самакіравання, які складаўся ў ВКЛ з выбарнай рады (на чале яе стаяў бурмістр) і лавы (суда), дзе старшынстваваў войт.

95. **Магнаты** – назва, якой сучасныя гісторыкі вызначаюць найбуйнейшых землеўладальнікаў. У ВКЛ найбольш вядомыя магнацкія роды Радзівілаў, Сапегаў, Агінскіх і інш.

96. **Мадэрнізацыя** – працэс паступовага пераўладкавання грамадства пры пераходзе ад аграрна-рамеснай да індустрыяльнай цывілізацыі. У прыватнасці, працэс пераходу ад феадальнага да буржуазнага грамадства, які распачаўся ў Беларусі ў сувязі з буржуазнымі рэформамі другой паловы XIX ст. (адмена прыгоннага права і інш.). Прыкметамі мадэрнізацыі з'яўляюцца індустрыялізацыя, урбанізацыя, дэмакратызацыя, развіццё навукі, адукацыі і культуры, абмежаванне пазіцый царквы, фарміраванне прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці.

97. **Маёмасны цэнз** – валоданне маёмасцю (зямля, дамы, прадпрыемствы і інш.) на пэўную суму грошай, якое давала права прымаць удзел у кіраванні або выбарах. Напрыклад, маёмасны цэнз быў уведзены пры выбарах гарадской думы ў час правядзення гарадской рэформы (пачалася ў Беларусі ў 1875 г.)

98. **Манаполія** – саюз прадпрымальнікаў з мэтай пераадолення канкурэнцыі і атрымання найвялікшых прыбыткаў. Абазначае таксама выключнае права на вытворчасць і продаж прадукцыі. Манаполіі ўзніклі ў Беларусі на рубяжы XIX–XX стст.

99. **Манархія** – улада аднаго кіраўніка (гаспадара) у дзяржаве. У ВКЛ пры Гедыміне, Альгердзе, Вітаўце ўлада вялікага князя лічылася неабмежаванай. У другой палове XV – XVI ст. улада вялікага князя пры Казіміры і Аляксандры была абмежавана панамі-радай, што сведчыла аб узнікненні саслоўна-прадстаўнічай (абмежаванай) манархіі.

100. **Мануфактура** – прадпрыемства, заснаванае на ручной працы і яе падзеле. З'яўлялася пераходнай формай ад рамеснай вытворчасці да фабрыкі. Першымі мануфактурамі на Беларусі сталі заснаваныя ў 10–30-хгг. XVIII ст. Налібоцкая і Урэцкая шкляныя мануфактуры. Шырокую вядомасць набылі Слуцкая і Нясвіжская мануфактуры шаўковых паясоў.

101. **Марксізм** – філасофскае, эканамічнае і палітычнае вучэнне, створанае ў першай палове XIX ст. К. Марксам і Ф. Энгельсам. Яны распрацавалі матэрыялістычную дыялектыку (вучэнне аб развіцці), матэрыялістычнае разуменне гісторыі, тэорыю прыбавачнай вартасці і вучэнне аб камунізме. Натуральны паступальны гістарычны ход грамадскага развіцця вызначаецца зменай грамадска-эканамічных фармацый, а класавую барацьбу паміж пануючым і прыгнечанымі класамі марксізм разглядаў у якасці рухаючай сілы гісторыі. Вышэйшым адлюстраваннем класавай барацьбы лічылася сацыяльная (пралетарская, сацыялістычная) рэвалюцыя, якая прывядзе да ўсталявання дыктатуры пралетарыяту (прымусовай улады рабочага класу). У пачатку XX ст. марксізм падзяліўся на дзве плыні – рэвалюцыйную (У. І. Ленін і інш.), у якой перамагло

Репозиторий ВГУ

бальшавіцкае вытлумачэнне марксізму, і рэфармісцкую (Э. Бернштэйн і інш.). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі марксізм стаў дзяржаўнай ідэалогіяй. Сучасныя філосафы вылучаюць некалькі версій марксізму: класічную, прадстаўленую заснавальнікамі вучэння; ленінскую трактоўку; сталінскі варыянт; сацыял-дэмакратычную версію (у прыватнасці, рускі меншавізм); сучасны неамарксізм.

102. **Мезаліт** – сярэднекаменны век – перыяд першабытнага ладу, на працягу якога асноўнымі здабыткамі чалавека з'яўляюцца лук і стрэлы, каменны тапор, зроблены першыя крокі ў накірунку прыручэння, а магчыма і адамашнівання жывелін.

103. **Меліярацыя** – мерапрыемствы з мэтай асушэння балот і павелічэння пасяўных плошчаў. Шырокі размах набыла ў 50–60-я гг. ХХ ст. у БССР. Парушэнне тэхналогіі прывяло да ўзнікнення экалагічных праблем.

104. **Мецэнат** – багаты апякун навук і мастацтваў. Назва паходзіць ад уласнага імя вядомага багатага рымляніна, дарадцы і сябра імператара Аўгуста (канец І ст. да н. э.). Прыкладам мецэнацтва ў гісторыі ВКЛ з'яўляецца дзейнасць Мікалая Радзівіла Чорнага, на сродкі якога была заснавана першая на сучаснай тэрыторыі Беларусі друкарня ў Брэсце.

105. **Міжваенны перыяд –** гістарычны перыяд паміж І і ІІ сусветнымі войнамі (1918-1939 гг.),

106. **Мілітарызм** – палітыка, арыентаваная на ваенныя сродкі вырашэння знешніх і ўнутраных праблем.

107. **Мюнхенскае пагадненне –** пагадненне, заключанае ў верасні 1938 г. у Мюнхене паміж Германіяй, Італіяй, Англіяй і Францыяй аб падзеле Чэхаславакіі (далучэнні да Германіі Судэцкай вобласці),

108. **Мяжа яўрэйскай аселасці** – тэрыторыя беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх губерняў Расійскай імперыі ў 1791–1917 гг., дзе ў гарадах і мястэчках дазвалялася пастаяннае пражыванне асобам яўрэйскай нацыянальнасці. Утварэнне мяжы звязана з усталяваннем улады самадзяржаўя на далучаных да Расіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай землях. Абмежаванні грамадзянска-маёмасных правоў яўрэяў у прыватнасці, забарона пакідаць вызначаныя тэрыторыі без урадавага дазволу, канчаткова ліквідаваны Часовым урадам.

109. **Мяшчане** – назва жыхароў гарадоў і мястэчак. У дарэвалюцыйнай расіі – гарадское саслоўе, якое складалася з рамеснікаў, гандляроў,ніжэйшых чыноў служачых.

110. **Наёмная праца** – праца па дамоўленасці з працадаўцам, за выкананне якой на працягу пэўнага рабочага часу прадугледжваецца пэўная аплата.

111. **Народнасць** – этнічная супольнасць з агульнай тэрыторыяй, пануючым эканамічным ладам, адзінай мовай, культурай, псіхічным складам, этнічнай самасвядомасцю.

112. **Народнікі** – рэвалюцыянеры, якія аб'явілі сваей задачай абарону народа, яго інтарэсаў.

113. **Натуральная гаспадарка** – феадальная гаспадарка, у якой выраблялася ўсё неабходнае для жыцця і ўжывалася амаль усё, што выраблялася. Прадукцыя натуральнай гаспадаркі не прызначалася для абмену або продажу (акрамя солі і жалеза).

Рэпазіторый ВГУ

114. **Нацыя** – сацыяльна-эканамічная і духоўная супольнасць людзей з пэўнай псіхалогіяй і самасвядомасцю, якая мае агульную мову, адметную культуру, побыт і тэрыторыю сталага пражывання.

115. **Нацыяналізацыя** – перадача масмасці (зямлі, прадпрыемстваў, транспарту, банкаў і г. д.) з прыватнай уласнасці ў дзяржаўную.

116. **Нацыянальнае пытанне** – комплекс нацыянальных праблем (сацыяльна-эканамічных, палітычных, культурных, рэлігійных і інш.).

117. **Неаліт** – новакаменны век – перыяд першабытнага ладу, на працягу якога асноўнымі здабыткамі чалавека з’яўляюцца новыя заняткі (земляробства і жывелагадоўля), новая тэхніка апрацоўкі камня (пілаванне, свідраванне), прынцыпова новыя матэрыялы (абпаленая гліна, тканіна).

118. **Неалітычная рэвалюцыя** – пераход ад прысвойваючага да вытворчага тыпу гаспадаркі (ад збіральніцтва і палявання да адпаведна земляробства і жывелагадоўлі), які адбыўся на працягу, пераважна, неаліту.

119. **Нейтральная дзяржава** – дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброеных канфліктах (войнах) і ваенных саюзах. Пасля атрымання Рэспублікай Беларусь суверэнітэту (незалежнасці) было абвешчана яе імкненне быць нейтральнай дзяржавай.

120. **НЭП –** (новая эканамічная палітыка),-сістэма мер, якая ўключала такія асноўныя моманты: умацаванне саюза рабочых і сялян; развіцце прамысловасці на базе электрыфікацыі; каапераванне насельніцтва; выкарыстанне таварна-грашовых адносін; паўсямеснае ўкараненне дзяржразліку, асабістай зацікаўленнасці; часовае дапушчэнне капіталістычных элементаў у эканоміцы; удасканальванне дзяржаўнага планавання і кіраўніцтва; барацьба з бюракратызмам; падняцце культуры ва ўсіх галінах дзейнасці чалавека.

121. **Ордэн** – назва сярэдневяковых манаскіх (духоўна-рыцарскіх) аб'яднанняў каталіцкай і уніяцкай цэркваў. На тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў канцы XII – пачатку XIII ст. (Лівонскі ордэн і інш.) для распаўсюджвання хрысціянскай (каталіцкай) веры. У XVI ст. на беларускіх землях замацаваліся ордэны езуітаў, францысканцаў, бернардзінцаў, аўгусцінцаў і інш.

122. **Пагоня** – ваенная павіннасць у Вялікім княстве Літоўскім. Герб – выява конніка з занесеным над галавой мячом. Існуе некалькі версій паходжання герба. Фарміраванне герба адбывалася на працягу XIII–XVI стст. Статут ВКЛ 1566 г. юрыдычна замацаваў выкарыстанне герба «Пагоня» за беларускімі землямі. Выява вершніка з мячом у руцэ стала гербам шэрагу гарадоў Беларусі, якія атрымалі магдэбургскае права. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі «Пагоня» стала гербам Віленскай і Віцебскай губерняў. Яна прысутнічала таксама ў Вялікім дзяржаўным гербе Расійскай імперыі. Герб «Пагоня» выкарыстоўвалі ўдзельнікі паўстання 1863–1864 гг. Статус дзяржаўнага быў нададзены гербу пасля абвяшчэння ў 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі. Ён таксама стаў дзяржаўным гербам Літоўскай Рэспублікі, каб падкрэсліць гістарычную пераемнасць з ВКЛ. Пасля прыпынення існавання СССР Літва аднавіла герб «Пагоня» як дзяржаўны. У 1991 – 1995 г. «Пагоня» была абвешчана дзяржаўным гербам Рэспублікі Беларусь. У выніку рэферэндуму ў 1995 г.была прынята новая дзяржаўная сімволіка.

Рэпазіторый ВДУ

123. **Падзел працы** – прыроднае раздзяленне працы паводле полу (паміж жанчынамі і мужчынамі) і паводле ўзросту. Таксама абазначае аддзяленне рамяства ад земляробства, якое адбывалася ў X-XIII стст. і было звязана са спецыялізацыяй на адпаведным тыпе вытворчасці. З'яўляецца характэрнай прыкметай мануфактурнай вытворчасці.

124. **Падсечна-агнявое земляробства** – тып земляробства, пры якім на месцы высечанага і спаленага лесу апрацоўвалі глебу з дапамогай бараны-сукаваткі, а попел служыў угнаеннем.

125. **Пакт** – дагавор, напрыклад, дагавор ад 23 жніўня 1939 г. аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй, які называюць пактам Рыбентропа–Молатава.

126. **Палеаліт** – старажытнакаменны век – перыяд першабытнага ладу, на працягу якога чалавек навучыўся здабываць агонь, вырабляць складаныя каменныя і касцяныя прылады працы, шыць вопратку, будаваць жыллё, паляваць і лавіць рыбу, а таксама жыць грамадскім ладам з грамадскай свядомасцю і яе найбольш важнымі формамі: мастацтвам і рэлігіяй.

127. **Палітыка генацыду –** планамернае знішчэнне цэлых груп насельніцтва па тых ці іншых матывах: з-за прыналежнасці да савецкіх актывістаў, камуністаў, яўрэяў і г.д.,

128. **Палітыка калектыўнай бяспекі –** палітыка шэрагу еўрапейскіх краін, якая мела мэтай стрымаць нарастанне фашысцкай агрэсіі ў 1930-ых гг.

129. **Палітычная партыя** – супольнасць людзей, аб'яднаных арганізацыйна і ідэалагічна, якая выражае інтарэсы пэўнага класа, сацыяльнага слоя, грамадскай групы і ставіць сваей мэтай іх рэалізацыю шляхам заваявання дзяржаўнай улады або ўдзелу ў яе здзяйсненні.

130. **Палюддзе** – збор князем натуральнай даніны прадуктамі з падуладнага сельскага насельніцтва.

131. **Паншчына** – від сялянскай павіннасці. Дармавая, прымусовая праца сялян уласнымі прыладамі працы ў гаспадарцы феадала (на яго землях) пэўную колькасць дзён на тыдзень. У сярэдзіне XIX ст. паншчына складала 12 дзён на тыдзень (па 6 дзён мужчынскай і жаночай працы).

132. **Перабудова –** новы палітычны курс, прыняты ў СССР у красавіку 1985 г..

133. **Першабытны лад** – грамадскія адносіны, якія характарызуюцца калектыўнай працай і сумесным пражываннем старажытных людзей, нізкім узроўнем развіцця прадукцыйных сіл.

134. **Перыяд «ваеннай дэмакратыі»**– апошні перыяд першабытнага ладу, для якога характэрна з'яўленне князёў-племянных правадыроў.

135. **Племя** – трывалае аб'яднанне некалькіх родаў якія звязаны агульнасцю паходжання. Узнікла на тэрыторыі Беларусі прыкладна 10–5 тыс. гадоў да н. э. на аснове кроўных сувязей.

136. **Плюралізм** – прызнанне існавання мноства поглядаў, думак, меркаванняў па пытанні аб шляхах развіцця дзяржавы і грамадства. Увасабляецца ў шматпартыйнасці як форме дэмакратычнага ўладкавання грамадства.

137. **Права** – сукупнасць агульнаабавязковых правіл паводзін, узаконеных магчымасцей чалавека, якія ўстаноўлены, рэгулююцца і ахоўваюцца дзяржавай.

Рэпазіторый ВГУ

138. **Права “liberum veto”** – права аднагалосся, якое існавала ў Рэчы Паспалітай у XVI – XVIII стст.

139. **Прававая дзяржава** – дзяржава, у якой улада падзяляецца на заканадаўчую і выканаўчую, якія ўзаемна кантралююцца, і незалежную судовую, якая падпарадкоўваецца толькі закону. Прадугледжваецца строгае выкананне ўсімі дзяржаўнымі органамі і службовымі асобамі законаў, роўнасць усіх людзей перад законам.

140. **Праваслаўе** – адзін з асноўных кірункаў у хрысціянстве (разам з каталіцызмам і пратэстантызмам). Аформіўся ў 1054 г. пасля падзелу на заходнюю (каталіцкую) і ўсходнюю (праваслаўную) цэрквы. Праваслаўе як дзяржаўная рэлігія ўводзілася на беларускіх землях з канца X ст. Пачаткам гісторыі праваслаўнай царквы на тэрыторыі Беларусі лічыцца заснаванне Полацкай епархіі (царкоўнай акругі) у 992г.

141. **Прадмет гісторыі Беларусі** – гэта **вучэнне аб** працэсе развіцця чалавека, тэхналагічным і эканамічным спосабе вытворчасці на тэрыторыі Беларусі, ва ўсёй разнастайнасці і ва ўзаемасувязі з іншымі навукамі і краінамі.

142. **Прадукцыйнасць працы** – эфектыўнасць працы. Вымяраецца колькасцю створанай за адзінку часу прадукцыі або велічынёй часу, затрачанага на вытворчасць адзінкі прадукцыі.

143. **Прамысловасць лёгкая** – прамысловасць перапрацоўчая, а таксама па вырабу тавараў народнага спажывання.

144. **Прамысловасць цяжкая** – вытворчасць сродкаў вытворчасці, перш за ўсё машынабудаванне, металаапрацоўка, электраэнергетыка і інш.

145. **Прамысловая рэвалюцыя** – пераход ад мануфактуры да фабрыкі; тэхнічны бок- сістэмнае прымяненне машын, сацыяльны бок – фарміраванне прамысловай буржуазіі і пралетарыяту.

146. **Прамысловы пераварот (рэвалюцыя)** – пераход ад мануфактурнай да фабрычна-заводскай стадыі вытворчасці, ад ручной да машыннай працы, звязаны з фарміраваннем прамысловай буржуазіі і вольнанаёмнага рабочага класа.

147. **Пратэстантызм** – агульная назва хрысціянскіх плыней і кірункаў, што ўзніклі пад уплывам Рэфармацыі, супраць узмацнення пазіцый каталіцкай царквы ў XVI ст. У аснове пратэстантызму – вучэнне аб непасрэднай сувязі чалавека з Богам без пасрэдніцтва царквы. Сярод пратэстантаў на тэрыторыі Беларусі быў, напрыклад, прыхільнік кальвінізму (вучэння Жана Кальвіна) Мікалай Радзівіл Чорны – канцлер Вялікага княства Літоўскага, які атрымаў у гісторыі метафарычную назву «бацькі Рэфармацыі» ў ВКЛ.

148. **Прыватызацыя** – раздзяржаўленне, пераход маёмасці з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную або калектыўную.

149. **Прывілей** – заканадаўчы дзяржаўны дакумент, у якім кіраўнік дзяржавы даваў або пацвярджаў правы феадалаў. Вядомы, напрыклад, прывілей Казіміра 1447 г., які забяспечыў феадалам (магнатам, шляхце) валоданне зямлёй на правах пэўнай уласнасці і даў пачатак афармленню запрыгоньвання сялян (іх залежнасці ад феадалаў).

Рэпазіторый ВГУ

150. **Прэзідэнцкая рэспубліка –** разнавіднасць рэспубліканскай формы кіравання, пры якой прэзідэнт юрыдычна і фактычна з’яўляецца галавой дзяржавы і выканаўчай улады.

151. **Путч** – дзяржаўны пераварот з удзелам невялікай групы загаворшчыкаў, тайная змова. Прыкладам можа служыць жнівеньскі путч 1991 г. у Маскве, калі ў краіне было ўведзена надзвычайнае становішча.

152. **Рада** – саслоўна-прадстаўнічы орган улады ў Вялікім княстве Літоўскім. Узнік спачатку як дарадчы орган пры вялікім князю Казіміру Ягайлавічу ў сярэдзіне XV ст. Затым ператварыўся ў заканадаўчы і выканаўчы орган улады. 3 канца XV ст. атрымаў назву «паны-рада».

153. **“Радаўцы”** – прадстаўнікі беларускага нацыяльна-дэмакратычнага руху на Беларусі ў пач.XX ст., якія самавызначэнне беларускіх зямель бачылі ў якасці вобласці ў складзе Расійскай імперыі,

154. **«Разбор шляхты»** – палітыка самадзяржаўя пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі, згодна з якой выключаліся з дваранскага саслоўя і пераводзіліся ў саслоўе дзяржаўных сялян або мяшчан тыя прадстаўнікі дробнай шляхты, якія не прадставілі дакументаў, што пацвярджалі іх дваранскае званне. Такія меры былі прыняты, напрыклад, у адносінах да ўдзельнікаў шляхецкага паўстання 1830-1831 гг.

155. **Ратуша** – гарадская пабудова для пасяджэнняў органаў гарадскога кіравання і самакіравання.

156. **Ратыфікацыя** – зацвярджэнне вярхоўнымі органамі дзяржаўнай улады міжнароднага дагавора або пагаднення, пасля чаго гэты дакумент набывае юрыдычную (прававую) сілу. Напрыклад, парламентамі Расійскай Федэрацыі (Дзяржаўнай думай) і Рэспублікі Беларусь (Нацыянальным сходам) у 2000 г. ратыфікаваны падпісаны ў 1999 г.. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

157. **Рэабілітацыя** – аднаўленне добрага імя і правоў рэпрэсіраваных.

158. **Рэвалюцыя** – карэнны пераварот ва ўсіх сферах жыцця – эканамічнай, палітычнай, грамадскай, культурнай і інш..

159. **«Рэвалюцыя культурная»** – умоўная назва комплексу пераўтварэнняў у галіне культуры, навукі, адукацыі, літаратуры, мастацтва ў 20–30-ыя гг. XX ст. у СССР і БССР.

160. **Рэвалюцыя навукова-тэхнічная** – укараненне навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць.

161. **Рэвалюцыя палітычная** – карэнныя змяненні, пераварот у грамадска-палітычным ладзе, які звязаны са звяржэннем старога і ўстанаўленнем новага дзяржаўнага ладу. Як правіла, адбываецца ў ходзе ўзброенага паўстання.

162. **Рэквізіцыя** – прымусовае адчужэнне маёмасці (уласнасці) на карысць іншых асоб або дзяржавы.

163. **Рэкруты** – асобы мужчынскага полу (прадстаўнікі сялянскага і мяшчанскага саслоўяў), якіх прызывалі на 20-гадовую вайсковую службу ў Расійскай імперыі ад пэўнай колькасці душ (з канца XVIII ст. ад 200, з 1820 г. – ад 125 душ мужчынскага полу).

164. **Рэлігія** – вызначаная сістэмапоглядаў, абумоўленая верай ў надзвычайныя сілы і пакланенне ім.

Рэпазіторый ВДУ

165. **Рэпарацыя** – поўная ці частковая кампенсацыя, аплата матэрыяльных страт ад вайны дзяржавай, якая здзейсніла агрэсію, той краіне, якая падвяргалася агрэсіі.

166. **Рэпрэсіі** –карная мера, пакаранні з боку дзяржаўных органаў нязгодных з праводзімай палітыкай.

167. **Рэспубліка** – форма дзяржаўнага кіравання.

168. **Рэфармацыя** – рэлігійна-грамадскі рух за рэфармаванне каталіцкай царквы ў Заходняй Еўропе ў XVI ст. На тэрыторыі Беларусі распаўсюдзіўся пераважна сярод магнатаў і шляхты. Найбольш адметныя прадстаўнікі рэфармацыйнага руху ў ВКЛ – Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі.

169. **Рэферэндум** – усенароднае галасаванне па найважнейшых пытаннях развіцця краіны. У Савецкім Саюзе ў 1991 г. быў праведзены рэферэндум па праблемах захавання СССР. У Рэспубліцы Беларусь у 1995 і 1996 гг. адбыліся рэферэндумы па пытаннях дзяржаўнага статусу беларускай і рускай мовы, дзяржаўнай сімволікі, інтэграцыі з Расіяй, прыняцця новай рэдакцыі Канстытуцыі.

170. **Рэформа** –ператварэнне, змяненне, перабудова якога-небудзь боку грамадскага жыцця пры захаванні асноў існуючага ладу.

171. **Самаўладдзе** – неабмежаваная манархія ў Расійскай імперыі,

172. **Самафінансаванне** – метад гаспадарання, пры якім прадпрыемства не атрымлівае фінансавых сродкаў з дзяржбюджэту, а зарабляе грошы самастойна, за кошт сваёй вытворчасці і рэалізацыі яе вырабаў.

173. **«Санацыя»** – палітычны і эканамічны рэжым, які быў устаноўлены ў Заходняй Беларусі ў 30-я гг. XX ст. кіраўніком Польскай дзяржавы Ю. Пілсудскім.

174. **«Санітарны кардон»** – умоўная назва тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая, уваходзячы ў склад Польшчы, выконвала ролю буфера паміж СССР і капіталістычнымі краінамі.

175. **Саслоўе** – грамадская група людзей, якая мае спадчынныя (тыя, што перадаюцца ў спадчыну ад бацькі да сына) правы і абавязкі. У ВКЛ існавалі саслоўі: магнаты і шляхта, мяшчане (жыхары гарадоў), духавенства, сяляне.

176. **Сацыялізм** – пераходная форма сацыяльна-палітычных адносін, якая мяняе капіталізм у выніку ўсталявання дыктатуры пралетарыяту і накіравана на будаўніцтва камуністычных адносін.

177. **Сацыялістычны рэалізм** – мастацкі метад, які патрабаваў адлюстравання ў літаратуры і мастацтве рэалій жыцця, звязаных з будаўніцтвам савецкага сацыялістычнага ладу.

178. **Сойм (сейм)** – вышэйшы шляхецкі саслоўна-прадстаўнічы орган улады ў Вялікім княстве Літоўскім у XV – першай палове XVI ст. і Рэчы Паспалітай у другой палове XVI-XVIII ст.ст.

179. **Спажывецкая гаспадарка** – гаспадарка, пры якой людзі пераважна спажываюць і карыстаюцца тым, што існуе ў прыродзе. Да яе належаць такія заняткі, як паляванне, збіральніцтва, рыбалоўства.

180. **Статут** – звод заканадаўчых актаў. Вядомы Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 г. Дзеянне Статута 1588 г., які быў выдадзены пры непасрэдным удзеле канцлера ВКЛ Льва Сапегі, было скасавана ў першай палове XIX ст.



Репозиторий ВГУ

181. **Суверэнітэт** – незалежнасць і самастойнасць дзяржаўнай улады ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае замежнага ўмяшання. Так, суверэнітэт БССР быў абвешчаны Дэкларацыяй 27 ліпеня 1990 г. Згодна з Канстытуцыяй, Рэспубліка Беларусь – суверэнная дзяржава.

182. **Супольнасць "польскі народ шляхецкі"** – новая сацыяльная супольнасць , у якую ўваходзіла шляхта ВКЛ і Польшчы, аб'яднаная адзінствам праў, агульнай мовай (польскай), рэлігіяй (каталіцтвам)

183. **Сярэднявечча** – перыяд гісторыі паміж старажытным сусветам і новым часам (V–XV стагоддзі).

184. **Талерантнасць** – рэлігійная верацярпімасць, паважлівыя адносіны да вернікаў розных канфесій (кірункаў і плыней).

185. **Талерантнасць** – цярпімасць да іншага народа, яго светапогляду, каштоўнасцей і паводзін,

186. **Таталітарны палітычны рэжым** – рэжым, пры якім ажыццяўляецца поўны (татальны) кантроль дзяржавы над усімі сферамі жыцця грамадства, забаронены дэмакратычныя арганізацыі, фактычна ліквідаваны канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян, а таксама палітычная апазіцыя.

187. **Унітарная дзяржава** – форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой на вышэйшым узроўні існуюць моцная цэнтральная ўлада, адзіныя канстытуцыя, урад, грошы, войска, праводзіцца адзіная знешняя палітыка, а на мясцовым узроўні дзейнічаюць свае органы кіраўніцтва. Рэспубліка Беларусь, згодна з Канстытуцыяй, – унітарная дзяржава.

188. **Унія** – саюз, аб'яднанне дзяржаў (цэркваў) на чале з адзіным кіраўніком. Вядомы, напрыклад, Крэўская унія 1385 г. – пагадненне паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам, адной з умоў якога стаў шлюб Ягайлы і Ядвігі; Люблінская унія 1569 г., якая прывяла да стварэння Рэчы Паспалітай; Берасцейская царкоўная унія 1596 г. праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, у выніку чаго ўзнікла уніяцкая царква з праваслаўнымі абрадамі пад уладай папы рымскага.

189. **Уніяцтва** – аб'яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Адбылося на тэрыторыі Рэчы Паспалітай паводле Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. Па яе ўмовах праваслаўныя вернікі прызнавалі кіраўніцтва уніяцкай царквы з боку папы рымскага пры захаванні праваслаўнай абраднасці. Першапачаткова прымусовае ўвядзенне уніі выклікала адмоўную рэакцыю жыхароў беларускіх зямель. У 1839 г. на Полацкім царкоўным Саборы прынята рашэнне аб далучэнні уніяцкай царквы да Рускай праваслаўнай царквы.

190. **Урбанізацыя** – колькасны рост гарадоў і павелічэнне гарадскога насельніцтва. Падобная з'ява стала характэрнай у сярэдзіне і другой палове XX ст.

191. **«Устава на валокі»** – назва галоўнага заканадаўчага акта аграрнай (сельскагаспадарчай, зямельнай) рэформы Жыгімонта II Аўгуста (1557). Згодна з умовамі рэформы, уся зямля падзялялася на валокі (мера плошчы ў 21,36 га), якія служылі адзінкай падаткаабкладання. Адна валока прыпадала ў сярэднім на дзве сялянскія сям'і. У выніку рэформы замацавалася і існавала амаль да сярэдзіны XIX ст. арыентаваная на продаж сваёй прадукцыі фальваркава-паншчынная сістэма ў сельскай гаспадарцы Беларусі.

Рэпазіторый ВГУ

192. **Фабрыка** – прамысловае прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і выкарыстанні машын. Першыя суконныя фабрыкі на тэрыторыі Беларусі ўзніклі ў 20-ыя гг. ХІХ ст. у мястэчках Хомск і Косава Гродзенскай губерні.

193. **Фальварак** – комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў феадала; частка прадукцыі фальварка прадвызначалася на прадаж, таму ў адрозненні ад вотчыны фальварак быў уключаны ў працэс таварна-грашовых адносін.

194. **Фашызм –** варыянт таталітарнага палітычнага рэжыму,

195. **Феадалізм** – грамадска-эканамічныя адносіны з вельмі марудным развіццём прадукцыйных сіл.

196. **Феадальная раздробленасць (феадальная ўсобіца)** – перыяд развіцця, характэрны для ўсіх сярэдневяковых краін, які ахоплівае пераважна ХІ–ХІІІ стст. (феадальная раздробленасць Русі існавала да канца ХV ст.). Прычынамі раздробленасці лічацца імкненне ўдзельных князёў да палітычнай самастойнасці, існаванне натуральнай гаспадаркі, якая абумоўлівала эканамічную самастойнасць асобных княстваў і інш. На беларускіх землях пачынаецца з раздраблення Полацкага княства ў канцы ХІ ст. Першым удзельным княствам, напрыклад, з'яўлялася Мінскае ў час княжання Глеба Усяславіча.

197. **Федэралізм** – сістэма кіравання, пры якой улада ажыццяўляецца адначасова агульнацыянальным урадам і аўтаномнымі органамі кіравання,

198. **Федэрацыя** – форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой ствараюцца федэральныя адзінкі – суб'екты федэрацыі (напрыклад, землі, штаты, нацыянальныя рэспублікі). Саюз некалькіх дзяржаў з мэтай стварэння новай адзінай дзяржавы, пры якім дзяржавы захоўваюць частку сваіх правоў як суб екты федэрацыі. У федэрацыі дзейнічаюць адзіныя канстытуцыя, органы дзяржаўнай улады, устанаўліваюцца адзінае грамадзянства, грашовыя адзінкі і г. д. Суб'екты федэрацыі маюць, як правіла, уласныя канстытуцыі, заканадаўчыя, выканаўчыя і судовыя органы. Прыкладам федэрацыі з'яўляецца СССР, у заснаванні якога ў 1922 г. прымала ўдзел беларуская дэлегацыя, а БССР стала саюзнай рэспублікай. Федэрацыямі з'яўляюцца ЗША, Індыя, Германія, Расія і інш.

199. **Фрэска** – роспіс сцен вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы.

200. **Харугва** – вайсковая адзінка ў войску ВКЛ, у якой налічвалася ад 60 да 600 коп'яў – баявых троек (рыцар-вершнік, збраяносец-парабак, лучнік). У іншым значэнні баявы сцяг падраздзяленняў войска ВКЛ.

201. **Харчразвёрстка** – сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, згодна з якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі прадукцыі, у першую чаргу збожжа. Выкарыстоўвалася ў гады грамадзянскай вайны ў савецкай Расіі і фактычна ператварылася ў рэквізіцыі збожжа ў сялян на патрэбы Чырвонай Арміі. З'ўлялася элементам палітыкі «ваеннага камунізму».

202. **Цаліна** – неапрацаваная глеба. У асваенні цалінных зямель у СССР у 50–60 гг. ХХ ст. прымала ўдзел беларуская моладзь.

203. **Цывілізацыя** – грамадская сістэма, звязаная адзінымі культурнымі каштоўнасцямі, эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай арганізацыяй, якія ўзгодненыя і ўзаемазвязаныя паміж сабой.

204. **Чынш** – аброк грашыма, які селянін выплачваў феадалу за карыстанне яго зямлёй. Паступова, пачынаючы з ХV ст., замяняе сабой натуральны аброк прадуктамі.

Рэпазіторый ВГУ

205. **Шавінізм** – прапаганда нацыянальнай переваґі і нацыянальнай выключнасці, проціпастаўленне інтарэсаў адной нацыі інтарэсам іншых нацый. Шавіністычную пазіцыю ў гады рэвалюцыі 1905–1907 гг. займалі манархічныя партыі і арганізацыі, напрыклад, «Рускі ўскраінны саюз». Ён выступаў з лозунгамі захавання «адзінай і непадзельнай Расійскай імперыі» і «Расія – для рускіх і толькі рускія павінны кіраваць ёю».

206. **Шлях «з варагаў у грэкі»** – гандлёвы водны шлях цераз Заходнюю Дзвіну, Дняпро і іншыя рэкі, які злучаў Балтыйскае і Чорнае моры і дазваляў выйсці ў Міжземнае мора.

207. **Шляхта** – назва большасці ўсіх феадалаў-землеўладальнікаў у ВКЛ і Польскім каралеўстве, якая стала ўжывацца з XVI ст. Да XV ст. яны называліся баярамі – служылымі людзьмі.

208. **Шматпартыйная палітычная сістэма –** мадэль партыйнай сістэмы, у якой больш за дзве партыі з’яўляюцца дастаткова ўплывовымі, у выніку выбараў атрымліваюць парламенцкае прадстаўніцтва і ўдзельнічаюць у фарміраванні ўрада.

209. **Экстэнсіўны шлях** – шлях развіцця, звязаны найперш з павелічэннем колькасці выпускаемай прадукцыі за кошт росту колькасці працуючых, колькасці грошай, колькасці прадпрыемстваў іг. д.

210. **Экстэнсіўныя фактары развіцця эканомікі – “**колькасныя” фактары, якія забяспечваюць развіцце эканомікі: рост колькасці прадпрыемстваў, колькасці рабочых рук, колькасці ўкладзеных грошаў і інш.

211. **Энеаліт** – медна-каменны век – перыяд першабытнага ладу, калі прымяняліся металічныя прылады працы, але яшчэ не з’явілася металургія сплаваў;

212. **“Эпоха застою” –** гістарычны перыяд у СССР , калі адбываліся вельмі марудныя змены ў эканамічным развіцці краіны.

213. **Этнагенез** – працэсс паходжання народа.

214. **Этнас** – гістарычна сфарміраваная супольнасць людзей з агульнай культурай, мовай і самасвядомасцю. Тэрмін блізкі да паняцця «народ» у этнаграфічным сэнсе. Фарміраванне этнасу адбываецца ў кірунку паслядоўнага складвання такіх формаў супольнасцей людзей, як племя, народнасць, нацыя. У V–VIII стст. адбываецца засяленне тэрыторыі Беларусі славянскімі плямёнамі з поўдня. У VIII–IX стст. у выніку славянізацыі балцкага насельніцтва склаліся некалькі аб'яднанняў усходніх славян: крывічы, дрыгавічы, радзімічы. Да XIII ст. адбывалася складванне перадумоў станаўлення беларускай народнасці, якая існавала прыкладна да рубяжа XVIII–XIX стст. У XIX–XX стст. адбываецца працэс афармлення беларускай нацыі.

215. **Язычніцтва** – мнагабожжа-пакланенне многім ідалам, існавала ў сярднявеччы. Пасля ўвядзення хрысціянства (праваслаўя) на працягу IX–XIII стст. на беларускай зямлі мела месца іх суіснаванне.

Репозиторий ВГУ

# З М Е С Т

I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ………………………………………. 3

II. МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АВАЛОДАННІ ЗМЕСТАМ ВЫВУЧАЕМЫХ ТЭМ ……………………………………… 5

ТЭМА 1. Беларусь пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі. Першы аднаўленчы этап. Выхад БССР на міжнародную арэну ………... 5

ТЭМА 2. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі ў першыя пасляваенныя пяцігодкі (чацвёртую (1946–1950 гг.) і пятую (1951–1955 гг.)) ……………………………………………………. 15

ТЭМА 3. Грамадска-палітычнае жыццё ў пасляваенны перыяд ……… 27

ТЭМА 4. Аднаўленне і развіццё духоўнай культуры Беларусі на этапе 1945–1955 гг. ………………………………………………………. 34

ТЭМА 5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 50-х – сярэдзіне 60-х гг. ……………………………………………….. 43

ТЭМА 6. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове 60-х – сярэдзіне 70-х гг. ……………………………………………... 53

ТЭМА 7. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у гады 10–11-й пяцігодак (1975–1985 гг.) …………………………………………… 66

ТЭМА 8. Сельская гаспадарка БССР у другой палове 60-х – першай палове 80-х гг. ………………………………………………………... 81

ТЭМА 9. Змены ў сацыяльна-бытавой сферы БССР ва ўмовах НТР (1966–1985 гг.) ……………………………………………………….. 90

ТЭМА 10. Стан адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва ў перыяд 1956–1980-х гг. ……………………………………………………… 98

ТЭМА 11. Неабходнасць кардынальных змен, пошукі шляхоў паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ………….. 109

ТЭМА 12. Пераадоленне крызісных тэндэнцый у эканоміцы Беларусі 120

ТЭМА 13. Новыя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі …… 132

ТЭМА 14. Пашырэнне палітычных, эканамічных і культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі …………….. 139

ТЭМА 15. Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на мяжы XX–XXI стст. ……………………………………………………… 146

III. МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ПА ВЫВУЧЭННІ ПЫТАННЯЎ, ВЫЗНАЧАНЫХ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ …………………… 158

СЕМІНАР 1. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1944–1955 гг. ……………………………………………………….. 158

СЕМІНАР 2. Аднаўленне ў галіне культуры БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ……………………………………… 159

СЕМІНАР 3. Эканамічныя рэформы ў прамысловасці, на транспарце і ў сельскай гаспадарцы: прычыны іх нязначных вынікаў ……... 160

СЕМІНАР 4. Сацыяльная палітыка і культурнае жыццё ў БССР у 60-х – першай палове 80-х гг. ……………………………….... 161

Рэпазіторый ВДУ

СЕМІНАР 5. Беларускае грамадства ў часы перабудовы …………….. **162**
СЕМІНАР 6. Беларусь ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту: пераход да рынкавай эканомікі ……………………………………………. **162**
СЕМІНАР 7. Рэспубліка Беларусь – сацыяльна арыентаваная дзяржава **163**

**IV. ДАДАТКІ** ……………………………………………………………….. **165**
ДАДАТАК 1. План-каляндар самастойнай працы студэнтаў …………. **165**
ДАДАТАК 2. Кантрольныя пытанні да экзамену ……………………. **166**
ДАДАТАК 3. Тэставыя заданні па тэме “Беларусь у пасляваенны час (1945–2015 гг.)” …………………………………………………… **168**
ДАДАТАК 4. Тлумачэнні асноўных (апорных) паняццяў …………….. **179**

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 1-02 01 01 ГІСТОРЫЯ І ГРАМАДАЗНАЎЧЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне

У 2 частках

Частка 2

Складальнік

**МАНДРЫК** Іван Уладзіміравіч


Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Камп’ютарны дызайн *Л.Р. Жыгунова*

Падпісана ў друк 12.02.2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 11,57. Ул.-выд. арк. 12,91. Тыраж 182 экз. Заказ 13.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.


Репозиторий ВГУ